# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
## ў 11 класе

Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Пад рэдакцыяй З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанка

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2011

УДК 373.5.016:821.161.3.09
ББК 74.268.3(4Беи)
Б43

А ў т а р ы:

**З. П. Мельнікава** («Васіль Быкаў»); **Г. М. Ішчанка** («Ніл Гілевіч»); **Н. Д. Андрэйкавец** («Драматургія»); **С. А. Бувіна** («Проза»); **І. М. Гоўзіч** («Міхась Стральцоў», «Паэзія»); **У. А. Лебедзеў** («Проза»); **М. І. Мішчанчук** («Іван Навуменка», «Яўгенія Янішчыц», «Паэзія»); **У. А. Сенькавец** («Георгій Марчук»); **В. М. Смаль** («Іван Чыгрынаў»); **Г. М. Снітко** («Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў»); **І. А. Швед** («Эрнэст Хемінгуэй», «Генрых Бёль»); **С. М. Шчэрба** («Рыгор Барадулін», «Аляксей Дудараў»); **М. І. Яніцкі** («Іван Шамякін», «Драматургія»)

Р э ц э н з е н т ы:

метад. аб'яднанне настаўнікаў беларус. мовы і літ. дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» (нам. дырэктара па вучэб. рабоце, настаўнік беларус. мовы і літ. выш. катэгорыі *Н. У. Целяпун*);

канд. філал. навук, дац., член секцыі філал. дысцыплін Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы *М. Ф. Шаўлоўская*

Б43 **Беларуская** літаратура ў 11 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава [і інш.] ; пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. — 192 с.
ISBN 978-985-465-870-4.

У дапаможніку змяшчаюцца метадычныя рэкамендацыі да правядзення ўрокаў розных тыпаў па беларускай літаратуры ў XI класе. Адрасуецца настаўнікам.

**УДК 373.5.016:821.161.3.09**
**ББК 74.268.3(4Беи)**

ISBN 978-985-465-870-4

© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2011

# *Ад аўтараў*

Змест і структура метадычнага дапаможніка адпавядаюць вучэбнай праграме па беларускай літаратуры для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. На гэтым этапе ў межах гісторыка-літаратурнага курса ў выпускным класе вывучаецца літаратура XX — пачатку XXI стагоддзя. У змест літаратурнай адукацыі ўваходзяць асновы гісторыі літаратуры, мастацкія творы, тэарэтычныя паняцці, развіццё вуснага і пісьмовага маўлення. Вучэбная праграма распрацавана нядаўна, таму яшчэ недастаткова забяспечана вучэбна-метадычнымі матэрыяламі, якія б улічвалі істотнае змяншэнне колькасці гадзін, адведзеных на вывучэнне традыцыйных для XI класа тэм.

Мэта гэтага выдання — дапамагчы настаўніку рэалізаваць асноўныя канцэптуальныя прынцыпы вучэбнай праграмы, праводзіць заняткі змястоўна і цікава. Характар змешчаных у дапаможніку рэкамендацый абумоўлены перакананнем аўтарскага калектыву ў тым, што на ўроку літаратуры славеснік павінен сфарміраваць у вучняў уменне чытаць і разумець мастацкі тэкст. «Навучанне і выхаванне творчасцю» (М. Лазарук) нельга рэалізаваць без удумлівага, дэталёвага асэнсавання твораў. Пры іх вывучэнні аўтары дапаможніка прапануюць настаўнікам выкарыстоўваць класічныя метады выкладання: эўрыстычны, даследчы, метад творчага чытання. У прапанаваным выданні эўрыстычны метад даволі часта рэалізуецца праз эўрыстычную гутарку, якая ўключае ў сябе праблемныя пытанні. Настаўнік павінен дапамагчы вучню выказаць *сваё* меркаванне аб прачытаным тэксце, аргументаваць *свае* высновы. Урока літаратуры няма без асобаснага перажывання і асэнсавання прачытанага. Менавіта спецыфіка ўспрымання мастацкага твора вучнямі канкрэтнага класа павінна дыктаваць настаўніку выбар той ці іншай інтэрпрэтацыі тэксту. Прапанаваныя метадычныя парады

носяць рэкамендацыйны характар, яны павінны быць творча выкарыстаны настаўнікам.

Аўтарскі калектыў разумее, што змяншэнне колькасці гадзін на вывучэнне роднай літаратуры выклікае неабходнасць арганізацыі самастойнай працы вучняў. Таму метадычны дапаможнік уключае сістэму даволі аб'ёмных, часам складаных апераджальных заданняў, звязаных з чытаннем твораў вялікай эпічнай формы, падрыхтоўкай рэфератаў і дакладаў пры вывучэнні біяграфій пісьменнікаў.

Асабліва нельга абысціся настаўніку без арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні аглядавых тэм. Урокі па гэтых тэмах, як паказвае практыка, лепш за ўсё праводзіць у форме семінарскіх заняткаў. Менавіта ўрок-семінар з добра арганізаванай апераджальнай працай, індывідуальнымі заданнямі дасць магчымасць за адну гадзіну абмеркаваць значны аб'ём інфармацыі, акрэслены ў анатацыі вучэбнай праграмы, выпрацаваць неабходныя ўменні і навыкі ў вучняў.

Метадычны дапаможнік для настаўнікаў падрыхтаваны аўтарскім калектывам, які працаваў над выданнем вучэбнага дапаможніка для вучняў[1]. Распрацоўваючы матэрыял для правядзення ўрокаў, аўтары імкнуліся задзейнічаць метадычны апарат падручніка, які павінен стаць інстументам для ўсвядомленага асэнсавання і спасціжэння мастацкага твора вучнямі.

Перад настаўнікам роднай літаратуры стаіць няпростая і вельмі адказная задача: абудзіць у выпускнікоў сярэдняй школы жаданне самастойных зносін з мастацкім тэкстам, дапамагчы адзінаццацікласнікам адчуць патрэбу і важнасць эстэтычных перажыванняў, неабходнасць далучэння да духоўных традыцый свайго народа.

Шчыра жадаем вам творчых адкрыццяў і здзяйсненняў.

---

[1] Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава [і інш.]; пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009. — С. 3—12.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1966—1985 ГАДОЎ

## УРОК.

### Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў. Агляд

Матэрыял, які складае тэму «Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў», не з'яўляецца новым для адзінаццацікласнікаў. З грамадска-палітычным і культурным жыццём Беларусі ў гэты перыяд яны знаёміліся на ўроках гісторыі Беларусі, з творчасцю многіх пісьменнікаў, імёны якіх будуць згадвацца ў аглядзе, — на ўроках беларускай літаратуры ў папярэдніх класах. Увесь матэрыял сістэматызаваны і лагічна выкладзены ў адпаведным раздзеле вучэбнага дапаможніка для XI класа. Гэта дае настаўніку падставы папярэдне прапанаваць вучням самастойна асэнсаваць тэму, а ўрок па яе вывучэнні арганізаваць у форме прэс-канферэнцыі.

Сутнаснае ва ўроках — прэс-канферэнцыях — «жаданне групы вучняў самастойна вывучыць тэму так, каб даваць адказы на любыя пытанні па ёй, а таксама такі ўзровень крытычнай думкі астатніх, каб мець жаданне і ўменне дасведчана ставіць пытанні тым, хто згадзіўся даваць адказы па навуковай праблеме, якая цікавіць вучняў» (В. Я. Ляшук). Улічваючы гэта, да ўрока па вывучэнні аглядавай тэмы «Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў» настаўнік павінен выбраць творчую групу: гісторыка, культуролага і трох даследчыкаў літаратуры (даследчыка паэзіі, даследчыка прозы, даследчыка драматургіі); даручыць ім самастойна засвоіць адпаведныя блокі матэрыялу, а з астатнімі вучнямі распрацаваць пытанні, адказы на якія раскрыюць тэму.

Ніжэй прыводзіцца адзін з магчымых варыянтаў пытанняў, якія клас можа адрасаваць творчай групе.

**Гісторыку:**

1. Ахарактарызуйце грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі ў 1966—1985 гадах. Чаму беларускую гісторыю гэтага перыяду мы разглядаем перш за ўсё праз прызму гісторыі Савецкага Саюза?

2. Якую палітыку праводзіла КПСС у гэты час па нацыянальным пытанні? Якія наступствы мела такая палітыка ў Беларусі?

**Культуролагу:**

1. Раскрыйце сутнасць тэрміна «ідэалагізацыя культурна-нацыянальнага жыцця».

2. Як у 1966—1985 гадах развівалася выяўленчае мастацтва? Якія карціны былі напісаны? Назавіце іх аўтараў.

3. Якія помнікі, манументы, мемарыяльныя комплексы былі ўзведзены ў Беларусі ў гэты час? Назавіце імёны найбольш вядомых скульптараў і архітэктараў.

4. Пералічыце набыткі беларусаў у галінах музыкі і кінамастацтва.

**Даследчыку паэзіі:**

1. Якія факты сведчылі пра актывізацыю літаратурнага жыцця ў Беларусі ў 1966—1985 гадах?

2. Назавіце імёны паэтаў, творчасць якіх прыпадае на гэты перыяд.

3. Якія тэмы былі характэрны для тагачаснай лірыкі? Прывядзіце прыклады.

4. У чым адметнасць так званай «жаночай паэзіі»? Пералічыце яе найбольш яркіх прадстаўніц.

**Даследчыку прозы:**

1. У чым выявіўся дакументалізм кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі…»? Акрэсліце антываенны пафас кнігі.

2. Як раскрывалася гістарычная тэма ў творах празаікаў з сярэдзіны 60-х па сярэдзіну 80-х гадоў XX стагоддзя?

3. На якія праблемы сучаснасці звярталі ўвагу пісьменнікі ў гэты час? Якія з твораў і чаму найбольш прыхільна сустрэлі чытачы?

4. Назавіце мастацкія набыткі беларускай «вясковай прозы».

**Даследчыку драматургіі:**

1. Хто з мастакоў слова актыўна працаваў у жанры драматургіі? Назавіце іх найбольш значныя творы.

2. Якія тэмы асэнсоўваліся беларускімі драматургамі?

Пры неабходнасці на ўроку настаўнік сам адказвае на пытанне, калі гэта не здолее зрабіць прадстаўнік творчай групы.

❒ **Дамашняе заданне:** паўтарыць па вучэбным дапаможніку матэрыял аглядавай тэмы «Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў» і з мэтай замацавання скласці план адпаведнага раздзела (с. 3—12)[1]; прачытаць аповесць І. Шамякіна «Непаўторная вясна».

## ІВАН ШАМЯКІН

У тэме «Іван Шамякін» у ХІ класе праграма прапануе вывучэнне адной з аповесцей на выбар — «Непаўторная вясна» або «Гандлярка і паэт».

### УРОК 1.

### Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка

Пачаць урок можна са знаёмства з незвычайнымі фактамі жыцця і творчасці пісьменніка, якія б адразу зацікавілі вучняў, прыцягнулі іх увагу да неардынарнай асобы творцы. Настаўнік паведамляе юнакам і дзяўчатам, што агульны тыраж твораў беларускага пісьменніка дасягае 25 мільёнаў экзэмпляраў, а гэта больш чым удвая перавышае колькасць усяго насельніцтва сучаснай Беларусі. Да ўрока мэтазгодна падрыхтаваць выставу кніг І. Шамякіна ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры. Заўважым, што творы народнага пісьменніка рэдка залежваліся на паліцах кніжных магазінаў. І. Шамякін — адзін з самых чытаемых айчынных аўтараў ХХ стагоддзя. Заінтрыгуе вучняў і той факт, што ў 1976 годзе адзін з твораў беларускага пісьменніка, па апытанні савецкага шматтыражнага часопіса

---

[1] Тут і далей пададзены старонкі вучэбнага дапаможніка: Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава [і інш.]; пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

«Роман-газета», меў самую вялікую чытацкую аўдыторыю ў СССР, апярэджваючы творы вядомага і надзвычай папулярнага на той час пісьменніка Чынгіза Айтматава. *У чым жа сакрэт поспеху ў чытачоў твораў І. Шамякіна?* Настаўнік прапануе вучням адказаць на гэтае пытанне ў канцы ўрока, пасля таго як яны пазнаёмяцца з біяграфіяй і творчасцю пісьменніка.

На дошцы запісаны асноўныя пункты плана лекцыі з элементамі гутаркі.

План

1. Дзіцячыя і юнацкія гады І. Шамякіна.
2. Лёс І. Шамякіна ў ваенны і пасляваенны час. Яго прыход у літаратуру.
3. Творчасць і грамадская дзейнасць пісьменніка другой паловы XX стагоддзя.

Адзін з самых складаных, на думку настаўніка, этапаў біяграфіі і творчасці І. Шамякіна можа паведаміць сам выкладчык. Для таго каб арганізаваць плённую працу на ўроку, ён прапануе адзінаццацікласнікам па ходзе паведамленняў занатоўваць тэзісны план у сшытку. Пры падрыхтоўцы да выступленняў па біяграфіі і творчым шляху І. Шамякіна можна выкарыстаць матэрыял вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры, а таксама ўспаміны пісьменніка: Шамякін І. Роздум на апошнім перагоне: дзённікі 1980—1995 гадоў. — Мінск, 1998. — 527 с.

## Уступныя заняткі па вывучэнні аповесці «Непаўторная вясна»

Пачынаючы ўступны этап па вывучэнні твора, настаўнік падагульняе веды вучняў аб характары творчасці народнага пісьменніка і паведамляе класу пра ўзнікненне задумы твора і гісторыю напісання пенталогіі.

Пенталогія «Трывожнае шчасце» — твор у многім аўтабіяграфічны. У І. Шамякіна не было спецыяльнага намеру напісаць менавіта пенталогію, але ж, безумоўна, гісторыю свайго жыцця, сваё першае каханне пісьменнік згадваў не аднойчы, і трэба было, каб нешта выклікала ў яго жаданне падзяліцца з чытачом успамінамі пра маладосць, лёс пакалення равеснікаў. І такая

нагода выдалася падчас турыстычнай паездкі ў Югаславію з жонкаю Марыяй Філатаўнай. Маляўнічыя пейзажы вярнулі пісьменніка ў даваеннае жыццё, прымусілі ўсхвалявана біцца сэрца. Так узнікла задума напісаць аповесць з рамантычнай назвай «Непаўторная вясна».

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Біяграфія І. Шамякіна — яго творчасць». Таксама даецца апераджальнае заданне для кожнай з пяці падгруп, на якія дзеліцца клас: сцісла перадаць змест сюжэтных ліній аповесцей пенталогіі «Трывожнае шчасце» (гл. наступны ўрок).

## Уступныя заняткі па вывучэнні аповесці «Гандлярка і паэт»

На ўступным этапе настаўнік знаёміць з гісторыяй напісання аповесці «Гандлярка і паэт». Для аргументацыі і стварэння пэўнай эмацыянальнай атмасферы ў класе ён можа звяртацца непасрэдна да ўспамінаў пісьменніка.

Ваенная тэма — адна з асноўных у творчасці народнага пісьменніка, былога франтавіка. Адметнасць ваеннай прозы І. Шамякіна выяўляецца ў яго ўменні спалучаць суровыя, нават жорсткія рэаліі часу з маральна-этычнай праблематыкай, часта з лірычным стылем пісьма. У шматтэмнай прозе пісьменніка пра вайну ёсць усё: і адлюстраванне франтавых падзей, і партызанская барацьба, і складаныя калізіі лёсаў людзей, скалечаных балючымі ўспамінамі, у нашы дні. І. Шамякіна ў 1970-я гады захапіла ідэя напісаць твор пра Мінскае падполле. Выпадак (незнаёмая жанчына прынесла ў рэдакцыю сшытак з вершамі ваеннага часу) падараваў пісьменніку магчымасць на аснове рэальнага факта выкупу з палону маладога савецкага воіна ажыццявіць сваю задуму. У 1976 годзе ў друку з'явілася аповесць «Гандлярка і паэт».

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Біяграфія І. Шамякіна — яго творчасць»; прачытаць аповесць «Гандлярка і паэт».

## УРОК 2.

### Арыентацыйныя заняткі па аповесці «Непаўторная вясна» Івана Шамякіна. Аўтабіяграфічны характар пенталогіі «Трывожнае шчасце», яе асноўныя сюжэтныя лініі

Праверка дамашняга задання падрыхтуе клас да працы на ўроку. Лагічным будзе наступнае пытанне: *Чаму І. Шамякіну так лёгка працавалася над «Непаўторнай вясной», на напісанне якой пісьменніку хапіла месяца?* Зразумела, што пытанне не павінна выклікаць цяжкасцей у вучняў. Ствараючы «Непаўторную вясну», І. Шамякін ішоў ад асабіста перажытага, блізкага і добра вядомага яму. Прысутнасць любімага чалавека побач таксама стымулявала творчую актыўнасць пісьменніка, натхняла яго.

На жаль, колькасць гадзін, адведзеных праграмай на вывучэнне манаграфічнай тэмы «Іван Шамякін», не дазваляе настаўніку асэнсаваць і прааналізаваць пенталогію «Трывожнае шчасце» цалкам. Рэкамендуецца пазнаёміць вучняў толькі з асноўнымі сюжэтнымі лініямі твора. Клас дзеліцца на пяць падгруп, кожная з якіх рыхтуе матэрыял па адной з аповесцей пенталогіі. Настаўнік загадзя акрэслівае кола пытанняў, якія вучні павінны асэнсаваць пры падрыхтоўцы аналітычных паведамленняў.

План

1. Кароткі змест аповесці, яе сістэма вобразаў.
2. Асноўныя праблемы і іх вырашэнне ў творы.
3. Майстэрства І. Шамякіна-празаіка, аўтарская ацэнка аповесці.

У якасці дадатковага матэрыялу настаўнік можа параіць выкарыстаць адпаведныя раздзелы вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры (с. 16—26), а таксама літаратуру, змешчаную ў праграме.

Каб актывізаваць працу вучняў на ўроку, настаўнік прапануе ім скласці кароткія тэзісныя планы падчас вусных паведамленняў аднакласнікаў. Яны могуць мець наступны выгляд.

**Першая аповесць пенталогіі «Непаўторная вясна»** (1957 г.)

1. Аўтабіяграфічная аснова аповесці як праўдзівы аповед пра пакаленне І. Шамякіна напярэдадні вайны. Сустрэча студэнта дарожнага тэхнікума Пятра Шапятовіча і фельчаркі Сашы Траянавай. Чысціня пачуццяў маладых людзей, аўтарскі лірызм у адлюстраванні іх кахання. Выпрабаванне пачуццяў Сашы і Пятра. Узаемаадносіны Сашы Траянавай і вясковага настаўніка Лялькевіча. Рэўнасць Пятра, яго сустрэча са знаёмай дзяўчынай Любай. Пераацэнка каштоўнасцей у выніку параўнання хлопцам прафесійнай дзейнасці і духоўных якасцей дзяўчат. Другая сустрэча закаханых, сталасць у паводзінах і ўпэўненасць у шчырасці інтымных пачуццяў аднаго да другога. Хвароба Пятра і натуральнае імкненне Сашы дапамагчы блізкаму чалавеку. Перадваенная грамадская атмасфера ў краіне. Боязь страты шчасця, кахання, акрэсленых маладымі людзьмі жыццёвых перспектыў.

2. Праблема ўзаемаадносін маладых людзей і яе вырашэнне ў творы.

3. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні займальнага сюжэта. Аўтабіяграфізм аповеду. Лірызм стылю празаіка.

**Другая аповесць пенталогіі «Начныя зарніцы»** (1958 г.)

1. Адлюстраванне партызанскага і падпольнага антыфашысцкага змагання. Лёс Сашы Траянавай, якая жыве і змагаецца з ворагам на акупіраванай тэрыторыі, — у цэнтры аповеду твора.

2. Праблема маральнага выбару ў аповесці. Узаемаадносіны Сашы і Лялькевіча. Паэтызацыя пакалення І. Шамякіна, услаўленне яго маральнай чысціні і высокіх духоўных якасцей.

3. Цяжкасці пры напісанні аповесці: недастатковае веданне рэалій жыцця і партызанскай барацьбы ў акупацыі, пакутлівыя пошукі матэрыялаў.

**Трэцяя аповесць пенталогіі «Агонь і снег»** (1959 г.)

1. Праўдзівасць адлюстравання ваенных, франтавых падзей у творы: аўтабіяграфізм аповесці, псіхалагічная дакладнасць абмалёўкі вобраза Пятра Шапятовіча і яго саслужыўцаў, дзённікавая форма аповеду.

2. Паказ баявога духу, патрыятызму і высокага пачуцця грамадзянскага абавязку воінаў. Выкрыццё кар'ерызму, празмернай амбітнасці, злоўжывання службовымі абавязкамі сярод некаторых прадстаўнікоў афіцэрскага саставу Чырвонай Арміі (Сцяпан Кідала).

3. Пільная ўвага празаіка да духоўнага свету чалавека на вайне. Высокая ацэнка кнігі крытыкай.

**Чацвёртая аповесць пенталогіі «Пошукі сустрэчы»** (1959 г.)

1. Адлюстраванне партызанскай барацьбы ў творы. Элементы прыгодніцтва ў яго сюжэце.

2. Праблема кахання і вернасці — асноўная ў аповесці.

3. Адыход ад рэальнасці ў мастацкай будове твора, празмернае захапленне сюжэтнымі хадамі, нелагічнасць развіцця падзей.

**Пятая аповесць пенталогіі «Мост»** (1965 г.)

1. Багаты ўласны вопыт мірнага аднаўлення жыцця, жаданне прадоўжыць мастацкі лёс любімых герояў як асноўныя крыніцы стварэння кнігі. Пасляваеннае жыццё беларускай вёскі, адлюстраванне цяжкасцей і нястачы, з якімі давялося сутыкнуцца вяскоўцам.

2. Сэнс назвы твора. Наладжванне ўзаемаадносін паміж галоўнымі героямі аповесці, здольнасць і ўменне даравацць адзін аднаму. Праблема чалавека і ўлады ў творы, вобразы кіраўнікоў.

3. Аповесць «Мост» — самая біяграфічная і праўдзівая ў «Трывожным шчасці» (І. Шамякін пра апошнюю аповесць).

Узнавіць і асэнсаваць занатаваны ў тэзісных планах матэрыял дапаможа гутарка з класам па наступных пытаннях:

*1. У чым выяўляецца аўтабіяграфічны характар пенталогіі? Падумайце, чаму апошнюю з аповесцей аўтар лічыць «самай біяграфічнай».*

*2. Перадайце змест сюжэтных ліній твораў пенталогіі, карыстаючыся сваім планам.*

*3. Якія эпізоды з жыцця пакалення І. Шамякіна вас зацікавілі? Чаму?*

*4. Што вас прываблівае ў характарах герояў пенталогіі, а што, магчыма, выклікае непрыязнасць ці асуджэнне?*

❐ **Дамашняе заданне:** перачытаць адпаведны раздзел вучэбнага дапаможніка і адказаць на пытанні (с. 26); падрыхтаваць вусную характарыстыку вобразаў Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай.

## УРОК 3.

## Духоўны свет Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай у аповесці Івана Шамякіна «Непаўторная вясна», паэзія кахання маладых людзей

Урок цалкам прысвечаны аналізу першай і самай лірычнай, рамантычнай аповесці пенталогіі — «Непаўторная вясна». У біяграфічным па сутнасці творы, па прызнанні аўтара, ён «успамінаў вясну кахання, жаніцьбу, развітанне...» з выпускніцай

медыцынскага вучылішча, якая стала жонкай пісьменніка, Машай Кротавай. Храналагічнасць аповеду падказвае шлях аналізу твора — «следам за аўтарам». Вядучым метадам аналізу, бясспрэчна, будзе гутарка ў яе разнастайных праявах.

*Якім паўстае перад намі галоўны герой аповесці Пятро Шапятовіч напачатку твора?* — уключае настаўнік вучняў у аналітычную дзейнасць на ўроку. Магчымы і варыянт выразнага чытання пачатку аповесці ў класе для стварэння адпаведнага эмацыянальнага настрою, уласцівага «Непаўторнай вясне». Думаецца, вучняў кране шчырасць маладога хлопца, яго аптымістычны настрой. У характары Пятра гарманічна спалучаецца юнацкі рамантызм і некаторая дарослацсь, упэўненасць у заўтрашнім дні студэнта дарожнага тэхнікума.

*Як паводзіць сябе Саша пры сустрэчы з Шапятовічам? Чым можна патлумачыць такія паводзіны дзяўчыны?* Дзяўчына ўсхвалявана прыездам Пятра. І хоць яна чакала каханага, імкнецца схаваць свае пачуцці. Узаемаадносіны маладых людзей таго часу і сённяшняга, безумоўна, адрозніваюцца. І. Шамякін тлумачыць матывацыю паводзін дзяўчыны. Яна не хоча, каб у вёсцы думалі пра яе, маладога фельчара, якая ўжо мае пэўны аўтарытэт, як пра легкадумную дзяўчыну.

Лагічным і, напэўна, цікавым будзе пытанне: *Ці асуджаеце вы паводзіны Сашы? Матывуйце свой адказ.*

Далей гутарка будзе мець пераважна рэпрадуктыўны характар, тым не менш яна дапаможа асэнсаваць усю глыбіню і часам складанасць узаемаадносін маладых людзей. Настаўнік прапануе класу паразважаць над наступнымі пытаннямі:

*1. Якія выпрабаванні на праверку шчырасці пачуццяў выпалі на долю Пятра і Сашы?*

*2. Якія эпізоды аповесці сведчаць пра тое, што галоўныя героі з годнасцю вытрымалі жыццёвыя выпрабаванні, аказаліся здольнымі (што не ва ўсіх атрымліваецца ў пару юнацкага максімалізму) да выпраўлення асабістых памылак?*

*3. Што вам падабаецца ва ўзаемаадносінах маладых людзей таго пакалення, а што з пазіцыі сённяшняга дня вам, магчыма, здаецца ўстарэлым, не актуальным?*

Пры адказах на пытанні вучні ў мэтах аргументацыі могуць не толькі звяртацца да зместу аповесці, але і выкарыстоўваць

выразнае чытанне асобных эпізодаў твора, найбольш значных і характэрных, на іх погляд, невялікіх урыўкаў з тэксту.

*Як адбывалася сталенне Пятра і Сашы? Як выявіліся іх характары ў прафесійнай дзейнасці і ва ўзаемаадносінах?* — такімі пытаннямі настаўнік арыентуе вучняў пераважна на асэнсаванне другой часткі аповесці.

Сапраўды, галоўныя героі аповесці сталі мудрэйшымі, навучыліся вельмі важнай і каштоўнай якасці, неабходнай ва ўзаемаадносінах закаханых, — уменню прыслухоўвацца да думак і пачуццяў іншага, даравацьадзін аднаму. Да таго ж у іх ужо меўся хоць і невялікі, але жыццёвы вопыт: яны маглі параўнаць свайго каханага, сваю каханую з іншымі і зрабіць высновы на карысць сваіх палкіх пачуццяў.

Далей настаўнік прапануе паразважаць над сэнсам назвы пенталогіі: *Як агульная назва твора суадносіцца са зместам першай аповесці «Непаўторная вясна»? Пацвердзіце свае выказванні тэкстам*. Непаўторная вясна Пятра і Сашы, вясна іх кахання, з юнацкай закаханасці вырасла ў сур'ёзнае і сталае пачуццё, калі маладыя людзі адчувалі не толькі радасць і захапленне ад яго, але і адказнасць адзін перад адным, патрэбу ў клопаце за блізкага чалавека. Здавалася б, ёсць усе перадумовы для сапраўднага чалавечага шчасця.

Заключную частку ўрока варта прысвяціць вывучэнню тэарэтычных пытанняў, згаданых у праграме: назіранням за адметнасцямі аўтарскага стылю ў творы, яго лірызмам, паглыбленню паняцця жанру аповесці. Настаўнік папросіць вучняў вызначыць мастацкія адметнасці твора, падмацаваць свае высновы тэкстам.

❐ Практыка паказвае, што твор звычайна выклікае цікавасць у юнакоў і дзяўчат блізкасцю тэматыкі да іх узросту, маральна-этычнай праблематыкай, а таму ў якасці **дамашняга задання** прапануем вучням падрыхтаваць творчыя працы вуснага і пісьмовага характару (на выбар вучняў) на наступныя тэмы: 1. Пятро Шапятовіч і Саша Траянава — лепшыя прадстаўнікі даваеннага і ваеннага пакаленняў моладзі. 2. Актуальнасць маральна-этычных праблем аповесці ў наш час. 3. Мастацкія адметнасці твора, яго лірычны і аўтабіяграфічны характар. 4. Ці змог бы (змагла б) я ў тыя складаныя часы паводзіць сябе так, як галоўныя героі аповесці?

## УРОК 2.

## Арыентацыйныя заняткі па вывучэнні аповесці Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт». Вобраз Вольгі Лянovіч у творы, фарміраванне характару гераіні. Тэма трагічнага лёсу жанчыны на вайне

Арыентацыйны этап вельмі важны ў сістэме вывучэння аповесці І. Шамякіна. Настаўніку варта высветліць, на чым юнакі і дзяўчаты спынілі сваю ўвагу, а што засталося па-за іх полем зроку. Пачаць можна з абмеркавання назвы твора, што стане перадумовай зацікаўленага аналізу. Вучні, бясспрэчна, прыйдуць да высновы, што ў цэнтры ўвагі аўтара не проста асвятленне ўзаемаадносін гандляркі і паэта, сутыкненне розных светапоглядаў, але і імкненне разабрацца ў сутнасці сапраўдных каштоўнасцей у жыцці. Пісьменнік настойліва праводзіць думку, што людзей, у першую чаргу герояў аповесці, трэба ацэньваць не па іх сацыяльным статусе, а найперш па духоўных якасцях. З гэтай мэтай настаўнік прапануе вучням адказаць на наступныя пытанні:

*1. Якія ўражанні выклікала ў вас аповесць «Гандлярка і паэт»?*

*2. Як ставіцца сам аўтар да герояў твора?*

*3. Чаму пісьменнік шмат увагі надае апісанню даваеннага жыцця герояў?*

*4. Што вас больш зацікавіла ў творы: напружанае развіццё дзеяння ці ўнутраныя маналогі-разважанні герояў аповесці? Чаму?*

Далей пры дапамозе аналізу «следам за аўтарам» вучні асэнсуюць ідэйны змест першых дзвюх частак аповесці: уклад жыцця сям'і Лянovічаў, жыхароў Камароўкі, фарміраванне характару Вольгі.

Працягнуць гутарку можна па наступных пытаннях:

*1. У якой сям'і расла і выхоўвалася Вольга Лянovіч?*

*2. Хто, на ваш погляд, быў больш аўтарытэтны ў сям'і: гарбар Міхал ці маці, вядомая камароўская гандлярка Хрысця?*

*3. На чым трымаўся дабрабыт сям'і? Якое месца займалі ў сям'і грошы?*

*4. Якім чынам дамашняя атмасфера паўплывала на характар Вольгі?*

Першыя два пытанні не павінны выклікаць цяжкасцей, паколькі ў значнай ступені носяць рэпрадуктыўны характар. Трэцяе ж і чацвёртае патрабуюць умення рабіць аналітычныя высновы, таму пры неабходнасці на дапамогу могуць прыйсці настаўнік і вучэбны дапаможнік. Пры адказах на пытанні можна выкарыстаць адпаведны матэрыял вучэбнага дапаможніка з каментарыямі тэксту вучнямі. Галоўная гераіня выхоўвалася ў незвычайнай па савецкіх стэрэатыпах сям'і. Яе маці была ўвішнай гаспадыняй, якая гандлявала гароднінай на вядомым Камароўскім рынку. Няхітраму сялянска-гандлярнаму бізнесу маці вучыла і сваіх дзяцей. Вольга была самай малодшай у сям'і Ляновічаў. Яна добра засвоіла «ўрокі» маці, пераняла яе погляды на жыццё і ўжо пасля восьмага класа кінула школу, пайшоўшы працаваць на Камароўку. Пісьменнік паказвае вобраз Вольгі Ляновіч у развіцці. Фарміраванне, станаўленне характару — важны перыяд у жыцці кожнага чалавека.

Пасля настаўнік можа пераходзіць да абмеркавання з класам галоўнай праблемы першай часткі аповесці: *Ці з'яўляецца жыццёвая практыка Ляновічыхі, а потым і яе дачкі, адзіна правільнай філасофіяй сямейнага дабрабыту, сапраўднай каштоўнасцю?* Цяжка прадбачыць адказы вучняў, але, трэба меркаваць, яны адзначаць псіхалагічную няўстойлівасць у сямейных узаемаадносінах Ляновічаў. Дабрабыт сям'і Ляновічаў, безумоўна, трымаўся на ўвішнай працы гаспадыні і яе дробнай камерцыйнай дзейнасці. Штодзённая цяжкая праца зрабіла Хрысцю Ляновіч чалавекам практычным і ў той жа час абмежаваным. Паступова І. Шамякін пераконвае ў няўстойлівасці дабрабыту ў доме Ляновічаў, адсутнасці любові і згоды ў сям'і. Поўны багацця дом на Камароўцы — вынік катаржнай, «ад цямна да цямна» працы гаспадыні. Насцярожвае і аўтарская характарыстыка Ляновічыхі — «як нявольніца, рабыня».

Аналізуючы жыццё насельніцтва Камароўкі ў першыя дні вайны, настаўніку варта сачыць, каб вучні не збіваліся на пераказ. Увагу класа можна засяродзіць на пытаннях, якія патрабуюць аналітычнага роздуму:

*1. Якія настроі панавалі ў горадзе ў першыя дні вайны?*

*2. Якім чынам Вольга намагалася пракарміць сям'ю ў зруйнаваным Мінску?*

*3. Як паводзілі сябе фашысты на акупіраванай тэрыторыі?*

Вучнёўскія адказы намалююць рэалістычную карціну жыцця насельніцтва Камароўкі ў акупіраваным горадзе.

❐ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць звязныя адказы на пытанні: *1. Што найперш паўплывала на фарміраванне характару Вольгі Лянові ч? 2. Чым прадыктаваны паводзіны гераіні ў першыя дні вайны?*

## УРОК 3.

### Каханне ў лёсе гераіні. Роля Алеся Шпака, «паэта і рамантыка», у духоўным узвышэнні Вольгі Лянові ч

Пачаць урок можна з абмеркавання вусных адказаў вучняў на пытанні дамашняга задання. Вобраз Вольгі Лянові ч, бясспрэчна, цікавы і арыгінальны. Ён прыцягвае сімпатыі чытачоў сваёй натуральнасцю, жыццёвай праўдзівасцю характару, што ў сваю чаргу абумоўлівае яго супярэчлівасць.

Настаўніку важна засцерагчы клас ад схематычнай ацэнкі гераіні — уяўнага перавыхавання асобы ад эгаістычнай пазіцыі да ўсведамлення патрэбы жыць для другіх. Ва ўступным слове настаўнік папярэджвае, што вобраз Вольгі Лянові ч намаляваны пісьменнікам з жыццёвай дакладнасцю. І. Шамякін паказвае яе складаны і супярэчлівы характар у развіцці, таму настаўніку варта даць магчымасць вучням паназіраць за гэтым: *Параўнайце гераіню ў пачатку і ў канцы аповесці.* Адзінаццацікласнікі, напэўна, заўважаць тыя змены, якія адбыліся ў характары і свядомасці Вольгі.

Пераказваючы абставіны з’яўлення ў доме гандляркі ваеннапалоннага Алеся, вучні паразважаюць: *Чаму Вольга адважылася на выратаванне вязня з Драздоў?* Нельга тлумачыць учынак жанчыны як свядомы крок. Найперш Вольгай кіравалі агульначалавечыя пачуцці: напачатку ёй патрэбен быў мужчына ў хаце, за якім жанчына адчувала б сябе больш упэўнена ў акупіраваным горадзе. Калі ж Вольга з’явілася ў лагеры, яе апанавалі натуральныя пачуцці маці, жанчыны: яна вырашыла выкупіць з няволі самага нямоглага, безабароннага. І ім аказаўся паэт Алесь Гапанюк.

Далей гутарку з класам варта скіраваць у рэчышча асэнсавання пытання: *Як змянілася жыццё гандляркі са з'яўленнем у доме паэта Алеся Шпака?* Відаць, жанчына сама не чакала, наколькі моцна зменіцца яе жыццё, яе свядомасць са з'яўленнем маладога афіцэра. Алесь быў зусім не падобны да яе сямейнікаў: ён жыў выключна духоўнымі інтарэсамі. Матэрыяльны бок жыцця, здавалася, не цікавіў хлопца. Вольга па-іншаму зірнула на свет. Вершы, якія чытаў ёй Шпак, разбудзілі ў яе свядомасці новыя, драмаўшыя да гэтага пачуцці. Яна зразумела, што не кахала свайго мужа Адася: ён патрэбен быў сям'і толькі як працаўнік. Каханне да Алеся зрабіла Вольгу натурай яшчэ больш цэльнай, мэтанакіраванай, гатовай да ахвяры дзеля каханага і яго жыццёвых прынцыпаў.

Для таго каб асэнсаваць ролю Алеся Шпака ў духоўным узвышэнні Вольгі Ляновіч, частку ўрока варта прысвяціць аналізу вобраза А. Гапанюка ў аповесці. Настаўніку трэба арганізаваць гутарку такім чынам, каб яна дазволіла выявіць сапраўдную сутнасць героя. Практыка паказвае, што форма дыспуту найлепш садзейнічае рэалізацыі складанай метадычнай задачы. Дыспут да таго ж прадугледжвае вядзенне інтэлектуальнай, аргументаванай дыскусіі з абавязковым прыцягненнем тэксту. У цэнтр дыскусіі можна паставіць тэзіс беларускага літаратуразнаўцы А. Рагулі: «Вольга выкупіла яго (Алеся. — *М. Я.*), а ён прадаў яе "нашаму чалавеку" — Друцьку». Гэтае выказванне можна запісаць на дошцы і прапанаваць вучням выказаць аргументаваную згоду з ім або аспрэчыць тэзіс.

*У якіх умовах адбывалася фарміраванне характару Алеся Гапанюка? Як, на ваш погляд, гэта адбілася на яго далейшым лёсе?* Алесь рос у інтэлігентнай сям'і. Бацькі клапаціліся, каб хлопец быў адукаваным, атрымаў прыстойную прафесію. Варта сказаць, што сын не падводзіў бацькоў. Ён сапраўды быў прыкладным вучнем, яшчэ падлеткам пачаў складаць вершы. Разам з тым Алесь жыў дваістым жыццём: у школе ён падпарадкоўваўся агульнапрынятым нормам паводзін, хаця ў душы быў не зусім згодны з тагачаснай ідэалогіяй. Хлопчык з дзяцінства навучыўся прыстасоўвацца да абставін, выкарыстоўваць іх у сваіх мэтах. Нездольнасць пераадольваць цяж-

касці асабліва праявілася падчас вайны, якая прад'яўляла да людзей зусім іншыя патрабаванні. Да іх Алесь, як высветлілася, аказаўся не гатовым.

*Чаму Алесь баяўся прызнацца ў каханні Вользе? Чаму ён старанна хаваў свае ўзаемаадносіны з жанчынай ад падпольшчыкаў?* Алесь баяўся самога сябе, ён не здольны на сапраўдныя пачуцці. Паэт лічыў сябе вышэйшым за Вольгу. Ён не мог дапусціць думкі, што калі-небудзь падпольшчыкі даведаюцца пра яго блізкія адносіны з гандляркай. Гэта па-сапраўднаму палохала А. Гапанюка.

*Чаму Алесь змог забіць нямецкага афіцэра і не мог адважыцца выканаць адказнае даручэнне падпольнай арганізацыі?* Калі ў вучняў узнікнуць цяжкасці з адказам на гэтае нялёгкае пытанне, іх можна скіраваць да тэксту вучэбнага дапаможніка (с. 34) і пракаменціраваць прачытанае.

Заключную частку ўрока варта прысвяціць асэнсаванню гераічнага ўчынку Вольгі. Каб сэканоміць час і прадухіліць магчымыя памылкі, настаўнік павінен быць гатовы да гутаркі з класам па пытаннях, якія наблізяць вучняў да асэнсавання подзвігу Вольгі Ляновіч:

*1. Чаму Вольга так прагнула дзейнасці, хацела атрымаць заданне ад кіраўніка падпольнай арганізацыі? Аўтар піша, што такое жаданне ў Вольгі ўзнікла «...і па нейкай іншай прычыне, не такой асабістай, па закліку нейкага іншага пачуцця — не жаночага, — якое яна не зусім яшчэ асэнсавала». Паспрабуйце асэнсаваць вы.*

*2. Ці можна сцвярджаць, што толькі каханне да паэта натхніла Вольгу на подзвіг?*

*3. Што канчаткова пераканала Вольгу ў неабходнасці пакарання ворагаў?*

У канцы ўрока настаўнік просіць вучняў паразважаць над наступнымі пытаннямі: *Ад чаго, на вашу думку, залежыць выбар асобай той ці іншай жыццёвай пазіцыі? Як пазбегнуць маральнай дэградацыі?* Цяжка прадбачыць адказы, асабліва на другое пытанне, але некаторыя высновы могуць быць агульнымі для класа. На маральны выбар асобы ўздзейнічаюць як аб'ектыўныя фактары (выхаванне, сямейная атмасфера, грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне і інш.), так і суб'ектыўныя (здольнасць

да шчырага праяўлення пачуццяў, цэльнасць натуры, уменне крытычна ацэньваць свае ўчынкі і паводзіны).

❒ **Дамашняе заданне:** паразважаць над наступным праблемным пытаннем: *Хто з герояў аповесці аказаўся на самай справе паэтам, а хто — гандляром?* Прачытаць раман «Сэрца на далоні» і выканаць апераджальныя заданні (гл. урок 4).

## УРОК 4.

## Уступныя і арыентацыйныя заняткі па вывучэнні рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Праблематыка твора, яго асноўныя сюжэтныя лініі

Улічваючы немалыя памеры рамана, яго насычанасць сюжэтнымі лініямі, для вывучэння твора мэтазгодна выкарыстаць камбінаваны шлях аналізу.

Пачаць урок можна з узнаўлення ведаў вучняў па гісторыі. Настаўнік прапануе класу прыгадаць палітычныя падзеі канца 50-х — пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя і іх наступствы для сацыяльна-грамадскага жыцця краіны. Тут варта не засяродзіцца на асэнсаванні толькі палітычных зрухаў у развіцці грамадства, а паставіць у цэнтр абмеркавання чалавека, яго надзённыя клопаты.

*Пра тое, наколькі значныя змены адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці краіны, гаворыць адзін з галоўных герояў рамана, журналіст Кірыла Шыковіч: «Адбыліся такія падзеі! Пераварот у мазгах, у сэрцах!» Пракаменціруйце думку героя твора з пазіцыі сучаснасці.*

Пасля настаўнік можа перайсці да вызначэння асноўнага канфлікту рамана і яго сюжэтных ліній. Не ўсе грамадзяне былога СССР з радасцю і аптымізмам сустрэлі абнаўленчыя працэсы ў разнастайных сферах чалавечай дзейнасці. Асабліва гэта тычылася наменклатуры, выразным прадстаўніком якой у рамане з'яўляецца старшыня гарсавета Гукан.

Асноўную сюжэтную лінію рамана «Сэрца на далоні» якраз і ўтвараюць калізіі канфлікту розных, супрацьлеглых поглядаў на дэмакратычныя змены ў жыцці савецкага грамадства. І. Шамякіна даўно хвалявала тэма гераічнай барацьбы беларус-

кага падпольнага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Палітычныя падзеі 1960-х гадоў падштурхнулі пісьменніка да аб'ектыўнага асэнсавання мінулага, адлюстравання розных светапоглядных пазіцый у разуменні сучасных аўтару грамадскіх пераўтварэнняў і далейшых шляхоў развіцця краіны. Частка грамадства, а асабліва старэйшае пакаленне з ліку партыйнага і наменклатурнага чыноўніцтва, выступала супраць пераацэнкі мінулага, фактычна супраць публічнага прызнання сваіх памылак. Асноўны канфлікт рамана ў значнай ступені і абумоўлівае сістэму вобразаў твора.

Прадстаўнікамі інтэлігенцыі, якія імкнуцца вярнуць праўду мінулага, а тым самым уплываць на сучаснае жыццё, будаваць будучыню на прынцыпах чалавечай сумленнасці, справядлівасці і гуманізму, у рамане з'яўляюцца доктар Яраш, журналіст Шыковіч, незаконна рэпрэсаваная Зося Савіч, сакратар гаркама Тарасаў і інш.

Паколькі вобразы Шыковіча, Яраша і Гукана будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі на наступным уроку, то клас засяродзіцца на ўзнаўленні асноўных сюжэтных калізій твора і абмеркаванні яго праблематыкі. Каб урок прайшоў больш эфектыўна і дынамічна, можна выкарыстаць апераджальныя заданні — падрыхтоўку вучнямі вусных паведамленняў па наступных тэмах:

1. Падзеі 1950—60-х гадоў, адлюстраваныя ў творы. Грамадскія і маральна-этычныя праблемы тагачаснай рэчаіснасці, узнятыя ў рамане.
2. Зварот да падзей вайны. Аўтарская пазіцыя ў творы.
3. Узаемаадносіны малодшага і старэйшага пакаленняў у рамане.

Паведамленні вучняў на арыентацыйных занятках павінны насіць пераважна рэпрадуктыўны характар, падрыхтаваць клас да далейшай аналітычнай працы. Задача настаўніка — дапамагчы вучням выявіць асноўны канфлікт рамана, знайсці галоўныя і другарадныя сюжэтныя лініі, звярнуць увагу на шчырасць і лірызм аўтарскага стылю, неабыякавую пазіцыю І. Шамякіна ў адносінах да таго, што ён імкнецца аб'ектыўна данесці да чытача. У якасці дапаможнага матэрыялу вучні могуць выкарыстаць літаратуразнаўчыя артыкулы М. Мішчанчука па манаграфічнай тэме «Іван Шамякін», змешчаныя ў вучэбным дапаможніку, і пракаменціраваць некаторыя факты (с. 38—48):

1) змены ў свядомасці і ва ўчынках герояў рамана ў сувязі з рашэннямі з'езда партыі па выкрыцці культу асобы Сталіна;

2) супрацьстаянне журналіста К. Шыковіча і старшыні гарсавета С. Гукана;

3) сямейнае жыццё галоўных герояў рамана;

4) сучаснасць і ваенныя падзеі ў рамане.

Сучаснасць у рамане цесна пераплецена з вайной, рэтраспектыўны план твора займае даволі значнае месца і дапамагае чытачу ў асэнсаванні яго зместу і аўтарскага ідэалу. Як заўжды, у адлюстраванні ваенных падзей І. Шамякін выяўляе сябе сапраўдным майстрам займальнага сюжэту, які трымае чытача ў напружанні, у чаканні развязкі. Пра падзеі недалёкага мінулага мы даведваемся з успамінаў доктара Яраша і горкай споведзі Зосі Савіч.

У якасці дыскусійнага задання, якое павінна абудзіць творчыя здольнасці вучняў, іх інтэлектуальную дзейнасць і ўменне актуалізаваць мастацкі тэкст, можна прапанаваць наступнае: *Параўнайце адносіны грамадства да падзей вайны, яе ўдзельнікаў у 1950—60-я гады і ў наш час.*

Наступнае пытанне стане лагічным працягам папярэдняга і падагульніць разважанні класа пра праблематыку, аўтарскую пазіцыю і ідэйны пафас рамана: *Які настрой у цэлым выклікае твор? У чым яго актуальнасць?*

Многія сюжэтныя лініі рамана заканчваюцца аптымістычна (вучні прыгадаюць змест фінальных сцэн). Аўтар верыць у паступальны рух жыцця народа наперад, у яго светлую перспектыву ва ўсіх сферах. Жыццесцвярджальны пафас рамана актуальны і для сучаснай ідэалогіі нашага грамадства.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць характарыстыку вобразаў Антона Яраша і Кірылы Шыковіча.

## УРОК 5.

### Асноўны канфлікт рамана. Вобразы Кірылы Шыковіча, Антона Яраша і Сямёна Гукана

Пабудаваць працу на ўроку можна рознымі шляхамі. Адзін з варыянтаў — праслухаць падрыхтаваныя дома вобразныя характарыстыкі цалкам, а потым наладзіць іх абмеркаванне з

абавязковымі ацэначна аргументаванымі выказваннямі вучняў. Пры такім падыходзе выяўляецца цэласная характарыстыка персанажаў, але губляецца дынаміка ўрока, ёсць небяспека, што вучні нешта важнае пры параўнальнай характарыстыцы вобразаў Шыковіча і Яраша пакінуць па-за ўвагай па прычыне вялікай колькасці інфармацыі.

Больш прадуктыўным бачыцца падыход, калі настаўнік прапануе вучням ахарактарызаваць герояў у розных жыццёвых праявах: у прафесійнай дзейнасці, у выяўленні грамадзянскай пазіцыі, у сям'і. Па ходзе абмеркавання згаданых асобасных якасцей «па гарачых слядах» класу будзе прасцей аргументаваць свае сімпатыі ці антыпатыі да таго ці іншага героя.

Мяркуем, што вучні без цяжкасцей дадуць партрэтныя характарыстыкі герояў. Без асаблівай ідэалізацыі намаляваны ў творы псіхалагічна цікавыя і рэалістычныя вобразы хірурга Антона Яраша і пісьменніка, супрацоўніка абласной газеты Кірылы Шыковіча — сяброў, суседзяў па дачы.

Добры, мяккі чалавек у сям'і, сапраўдны прафесіянал журналісцкай справы, Кірыла Шыковіч уступае ў адкрытую барацьбу з Гуканам, якога не без падстаў лічыць фальсіфікатарам, які сказіў сапраўдную сутнасць падпольнай барацьбы ў горадзе ў час вайны.

Журналіста па-чалавечы абражае тое, што старшыня гарсавета свядома прысвоіў сабе заслугі аднаго з загінулых кіраўнікоў падполля — доктара Савіча — і зрабіў на гэтым кар'еру. Прыкра Шыковічу і ад таго, што ён па няведанні дапамагаў Гукану ў напісанні «мемуараў». Кроплю за кропляй збіраючы звесткі і факты пра падполле, схіляючы да шчырасці сведкаў ваеннага часу, Кірыла Шыковіч імкнецца даведацца праўду пра мінулае. Трэба было мець мужнасць, каб надрукаваць у абласной газеце артыкул, які супярэчыў афіцыйным «гуканаўскім» звесткам пра дзейнасць падпольнай арганізацыі ў горадзе. Для Шыковіча гэта важна не столькі з-за неабходнасці выкрыць ілжывую манаполію на ісціну ў асобе Гукана, колькі для таго, каб вярнуць народу светлыя імёны яго герояў: «...Абыякавасць да лёсу людзей, якіх мы ведалі, з якімі працавалі, якія вучылі нас, прынесла вялікую шкоду...»

Антон Кузьміч Яраш менш актыўны ў грамадскай дзейнасці, а значыць, і ў вырашэнні асноўнага канфлікту з Гуканам, але з-за гэтага не губляе сваёй прывабнасці і прыцягальнасці. Гэтым вобразам захаплялася не адно пакаленне чытачоў па прычыне таго, што Яраш не ідэалізаваны персанаж, а жывы чалавек, са сваімі станоўчымі рысамі характару і слабасцямі, заганамі. Антон Кузьміч займаецца медыка-хірургічнай практыкай. Як вучонага, яго цікавяць складаныя аперацыі на сэрцы. Яраш — аддадзены навуцы і медыцыне працаўнік. Ад сваёй нялёгкай прафесіі, якая так неабходна людзям, хірург атрымлівае маральнае задавальненне. Доктар клапоціцца пра сваіх пацыентаў і заўсёды імкнецца ім дапамагчы. Мы назіраем, як пакутуе Яраш ад бяссілля, калі не можа выратаваць падлеткаў, падарваўшыхся на міне. З-за непаваротлівасці чыноўнікаў аднаго з раённых цэнтраў медыцынская дапамога хірурга ўжо не магла выратаваць жыццё дзецям.

Але самаахвярная прафесійная дзейнасць хірурга ў некаторай ступені аддаляе Яраша ад праблем грамадства, сям'і. Так, Антон Кузьміч, былы падпольшчык, доўга не рашаецца дапамагаць Шыковічу ў яго жаданні дазнацца праўду пра гарадское падполле і данесці яе да землякоў. Яраш не перакананы ў тым, што варта варушыць мінулае, хаця б з гуманных памкненняў. Тым не менш у сітуацыях, што патрабуюць ад чалавека маральнага выбару, доктар выяўляе свае лепшыя якасці: сумленнасць, шчырасць, гуманізм, нават мужнасць.

Антыподам згаданых герояў у рамане выступае Гукан. Настаўнік працягвае ўрок пытаннем: *Хто ж такі Сямён Гукан? Якія з'явы грамадскага жыцця можна назваць гуканаўшчынай?* Антыподам прыхільнікаў прагрэсіўных пераўтварэнняў у грамадскім жыцці як краіны, так і горада выступае ў рамане Гукан. Самае страшнае для чыноўніка сталінскай фармацыі — гэта нязгода мас, падначаленых, з думкай начальства, якую ён заўсёды лічыць «непагрэшнай ісцінай». Ініцыятыву простых людзей, іх натуральнае жаданне даведацца праўду пра мінулае і сучаснасць Сямён Парфёнавіч называе «распустай». Але адгарадзіцца ад мас старшыні гарсавета не ўдалося. Чым актыўней супраць яго выступалі Шыковіч, Яраш, Тарасаў, тым ніжэй згушчаліся хмары над аўтарытарным, антынародным па сваёй сутнасці стылем кіраўніцтва Гукана. Перамога над

гуканаўшчынай як грамадскай з'явай увасабляе ў рамане права грамадзян на ісціну, праўду, магчымасць, не баючыся наступстваў, выказаць сваю думку; яна сведчыць пра аўтарскі аптымізм, веру ў дэмакратычныя, гуманістычныя прынцыпы адносін паміж людзьмі. Але грамадства знаходзілася толькі напачатку шляху да поўнай дэмакратызацыі. Гуканаўшчына яшчэ паразітуе, бо засталіся на сваіх пасадах аднадумцы старшыні гарсавета: Рагойша, Сазоненка, Гамбіцкі, Тукала, партыйныя і нават камсамольскія работнікі Красоўскі і Грыбок.

Безумоўна, на ўроку, прысвечаным асэнсаванню вобразаў старэйшага пакалення, нельга не згадаць пра Зосю Савіч. *Як выяўляюцца характары доктара і журналіста ў адносінах да Зосі Савіч? Якая роля гэтага вобраза ў рамане?* Хірург Яраш змагаецца за жыццё Зосі Савіч, каб абудзіць у яе сэрцы давер да людзей, веру ў справядлівасць. Выздараўленне Зосі для Антона Кузьміча становіцца не толькі справай прафесійнай годнасці, але і грамадзянскім абавязкам, імкненнем вярнуць добрае імя сям'і Савіч і іншым падпольшчыкам.

Пошукі журналістам праўды пра лёс сям'і Савіча вымагаюць ад яго ўзнаўлення гераічных старонак вайны, а значыць, і згадкі пра пэўных герояў старэйшага пакалення, якое перанесла фашысцкую акупацыю.

Вобразы Савічаў пазбаўлены ў рамане той індывідуальнасці, якая характэрна галоўным героям твора. Яны ў значнай ступені абагульненыя: нездарма ж аўтар падкрэслівае, што Зося «да незапамінальнасці звычайная з твару». Тым самым І. Шамякін выказвае свой боль па сотнях, тысячах суайчыннікаў, ахвяр сталінскага рэжыму. Вобраз рэпрэсаванай Зосі Савіч, якая падарвала сваё здароўе ў фашысцкіх і сталінскіх лагерах, становіцца цэнтрам ідэйнага зместу твора. Праз адносіны персанажаў рамана да драматычнага лёсу гэтай мужнай жанчыны выразна выяўляюцца характары герояў твора, іх грамадзянская пазіцыя, адказнасць кожнага перад часам, перад няўхільным судом гісторыі.

❒ **Дамашняе заданне:** напісаць сачыненне-мініяцюру на тэму «Як я разумею назву рамана»; падрыхтаваць аргументаваны адказ на чацвёртае пытанне вучэбнага дапаможніка (с. 48); апераджальныя заданні асобным вучням (гл. урок 6).

## УРОК 6.

### Маладое пакаленне ў творы

*Якую ролю займаюць вобразы маладых герояў у творах І. Шамякіна, якія вы ўжо вывучылі? Чым вы гэта можаце патлумачыць?* — такімі пытаннямі настаўнік адразу ўключае вучняў у актыўную аналітычную дзейнасць па асэнсаванні тэмы ўрока. Адзінаццацікласнікі, напэўна ж, адзначаць, што галоўнымі героямі аповесці «Гандлярка і паэт» і пенталогіі «Трывожнае шчасце» з'яўляюцца маладыя людзі. У многіх творах пісьменнік звяртаецца да вобразаў сучаснікаў. Раман «Сэрца на далоні» высвечвае яшчэ адну пісьменніцкую адметнасць — яго неабыякавасць да жыцця пасляваеннага пакалення. І. Шамякін разумее, што будучае краіны ў руках моладзі, а таму пісьменніку важна асэнсаваць грамадскія і этычныя прыярытэты, маральныя ідэалы маладых людзей. Пісьменніка цікавіць выбар моладдзю свайго месца, прызначэння ў жыцці.

Далей клас слухае разгорнутыя адказы-паведамленні падрыхтаваных вучняў на апераджальныя пытанні.

*Каму з маладых герояў аўтар надае найбольш увагі? Ці выяўляецца ў гэтым аўтарская сімпатыя.* Дэталёва, у розных жыццёвых сітуацыях, няхай і без грунтоўных псіхалагічных каментарыяў (гэтае права аўтар пакідае за чытачом), паказаны ў рамане вобраз Славіка Шыковіча, сына вядомага ў горадзе журналіста. Нягледзячы на супярэчлівасць характару юнака, яго натуральную псіхалагічную, а часам і маральную няўстойлівасць, пісьменнік адносіцца да яго з сімпатыяй.

*Што прываблівае вас у вобразе Славіка, а што вы не можаце прыняць у паводзінах юнака?* Вобраз Уладзіслава Шыковіча намаляваны з жыццёвай дакладнасцю, аўтар імкнецца данесці да чытача псіхалагічную матывацыю паводзін героя. Крок за крокам, учынак за ўчынкам Славік сталее, мужнее, становіцца патрабавальным да сябе, гэта значыць яго вобраз паказаны ў развіцці. Напачатку гэта малады «нігіліст», перакананы ў тым, што жыццё павінна прыносіць чалавеку толькі задавальненне. У пэўнай ступені сын журналіста Шыковіча ўвасабляе, персаніфікуе моладзь 1960-х, якая адкрыта асуджала мяшчанска-спажывецкую атмасферу ў грамадстве, выступала супраць ханжаства і крывадушша ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Галоўнае, што вылучае Славіка з асяроддзя маладых людзей, — гэта яго шчырасць, адкрытасць у пачуццях. За гэтыя якасці юнака пакахала Маша, асістэнтка хірурга Яраша. Машы падабаецца і прыёмны сын доктара Тарас, але яна аддае перавагу Славіку за яго здольнасць да моцнага пачуцця.

Пэўныя заганы ў паводзінах Славіка тлумачацца не толькі яго выклікам тагачаснай грамадскай атмасферы, але і супярэчлівымі падыходамі да выхавання сына з боку бацькоў. Калі бацька Славы занадта заняты рэалізацыяй сваіх творчых праектаў і яму часта не хапае часу на выхаванне сына, то маці, Валянціна Андрэеўна, наадварот, іншы раз залішне песціць яго.

У пэўнай ступені вобраз Славіка Шыковіча выступае ў рамане ў ролі «лакмусавай паперкі», якая выяўляе сапраўдную сутнасць іншых герояў, здымае з іх маскі, паказвае на няшчырасць ва ўзаемаадносінах многіх персанажаў, недасканаласць грамадскай маралі.

*Чым адрозніваецца ад Славіка Тарас Ганчароў? Паспрабуйце ахарактарызаваць гэты вобраз з пазіцый сучаснасці.*
«Вельмі правільным», але збедненым у псіхалагічным плане малюецца ў рамане вобраз Тараса Ганчарова. Тарас у гады вайны страціў свайго бацьку, рана зазнаў сірочы лёс, навучыўся адрозніваць чалавечую жорсткасць і пяшчоту, цаніць дабрыню. Ён удзячны доктару Ярашу за бескарыслівае апекаванне і мудрыя жыццёвыя парады. Пачуццё адказнасці і самастойнасць, прынцыповасць і выразнае ўяўленне жыццёвых арыенціраў вылучылі Тараса на роль лідара, арганізатара сярод моладзі станкабудаўнічага завода.

Дэкларатыўнасць у паводзінах Тараса Ганчарова перадаецца і іншым членам яго брыгады. Маладыя людзі шмат дыскутуюць, на словах імкнуцца вырашыць многія вытворчыя праблемы, але гэта рэдка падмацоўваецца рэальнымі ўчынкамі, канкрэтнымі справамі. Бясспрэчна, аўтара, захопленага кардынальнымі дэмакратычнымі пераўтварэннямі ў краіне, хвалявала тое, што грамадства яшчэ не пазбавілася ад жыцця ў адпаведнасці з партыйнай рэгламентацыяй, вытворчай паказухай.

Жаночыя вобразы дапамагаюць аўтару ў асэнсаванні не толькі праблем грамадска-сацыяльнага плана, але і вечных праблем інтымных узаемаадносін, праблем маральнага выбару,

сяброўства і здрады. Цікавым і прыцягальным з'яўляецца вобраз Машы ў рамане.

*У чым адметнасць характару Машы?* Яе прыцягальнасць — найперш у псіхалагічна дакладнай абмалёўцы, што выяўляецца ў жаночай непрадказальнасці і супярэчлівасці характару. Відаць, гэтая загадкавасць Машы прыцягвае да яе прадстаўнікоў супрацьлеглага полу. Не валодаючы ідэальнай знешнасцю, Маша вылучаецца бездакорным густам, душэўнай прывабнасцю.

Прыехаўшы з вёскі ў абласны цэнтр, дзяўчына атрымала спецыяльнасць медсястры і працуе асістэнткай хірурга Яраша. Маша адразу пранікласся павагай да аўтарытэтнага спецыяліста, які таксама ацаніў прафесійныя якасці і чуласць дзяўчыны. Пастýпова пачуццё павагі і сімпатыі да дактора перарасло ў дзяўчыны ў закаханасць. Рамантычна-трапяткія адносіны Машы да Яраша натуральныя і апісаны аўтарам з жыццёвай дакладнасцю. Да годнасці хірурга, жанатага мужчыны, ён перасцярог дзяўчыну ад паспешлівых, неабдуманых учынкаў. Жыццёвыя ўрокі доктара Яраша навучылі Машу быць крытычнай, абачлівай у выбары спадарожніка жыцця.

*Як выяўляецца характар Машы ў адносінах да маладых людзей?* Дзяўчына вагаецца, каму даверыць свой лёс — Славіку ці Тарасу. Машы па-свойму сімпатычны абодва хлопцы, але яна не можа зразумець, пачуцці да каго з іх з'яўляюцца шчырымі, здольнымі перарасці ў сапраўднае каханне. Напачатку яна аддае перавагу Тарасу. Ёй утульна і спакойна з надзейным, упэўненым у сабе важаком брыгады Ганчаровым. Знаёмства ж са Славікам пакідае ў дзяўчыны негатыўнае ўражанне: ён здаецца Машы легкадумным маладым чалавекам, не здольным адказваць за свае ўчынкі. Цвярозы розум і практычная жаночая логіка падказваюць ёй, што Тарас будзе надзейным мужам, і таму ў перспектыве свой лёс Маша вырашае звязаць з Тарасам.

Але якраз залішняя асцярожнасць, прагматызм, прамалінейнасць, няздольнасць да шчырага праяўлення пачуццяў, асабліва ў супастаўленні са Славікам Шыковічам, насцярожвае дзяўчыну, прымушае яе задумацца, канчаткова акрэсліцца ў сваім выбары.

Ёй больш даспадобы непрадказальныя, але шчырыя ўчынкі Славіка. І хоць аўтар не паказаў у творы выразнай развязкі

ўзаемаадносін трохкутніка, ход падзей рамана дазваляе чытачу зрабіць пэўныя высновы. Напярэдадні заручын з Тарасам у размове з Зосяй Савіч Маша шчыра прызнаецца, што, не задумваючыся, згадзілася б выйсці замуж за Славіка Шыковіча, «гэтае дзіця горкае», «не з ветрыкам, з завірухай у галаве». Са Славікам Маша адчувае сябе па-жаночы ўтульна, бо яна і сама здольная на смелыя, непрадказальныя ўчынкі.

У заключэнне настаўнік прапануе вучням: *Вызначце ролю моладзі ў ідэйным пафасе рамана.* З вобразамі моладзі І. Шамякін звязваў надзеі на далейшую дэмакратызацыю грамадства. Ён хацеў бачыць маладых асоб сучаснасці ў авангардзе абнаўленчых працэсаў. Такім ён малюе ў рамане маладога архітэктара, які насуперак аўтарытарным, забарончым дзеянням мясцовага кансерватара-чыноўніка змог дабіцца прызнання сваіх таленту і вынікаў напружанай працы — цікавага праекта забудовы мікрараёна, на жаль, не ў сябе на радзіме, а ў іншым горадзе.

❒ **Дамашняе заданне:** адказаць на пытанні 5—7 вучэбнага дапаможніка па манаграфічнай тэме «Іван Шамякін» (с. 48); прачытаць аповесць В. Быкава «Сотнікаў».

## ВАСІЛЬ БЫКАЎ

З творчасцю В. Быкава вучні, несумненна, ужо знаёмыя. Яны вывучалі аповесць «Жураўліны крык» і апавяданні «Незагойная рана», «Страта», для пазакласнага чытання раіліся ў VII класе «Альпійская балада», у VIII класе — «На ўсходзе сонца», «Дажыць да світання». У XI класе творчасць В. Быкава вывучаецца манаграфічна.

### УРОК 1.
### Жыццё і творчасць Васіля Быкава, уступныя заняткі па аповесці «Сотнікаў»

Гэты ўрок можа мець эпіграф, які падбярэ настаўнік з трапных і ёмістых выказванняў вядомых, аўтарытэтных майстроў слова пра В. Быкава. Напрыклад: «Васіль Быкаў — пароль

чуласці і рашучасці нашае шматпакутнае Беларусі» (паводле Р. Барадуліна); «Васільком у жыце беларушчыны застанецца назаўсёды Быкаў» (Р. Барадулін); «Уся творчасць Быкава — гэта не толькі мастацкая праўда пра чалавечае жыццё, але і падручнік нацыясцвярджэння, вялікі асветніцкі, духоўны капітал для суайчыннікаў» (С. Законнікаў). Эпіграфам да ўрока аб жыцці і творчасці пісьменніка могуць быць і яго ўласныя словы: «Калі чалавецтва не створыць у сабе самай надзейнай абароны ад зла — маральнай абароны, што зыходзіць з унутранай, боскай сутнасці чалавека, дык іншага паратунку яму не будзе».

Неабходна прадумаць абсталяванне да ўрока, дзе абавязкова павінны быць партрэт В. Быкава і выстава яго кніг і публікацый пра яго.

У пачатку ўрока неабходна актуалізаваць веды вучняў, задаць, напрыклад, такія пытанні:

*1. Што вы ведаеце пра жыццё і творчасць В. Быкава, яго ўдзел у грамадскім жыцці Беларусі?*

*2. З якімі творамі В. Быкава вы ўжо пазнаёміліся? Чым яны вам запомніліся? Лёсы якіх герояў вас усхвалявалі і ўразілі? Чаму?*

На гэтым уроку настаўнік будзе імкнуцца паказаць значнасць творчага ўкладу пісьменніка ў беларускі і сусветны літаратурны працэс, звярнуўшы ўвагу на грамадзянскасць, мужнасць асобы мастака слова і яго творчасці. Найважнейшая задача настаўніка — зацікавіць адзінаццацікласнікаў творчасцю сусветнавядомага нацыянальнага пісьменніка, выклікаць у іх жаданне прачытаць не толькі прапанаваныя праграмай творы, а і многія іншыя і як мага больш даведацца пра славутага сына беларускага народа, імя якога займае пачэснае месца побач з вялікімі імёнамі Ф. Скарыны, К. Каліноўскага, Янкі Купалы, Якуба Коласа; выклікаць пачуццё гонару за Беларусь, яе дзяцей і родную беларускую літаратуру.

Настаўніку варта сказаць, што, па звестках міжнароднай арганізацыі ЮНЕСКА, у 80-я гады мінулага стагоддзя В. Быкаў быў у ліку самых вядомых і чытаемых пісьменнікаў свету, што яго вядомасць не страчана і сёння, у пачатку XXI стагоддзя. Яго творы перакладзены на мноства моў свету. Яны ўражваюць чытачоў сумленнасцю і мужнасцю быкаўскай праўды аб вайне. Пісьменнік сам прайшоў вайну да апошняга дня, зведаў

яе трагізм і цяжар, на яго вачах загінула многа франтавых таварышаў. Смерць некалькі разоў была побач з В. Быкавым, але лёс яго збярог. Таму, пачынаючы сваю творчую дзейнасць, ён вырашыў паказаць веліч подзвігу чалавека, паказаць праўдзіва, бо на вайне, як і ў мірным жыцці, поруч з мужнасцю сустракалася баязлівасць, поруч з самаахвярнай геройскай гібеллю за незалежнасць Радзімы і чалавецтва ад фашызму — прыкрае прыстасаванства, ілжэгеройства, імкненне да гучнай славы. Сам В. Быкаў пісаў: «Гаварыць няпраўду аб вайне — не толькі амаральна, але і злачынна як у адносінах да мільёнаў яе ахвяр, так і ў адносінах да будучыні. Людзі Зямлі павінны ведаць, ад якой небяспекі яны пазбавіліся і якой цаной дасталося ім гэтае збавенне».

Творчасць пісьменніка прысвечана пераважна ваеннай тэме. Настаўнік абавязкова звяртае ўвагу вучняў на тое, што В. Быкаў паказаў мужныя і трагічныя старонкі вайны: узнавіў як франтавыя падзеі, так і народнае супраціўленне на акупіраванай беларускай тэрыторыі, у падполлі і партызанскіх атрадах.

У творчасці мастака слова ёсць і яшчэ адзін значны тэматычны пласт. Ён адзін з першых у нашай літаратуры пачаў па-мастацку ўзнаўляць надзвычай трагічную беларускую гісторыю 20-х і 30-х гадоў XX стагоддзя. У апошнія гады В. Быкаў пісаў апавяданні, кароткія аповесці, алегарычныя казкі, прасякнутыя не толькі трывогай за Беларусь і яе народ, але і незнішчальнай верай у беларускую будучыню.

Варта, звярнуўшыся да матэрыялу вучэбнага дапаможніка, пракаменціраваць вучням словы Р. Барадуліна з трыпціха «Апостал нацыі»:

«Нашча трэба чытаць Быкава.

Нашча трэба думаць пра Быкава. Нашча трэба хінуцца душой да святла слова ягонага.

Чытаць нашча, каб прычасціцца да бязлітаснай праўды, няўтульнай і мулкай, цвярозай і незалежнай, нішчымнай і раздзетай.

Думаць нашча, каб ачысціцца ад похапкавасці і мітусні, ад ліслівай хлусні і марнай мітрэнгі, ад нікчэмнага гневу і самазжэрнай зайздрасці.

Хінуцца нашча душой, каб святло слова існага прагнала смагу і дух угрунтавала смуткам Быкава, нясхібнасцю Быкава».

Вельмі важна, каб вучні зразумелі сутнасць барадулінскага выказвання, якое трапна акрэслівае значнасць асобы і творчасці В. Быкава. Неабходна даць каментарый да некаторых слоў у дадзеным тэксце: «нашча», «нішчымная праўда», «похапкавасць», «мітусня», «марная мітрэнга», «нясхібнасць», і патлумачыць слова «апостал». У прамым сэнсе — гэта вучань Хрыста, прапаведнік хрысціянскага вучэння.

**ДАВЕДКА**. ***Нашча*** — не еўшы нічога; ***похапкавасць*** — паспешнасць, няўважлівасць, павярхоўнасць; ***марна*** — дарэмна, без карысці (рабіць што-небудзь); ***мітрэнга*** — непакой, клопат, непрыемнае здарэнне; ***нішчымны*** — посны, пусты, без нічога (пра ежу).

Гэтым выказваннем Р. Барадулін пераконвае, што творчасць В. Быкава, яго запавет быць духоўна моцнымі, нязломнымі («нясхібнымі») павінен асэнсаваць кожны беларус. Нашча звычайна чытаюць малітву, ходзяць у храм на споведзь, да прычасця, нашча — каб захаваць чысціню святых Боскіх таямніц. Так, сваім метафарычным словам Р. Барадулін падкрэслівае, што быкаўская творчасць і праўда неабходныя кожнаму з нас для грамадзянскага станаўлення, духоўнай і светапогляднай сталасці. Менавіта таму, каб спасцігнуць глыбокую змястоўнасць твораў пісьменніка, зразумець яго заклапочанасць лёсам і будучыняй беларусаў, быкаўскія старонкі, кнігі трэба чытаць уважліва, засяроджана, разумеючы яго горкую, бязлітасную, балючую праўду аб вайне, подзвігу, смерці, здрадніцтве.

Мэтазгодна задаць вучням пытанні: *Чаму Р. Барадулін прапануе нашча спасцігаць В. Быкава: чытаць і думаць пра яго? Чаму паэт назваў В. Быкава апосталам нацыі?*

Веліч Быкава-грамадзяніна і творцы выдатна ўсведамлялася і раней, яшчэ пры яго жыцці. У 1984 годзе да 60-гадовага юбілею В. Быкава выдатныя радкі напісаў У. Караткевіч у вершы-прысвячэнні «Васілю Быкаву»:

Час стагоддзі, як касой, сцінае,
Веры, царствы, догмы йдуць да ценяў...
Ўсё мінае — Гонар не мінае,
Бо народжаны адным сумленнем.

Калі сонца выб’ецца з туману,
Толькі іх і ўславіць хор народаў,
Воінаў сваіх, святых і зраненых,
Рыцараў сумлення і свабоды.

На ўроках па вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменніка карысна спыняць увагу вучняў на дзяцінстве і юнацтве творцы, каб яны мелі магчымасць параўнаць рэаліі ўласнага жыцця з абставінамі, што ўплывалі на фарміраванне светапогляду будучага мастака слова і, як правіла, на праблематыку творчасці. Першае заданне вучэбнага дапаможніка і скіравана на гэта (с. 59). Клас можа знайсці адказы на пастаўленыя пытанні ў вучэбным дапаможніку, але настаўніку неабходна паглыбіць уяўленні вучняў пра маленства і юнацтва В. Быкава, звярнуўшыся да яго аўтабіяграфічнага твора «Доўгая дарога дадому» (2002 г.). У прыватнасці, адказ вучняў на пытанне *Як уплывалі кнігі на станаўленне светапогляду будучага пісьменніка?* запамінальна падмацуецца выказваннямі самога В. Быкава са згаданай кнігі: «У тыя гады я ўжо захапіўся чытаннем. Але дзе браць кнігі? Канешне, у школьнай бібліятэцы, якая была нядужа багатая, ды ўсё ж класіка ў ёй знаходзілася, і беларуская, і руская, і што-нішто з сусветнай. Найперш прыгодніцкая літаратура — ад Жуля Верна да нашага Янкі Маўра, кнігі якога я вельмі любіў. Дужа папулярную на той час “Як гартавалася сталь” чыталі па чарзе ўсёй школай. Аднойчы я захварэў і доўга не хадзіў у школу, затое чытаў і перачытаў усё, што было ў школе... Тады ж адолеў “Вайну і мір”, тры тамы “Ціхага Дону”, шмат што з Ганчарова, Тургенева, а таксама Зарэцкага, Гартнага, Галавача. Доўга нідзе не мог дастаць коласаўскую “Дрыгву”... Ішло паляванне на кніжкі па сябрах і знаёмых. Скажам, дачуўся, што ў кагосьці ёсць якія незнаёмыя кніжкі, я прасіў даць пачытаць. На два дні, на адну ноч... Кніжны свет ужо звыкла стаў для мяне не меней значны за рэальны. У дзіцячыя гады адбывалася нейкае душэўнае фармаванне, можа, болей важнае за ўплывы рэальнага свету...»[1].

---

[1] *Быкаў, В.* Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. — Мінск: Кніга, 2002. — С. 22—23.

Фрагментамі з аўтабіяграфічнай прозы можна праілюстраваць і шлях Быкава-салдата. Гэта будзе дарэчы зрабіць і пры вывучэнні твораў на ваенную тэму.

Любімыя героі В. Быкава — гэта звычайныя людзі, якія, аднак, маральна і духоўна моцныя і застаюцца мужнымі і высакароднымі нават перад пагрозай смерці. У цэнтры ўвагі пісьменніка не апісанне баёў, важных ваенных аперацый, а псіхалогія, духоўны стан чалавека на вайне, на мяжы жыцця і смерці. Яго героі пастаўлены ў такія ўмовы, калі выяўляецца іх сапраўдная сутнасць — высокая маральнасць ці амаральнае прыстасаванства. Пісьменнік лічыў літаратуру чалавеказнаўствам. У сваіх творах ён імкнуўся «расшыфраваць» псіхалагічную і маральную матывацыю людскіх учынкаў, што ўдаецца не кожнаму мастаку слова.

З біяграфіі В. Быкава вучні маюць уяўленне пра яго франтавы вопыт, але на дадзеным этапе варта прыгадаць, чаму пісьменнік на мяжы 1960—70-х гадоў звярнуўся да адлюстравання вайны, супраціўлення акупантам у «партызанскіх аповесцях». Можна папрасіць вучняў прыгадаць, як сам В. Быкаў тлумачыў свой зварот да гэтай тэматыкі (с. 57): «Адвечная тэма выбару ў партызанскай вайне і на акупіраванай тэрыторыі стаіць больш востра, матываванасць чалавечых учынкаў больш складаная, чым у любой арміі» (з артыкула В. Быкава «Як была напісана аповесць “Сотнікаў”»). Настаўніку мэтазгодна падрабязней пазнаёміць вучняў з названым артыкулам[1].

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць па вучэбным дапаможніку матэрыял, прысвечаны жыццю і творчасці В. Быкава (с. 49—59); асэнсаваць інфармацыю на сайце www.bykau.by.ru і падрыхтавацца да разгорнутага адказу «Жыццёвы і творчы шлях В. Быкава».

---

[1] Гл.: *Быкаў, В.* Праўдай адзінай. Літаратурная крытыка, публіцыстыка, інтэрв’ю / В. Быкаў. — Мінск, 1984. — С. 96—97.

## УРОК 2.

### Арыентацыйныя заняткі па аповесці Васіля Быкава «Сотнікаў». Праблематыка твора

На гэтым уроку неабходна засяродзіцца на асэнсаванні праблемы «чалавек перад знішчальнай сілай бесчалавечых абставін», а таксама правесці параўнальную характарыстыку вобразаў Сотнікава і Рыбака. Урок пачынаецца з выяўлення вучнёўскіх адносін да прачытанага:

1. *Хто з герояў аповесці ўразіў вас найбольш і чаму?*
2. *Што штурхнула Рыбака на ганебны шлях здрады?*
3. *Як вы думаеце, ці можа чалавек перамагчы абставіны?*

Пасля выяўлення ўзроўню чытацкага ўспрымання клас пераходзіць да асэнсавання тэматыкі і праблематыкі твора.

Тэматычна аповесць «Сотнікаў» адносіцца да «партызанскіх», хоць з яе нямнога можна дазнацца аб партызанскім жыцці і змаганні: у творы толькі згадваюцца цяжкія баі з ворагам, вядома, што многія партызаны гінуць, многія паранены. Знясілены, абяскроўлены партызанскі атрад да таго ж галадае. За харчам для атрада адпраўляюцца на заданне героі твора. Аднак асноўная мастацка-даследчыцкая ўвага аўтара скіравана на асэнсаванне складанай філасофскай праблемы «чалавек і абставіны». Ва ўмовах партызанскай барацьбы, супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі абставіны вельмі часта ставілі чалавека перад нялёгкім выбарам: жыць і памерці сумленна ці любой цаной зберагчы сваё адзінае бясцэннае жыццё. Часта неабходнасць заставацца да канца чалавекам вымагала за лепшае прыняць смерць, чым імкнуцца прадоўжыць уласнае існаванне. Многім людзям у тых умовах хацелася «сумясціць несумяшчальнае — захаваць жыццё і не паграшыць супраць чалавечнасці, што ў пэўных трагічных абставінах аказвалася неверагодна цяжкім, калі не зусім безнадзейным... Зразумела, цяжка патрабаваць ад чалавека высокай чалавечнасці ва ўмовах бесчалавечных, але ж існуе мяжа, за якой чалавечнасць рызыкуе ператварыцца ў сваю процілегласць...» (В. Быкаў).

Лёс не даў байцу-здрадніку, які стаў прататыпам галоўнага героя аповесці В. Быкава, моманту і магчымасці перабегчы да сваіх, бо за такімі, як ён, вельмі пільна сачылі фашысты. Яму

давялося прымаць удзел у баях супраць сваіх, хоць ён і страляў угору... Урэшце, аказаўся ў палоне ў сваіх — здраднікам. Вось як пра яго пісаў В. Быкаў: «Я слухаў яго і верыў яму: ён гаварыў праўду. Безумоўна, ён не быў з ліку тых, якія прагнулі служыць ворагу, яго асабістая храбрасць і воінскае майстэрства былі пацверджаны высокай узнагародай. Проста, апынуўшыся ў палоне, ён вышэй за ўсё паставіў уласнае жыццё і вырашыў абхітрыць фашыстаў. І вось варты жалю вынік гэтых хітрошчаў...»

Драматычны лёс чалавека-адступніка ўвасобіўся ў аповесці В. Быкава ў вобразе Рыбака. Для мастацкага ўвасаблення праблемы «што такое чалавек перад неадольнаю сілай абставін?» пісьменніку спатрэбіўся антыпод здрадніку. Такім героем у творы стаў найперш Сотнікаў, які не скарыўся абставінам, а ўзвысіўся над імі сваёй маральнай сілай і духоўнай веліччу. Гэтаму персанажу адведзена цэнтральнае месца ў аповесці, бо менавіта Сотнікаў задумваецца над пытаннямі, якія вызначаюць філасофію гэтага твора, і дае адказ на іх сваёй гераічнай гібеллю.

Неабходна звярнуць увагу вучняў, што кампазіцыйная будова аповесці «Сотнікаў» увасабляе аўтарскую задуму: параўнанне дзвюх жыццёвых пазіцый, двух лёсаў, дзвюх супрацьлеглых ліній паводзін людзей ва ўмовах выбару — годная смерць ці здрадніцкі кампраміс з уласным сумленнем дзеля захавання фізічнага існавання любой цаной. Таму пісьменнік часта чаргуе раздзелы, прысвечаныя ранейшаму жыццю, выхаванню, учынкам то Сотнікава, то Рыбака.

На наступным этапе ўрока неабходна прасачыць за спосабамі стварэння характараў і аднаго і другога героя. Можна паставіць класу праблемныя пытанні: *Чаму рашэнне памерці з годнасцю выбірае толькі Сотнікаў? Чаму яно непрымальнае для Рыбака?* Адказ на гэтыя пытанні можна знайсці ў паслядоўнай, псіхалагічна дакладнай параўнальнай характарыстыцы персанажаў, дадзенай ім пісьменнікам з вялікай увагай, часам да падрабязных дэталей, праз аповеды пра іх даваеннае жыццё, праз размовы, развагі, унутраныя маналогі і паводзіны. Напачатку аўтар нават падкрэслівае тое, што іх аб'ядноўвае: адна мэта, пастаўленая камандзірам; узаемная сімпатыя, бо ў нядаўнім баі яны ратавалі адзін аднаму жыцці; ім абодвум па 26 год і абодва паспелі ўжо многае паражыць.

В. Быкаў апісвае эпізод бою, пасля якога Рыбак ацаніў мужнасць і стойкасць Сотнікава і пачаў цягнуцца да яго, хацеў мець такую ж сілу волі. Тады іх дваіх і яшчэ аднаго партызана пакінулі ў заслоне, каб затрымаць фашыстаў і паліцаяў і даць магчымасць атраду адступіць. Рыбак быў упэўнены, што ім не ўтрымацца, што ворагаў многа і ўзброены яны значна лепш. Ён вырашыў: пакуль не паранены і мае сілы, трэба ратаваць жыццё, — і з іншым партызанам пачаў уцякаць у лес, пакінуўшы Сотнікава аднаго стрымліваць фашыстаў. Сотнікаў жа не сышоў з месца, вёў па ворагах трапны, прыцэльны агонь, прымусіў іх залегчы і тым самым прыкрыў адыход партызанаў. Убачыўшы гэта, Рыбак сабраўся з духам, пераадолеў страх і інстынктыўнае жаданне ратаваць уласнае жыццё, стаў таксама страляць па немцах. Атрымалася, што мужнасць і вытрымка Сотнікава спынілі ганебныя ўцёкі Рыбака. Пасля таго бою, піша В. Быкаў, яны як бы пасябравалі, побач спалі, елі з аднаго кацялка.

Даючы каментарый гэтаму эпізоду, неабходна заўважыць, што схільнасць да здрадніцтва, авантурызму была заўсёды ўласцівай Рыбаку.

Для разумення розных ліній паводзін герояў варта звярнуцца да іх выхавання ў родных сем'ях і запытаць у адзінаццацікласнікаў: *Што нам вядома пра даваеннае жыццё Сотнікава і Рыбака?* Асэнсаванне і даваенных лёсаў абодвух персанажаў дапаможа вучням зразумець прычыны align рознага маральнага выбару кожнага перад тварам смерці. Сотнікаў вырас у сям'і ўдзельніка грамадзянскай вайны, дзе высока цанілася інтэлігентнасць, пачуццё ўласнай годнасці, ён выхоўваўся на гераічных традыцыях. Неабходна абавязкова звярнуцца да эпізодаў, дзе згадваецца Біблія. Так, Сотнікаў памятаў з маленства, што на матуліным камодзе заўсёды ляжала Біблія. Гэтую, на першы погляд выпадковую, дэталь аўтар уводзіць у твор, каб ёміста ахарактарызаваць высокі маральны, хрысціянскі ўклад духоўнага жыцця сям'і. Хлапчуком Сотнікаў часам гартаў састарэлыя жоўтыя старонкі гэтай незвычайнай матулінай кнігі, відавочна, намагаючыся адкрыць для сябе яе вялікую таямніцу і веліч: нездарма ж мама штодзень мела яе перад сабой, брала ў рукі, чытала...

У працэсе распрацоўкі параўнальнай характарыстыкі галоўных герояў і пазней, аналізуючы другарадных персанажаў, у іх ліку Пётру Качана, настаўніку неабходна засяродзіць увагу вучняў на тым, што тэма Бібліі ў аповесці гучыць не аднойчы: Біблія была ў хаце Пётры Качана, дзе Рыбак яе бачыў і трымаў у руках упершыню, словы з Бібліі вымаўляў у сне Сотнікава яго бацька-бязбожнік, чырвоны камандзір... Біблія — гэта важная і шматзначная дэталь, якая сведчыць аб філасофска-хрысціянскім сэнсе твора, бо быкаўскія героі ў фінале нагадваюць біблейскіх братоў Каіна і Авеля: Рыбак дапамагае павесіць Сотнікава.

Неабходна звярнуць увагу вучняў на, здавалася б, эпізадычныя вобразы палкоўніка, нязломнасць якога ўразіла Сотнікава, і безыменнага лейтэнанта, які кінуўся з нажом на канваіра, каб у іншых палонных з'явілася магчымасць ратаваць жыццё. І ён спрабуе сваім жыццём выратаваць ні ў чым не павінных Пётру Качана, Дзёмчыху, Басю: прызнаецца, што партызан і забіў паліцая, што астатнія — выпадковыя, невінаватыя людзі.

Застацца нязломным, перамагчы абставіны і маральна ўзвысіцца Сотнікаву дапамагло яго непахіснае пачуццё вернасці воінскаму і чалавечаму абавязку. Менавіта гэта і падкрэслівае В. Быкаў, характарызуючы героя: «На яго долю выпала нямала нялёгкага, нават жахлівага. Але быў абавязак. Ён вызначаў там, дзе было надта заблытана, ён вёў, калі не свяціла ніводнае сцежкі, ён вымагаў на амаль немагчымае». У адрозненне ад Рыбака ў Сотнікава была цвёрдая сістэма поглядаў, пачуццё маральнага абавязку і выразны адказ на пытанне, як і ў імя чаго жыць.

З першай і да апошняй старонкі твора характар Сотнікава, яго лад думак і спосаб жыцця застаюцца нязменнымі. Абставіны знішчаюць яго таму, што ён падначалены не ім, а сваім прынцыпам і логіцы. Гэта дапамагае герою вытрываць усе фізічныя і маральныя пакуты, аднак адымае жыццё. Нічога іншага ён не мог сабе дазволіць.

Сведкамі трагедыі і ўзнясення Сотнікава з'яўляюцца сагнаныя на плошчу мястэчкоўцы, а таксама маўклівыя, але вельмі красамоўныя неадушаўлёныя прадметы: пагорак, святочная арка, новыя, толькі што выпісаныя са склада пяньковыя вяроўкі, на якіх будуць вісець праз колькі хвілін целы пакутнікаў, старая лава, свежыя спілаваныя цурбаны, пах нямецкіх цыгарэт і адэкалону, чэзлыя дрэвы, аблезлая цэркаўка...

В. Быкаў малюе гібель Сотнікава надзвычай рэалістычна, нават натуралістычна, і ў той жа час эмацыянальна стрымана, празаічна, каб паказаць яе будзённасць на вайне. Вось рукі ката злавілі ўжо над галавой партызана пятлю і, абдзіраючы балючыя, памарожаныя вушы Сотнікава, насоўваюць яе на галаву да падбародка. Нямецкае і цывільнае паліцэйскае начальства цярпліва топчацца, адны хмурацца, а іншыя лагодна і бесклапотна размаўляюць, бы сышліся на штодзённую, не вельмі цікавую патрэбу і спяшаюцца хутчэй вярнуцца да сваіх звычайных спраў. Каб вучні зразумелі перакананне аўтара, што гібель Сотнікава не была бессэнсоўнай, можна, характарызуючы героя, задаць пытанне класу: *Каму ў апошнія хвіліны свайго жыцця стрымана, толькі позіркам, усміхнуўся Сотнікаў? Дзеля чаго аўтар напісаў гэты эпізод?*

Можна прапанаваць яшчэ раз прачытаць гэтыя радкі, каб вучні падышлі да падагульнення: вобраз хлапчука сімвалічны і шматзначны. Хлопчык у будзёнаўцы ўсё ўбачыў, усё зразумеў і здагадаўся пра пятлю — вольную, без Рыбака. Ён — надзея на адплату за здрадніцтва, сведка, бо калі ён ёсць, то будзе і помста. Хлапчук запомніць мужнасць Сотнікава, як памятае сам Сотнікаў выпадкова сустрэтых і такіх важных у яго лёсе безыменных палкоўніка і лейтэнанта. З вобразам хлопчыка, са спадзяваннем на яго памяць звязана надзея на будучае чалавецтва, на жыццё людзей без войнаў і здраднікаў.

Настаўнік такім чынам зможа давесці вучням глыбокі грамадзянска-філасофскі сэнс твора: праз вобраз Сотнікава В. Быкаў увасабляе ідэю духоўнай нязломнасці, хрысціянскай, маральна-этычнай чысціні, супрацьпастаўляючы яе поглядам практычнай выгады і прагматычнай маралі. Аўтар дае нам адчуць і зразумець, што амаральныя ці нават недастаткова маральныя рашэнні і ўчынкі, ідэйная, духоўна-этычная непаслядоўнасць — на вайне ці ў мірны час — разбуральна ўздзейнічаюць на людзей, параджаючы духоўны прымітывізм, абыякавасць, здраду, разбурэнне высокадухоўнага ў чалавеку, што выразна бачна ў вобразе другога героя — Рыбака.

Вучням прапануецца ўважліва перачытаць раздзел 18 аповесці, каб прасачыць, як пісьменнік паказвае незваротнае ўзыходжанне Сотнікава да подзвігу духу і канчатковае маральнае падзенне Рыбака.

Аналізуючы вобраз Рыбака, неабходна папрасіць вучняў: *Знайдзіце ў тэксце эпізоды, калі адбываецца наша знаёмства з гэтым героем, звярніце ўвагу на аўтарскую характарыстыку, дадзеную яму.* Рыбак фізічна дужы, гаваркі, зычлівы, абаяльны, без амбіцый і прэтэнзій. Ён не дазваляў сабе крыўдзіць іншых, быў добрым таварышам: заўважыўшы, што Сотнікаў замярзае ў халодным шынялі і пілотцы, ён аддае напарніку ручнік, каб той хоць бы шыю заматаў і крыху сагрэўся. Дзеліцца Рыбак з Сотнікавым і апошняй ежай — порцыяй паранага жыта.

*Як жа і чаму атрымалася, што Рыбак стаў здраднікам?* Варта адзначыць, што Рыбак не баяўся загінуць у баі з праціўнікам. Да палону ён здраднікам не быў і не збіраўся ім станавіцца. У артыкуле «Як стваралася аповесць “Сотнікаў”» В. Быкаў тлумачыць сутнасць гэтага вобраза: «Рыбак таксама не нягоднік па натуры: складзіся абставіны інакш, магчыма, праявіўся б зусім іншы бок ягонага характару і ён прадстаў бы перад людзьмі ў святле. Але няўмольная сіла ваенных абставін вымусіла кожнага зрабіць самы рашучы чалавечы выбар у жыцці — годна памерці або застацца жыць подла. І кожны выбраў сваё».

Вучняў неабходна падвесці да высновы: прычыны падзення Рыбака ў яго духоўнай і маральнай няўстойлівасці і нявызначанасці. Ён хоча жыць насуперак усяму і таму ў вырашальныя хвіліны ігнаруе інтарэсы і лёсы іншых людзей, клапоціцца толькі аб сабе, аб захаванні ўласнага жыцця. У адрозненне ад Сотнікава, які намагаецца сваімі паводзінамі, словамі ў палоне выратаваць іншых (Качана, Дзёмчыху, Басю), Рыбак вызваляе сябе ад маральных абавязкаў перад уласным сумленнем і перад іншымі людзьмі. У трагічных абставінах ён разглядае некалькі варыянтаў выбару свайго далейшага лёсу. Страціўшы цвёрдасць і ўпэўненасць у сабе, ён паверыў прывіднай думцы, што ў змаганні-гандлі за жыццё можна паступіцца чым-небудзь дробным, неістотным. Яго не стрымлівае нават цвёрдая перасцярога Сотнікава, якога ён шанаваў: «Дзівак! З кім ты ўздумаў цягацца? Гэта — машына! Або ты будзеш служыць ёй, або яна сатрэ цябе ў парашок». Аднак ахоплены неадольнай прагай жыць, страшэнна не хочучы гінуць, Рыбак ужо наважыўся на самае горшае, хоць у душы стараецца знай-

сці апраўданне свайму адступніцтву: нічога не здарыцца, калі фашысты дазнаюцца аб месцы знаходжання партызанскага атрада, паліцаям туды не дабрацца...

Ратуючы сябе, Рыбак вырашае перакласці адказнасць на вясковага старасту Пётру Качана. Ідучы на кампраміс са сваім сумленнем, ён ужо не шкадуе і Сотнікава, згаджаецца дапамагчы паліцаям павесіць свайго сябра. Ад жывога, але нямоглага Сотнікава, на яго думку, ужо не можа быць нікому ніякай карысці, але яго смерць дае шанс Рыбаку ўратаваць уласнае жыццё. І Рыбак спадзяецца выйграць у ворагаў час і жыццё, каб потым расквітацца і за Сотнікава, і за сябе.

Рыбак падмануўся: згода, нават на словах, служыць у паліцыі — не выйсце з тупіка, а тая ж смерць, толькі ганебная. І зусім хутка ён гэта зразумеў, хоць не хоча прызнавацца нават сабе, што стаў здраднікам. І сваю віну ў расправе над Сотнікавым Рыбак адмаўляе: «Прычым тут ён? Хіба гэта ён? Сотнікаў сам узлез, сам скочыў з цурбана. Ён толькі трымаў. І то па загаду». В. Быкаў у фінале аповесці сцвярджае, што колішняга партызана Рыбака ўжо няма. Пасля смерці Сотнікава з'явіўся Рыбак-здраднік.

Быкаў-філосаф і мастак у гэтым творы даводзіць, што толькі слабы чалавек бяссільны перад абставінамі; безвыходнасць сітуацыі не павінна здымаць з чалавека адказнасці за сябе і за іншых. Трагічныя ўмовы жыцця, наадварот, вымагаюць большай адказнасці асобы за свае ўчынкі, бо бязвольнае падпарадкаванне абставінам, памылковы выбар прыводзяць да бясслаўнага жыццёвага тупіка.

❐ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць тэзісную параўнальную характарыстыку Сотнікава і Рыбака.

## УРОК 3.

## Другарадныя вобразы ў аповесці: прадстаўнікі «народнай праўды» і здраднікі

Урок прысвячаецца аналізу герояў другога плана: прадстаўнікоў «народнай праўды» (стараста Пётра Качан, Дзёмчыха і яе дзеці, яўрэйская дзяўчынка Бася) і здраднікаў-паліцаяў (Партноў, Гаманюк, Будзіла); звяртаецца ўвага на аўтарскія сродкі стварэння вобразаў-персанажаў абедзвюх груп.

Спачатку настаўнік правярае дамашняе заданне: удакладняюцца і дапаўняюцца параўнальныя характарыстыкі галоўных герояў. Потым неабходна звярнуцца да другарадных персанажаў аповесці, якія таксама размежаваны на два супрацьлеглыя лагеры.

Настаўнік можа прапанаваць класу ўспомніць: *Калі, у якіх сітуацыях адбываецца знаёмства чытачоў са старастам Качаном, Дзёмчыхай і Басяй?* Гэта заданне дапаможа ўзнавіць сюжэт твора. Важна давесці да ўсведамлення вучняў, што вобразамі гэтых герояў, як і вобразам Сотнікава, В. Быкаў услаўляе чалавечую годнасць і мужнасць, якія адольваюць трагізм і безвыходнасць абставін; праз вобразы мірных жыхароў, якія бязвінна прынялі пакутніцкую смерць, аўтар таксама асуджае вайну як антычалавечую з'яву.

Пры характарыстыцы Пётры Качана можна прапанаваць вучням яшчэ раз зачытаць эпізод аповесці, калі ў хаце Качана з'явіліся партызаны, і адказаць на пытанні: *Як Пётра сустрэў партызан? Як аўтар апісвае знешні выгляд і паводзіны герояў?*

Важна звярнуць увагу на годныя, стрыманыя паводзіны гаспадароў. Пётра — сталы ўжо чалавек, «стараваты, з коратка пастрыжанай сівой барадой», — такім убачылі яго Сотнікаў і Рыбак. Неабходна падкрэсліць, што ўпершыню мы ўбачылі Качана з Бібліяй у руках. Гэта дэталь ёміста і трапна характарызуе героя: такі чалавек не пакіне іншага ў бядзе, не пакрывіць сумленнем, будзе паводзіць сябе годна, па-хрысціянску. Пётру фашысты і паліцаі схапілі першым, бо даведаліся, што ён аддаў партызанам авечку. Ён мужна і стрымана пераносіць выпрабаванні лёсу, што асабліва бачна, калі герой апынуўся ў камеры. Пётра не спрабуе скінуць віну на партызан, каб уратаваць сябе. Такія годныя паводзіны Качана здзіўляюць Рыбака, які ў няволі пачынае гандляваць сумленнем. Пётра прызнаецца, што старастам ён стаў па просьбе раённага начальства: «...пагаджайся. А то Будзілу паставяць — усім горай будзе». Дзеля дабра ўсім ён дае гэтую нялёгкую згоду.

Спакойны, аціхлы, паглыблены ў сябе, «са спаважнай паныласцю» сустракае апошнюю раніцу свайго жыцця гэты чалавек. Неабходна зачытаць радкі, у якіх апісваецца развітанне Пётры з людзьмі і жыццём, падкрэсліць яго духоўную сілу і маральную вартасць.

Вобраз Аўгінні Дзёмчыхі ўвасабляе надзвычай трагічны лёс жанчыны ў ваеннае ліхалецце. Яна застаецца адна з чацвярымі дзецьмі: муж ваюе на фронце і невядома, ці вернецца з вайны. Мэтазгодна зноў звярнуцца да тэксту, зачытаць эпізод прыходу ў хату Дзёмчыхі партызан і адказаць на пытанні: *Як сустрэлі дзеці, а потым і маці няпрошаных гасцей? Якія маральныя якасці выяўляюць пры гэтым Аўгіння і яе дзеці?*

Неабходна звярнуць увагу на словы старэйшай дзесяцігадовай дзяўчынкі: «...маці на хлеб зарабляе. Нас жа чацвёра едакоў, а яна адна». Дзеці не са страхам, а з цікавасцю глядзяць на незнаёмых. Старэйшая «...на цыпачках звыкла пацягнулася ў чаленік і забразгала засланкай печы, яна са шчырасцю хацела дагадзіць людзям: дастала лыжкі, шмыганула некуды ў цемнаваты кут і паставіла на стол яшчэ і талерку з вялікімі зморшчанымі агуркамі», з цікавасцю пазіраючы на маўклівых узброеных дзядзькоў. Гэтыя радкі дапамогуць вучням пераканацца, што дзеці Дзёмчыхі выхоўваюцца па спрадвечнай народнай маралі: тут дзеляцца апошняй бульбінай і агурком.

Жанчына спачатку абурана з'яўленнем няпрошаных гасцей, але, убачыўшы, што Сотнікаў паранены, яна пачынае спагадліва дапамагаць яму перавязаць рану, спрабуе ўратаваць партызан, схаваўшы іх на гарышчы. Яна не скараецца ворагам, нават апынуўшыся ў камеры, супраціўляецца іх гвалту і здзекам над сабой і іншымі. У апошнія хвіліны жыцця перад шыбеніцай душа маці разрываецца ад болю за дзяцей: «Як яны будуць без мяне! Ой, дзеткі мае родненькія...»

Закранаючы самы трагічны ў аповесці вобраз дзяўчынкі Басі — дачкі мястэчковага яўрэя-шаўца, неабходна спытаць у вучняў: *Што вам вядома пра лёс яўрэйскага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны, пра Халакост, пра людзей — «праведнікаў свету», якія ратавалі яўрэяў ад смерці ў час фашысцкай акупацыі?*

**ДАВЕДКА.** 27 студзеня адзначаецца Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста. Ён устаноўлены рашэннем Генеральнай Асамблеі ААН ад 1 лістапада 2005 года. Дата 27 студзеня выбрана невыпадкова: у гэты дзень у 1944 годзе Савецкая Армія вызваліла Асвенцым, самую вялікую ў

гісторыі чалавецтва «фабрыку смерці». Асвенцым — гэта комплекс нямецкіх канцлагераў на поўдні Польшчы. У ім замучаны 1 300 000 чалавек, з якіх больш за мільён былі яўрэі. Тут шырока практыкаваліся бесчалавечныя медыцынскія эксперыменты.

Рызыкуючы ўласным жыццём і жыццём сваіх сямейнікаў, беларускія сяляне хавалі яўрэяў. Можна прапанаваць вучням расказаць, што адбылося з дзяўчынкай (калі фашысты расстрэльвалі ўсіх яўрэяў, Басю ўратавала суседка; паліцаі, злавіўшы дзіця, дамагаюцца, каб Бася прызналася, хто яе хаваў). Пётра і Дзёмчыха шкадуюць дзяўчынку і вучаць яе не выдаваць сваіх збавіцеляў: «І не кажы ім. Нельга такое казаць. Людзі дабро зрабілі, дык і маўчы. Калі і біць будуць...» Басю ўжо білі, з яе здзекваліся. Адагрэтая пяшчотай і спагадай гэтых людзей, душа дзяўчынкі не можа стрымаць нясцерпны балючы плач.

*Звярніце ўвагу на тое, як прымае смерць Бася.* Можна яшчэ раз перачытаць гэты эпізод і адказаць на пытанне: *Што шукала ў натоўпе ў апошнія імгненні жыцця Бася?* Следам за Пётрам Качаном, як непазбежнасць і наканаванасць, яна ўспрымае тое жахлівае, што павінна зараз адбыцца. Яна, як піша В. Быкаў, хуценька ўзлезла на ўслон перад «сваёй» шыбеніцай, пераступаючы замерзлымі парэпанымі нагамі. У апошнія імгненні жыцця Бася з палахлівай цікаўнасцю азірала натоўп, нібы шукала знаёмых, якія б маглі яе падтрымаць.

Каб вучні спасціглі маральна-філасофскі сэнс аповесці, іх увагу можна скіраваць на вобразы паліцаяў, дарослых і дужых мужчын, якія па розных прычынах зрабілі ганебны выбар — сталі здраднікамі і катамі. Дзеля гэтага неабходна зноў звярнуцца да зместу: *Што нам вядома аб мінулым жыцці Партнова, Будзілы, Гаманюка? Чым яны кіраваліся, прымаючы рашэнне?*

Паводле развага аб жыццёвым выбары герояў другога плана вучняў неабходна падвесці да высновы: кожная смерць — вялікая страта, а тым больш гібель бязвінных сумленных людзей; але ў сапраўдным чалавеку павінна быць у дастатковай меры людскасці, мужнасці, каб памерці з годнасцю, а не здраджваць духоўным і маральным святыням дзеля падаўжэння ўласнага

існавання. Гібель кожнага з быкаўскіх герояў, пачынаючы ад Сотнікава і канчаючы трынаццацігадовай Басяй, — гэта перамога над страхам смерці, гэта сапраўднае ўзыходжанне да вяршынь чалавечага духу. Невыпадкова вядомы рэжысёр Л. Шапіцька назвала свой фільм па аповесці «Сотнікаў» — «Узыходжанне».

Неабходна звярнуць увагу на мастацкія асаблівасці быкаўскага твора: аўтар перадае падзеі ад імя то аднаго, то другога персанажа — то Сотнікава, то Рыбака. Аўтарскі голас «зліваецца» то з адным з іх, то з другім. В. Быкаў невыпадкова выбірае гэты прыём: такая манера пісьма паглыбляе дакладнасць, выразнасць і ёмістасць мастацкага даследавання ўнутранага свету герояў. Філасофска-маральная праблематыка твора патрабуе менавіта такога «ўнутранага» духоўна-псіхалагічнага падыходу.

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць матэрыял вучэбнага дапаможніка на старонках 66—69 і падрыхтаваць разгорнуты адказ на пытанне 4 (с. 69); апераджальнае заданне — прачытаць аповесць «Знак бяды». Пажадана ў пазаўрочны час арганізаваць прагляд з наступным абмеркаваннем фільма «Узыходжанне» па аповесці В. Быкава.

## УРОК 4.

### Уступныя і арыентацыйныя заняткі па аповесці Васіля Быкава «Знак бяды». Маральна-філасофская праблематыка твора, вобразы галоўных герояў — Петрака і Сцепаніды Багацькаў

На гэтым і наступным уроках вучні павінны асэнсаваць падзеі перадваеннага жыцця, адкуль бярэ вытокі драматызм адносін ва ўмовах акупацыі паміж мірнымі людзьмі і паліцаямі і такая ганебная з'ява, як калабарацыянізм.

**ДАВЕДКА.** ***Калабарацыянізм*** — пераход на бок ворага, каб змагацца супраць сваіх. Калабарацыяніст — здраднік, які супрацоўнічае з ворагамі сваёй радзімы і народа. У час Вялікай Айчыннай вайны — гэта паліцаі.

Карысна пазнаёміць вучняў з ацэнкамі аповесці ў крытыцы, сказаць, што і па гэтым творы В. Быкава рэжысёрам

М. Пташуком зняты мастацкі фільм з аднайменнай назвай. На адным з урокаў абавязкова трэба звярнуцца да вучэбнага фільма «Васіль Быкаў. Знак бяды», у якім па праблематыцы аповесці з артысткай Таццянай Мархель, якая іграла ролю Сцепаніды, разважае аўтар — В. Быкаў, а таксама выкарыстаць магчымасць на ўроку паглядзець фрагменты з мастацкага фільма «Знак бяды».

На арыентацыйным этапе важна высветліць: *Хто галоўныя героі твора?* Настаўнік скіроўвае ўвагу вучняў на тое, што галоўнымі героямі з'яўляюцца не салдаты-франтавікі, нават не партызаны, што са зброяй у руках змагаліся супраць захопнікаў, а мірныя жыхары хутара, сяляне, людзі сталага ўзросту. Асэнсаванне вобразаў Сцепаніды і Петрака як патрыётаў і моцных духам людзей, для якіх годнасць і вольнае, незалежнае жыццё на сваёй зямлі — найбольшыя каштоўнасці, павінна прывесці вучняў да высновы, што менавіта гэтыя героі з'яўляюцца носьбітамі сапраўднай народнай маралі, народнай жыццёвай мудрасці, увасабляюць ідэал пісьменніка, сутнасць задумы твора.

У аповесці аўтар выпрабоўвае сваіх герояў на трываласць ва ўмовах фашысцкай акупацыі. Працу па засваенні праблематыкі твора на ўроку мэтазгодна весці па пытаннях: *Чаму ж Пятрок і Сцепаніда не змаглі змірыцца з нашэсцем на хутар і здзекамі фашыстаў і паліцаяў-здраднікаў? Чаму яны, як некаторыя іншыя вяскоўцы, напрыклад Карніла, не змаглі пакорліва перачакаць навалу? Чаму яны не намагаюцца зберагчы сваё жыццё і не скараюцца абставінам?*

Для знаходжання адказаў на пастаўленыя пытанні неабходна звярнуцца да мінулага герояў, прасачыць логіку іх паводзін і ўчынкаў у складаны і драматычны перадваенны час. Важна, каб для аргументацыі сваіх меркаванняў вучні выкарыстоўвалі тэкст твора.

Клас пад кіраўніцтвам настаўніка павінен прыйсці да наступных падагульненняў: абодва героі — і Пятрок, і Сцепаніда — з маладосці імкнуліся многа і сумленна працаваць, каб мець уласны сямейны куточак, сваю зямлю. Гэта быў час, калі закончылася грамадзянская вайна, калі людзі, асабліва моладзь,

верылі, што зараз удасца пачаць «новае, адваяванае ў старога жыццё». Працавітыя батракі, пабраўшыся, былі шчаслівыя, што савецкая ўлада дала ім зямлю, але засмучаліся, што гэтая зямля ўсё ж чужая — іх гаспадара пана Яхімоўскага, які даў іх маладой сям'і прытулак на сваім хутары. Сцепаніда, як піша В. Быкаў, «проста гатова была скакаць ад радасці — гэта ж падумаць: яны займеюць сваю зямлю, і без грошай, без свары, без судоў і рашэнняў — атрымаюць і ўсё. Па праву экспрапрыяцыі». Пан Яхімоўскі тады з крыўдай, якую нельга было схаваць, сказаў сваім парабкам трывожныя і прарочыя словы: «Бярыце, цяпер усё ваша. Заўсёды быў грэх кваціцца на чужое. На чужым і дармовым шчасця не будзе. Шкада мне вас...» Гэтыя словы старога гаспадара сталі сумным прароцтвам: на былым хутары пана Яхімоўскага ў час вайны Сцепаніда і Пятрок прынялі пакутніцкую смерць.

Важна падкрэсліць, што Пятрок і Сцепаніда — набожныя, высокамаральныя людзі, якія пакутавалі ад адчування невытлумачальнай несправядлівасці: яны спачувалі Яхімоўскаму, але і ім хацелася быць гаспадарамі сваёй зямлі і лёсу. Савецкая ўлада, якая спачатку нарадзіла ў душы Сцепаніды веру ў магчымасць справядлівых адносін паміж людзьмі, выклікала і зразумелы недавер. Пра яе аўтар піша: «Наследуючы і захоўваючы многія нормы маралі, Сцепаніда была пераканана, што на чужым няшчасці не пабудуеш свайго шчасця, што трэба жыць па справядлівасці». Але сам лёс так распарадзіўся, што чужая зямля дасталася батракам Багацькам, бо сам Пятрок не хадзіў у валвыканкам за панскай зямлёй: «Не пайду, і ўсё. Не магу я».

Трэба давесці вучням, што перад намі не слабы, а моцны духам герой, ён не можа ігнараваць маральнасць. І гэта выразна тлумачыць сілу і сумленнасць яго характару, вытокі яго мужных паводзін у час вайны. Такім чынам, у мірны час, задоўга да вайны, з народнага жыцця, ад продкаў героі засвоілі, што трэба жыць сумленна, са сваёй працы здабываць кавалак хлеба, жыць у згодзе між сабой, ісці да людзей з дабрынёй. Гэта лепшыя якасці беларускага нацыянальнага характару, таму Сцепаніда і Пятрок з'яўляюцца носьбітамі высокай духоўнасці і маралі нашага працоўнага народа.

Важна, каб вучні аргументавана адказалі на пытанне: *Чаму Пятрок і Сцепаніда былі за калгасы?* Пятрок і Сцепаніда паверылі ў калектыўную гаспадарку, бо на ўласным вопыце пераканаліся, што аднаасобніцкі хлеб цяжкі і непасільны. В. Быкаў па-мастацку трапна паказвае і нібы прадказвае, што жыццё яго герояў будзе трывожна-трагічным. Увесь час яны жылі ў пастаянным напружанні, без цвёрдай упэўненасці, што заўтрашні дзень будзе лепшым. Асабліва балюча перажывалі яны раскулачванне і высылку аднавяскоўцаў. Вайна яшчэ не абрынулася на хутар усім сваім жахам, але прадчуванне вялікай бяды жыве ў душы герояў. На гэта ўказвае і аўтарскае апісанне, калі адбываецца знаёмства чытачоў з галоўнай гераіняй.

Мэтазгодна папрасіць вучняў: *Знайдзіце ў тэксце і яшчэ раз перачытайце эпізоды, калі мы ўпершыню бачым Сцепаніду. Які псіхалагічны фон стварае апісанне прыроды? Якое ўражанне, прадчуванне пакідае ў чытача знаёмства з гераіняй? Аб чым і аб кім яна непакоіцца?* Хмарным восеньскім днём Сцепаніда пасвіць карову. Яна спрабуе схавацца ад халоднага пранізлівага ветру, але гэта не так проста. «Было не сцюдзёна, трохі зябкавата нагам у воглай траве і ветрана. Сцепаніда... шчыльней саставіла ў траве босыя ногі... Неба спрэс усцілалі хмары, сонца не паказвалася ад рання...» У памяці гераіні праносяцца страшныя падзеі апошніх дзён, калі адступалі чырвонаармейцы. Яе позірк затрымліваецца на некалі сваім хутарскім полі, якое зараз стала калгасным, на Галгофе. Яна пакутуе ад невядомасці: дзе цяпер яе дзеці — Федзька і Феня? Чаго чакаць ад немцаў?

З трывогай за чалавека ўвогуле, з душэўным болем за сваіх герояў, за людскія пакуты на пакручастых жыццёвых дарогах і гістарычных тупіках прасочвае В. Быкаў іх лёсы, расказвае аб цяжкіх выпрабаваннях, з якімі яны сутыкнуліся. «Уласцівае Быкаву псіхалагічнае майстэрства, уменне дакладна перадаць кожны душэўны рух, жэст, кожны паварот думкі і пачуцця — гэтае ўменне на поўную сілу заяўляе пра сябе ў паказе як Петрака, так і Сцепаніды», — слушна пісаў аб майстэрстве аўтара даследчык Д. Бугаёў.

Звяртаючыся да аналізу вобраза Петрака, неабходна задаць вучням пытанне: *Калі адбываецца першае знаёмства чытачоў з Петраком? Што мы пра яго даведваемся?* Гэтага

героя мы ўпершыню сустракаем у згадках Сцепаніды пра яго. Яна абвінавачвае мужа, што гаспадарка засталася без каня: калі на пачатку вайны распусцілі калгасы, Пятрок не прывёў сваёй кабылы, якую яны некалі аддалі ў калгас, яе забралі па патрэбе на станцыю, але, па меркаванні Сцепаніды, Пятрок мог бы ўзяць іншага каня. «Яна тады насварылася на Петрака... як жа без каня ў гаспадарцы? Як тады жыць? Але гэты Пятрок — вядомая недалэнга, хіба ён зробіць як трэба? Толькі знае адно — моўчкі смаліць смярдзючую сваю махорку. Цяпер во жыві як хочаш, добра яшчэ, што ёсць гэтая Бабоўка...» Важна звярнуць увагу вучняў, што гэты ўнутраны маналог выразна характарызуе не толькі Петрака, але і Сцепаніду, яе рашучасць, бескампраміснасць, яе адносіны да Петраковай стрыманасці ва ўчынках, да ўласцівай яму сціпласці.

Пятрок паказаны больш мяккім, памяркоўным, далікатным у параўнанні з жонкай. Сцепаніда часам сварылася за гэта на яго, а потым да слёз і шкадавала. Спасцігнуць характар героя дапаможа адказ на пытанне: *Як мяркуе Пятрок адвесці ад хутара бяду?* У трывожны ваенны час Пятрок спадзяецца хоць на нейкую чалавечую прыстойнасць паліцаяў, хоча адкупіцца, задобрыць іх, каб пакінулі хутар у спакоі, але хутка ўпэўніваецца, што гэта немагчыма. Пятрок больш не хоча дагаджаць п'яным паліцаям-здраднікам, ён гатовы прыняць смерць. Важна, каб вучні знайшлі і пракаменціравалі апісанне гэтага трагічнага ўсведамлення героя: «...Ачнуўся амаль ад сполаху, што пачынаецца новы дзень — што ён прынясе? Але ўжо было пэўна — не добрае ж ён прынясе. А новыя пакуты і страхі, можа, смерць... Чорт яе бяры, тую смерць, ён перастаў ужо баяцца, калі б толькі хутчэй. Шкада... многа чаго ён не пабачыць, а галоўнае — не дазнаецца ўжо пра лепшае. Мусіць жа яно будзе калі-небудзь...» За чалавечую годнасць і за лепшую будучыню ён змагаецца і гіне.

Неабходна звярнуць увагу на тое, якімі спосабамі пратэстуе супраць вайны і бесчалавечнасці Сцепаніда. Хоць гераіня добра разумее кволасць свайго пратэсту, але яна інача не можа (кідае ў калодзеж зброю, хавае парсючка, выдойвае на зямлю малако, каб яно не дасталося ворагам). Увасабленнем зла для Сцепаніды сталі фашысты і іх памагатыя — найперш мясцовыя

паліцаі з былых рэпрэсаваных сем'яў, якія пайшлі на службу да акупантаў, каб адпомсціць савецкай уладзе, яе актывістам за раскулачванне і рэпрэсіі ў 1930-я гады. Сцепаніда, як і Пятрок, ужо не баіцца смерці. Яна прагне помсты нелюдзям, таму выменьвае парсючка на бомбу ў Карнілы. Самае трагічнае ў творы, што Пятрок і Сцепаніда гінуць ад рук былых сваіх людзей і нават аднавяскоўцаў, якія «ператварыліся ў звяр'ё і вытвараюць такое па чужым прымусу, прытупіўшы ў сабе ўсё чалавечае, ці, можа, яны і не былі людзьмі, адно прытвараліся імі ўсе гады да вайны, якая разбудзіла ў іх звяругу» (думкі Петрака). Сапраўды, душы многіх людзей былі зруйнаваны, растаптаны ў гады калектывізацыі і «карэннага пералому».

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць матэрыял на старонках 69—73 вучэбнага дапаможніка, падрыхтаваць разгорнутыя адказы на пытанні 1—2 (с. 77).

## УРОК 5.

## Вобразы паліцаяў у аповесці. Мастацкая сімволіка твора

На гэтым уроку мэтазгодна звярнуцца да вобразаў здраднікаў — прыслужнікаў акупантаў — Гужа, Недасекі, Каландзёнка, засяродзіцца на прычынах іх здрадніцтва і расчалавечвання. Неабходна, каб вучні зразумелі, што вытокі ганебнай з'явы калабарацыянізму В. Быкаў бачыў у трагічным перадваенным жыцці: гвалтоўнай калектывізацыі, беспадстаўных, бязлітасных рэпрэсіях улады супраць свайго народа, супраць працаўніка-селяніна, гаспадара зямлі. Замоўчванне трагічнай гісторыі беларусаў В. Быкаў называў «хваробай духу» і многа рабіў, каб вылечыць мараль і духоўнасць грамадства, ён першы з беларускіх пісьменнікаў узняў у сваіх творах тэму асуджэння таталітарызму, сталіншчыны. Гвалтоўную калектывізацыю і вынішчэнне сялянства ён называў «самым недаравальным злачынствам сталіншчыны». В. Быкаў разбурыў «зону хлуслівага маўчання», прымусіў нас задумацца над тым, што многія нацыянальныя беды бяруць пачатак у трагічнай гісторыі.

На гэтым жа ўроку вучні павінны будуць асэнсаваць па тэорыі літаратуры паняцці «аўтарская задума» і «аўтарская

канцэпцыя». Таму мэтазгодна звярнуцца да вучэбнага фільма «Васіль Быкаў. Знак бяды», дзе адзінаццацікласнікі ўбачаць аўтара і паслухаюць яго развагі аб ганебнай з'яве калабарацыянізму, пачуюць, як пісьменнік выкладае сваю творчую задуму і канцэпцыю, якія ляглі ў аснову аповесці «Знак бяды». На ўроку важна паназіраць за майстэрствам мастака слова, за прыёмамі ўвасаблення аўтарскай задумы. Мэтазгодна запытаць аб гэтым вучняў: *Назавіце прыёмы, спосабы абмалёўкі герояў і перадачы падзей, якія дапамаглі В. Быкаву паспяхова рэалізаваць творчую задуму і аўтарскую канцэпцыю.* Гаворка павінна весціся аб прыёме рэтраспекцыі і вобразах-сімвалах, якія ў гэтым творы маюць глыбокі сэнс і падтэкст. Важна, каб вучні зразумелі, што падзеі 1930-х гадоў у гэтым творы В. Быкава паказаны рэтраспектыўна — праз успаміны, пераважна Сцепаніды. Сумненні наконт рашучых змен закрадваліся ў яе душу, але яна вырашыла разам з іншымі даверыцца новаму, за якое агітавалі разумныя, як здавалася ёй, людзі, хоць дапускала, што, магчыма, потым і пашкадуе. Яна пратэставала супраць несправядлівага раскулачвання Ладзімера Багацькі, а затым супраць арышта старшыні калгаса Лявона Багацькі. У той складаны час Сцепаніда намагалася бараніць праўду, але марна. Пятрок хутчэй за Сцепаніду адчуў небяспеку і злачыннасць гвалтоўнай палітыкі. Успаміны герояў тлумачаць і паводзіны паліцаяў, асабліва Зміцера Гужа, выкрываючы сталіншчыну, што дзяліла людзей на сваіх і чужых.

Неабходна, каб вучні знайшлі адказ на пытанне: *Чаму Зміцер Гуж пайшоў у паліцыю?* Гуж прызнаецца Сцепанідзе, што ў паліцыю ён пайшоў не для таго, каб вярнуць адабраную саветамі зямлю і гаспадарку, бо зямлю ён узненавідзеў з часу калектывізацыі, а для таго, каб мець уладу і адпомсціць тым, хто разбурыў працавітую сям'ю яго бацькоў. Так В. Быкаў паказвае не толькі вытокі помслівай здрады гэтага героя, але і тое, як знішчалася ў 1930-я гады спрадвечная мара беларуса — быць гаспадаром сваёй зямлі і лёсу.

На ўроку важна прачытаць і абмеркаваць эпізод раскулачвання Ладзімера Багацькі. Неабходна звярнуць увагу на трагічны лёс сям'і Ганчарыкаў, дзеля чаго можна задаць пытанне: *Пасля якіх трагічных падзей знямеў Янка Ганчарык?*

Настаўнік просіць вучняў: *Паразважайце аб прызначэнні кампазіцыйнага прыёму рэтраспекцыі.* У аповесці падзеі паказаны ў двух часавых вымярэннях: у перадваенны і ў ваенны час. Такі спосаб падачы матэрыялу не толькі дапамагае цалкам прасачыць характары і лёсы герояў, зразумець матывацыю іх паводзін і выбару ў гады вайны, але і ўвасабляе аўтарскае перакананне: сучаснае звязана з мінулым і абумоўлена ім.

На заключным этапе абмеркавання праблематыкі і мастацкіх адметнасцей аповесці неабходна звярнуцца да мастацкай сімволікі, спасціжэнне якой значна паглыбляе і пашырае маральна-філасофскую прастору твора: *Пералічыце вобразы-сімвалы ў творы і вызначце іх прызначэнне.* Пры дапамозе вобразаў-сімвалаў, «знакаў бяды» — мёртвы жаваранак, неўрадлівы ўзгорак Галгофа, крыж, неўзарваная бомба і некаторыя іншыя — аўтар увасабляе свой балючы і заклапочаны роздум аб лёсе суайчыннікаў, аб мінулых трагедыях беларускага народа, аб непрадказальнай, трывожнай будучыні. Важна патлумачыць вучням, што некаторыя вобразы-сімвалы маюць біблейскае паходжанне, сцвярджаюць хрысціянскія агульначалавечыя каштоўнасці: годнасць, працавітасць, трывушчасць, любоў да роднай зямлі, пакутлівасць людскіх лёсаў, выбар паміж жыццём у знявазе і здзеку ці смерцю, якая сведчыць аб непераможнасці годнага, самаахвярнага, духоўнага жыцця.

Арыгінальныя метадычныя прапановы па вывучэнні творчасці пісьменніка ўтрымлівае дапаможнік для настаўнікаў: Бугаёў, Д. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе / М. і В. Вярціхоўскія. — Мінск, 2005. Праверыць і замацаваць веды вучняў настаўніку дапаможа выданне: Беларуская літаратура. Тэсты. 11 кл. / аўт.-склад.: Г. С. Гарадко [і інш.]. — Мінск, 2001.

❒ **Дамашняе заданне:** асэнсаваць матэрыялы вучэбнага дапаможніка на старонках 73—79 і падрыхтаваць адказы на пытанні 3—4 (с. 77); прачытаць аповесць Э. Хемінгуэя «Стары і мора» і падумаць над праблемамі: 1. У чым сэнс жыцця чалавека? 2. Якім з’яўляецца ідэальны чалавек, у чым яго непераможнасць?

**ДАВЕДКА.** Каб зацікавіць адзінаццацікласнікаў творам Э. Хемінгуэя, можна аформіць чытацкі бюлетэнь. Тут змяшчаецца фотаздымак Э. Хемінгуэя 1950-х гадоў, здымкі з

Кубы, якая стала ў апошнія гады жыцця пісьменніка яго другой радзімай, малюнкі вокладак выданняў аповесці, ілюстрацыі да яе. У якасці анатацыі можна прывесці выказванні вядомых дзеячаў пра гэты твор Э. Хемінгуэя. Так, пасля знаёмства з рукапісам аповесці «Стары і мора» славуты кінарэжысёр Л. Хэйуорд пераконваў яе аўтара: «Чаго Вы дасягнулі ў ёй, дык гэта дасканаласці. Вам не ўдалося б сказаць больш за тое, што Вы сказалі, калі б напісалі тысячу старонак». Цікавыя ўражанні ад чытання аповесці ў адной з амерыканскіх газет пакінуў У. Фолкнер: «Час яшчэ пакажа, што "Стары і мора" — лепшае тварэнне пісьменніка... лепш за яго пра гэта не пісаў ніхто з нашых сучаснікаў. На гэты раз ён адкрыў Творцу, Стваральніка. Да гэтага часу мужчыны і жанчыны самі стваралі сябе з гліны; іх перамогі і паражэнні знаходзіліся ў іх уласных руках і патрэбныя былі толькі для таго, каб даказаць, якімі моцнымі яны могуць быць». Д. Кэнан адзначаў: «Па-мойму, апавяданне не патрабуе якіх-небудзь тлумачэнняў. Гэта суровая рэч, але ў той жа час яна прыгожая і надзвычайная, як прыгожы і надзвычайны Яго Вялікасць Чалавек».

## ЭРНЭСТ ХЕМІНГУЭЙ

### УРОК.

### Роздум пра сэнс жыцця чалавека ў аповесці Эрнэста Хемінгуэя «Стары і мора»

Урок мэтазгодна пабудаваць у форме лекцыі настаўніка з элементамі гутаркі і самастойнай творчай працы вучняў. Эпіграфам да ўрока можа быць хемінгуэеўскі афарызм: «Чалавека магчыма знішчыць, але перамагчы яго нельга», які неабходна асэнсаваць у ходзе аналізу аповесці «Стары і мора».

Ва ўступным слове настаўнік фармулюе тэму ўрока, чытае і каменціруе эпіграф, больш канкрэтнае і глыбіннае значэнне якога адкрыецца адзінаццацікласнікам пасля вывучэння аповесці, падкрэслівае значэнне названай тэмы, пытаецца ў вучняў пра іншых пісьменнікаў, якія намагаліся раскрыць гэтую ж

праблематыку, запрашае паразважаць над тым, чаму адзін са сваіх першых нарысаў В. Карамазаў (з творчасцю якога вучні знаёміліся ў IX класе) назваў «Жыццё па Хемінгуэю». Гэтым пісьменнікам-вандроўнікам, журналістам свет цывілізацыі пакідаў мала доказаў разумнасці сваёй арганізацыі, бо ў ім многае падначалена разбурэнню чалавечай сутнасці і знішчэнню жывой прыроды. Таму абодва празаікі былі верныя тэме «чалавек і свет прыроды». Далей настаўнік пераходзіць да гісторыі напісання аповесці «Стары і мора».

Першым подступам да тэмы аповесці стаў нарыс «На блакітнай вадзе. Гальфстрымскае пісьмо», апублікаваны яшчэ ў красавіку 1936 года. На доўгім шляху ад нарыса да аповесці, якая была надрукавана ў 1952 годзе тыражом 5 мільёнаў экзэмпляраў, Э. Хемінгуэй назапашваў жыццёвы вопыт, вывучаў людзей. Пры гэтым ён пераадольваў уласныя сумненні і трагізм, якія лічыў натуральнымі ў лёсе чалавека, «згубленага» ў свеце, пераадольваў спустошанасць і ўнутраную раздвоенасць, пачуццё сусветнай адзіноты, адчуванне бессэнсоўнасці і жорсткасці свету, што было ўласціва большасці герояў пісьменніка. І гераізм яго персанажаў выяўляецца ў тым, каб жыць, пакутаваць і паміраць як мага больш годна, выконваючы свой абавязак, чалавечы ці вайсковы. Гэтыя героі знаходзілі заспакаенне ў свеце прыроды, але яны толькі ўцекачы са свету цывілізацыі. Стары Санцьяга належыць да свету прыроды. У адным са сваіх лепшых раманаў «Па кім звоніць звон» і іншых творах Э. Хемінгуэй ставіць пытанне пра адказнасць кожнага чалавека за ўсё, што адбываецца на зямлі.

Лекцыя настаўніка можа перарывацца «бліцрэкламай» па творах Э. Хемінгуэя, якія былі дадзены для дадатковага чытання. Вучні выкажуць агульныя ўражанні ад прачытанага і коратка адкажуць на пытанні аднакласнікаў, парэкамендуюць тыя ці іншыя кнігі. Адзінаццацікласнікі могуць распрацаваць каментарыі да прачытаных твораў або да кінастужак, знятых па творах пісьменніка.

Пасля знаёмства з асобай Э. Хемінгуэя — нястомнага вандроўніка і шукальніка прыгод, пісьменніка, які захапляўся талентам Фёдара Дастаеўскага, Антона Чэхава, Івана Тургенева, Льва Талстога, Джэймса Джойса, Гертруды Стайн, Марка

Твэна, — настаўнік павінен пераключыць увагу вучняў на аповесць «Стары і мора». Ён робіць гэта з дапамогай гутаркі і свайго каментарыя. Для аналізу чытацкага ўспрымання аповесці адбываецца гутарка па пытаннях:

*1. Падзяліцеся ўражаннямі ад аповесці Э. Хемінгуэя «Стары і мора». Якія пачуцці ўзніклі пасля яе прачытання? Якія старонкі аповесці чыталіся з асаблівай цікавасцю?*

*2. Як ставіцца сам аўтар да галоўнага героя?*

*3. Як вы ацэньваеце вобразы Санцьяга і Маналіна?*

*4. Якія старонкі аповесці вам больш запомніліся: напружаныя моманты ў развіцці дзеяння ці ўнутраныя маналогі-развежанні галоўнага героя?*

*5. Падрыхтуйце вусныя малюнкі да твора, патлумачце, да якіх радкоў аповесці зроблены ілюстрацыі і чаму менавіта такія.*

*6. Паназірайце за адметнасцямі мовы аповесці. Што дазваляе аўтару дасягнуць мастацкага эфекту ў эпізодах, якія найбольш уразілі вас? Як бы вы вызначылі ідэю твора?*

Выявіўшы чытацкае ўспрыманне, падводзячы вынік працы па вызначэнні жанравых асаблівасцей аповесці «Стары і мора», настаўнік запрашае клас падумаць над тым, чаму крытыкі называюць твор філасофскай прыпавесцю, іншасказаннем ці міфам, і звяртае іх увагу на наяўнасць падтэксту ў творы. Каб даць правільны кірунак разважанням вучняў, неабходна прапанаваць ім успомніць, што такое прыпавесць і міф.

Далей настаўнік высвятляе, як вучні асэнсавалі паслядоўнасць падзей у творы:

1. *Як Э. Хемінгуэй пачынае знаёмства чытачоў з месцам дзеяння і героямі твора?*

2. *У чым адметнасць экспазіцыі аповесці?*

3. *Што з’яўляецца завязкай сюжэтнага дзеяння?*

4. *Вызначце і выразна прачытайце кульмінацыйную сцэну твора.*

5. *Прасачыце, як змяняецца мастацкі рытм апавядання. Якая сцэна выступае развязкай сюжэтнага дзеяння?*

Настаўнік дапаможа вучням у вызначэнні асаблівасцей кампазіцыі, адзначыўшы, што экспазіцыйнай частцы характэрны нетаропкі рытм аповеду пра адносіны паміж рыбакамі ў маленькім селішчы, пра сяброўства Санцьяга з Маналінам, апісан-

не мора і яго насельнікаў. Напружанасць рытму адпавядае завязцы дзеяння, калі незвычайная рыба схапіла прынаду. У кульмінацыйнай сцэне забойства велізарнай рыбы рытм становіцца таропкім, што звязана з імгненнымі зменамі падзей. Напружанне сюжэта ўзмацняецца ў час змагання старога рыбака з акуламі, калі зноў паўстае пытанне: хто каго? У апошніх эпізодах твора, пасля развязкі, Санцьяга вяртаецца да звыклага жыцця, і рытм, як і ў экспазіцыі аповесці, робіцца запаволеным.

Вучням можна прапанаваць: *Падрыхтуйце творчы пераказ ад імя Маналіна і дамысліце будучы лёс хлопчыка, але абавязкова з апораю на тэкст.*

Мэтазгодным пераходам да аналізу аповесці «Стары і мора» можа быць засяроджанне ўвагі вучняў на галоўнай думцы твора і спецыфіцы яе раскрыцця з развіццём сюжэта. Варта звярнуцца да хемінгуэеўскага афарызму, вынесенага ў эпіграф, і такім чынам падрыхтаваць вучняў да аналізу аповесці, а затым правесці яго па пытаннях, змешчаных у вучэбным дапаможніку (с. 86). Пасля прачытання вучнямі артыкула аналіз праводзіцца камбінаваным шляхам, які ўключае элементы павобразнага, «следам за аўтарам», праблемна-тэматычнага, кампазіцыйнага аналізу.

Цяжкасці могуць выклікаць абагульняльныя пытанні: *Раскрыйце сутнасць сфармуляванага Э. Хемінгуэем прынцыпу «айсберга» і акрэсліце пафас аповесці.* Айсберг — любімая метафара Э. Хемінгуэя для азначэння свайго метаду. Аўтар меў на ўвазе, што, рэальна ведаючы сваю тэму, пісьменнік можа скараціць любы фрагмент тэксту без страты для агульнай эмацыянальнай праўды ўражання. Асабліва гэта датычыцца правільна пабудаваных сюжэтаў, падрабязных апісанняў, традыцыйнага псіхалагізму (тлумачэнне ўчынкаў Санцьяга праз унутраны маналог). Хлопчык і Санцьяга размаўляюць пра зусім пабытавыя рэчы: вячэру, сеткі, мясцовых бейсбалістаў, латарэю і г. д. Але на самай справе вячэры і сетак няма. Аднак кожны з іх, гаворачы пра неіснуючае, робіць выгляд, нібыта яно ёсць. Размова пра латарэю таксама нясе важную сэнсавую нагрузку. Латарэя ўвасабляе ўдачу і звязваецца з надзеяй на лепшую будучыню. У гэтых двух беднякоў ёсць спадзяванне на пазбаўленне ад галечы, на тое, што будзе лепш, што будзе і

вячэра, і сетка, і ўсё неабходнае. Перад намі літаратурны прыём падтэксту, ці «падводнага цячэння», які Э. Хемінгуэй і назваў прынцыпам «айсберга». Калі б пісьменніку прыйшлося апісваць усё, што ён ведаў пра мора і рыбакоў, твор расцягнуўся б на тысячы старонак. Э. Хемінгуэй усё гэта апусціў, але тое, што ён ведаў, склала падводную частку «айсберга». У амерыканскага пісьменніка падтэкст, падводная частка «айсберга», становіцца да такой ступені значным, што ўтварае другі надзвычай важны план аповеду, які не толькі не супадае з першым, але калі-нікалі нават нібыта процістаіць яму. Між тым падтэкст цесна звязаны з тэкстам: яго можна прачытаць толькі «скрозь» тэкст, з гэтай мэтай пэўным чынам — і пры тым вельмі дакладна — арганізаваны. Гэта і было наватарствам Э. Хемінгуэя: асаблівая двухпланавая структура прозы і эканомная, але добра распрацаваная сістэма выяўленчых сродкаў, якая дапамагала ствараць і тэкст і падтэкст і ўстанаўліваць складаную асацыятыўную сувязь паміж імі[1].

Пісьменнік прымушае чытача задумацца над пытаннямі, у чым сэнс жыцця чалавека і ў што яму верыць. Пафас аповесці ў тым, што жыццё складанае і шматграннае, але яно — вечнае выпрабаванне, у якім ёсць узлёты і падзенні, трыумфы і няўдачы, у ім ёсць месца руху і спакою, дню і ночы. *Раскрыйце сімвалічны сэнс назвы аповесці «Стары і мора»*. Назва аповесці — «Стары і мора» — сімвалічная: вобразы чалавека і першастыхіі — мора, узятыя ў непарыўным адзінстве. Санцьяга — адзін з найбольш «філасафічных» герояў Хемінгуэя — набывае сімвалічную маштабнасць, увасабляе процістаянне і адначасова суіснаванне чалавека і прыроднай стыхіі. Магчыма, хтосьці з адзінаццацікласнікаў палічыць Санцьяга пераможаным. Настаўніку не варта рашуча пярэчыць: кожны мае права на ўласнае меркаванне. Але ён павінен аргументавана падвесці клас да думкі, што Санцьяга застаецца маральна непераможаным. Вучням рэкамендуецца знайсці і зачытаць словы старога рыбака, якія пацвярджаюць сказанае («Хто ж цябе перамог, стары?.. — Ніхто, — адказаў ён. — Проста я занадта далёка зайшоў у мора»).

---

[1] *Денисова, Т.* Секрет «айсберга» / Т. Денисова // Литературная учеба. — 1980. — № 5. — С. 202—207.

У заключэнне варта звярнуцца да эпіграфа: цяпер словы Э. Хемінгуэя будуць для вучняў напоўнены канкрэтным сэнсам. Пажадана, каб адзінаццацікласнікі знаходзілі аргументы не толькі ў творы, але і ў іншых крыніцах, у рэальным жыцці.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць адказ на пытанне: *У чым ісціна, філасофія, раскрытыя ў аповесці «Стары і мора»?* Прачытаць апавяданне М. Стральцова «Сена на асфальце».

## МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ

### УРОК 1.

### Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Аналіз апавядання «Сена на асфальце»

Урок кампазіцыйна будзе складацца з дзвюх частак: лекцыі настаўніка пра жыццё і творчасць празаіка і эўрыстычнай гутаркі пра апавяданне «Сена на асфальце» па пытаннях падручніка і дадатковых.

Расказваючы пра жыццё і творчасць М. Стральцова, настаўніку важна спыніцца на наступных момантах.

Па-першае, Міхась Лявонавіч Стральцоў — прадстаўнік пасляваеннага (ці філалагічнага) пакалення, якое дзіцячымі вачыма бачыла вайну, яе жахі, выжывала ў невыносных умовах. Таму гэтае пакаленне яшчэ называюць «дзецьмі вайны». У П. Панчанкі так называецца верш, у якім пішацца, што ў абстаноўцы міру і спакою «дзецям вайны» «здаецца самалётам першы бусел». Філалагічнае пакаленне прадстаўлена такімі постацямі, як Н. Гілевіч, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, В. Казько, І. Пташнікаў і інш. Па-другое, трэба засяродзіць увагу вучняў на маштабнасці і шматграннасці таленту пісьменніка. Яго дэбютам стаў зборнік апавяданняў з узнёслай, лірычнай назвай «Блакітны вецер» (1962 г.) пра жыццё вёскі, родную прыроду, светлае і шчырае каханне. Апавяданні «Трыпціх», «Дома» і іншыя характарызаваліся шчырасцю пачуццяў маладых людзей, у іх паказаных, — дзяцей вёскі, якім нялёгка «ўрастаць» у горад, прымірыцца з тым, што ў мінулае адыходзіць

грукат падводаў на асфальце, а гарадская цывілізацыя адмоўна ўплывае на людзей, вядзе да страты імі роднага карэння, сувязі з зямлёй. Голас сына вёскі — гуманіста, патрыёта, змагара за чысціню чалавечых адносін — гучыць і ў шматлікіх зборніках прозы: «Сена на асфальце» (1966 г.), «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970 г.), «Падарожжа за горад» (1986 г.) і інш. М. Стральцоў быў выдатным паэтам, крытыкам і эсэістам. Можна прапанаваць праслухаць адзін з яго вершаў у выкананні вучня і даць яму агульную ацэнку.

Вынікі гэтай часткі ўрока можна падвесці па пытаннях вучэбнага дапаможніка (с. 89). На першае пытанне — *З якімі творамі М. Стральцова вы знаёміліся ў папярэдніх класах? Пра што ў іх апавядаецца?* — адназначнага адказу не будзе, бо толькі ў VIII і X класах раіцца чытаць яго творы ў спісе «Для пазакласнага чытання».

Другое заданне — *Вызначце асаблівасці і тэматычны дыяпазон апавяданняў М. Стральцова* — патрабуе наступнага адказу: «Самай галоўнай тэмай у творчасці М. Стральцова і многіх яго равеснікаў з'яўляецца тэма вёскі і горада, духоўнай сувязі паміж імі, якая можа быць у любы момант парушана. З гэтай прычыны вынікае элегізм (сум, шкадаванне) многіх твораў прадстаўнікоў філалагічнага пакалення, і галоўным героем іх становіцца інтэлігент у першым калене (якога амаль стагоддзе таму паказаў у кнізе "Рунь" М. Гарэцкі), які адчувае сябе няўтульна ў горадзе. Да гэтай асноўнай тэмы дастасоўваюцца тэмы маральна-этычныя, вечныя. Тэма кахання раскрываецца ў многіх творах, у тым ліку ў апавяданні "Сена на асфальце". У маральна-этычны план пераводзіцца тэма пасляваеннага жыцця ў апавяданні "На чацвёртым годзе вайны" — праз побытавую сцэну пакарання хлопчыка бабуляй раскрываецца праблема дабрыні, якая перамагае ў экстрэмальных умовах. Такім чынам, тэматыка прозы М. Стральцова надзвычай шырокая і вынікае з абставін пасляваеннага жыцця, калі краіна ўзнялася з руін, але раны, нанесеныя вайной, не загаіліся поўнасцю».

Трэцяе пытанне — *Якімі асаблівасцямі лірычная проза адрозніваецца ад эпічнай? Хто акрамя М. Стральцова пісаў лірычную прозу?* — мае тэарэтычную «падсветку». Настаўнік зазначыць, што літаратура традыцыйна складалася з трох родаў:

апавядальнага (эпас), спавядальнага (лірыка) і драматургічнага (драма). Мастацкая практыка часта пярэчыць зададзенасці, таму лірычны (спавядальны) пачатак спалучаецца з апавядальным (падзейным, апісальным), апавядальны з драматургічным, і атрымліваецца мастацтва сінтэтычнае — ліра-эпічнае, эпіка-драматургічнае. Лірычная хваля літаральна захліснула прозу пачатку 1960-х гадоў, бо ў той час людзі спадзяваліся на хуткія змены, станавіліся рамантыкамі. У прозе М. Стральцова героі — маладыя людзі — летуценнікі, сумленныя і даверлівыя людзі, глядзяць на свет адкрытымі вачыма, вераць у будучыню, ідэалісты. Яны ўлюбёныя ў прыроду, у сваю малую радзіму, вёску, дзе нарадзіліся. А каханне для іх — святое і чыстае.

Такімі ж рамантыкамі — лірыкамі ў прозе — былі У. Караткевіч, І. Пташнікаў, равеснікі М. Стральцова І. Чыгрынаў, Б. Сачанка. Лірызм — асноўная рыса празаічнай творчасці І. Навуменкі.

Другую частку ўрока — аналіз апавядання «Сена на асфальце» — лепш за ўсё правесці ў форме эўрыстычнай гутаркі па пытаннях вучэбнага дапаможніка (с. 94) і дадатковых, якія могуць узнікнуць пры разглядзе твора.

Адказ на першае пытанне (с. 94) — *Якія рысы характарызуюць галоўнага героя? Якая яго асноўная мара?* — можа быць прыкладна такі: «Галоўны герой апавядання Віктар — рамантык, летуценнік, сын вёскі, які — і гэта яго галоўная мара — хоча прымірыць горад і вёску, паяднаць “месяц над хатай” і “электрычны ліхтар”. На падобную думку яго навяло жыццё, сустрэчы з дзядзькам Ігнатам: “Мне хацелася даўно прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была мая самая патаемная і самая душэўная думка”. Віктар добры, мяккі характарам, здольны па-сапраўднаму кахаць. Ён памятае пра сваё вясковае паходжанне, свае былыя заняткі, і таму з ахвотай абкошвае разам з дзядзькам Ігнатам газон на гарадской плошчы. Гэты чалавек — рамантык у душы, адкрыты бедам і радасцям іншых людзей. Некалькі меншае месца ў апавяданні адведзена дзядзьку Ігнату — былому вяскоўцу, які перажыў пасляваенную нішчымніцу, пабачыў несправядлівасць. У раздзеле “Дзядзька Ігнат” той спавядаецца Віктару, што быў брыгадзірам, пабачыў людскога гора — удовы “карову ставілі ў плуг”, вымольвалі каня

ў начальнікаў, “што на людскім горы падчаровак гадавалі”. Некалі ён заступіўся за адну з такіх удоў — суседку Арыну — перад фінінспектарам-п’яніцам “Куфрам”. Дзядзька Ігнат вучыць дабру і любві да родных каранёў Віктара».

Паводле другога пытання патрабуецца скласці цытатную характарыстыку Віктара. Яна можа выглядаць наступным чынам: 1. «Я ведаю, што без вёскі нельга, але і без горада нельга таксама. Што я думаю, дык гэта — каб тое і другое ў чалавечай душы прымірыць». 2. «Але твой бацька не загінуў, ён вярнуўся: памятаеш, ты саромеўся казаць мне, што ён быў у палоне. Ты не мог дараваць яму гэта, і, навошта таіць, не мог дараваць і я». 3. «Давай жа цяпер, дружа, паклонімся невядомай магіле майго бацькі, і камень той, кінуты на пакутную дарогу бацькі твайго, давай падбяром таксама. Ні мой, ні твой бацька не вінаватыя перад часам і перад вайной». 4. «Не ведаю, як можна назваць гэтую пастаянную напружанасць душы, гэты парыў да самаахвярнасці, да радасці і нават да тугі». 5. «Да глыбіні душы абражалі нас несправядлівасць, падман і няшчырасць». 6. «Патроху ды памалу вучыліся мы ва ўсім пакладацца на саміх сябе». 7. «...бо там, дзе душы кранаецца вечнасць, не існуе мяжы паміж жыццём і смерцю». 8. «О зямля! Ты даеш нам тугу па небе, але не меншая наша туга па табе. З далёкіх дарог вяртаемся мы да цябе, і спеў жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта». 9 «...кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі». 10. «Сена на асфальце, — узрадавана думаў я. — Вёска ў горадзе».

Трэцяе пытанне — *Што непакоіць дзядзьку Ігната? Як ён адносіцца да людзей?* — датычыцца чалавека, які не па сваёй ахвоце, а пад прымусам пакінуў вёску і з’ехаў у горад, а таму не можа (і не хоча!) заставацца ў чужым для яго асяроддзі. Таму настаўнік павінен улічваць гэты момант. Дзядзька Ігнат — абаронца людзей, іх дарадца (заступіўся за суседку, абараніў яе ад фінінспектара па мянушцы Куфар). Ён бароніць і Віктара ад адмоўнага ўплыву горада, цэніць яго за шчырасць, за любоў да вёскі, бачыць у ім — маладзейшым — свайго апанента. Яго непакоіць дэградацыя нораваў, безгаспадарчасць («А то во і вы пішаце, што як пілараму ў нас паставілі, дык многа лесу без пары і толку на глум ідзе...»). Ён востра адчувае, «што многія

беды ад таго, што да зямлі пашаны няма. Адпрацуе на трактары калыглуз які, што дзесяць класаў скончыў і ў калгасе стаж зарабляе, каб з вёскі ўцячы… і да дзявок. Яму хоць трава не расці». У людзях дзядзька Ігнат цэніць дабрыню і чалавечнасць.

Адказ на чацвёртае пытанне — *У чым заключаецца адметнасць кампазіцыі апавядання?* — дадзены ў вучэбным дапаможніку. Трэба падкрэсліць, што яно складаецца з некалькіх частак — эцюдаў, лістоў, апавядальных гісторый, што дае магчымасць аўтару раскрыць характары розных герояў: летуценніцы і мяккай натуры Лены — «Ліст першы»; чалавека, які пастаянна дакарае сябе, што пакінуў вёску, — аповед «Дзядзька Ігнат»; рамантыка і летуценніка Віктара — «Ліст другі»; роздумы Віктара над сэнсам жыцця — аповед «Заўтра футбол»; настрой дзядзькі Ігната, які думае пра вяртанне ў вёску, — «Ліст трэці»; рамантыку працы, улюбёнасць у яе Ігната і Віктара.

На пятае пытанне — *Якая асноўная ідэя апавядання? Ці выяўляецца яна ў загалоўку твора?* — можа быць лаканічны адказ: «Асноўная ідэя апавядання — ухваленне дзеянняў сумленных людзей, вера ў вясковую мараль, заклік да яднання пакаленняў. Адсюль і назва твора — “Сена на асфальце”, якая нібы пацвярджае жаданне Віктара “прымірыць горад і вёску ў сваёй душы”». Пры больш разгорнутай размове вучні могуць адзначыць, што здаўна вёска была эталонам дабрыні і шчырасці. Менавіта ў вёсцы выпрацоўвалася мараль, этыка чалавечых паводзін. Нехта заўважыць, што сучасная вёска вымірае, страчваюцца многія традыцыі.

❐ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць адказ на пытанне: *Якія пазітыўныя якасці нясе людзям гарадская цывілізацыя?* Прачытаць апавяданне «На чацвёртым годзе вайны».

## УРОК 2.

### Аналіз апавядання «На чацвёртым годзе вайны». Унутраны маналог

Аналіз апавядання варта пачаць з расшыфроўкі эпіграфа — радкоў верша рускага паэта К. Случэўскага: «И капля вод полна трагедий / И неизбежности полна». Эпіграф адлюстроўвае аўтарскую задуму — падкрэсліць ісціну, што эпізод з хлебам, які

адбыўся ў сям'і ў галоднае ліхалецце, адлюстроўвае агульную трагедыю народа, які перажывае пасляваенныя нястачы, выжывае ў нечалавечых умовах. Варта падкрэсліць у самым пачатку, што апавяданне сюжэтнае, строга рэалістычнае ў паказе і абставін («пуставата на градах», «трухляе ў хаты ніжні вянец», хлеб з бульбы і ячменных шароек), і знешняга выгляду людзей (бабуля — «высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам», які да таго ж «спустошаны і нейкі пакутліва нямы»), і хатняй жывёлы («худы, як дошка, парсюк»), і паводзін свекрыві, нявесткі і малога, якія кожны па-свойму перажываюць сямейную драму: бабулька адсцябала матузамі ўнука, які «паабшчапаў» дачасна акрайчык хлеба.

Адказ на першае пытанне вучэбнага дапаможніка (с. 97) — *Які перыяд жыцця народа паказаны ў апавяданні?* — вучні дадуць, хутчэй за ўсё, такі: «Падзеі адбываюцца ў 1944 годзе, калі Беларусь была амаль вызвалена ад фашыстаў. Усё было разбурана — і гарады, і вёскі. Многія воіны загінулі. Людзі галадалі. Тое, што паказана ў апавяданні, напэўна, перажыў і сам аўтар, бо так дакладна, выразна паказана трагічная карціна жыцця».

Другое пытанне-заданне — *Перакажыце сюжэт апавядання. Што страцілася ў вашым пераказе?* — патрабуе аналітычнага падыходу да з'яў, самастойнасці мыслення ад вучняў. Сюжэт апавядання просты. Бабуля адсцябала матузамі ўнука за тое, што ён абгрыз кавалак хлеба, не дачакаўся вячэры. Той схаваўся спачатку, роспачны, у алешніку паблізу хаты, зрабіў з яго будан і заснуў, і адсюль яго, амаль непрытомнага, занеслі ў хату, паклалі на ложак. Ачуняў хлопчык ад матчынага плачу па ім, затым пачуў, што маці і бабуля разам галосяць па яго бацьку, які загінуў на фронце, і пачаў іх супакойваць, абяцаць, што не будзе больш чапаць хлеба, адпомсціць за крыўду сыну паліцая Зміцера Васілю. У такім пераказе губляюцца дэталі, спрашчаецца дзеянне, знікаюць перажыванні герояў, іх роздумы, аўтарскія каментарыі. Застаецца толькі невялікая дакументальная фіксацыя падзей.

Трэцяе заданне — *Ахарактарызуйце герояў апавядання* — лепш за ўсё можна выканаць, склаўшы цытатныя планы характарыстык бабулі, маці і хлопчыка ў выглядзе табліцы:

| Герой | Рыса характару | Цытата |
|---|---|---|
| Маці | Добрая, здольная ацэньваць свае ўчынкі | «Усё бачыла... і ў яе тады перавярнулася ўсё нутро, і яна падумала, што і сама часам гэтак жа сцябала малога, і цяпер пашкадавала, што рабіла гэтак» |
| | Працалюбівая | «Ёй хацелася забыцца ў рабоце, і яна, не разгінаючыся, круціла цяжкі скрыгатлівы круг» |
| | Цвяроза ацэньвае жыццё, рыхтуецца да выпрабаванняў, моцная духам | «А можа, і добра, што сын не помніць бацьку: так будзе лепш яму, але ж затое колькі ёй трэба трывання, жорсткасці да сябе і да людзей, каб паставіць сябе ў жыцці, каб не даць у крыўду сябе і сына» |
| | Умее чуць боль сына, другіх людзей | «А сыночак мой, а сіраціначка мая, — жалілася маці, — ніхто цябе не пашкадуе, ніхто цябе не абароніць» |
| | Сэрцам успрымае падзеі, сардэчная, умее даравацъ людзям іх жорсткія ўчынкі | «Яны (маці і бабуля. — *І. Г.*) стаялі, як ніколі блізкія адна адной, падтрымлівалі адна адну за плечы і ціха плакалі — ужо не столькі ад гора, колькі ад гэтай роднасці адна адной» |
| Бабуля | Знясіленая працай, хворая | «Высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам»; «свякроўчын твар — спустошаны і нейкі пакутліва нямы» |
| | Жыве трывогай пра мінулы і сёняшні дзень | «...трывога жыве ў ёй, як у грудзях застарэлы кашаль» |
| | Асуджае сябе за жорсткасць, у душы — добрая, у дзеяннях — строгая праз меру | «...перад вачамі паўстаў малы, тое, як кідаўся ён па хаце, бездапаможна ўгнуўшы ў плечы шэрую, стрыжаную пад нажніцы галаву. Яна бачыла ўсё гэта так выразна, і нічога ўжо на свеце не існавала для яе, акрамя гэтай безабароннай, беднай, няўмела |

| Герой | Рыса характару | Цытата |
|---|---|---|
| | | пастрыжанай галавы. І яна шкадавала ўнука, шкадавала, што некалі, даўно, адсцябала гэтак жа матузамі сына, забітага цяпер на вайне...» |
| | Сентыментальная, як і нявестка | «...старая плача пра тое, пра што плача і яна (нявестка. — *І. Г.*)» |
| Малы | Крыўдлівы і помслівы | «...нейкая помслівая асалода трымала яго ў кустах» |
| | Дзіцячы максімалізм | «...колькі разоў пачынаў думаць пра свае ўцёкі з вёскі, надоўга, назусім...» |
| | Жаданне быць самастойным, дарослым | «Ён адчуваў сябе моцным і адзінокім, і гэта было прыемна яму» |
| | Любіць ласку, па-дзіцячы бездапаможны | «Была нястрашная, вялікая і добрая гэтая рука, і ён заплюшчыў вочы і, сцішыўшыся, так ляжаў — паспакайнелы...» |
| | Ранняе сталенне, думае па-дарослому | «...трэба браць на свае плечы недзіцячы цяжар» |

Пры адказе на чацвёртае пытанне — *Якую ролю ў апавяданні адыгрываюць унутраныя маналогі?* — настаўнік павінен скіраваць увагу вучняў на тое, што аўтар пабудаваў апавяданне поўнасцю на ўнутраных маналогах герояў і тым самым перадаў драматычныя перажыванні ўдзельнікаў сямейнага (часовага) непаразумення і прымірэння. Перажывае бабуля, што пакрыўдзіла ўнука («і вось цяпер ёй балюча было ад таго, што ніколі ўжо не скажа сыну, што нізавошта пабіла яго тады, — і ёй ужо здавалася, што ў сынавай смерці вінаватая і яна і што няўцешная і горкая будзе цяпер яе старасць»). Не менш перажывае і яе нявестка, больш шкадуючы, чым асуджаючы, старую, думаючы пра забітага мужа, пра непрактычнасць свёкра, пра тое, што цяпер у кожнай хаце хапае свайго гора. Марыць уцячы з дому, але перад тым адпомсціць сыну паліцая за крыўду малы. Аўтар толькі апісвае абмежаваныя ў часе і

прасторы дзеянні герояў і каментуе іх думкі. Апавяданне рэалістычнае і глыбока псіхалагічнае.

❒ **Дамашняе заданне:** пазнаёміцца з артыкулам у вучэбным дапаможніку, прысвечаным жыццёваму і творчаму шляху Н. Гілевіча (с. 99—106).

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

### УРОК 1.

### «Паклон табе, мой беларускі краю!» Жыццёвы і творчы шлях Ніла Гілевіча. Вывучэнне лірыкі

Каб зацікавіць клас асобай мастака слова, варта выкарыстаць літаратурны мантаж. На ўроках такога тыпу ў пэўнай паслядоўнасці павінны гучаць вершы паэта, урыўкі з навукова-папулярнай літаратуры, часам уключаюцца музыкальныя творы. Пачаць можна з выразнага чытання загадзя падрыхтаваным вучнем верша Н. Гілевіча «І ўсё-такі дойдзем» (1992 г.). Настаўнік, які выступае ў ролі вядучага, пакажа партрэт пісьменніка і скажа, што літаратурна-мастацкі часопіс «Дзеяслоў» (№ 21—26 за 2006—2007 гг.) змясціў успаміны Н. Гілевіча пад назвай «Між роспаччу і надзеяй. Абрыс пройдзенага шляху ў святле адной мары». Болем і пакутай напоўнена прызнанне Ніла Сымонавіча, які на схіле гадоў вымушаны канстатаваць: «Між роспаччу і надзеяй пражыў усё сваё свядомае жыццё — ад маладосці да старасці. Між роспаччу і надзеяй жыву, дажываю і сёння. І роспачы, на вялікі жаль, усё больш і больш. Але надзея застаецца».

Настаўнік актуалізуе веды вучняў, набытыя самастойна: *Дома вы пазнаёміліся з кароткімі звесткамі пра жыццё і творчасць Н. Гілевіча. Паспрабуем акрэсліць запаветную мару паэта. У чым заключаецца сэнс яго жыцця і творчасці?* Затым можна высветліць асобаснае стаўленне адзінаццацікласнікаў да праблемы пошукаў беларусамі Беларусі: *Што дало падставы Нілу Сымонавічу пісаць: «Дзе ж яна, гэта мая Беларусь? Не бачу. Не чую. Не ўдыхаю з паветрам. Не пазнаю навобмацак.*

*Няма яшчэ маёй Беларусі, няма. Той, якая і сніцца, і мроіцца з далёкіх маладых гадоў...»?*

Далей настаўнік просіць аднаго з вучняў акрэсліць асноўныя кірункі шматвектарнай творчасці Н. Гілевіча (паэт, публіцыст, перакладчык, фалькларыст, сатырык, драматург, асветнік, грамадскі дзеяч): *Хто і што паўплывала на фарміраванне светапогляду будучага пісьменніка? Назавіце асноўныя этапы і матывы яго творчасці.*

Пасля гутаркі па актуалізацыі ведаў загадзя падрыхтаваны вучань выразна прачытае радкі:

«З чаго пачынаецца пісьменнік? Як у звычайным хлапчуку зараджаецца мастак? Я. Брыль адзначае два этапы гэтага працэсу: спачатку — захапленне прыгажосцю жыцця, затым — радаснае і адначасова пакутлівае жаданне выказаць свае пачуцці, перадаць сваё іншым. Напэўна, не абмінуў гэтай схемы і Н. Гілевіч. На пытанне карэспандэнта, зададзенае ўжо сталаму майстру, калі б з'явілася магчымасць вярнуцца на момант у дзяцінства, якое б месца выбралі: сад, хату, вуліцу або лес, Ніл Сымонавіч з упэўненасцю адказвае: "Не сад, не хату, не вуліцу, не лес, а — поле! Навакольнае поле — з пагоркамі і лагчынамі, з гаямі і сасоннікамі, з кустоўем на касагорах, з крушнямі камення на ўзмежках, з жоўтымі нівамі жыта і бялёсымі гонамі аўса, з блакітнымі разлівамі лёну, з белымі азярынамі грэчкі, з укрытымі ружовым і бэзавым цветам прасцягамі бульбы… Перад заходам сонца я стаяў, як зачараваны, на гумне і слухаў шырокі тужлівы спеў, што далятаў у вёску з поля, з-пад Краснай Горкі. Гэта, канчаючы цяжкі прыпарны дзень, спявалі жнеі, нашы слабодскія жанчыны. Спявалі старажытныя жніўныя песні.

Незабыўныя і непаўторныя хвіліны! О, каб можна было туды — у той адвячорак, у тое сугалоссе цішыні і напеву — вярнуцца хоць на імгненне! Як гэта кажуць — дорага заплаціў бы. Ну, але дзякаваць Богу і за тое, што яны былі, тыя хвіліны. Можа, і ў астатні свой дзень прыгадаю менавіта іх, і ўбачу тое жніво на полі, пад Краснай Горкай, і пачую тыя несмяротныя песні"».

Гучыць мелодыя песні «Вы шуміце, шуміце нада мною бярозы…».

Вядучы-настаўнік кажа, што вершы, прапанаваныя праграмай для вывучэння, напісаны ў 70-я гады мінулага стагоддзя.

Далей вучань чытае верш «Калі я жыў», у якім сам паэт характарызуе сваю эпоху:

О, невясёлыя гады
Майго жыцця!
Я жыў тады,
Калі вучылі ў мове рускай
У нас і горад, і сяло,
І на ангельскай, на французскай,
І на іспанскай — аж гуло,
На выкапнёвай старапрускай,
На мове інкаў і этрускаў
Таксама хораша ішло,
І толькі роднай беларускай
У школах месца не было.
Ну, а калі не вучыць школа
І гоніць мову за парог —
То як жа ёй гучаць наўкола,
Ды так, каб свет прывеціць мог?

Далей можна прапанаваць загадзя падрыхтаваным вучням выразна прачытаць вершы «Ах, якая над Гайнай купальская ноч» (1970 г.), «Святочны, старажытны дух калядны» (1974 г.). Класу прапаноўваецца заданне: *Паразважайце над праблемай: «Традыцыі майго народа, традыцыі маёй сям'і, мае традыцыі».*

Абагульняючы сказанае вучнямі, настаўнік можа прачытаць радкі яшчэ аднаго верша Н. Гілевіча, напісаныя ў 1970-я гады, якія даюць магчымасць адчуць шматграннасць мастакоўскага таленту паэта-лірыка, паэта-публіцыста, паэта-сатырыка:

«Нашто трымацца так за памяць продкаў?!» —
Скрывіўся крытык, прачытаўшы вершы.
О, тонкі майстар каверзных папрокаў,
Схавай капусны храпак, што жуеш ты!
Паразумецца нам не ўдасца, мусіць:
Мяне — радзіла ў цяжкіх муках маці,
Цябе — гатовага знайшлі ў капусце:
Табе — даволі за качан трымацца.

Як сведчыць верш, тэматыка і праблематыка творчасці Н. Гілевіча не заўсёды адпавядала афіцыйнай ідэалогіі.

У 1970—80-я гады Н. Гілевіч шмат перакладае. Пераклады вершаў замежных пісьменнікаў давалі магчымасць адкрыта гаварыць пра актуальныя праблемы Бацькаўшчыны. Быццам да беларусаў звернуты словы славенскага паэта Франа Леўстыка:

Халуйства, здраднасць, слепата, бязволле,
грызня за костку з панскага застолля
і здольнасць, што нас з малпамі радніць:
сваё — аплёўваць, не сваё — хваліць, —
вось тое зло, што нас ператварыла
ў няшчасны люд, а не чужая сіла.

Вернасць маці, Радзіме, служэнне Бацькаўшчыне сталі сэнсам жыцця Н. Гілевіча. Верш-клятва «Паклон табе, мой беларускі краю...» гучыць шчыра і ўзнёсла, бо ў ім выяўлена сутнаснае ў душы Паэта і Грамадзяніна. Вучань чытае верш «Паклон табе, мой беларускі краю...».

На заключным этапе ўрока настаўнік скажа: «У 1996 годзе выйшла лірыка-публіцыстычная хроніка, кніга-анталогія паэта “Любоў прасветлая: Роздумы ў вершах і прозе аб роднай мове” з пазнакай: “Светлай памяці маці Кацярыны Мікалаеўны гэтую галоўную кнігу свайго жыцця прысвячаю”. Кніга гэтая стваралася на працягу 1947—1995 гадоў. Найбольшы плён гэтае працы прыпадае на 1980-я гады, калі, на думку Н. Гілевіча, гісторыя давала беларусам яшчэ адзін шанс сцвердзіць сябе як самастойны славянскі народ. Назва кнігі сімвалічная, яе сэнс раскрываецца вершам:

Калі ліхое насланнё
Душу мне мучыла
І за апірышча сваё
Прымаў я чучала,
Калі хацеў мяне хаўрус
Купіць падманкаю,
Каб быў я «тоже белорус»
З душой-балванкаю, —
Я голас маці ўчуў здалёк —
З-за вечнай цемрадзі:

«А ты любоў маю, сынок,
Пусці наперадзе.
Яна не дасць табе пайсці
Гнілою кладчынай...»
Так і ратуюся ў жыцці
Любоўю матчынай.

❐ **Дамашняе заданне:** прачытаць раман «Родныя дзеці» і тэарэтычныя звесткі «Раман у вершах як жанр» у вучэбным дапаможніку (с. 114).

## УРОК 2.

## «Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе». Вывучэнне раздзелаў рамана ў вершах Ніла Гілевіча «Родныя дзеці»

Урок можна пачаць з прапановы адзінаццацікласнікам паглядзець на рэпрадукцыю карціны Рэмбранта «Вяртанне блуднага сына» і згадаць змест прытчы пра блуднага сына. Пасля таго як нехта з вучняў перакажа змест прытчы, настаўнік пытае: *Чаму ж так узрадаваўся бацька вяртанню свайго малодшага сына? Чаго не мог зразумець яго старэйшы сын?* Вяртанне блуднага сына сведчыць аб яго духоўным перараджэнні. Бацька радуецца, бо цаной памылак і падзенняў сын нарэшце зразумеў ісціну. Шлях да яе быў складаным і доўгім, аднак тым даражэйшай з'яўляецца перамога. Па гэтай прычыне бацька наладжвае свята, бо спраўдзілася тое, на што ён спадзяваўся, любячы ўласнае дзіця.

Настаўнік просіць вучняў уявіць, якую мелодыю можна падабраць, каб перадаць тое, што ўвасоблена пры дапамозе фарбаў і слова. Напэўна, гэта будзе пяшчотна-ўзнёслая мелодыя, якая перадае радасць сустрэчы бацькі з сынам, а таксама ўвасабляе трыумф Веры, Надзеі, Любові.

Першыя строфы рамана «Родныя дзеці» былі напісаны Н. Гілевічам у 1972 годзе. Пісьменнік так тлумачыць прычыны, што абумовілі з'яўленне твора: «Сталася так, што 1970-я гады прынеслі мне многа горкіх стратаў. У лютым 1972-га памёр ад раку лёгкіх бацька Сымон Пятровіч. У красавіку 1976-га памёр

ад хваробы сэрца старэйшы на два гады брат Леў Сымонавіч. У жніўні 1978-га — пасля больш чым двух гадоў страшных пакут у поўным паралюшы, без мовы і ў нерухомасці — адышла ў іншы свет мама Кацярына Мікалаеўна. У студзені 1980-га памерла маладзейшая на тры гады сястра Ідзея Сымонаўна. Гэтыя асабістыя страты, што праходзілі праз сэрца адна за адной, прымусілі пільней паўзірацца ў мінулае — пройдзенае і перажытае, глыбей адчуць свой сыноўні і брацкі абавязак і сваю віну…»

*Хто з герояў рамана і чаму з'яўляецца «блудным сынам»?* «Аблудным сынам» называе аўтар свайго галоўнага героя Сцяпана Вячорку. Кампазітар шмат гадоў не быў дома, пакуль не атрымаў «пісьмо-павестку», у якой малодшы брат нагадваў аб тым, што ў маці юбілей.

*Чаму Сцяпан так доўга адкладваў паездку дамоў? Наколькі пераканальна гучыць яго ўласная матывацыя сваіх паводзін?* Сцяпан Якубавіч — вядомы ў краіне кампазітар, які жыве ў сталіцы, займае пасаду. Творчасць і праца забіраюць шмат энергіі і часу, кожны раз знаходзіцца прычына, якая перашкаджае паездцы. А яшчэ Вячорка пазбягае сустрэчы з Альжбетай, якую кахаў у маладосці.

*Якія жыццёвыя абставіны спрыялі аддаленню Сцяпана ад родных? Хто вінаваты ў тым, што разышліся дарогі закаханых?* Як і многія вяскоўцы, Вячорка паехаў у горад вучыцца. Юнаку пашанцавала, ён стаў студэнтам. Сцяпан гадаваўся ў шматдзетнай сям'і, таму не мог разлічваць на вялікую матэрыяльную падтрымку бацькоў-калгаснікаў, часта галадаў.

Каханне, што нарадзілася ў душах маладых, стала шчасцем, дарункам лёсу, яно ж з'явілася і прычынай бяды. Сарамяжлівасць, замкнутасць натуры Сцяпана не дазволіла пакрыўджанаму юнаку шукаць падтрымкі ў сяброў, каханай, родных. Крыўда, расчараванне ў людзях, жаданне пачаць новае жыццё прывялі Вячорку на цаліну, аддалілі ад радзімы. Сцяпан доўга не мог пазбавіцца ад адчування ганьбы і гора. Напэўна, баючыся вярэдзіць раны, Вячорка вырашыў прадоўжыць вучобу не ў Мінску, а ў Маскве, тым самым працягваючы сваю адлучанасць ад радзімы і блізкіх.

Сцяпану пашанцавала, яго жонкай стала масквічка. *Чаму ж Сцяпан вярнуўся ў Мінск? Як гэты ўчынак характарызуе галоўнага героя рамана?*

Бог узнагародзіў Вячорку талентам кампазітара, і перад Сцяпанам паўстала праблема выбару:

Ці ты музы́ка з ласкі божай
І для цябе твой дар — твой крыж,
Ці дзеля сытасці і грошай
Людзей забаўкамі чмурыш?

Калі б Сцяпан выбраў апошняе (як гэтага прагла яго жонка), то жыццё ў Маскве толькі б спрыяла дасягненню мэты. Але Сцяпана не задавальняла рамесніцтва, ён хацеў сцвердзіцца як мастак, таму і вярнуўся на радзіму, хоць Фенечка і не падзяляла яго поглядаў.

*Якім вяртаецца Сцяпан Вячорка ў бацькоўскі кут? Ахарактарызуйце галоўнага героя.* Дамоў вяртаецца сталы мужчына, якога не песціла жыццё. Духоўная сіла Вячоркі загартавалася няўдачамі з першым каханнем, з жаніцьбай, пошукамі ўласнага мастакоўскага почырку. Вяртаецца дамоў сын, крыху расчараваны ў жыцці, бо адчувае, што ў грамадстве цэняцца не чалавечыя і мастакоўскія якасці асобы, а здольнасць прыстасоўвацца пад начальства.

*Чым уразіла Сцяпана сустрэча са сваёй малой радзімай? Каго кампазітар лічыць вінаватым у бядзе роднай зямлі? Ці падзяляеце вы яго пазіцыю?* Болем напаўняецца душа галоўнага героя, калі ён бачыць, як знявечыла твар радзімы бяздумна праведзеная меліярацыя. У размове з аднавяскоўцамі Сцяпан абвінавачвае землякоў у тым, што не змаглі абараніць прыроду. Тамаш не падзяляе яго пазіцыю. Сваімі словамі Тамаш нагадвае брату, вядомаму кампазітару, у якога ёсць доступ у высокія кабінеты, што мала быць проста сумленным чалавекам, неабходна быць яшчэ грамадзянінам, здольным адстойваць уласныя перакананні.

*Як рэагуе Сцяпан Вячорка на сустрэчу з Альжбетай? Ацаніце паводзіны кампазітара.* Рэальнасць аказалася празаічна-сумнай, бо ў пажылой, спрацаванай жанчыне кампазітар не знайшоў: «Амаль нічога — ані следу / Ад той дзяўчынкі, з той

вясны». Паводзіны Вячоркі эгаістычныя, бо, заняты аналізам уласных пачуццяў, Сцяпан зусім не задумваецца, што творыцца ў душы Альжбеты. Дэманструючы беззваротнасць мінулага, Сцяпан на вачах у Альжбеты спрабуе заляцацца да другой.

*Калі і чаму кампазітар пачуў у сваёй душы доўгачаканую мелодыю, што яна ўвасабляе ў творы?* З размовы з Тамашом Сцяпан даведаўся, што Альжбета ўсё яшчэ кахае яго і вельмі балюча перажывае памылку маладосці. Захапленне Тамаша настаўніцай, аповед пра яе пакуты і жыццёвую стойкасць прымусілі Сцяпана іншымі вачыма глянуць на Альжбету. Крыўда і раўнадушша змяняюцца спачуваннем. На гэты раз твар Альжбеты ўражвае Сцяпана не старасцю, а святасцю:

Што вельмі ўразіла перш-наперш —
Твар — незвычайнай белатой
І дзве рукі — ля сэрца накрыж, —
Як на іконе ў прасвятой.

Слёзы і сціпласць Альжбеты выбіваюць той грунт, на якім яшчэ нядаўна так цвёрда стаяў Вячорка. Нягледзячы на тое, што розум пакуль што не знаходзіць выйсця, душа Сцяпана адгукаецца музыкай:

Гучала мякка, задуменна
І ўся — праменіла святло.
Ад калыханкі нешта мела,
І штосьці ад гімна ў ёй было.

Мелодыя перадае пачуццё пяшчоты і спагады да Альжбеты, якое вярнулася ў сэрца Сцяпана. Гімнам адгукнулася яго душа на тое лепшае ў яго характары, якое брала верх над дробязнасцю і помслівасцю.

*Чаму вяртанне галоўнага героя можна лічыць блаславёным?* Праблему вяртання «аблуднага сына» Сцяпана Вячоркі можна лічыць цэнтральнай, аднак не самай галоўнай у рамане Н. Гілевіча «Родныя дзеці». Пісьменніка найбольш хвалюе праблема вяртання блудных дзяцей Беларусі, блудных дзяцей планеты Зямля.

*У чым бачыць Н. Гілевіч прычыну адчужэння дзяцей Беларусі, дзяцей планеты Зямля? Дзе вытокі нашага нацыянальнага*

*нігілізму і драпежніцкіх адносін да прыроды?* Прычына хаваецца ў тым, што большасць з нашых сучаснікаў страцілі вернасць той маральнай сістэме, якая спрыяе рэалізацыі чалавечага ў чалавеку. Мэтай жыцця для многіх стала спажывецтва. Аўтар сцвярджае, што бацыла спажывецтва ўзнікае на глебе бездухоўнасці, на глебе духоўнага і маральнага вакууму і адначасова сама нараджае вакуум дабра, сумленнасці, чалавечнасці вакол сябе.

Можна папрасіць адзінаццацікласнікаў яшчэ раз перагарнуць старонкі рамана, выбраць тыя радкі, якія прысвечаны праблеме спажывецтва, і паспрабаваць даць характарыстыку філасофіі спажыўца.

На заключным этапе ўрока настаўнік паказвае вучням рэпрадукцыю карціны рускага мастака І. Глазунова «Вяртанне блуднага сына» (1977 г.) і просіць ахарактарызаваць яе ідэйны змест, параўнаць яго з пафасам рамана Н. Гілевіча «Родныя дзеці».

❐ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Твор Н. Гілевіча “Родныя дзеці” як узор рамана ў вершах»; прачытаць апавяданне І. Чыгрынава «У ціхім тумане».

# ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

## УРОК 1.

### Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Аналіз апавядання «У ціхім тумане»

Эпіграфам да ўрока могуць стаць словы самога пісьменніка: «Вайна — гэта заўсёды трагедыя для народа, а тым больш для асобных людзей...»

Урок пачынаецца з дэманстрацыі вучням партрэта пісьменніка і яго кніг. І. Чыгрынаў — адзін з шэрагу таленавітых беларускіх майстроў слова, якія прысвяцілі пераважную частку сваёй творчасці апісанню трагічных падзей Вялікай Айчыннай вайны, таму настаўнік можа пачаць з вылучэння спадчыны

пісьменніка сярод твораў іншых аўтараў. Дапамогуць гэта зрабіць словы беларускага літаратуразнаўцы У. Юрэвіча: «Падзеі ваенных гадоў неяк неўпрыкмет пачынаюць заставацца ў даволі аддаленым мінулым. Як-ніяк, а прайшло паўвека, як грымела, грукала, бясчынствавала Вялікая Айчынная вайна. ...Адзін з самых працавітых аратых на літаратурнай ніве Беларусі, Іван Чыгрынаў даволі рана заявіў аб сваім адметным таленце жывапісаць чалавека ў вайну і на вайне». Развіць думку можа выказванне пра І. Чыгрынава Д. Бугаёва ў кнізе «Шматграннасць»: «Ён досыць глыбока разбіраецца ў людзях, у іх псіхалогіі, умее бачыць не толькі не заўсёды спрыяльны ўплыў адпаведнага збегу абставін на чалавека, зразумець яго бяду, але і вызначыць яго асабістую віну, з-за якой часта набываюць асаблівую абвостранасць і без таго складаныя калізіі».

Затым настаўнік можа прывесці словы самога пісьменніка пра вайну ў яго біяграфіі: «У вайну хапіла ўсім — і дарослым, і дзецям... На вайну прыпала толькі тры няпоўныя гады майго жыцця, але якраз яна стала галоўнай падзеяй, якая вызначыла на доўгі час маю творчасць». Каб паказаць адданасць пісьменніка тэме вайны вучням дэманструецца схема.

**Творы І. Чыгрынава на тэму Вялікай Айчыннай вайны**

| Апавяданні | Раманы | П’есы |
|---|---|---|
| «Праз гады»<br>«Самы шчаслівы чалавек»<br>«Бульба»<br>«Ішоў на вайну чалавек»<br>«У ціхім тумане»<br>«За трэцім разам» і інш. | «Плач перапёлкі»<br>«Апраўданне крыві»<br>«Свае і чужынцы»<br>«Вяртанне да віны»<br>«Не ўсе мы згінем» | «Плач перапёлкі»<br>«Свае і чужыя» |

Таленавітае апісанне І. Чыгрынавым трагічных старонак барацьбы нашага народа з фашызмам было справядліва адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі і Літаратурнай прэміяй імя А. Фадзеева. Аб таленце гэтага пісьменніка гаворыць і той

факт, што па раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы» на кінастудыі «Беларусьфільм» рэжысёр І. Дабралюбаў зняў шматсерыйны тэлевізійны фільм «Плач перапёлкі».

Каб не звужаць творчасць пісьменніка да адной тэмы, неабходна адзначыць, што І. Чыгрынаў у сваіх творах звяртаўся да тэм сучаснасці (п'есы «Госці», «Хто вінаваты») і гістарычнага мінулага (п'есы «Следчая справа Вашчылы», «Чалавек з мядзведжым тварам», «Звон — не малітва», «Прымак», «Брат караля», «Ігракі», «Савіцкі»), ён быў адным з перакладчыкаў «Слова пра паход Ігаравы».

Для таго каб раскрыць фактары станаўлення творчай індывідуальнасці І. Чыгрынава, настаўнік звяртаецца да дзіцячых і юнацкіх гадоў пісьменніка. Каб эмацыянальна настроіць вучняў, можна працытаваць верш «Вялікі Бор». Гэты верш зямляк А. Пісьмянкоў прысвяціў калегу па творчасці і яго роднай вёсцы. Менавіта ў вёсцы Вялікі Бор 21 снежня 1934 года з'явіўся на свет будучы мастак слова.

Над Вялікім Борам —
Над палын-травой,
Над вялікім горам,
Над зямлёй сівой
Плача ў небе жораў.
Плач праносіць свой.

Пасля Чарнобыльскай трагедыі ў 1986 годзе малая радзіма І. Чыгрынава была атручана радыяцыяй. Гэта пакінула незагойную рану ў яго сэрцы. Такіх незагойных ран і ў біяграфіі народнага пісьменніка, і ў гісторыі нашага народа шмат. На долю Івана Гаўрылавіча выпала шмат выпрабаванняў: басаногае дзяцінства ў 1930-я гады, жахі ваеннага ліхалецця, няпростыя гады аднаўлення Беларусі ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі, боль за атручаную радыяцыяй зямлю. Гэта загартавала характар пісьменніка і сфарміравала яго як грамадзяніна.

Вучням неабходна давесці, што на фарміраванне лепшых чалавечых якасцей і гуманістычных ідэалаў І. Чыгрынава паўплывала сямейнае выхаванне (гадаваўся будучы пісьменнік у вялікай і руплівай сялянскай сям'і: бацька — старшыня сель-

савета, маці — звычайная працаўніца-калгасніца) і тое, што дзяцінства Івана, як і многіх пісьменнікаў філалагічнага пакалення, апаліла вайна.

Разглядаючы гады вучобы пісьменніка, настаўнік можа падкрэсліць, што школа, у якой вучыўся будучы мастак слова, дала краіне двух народных пісьменнікаў Беларусі — Аркадзя Куляшова і Івана Чыгрынава. «...Калі ў іншых школах літаратуру пазнавалі па кнігах безадносна да мясцовасці, дзе вучні нарадзіліся і жылі, дык мы, хто хадзіў у Саматэвіцкую школу, мелі магчымасць знаходзіцца сярод герояў куляшоўскіх кніг, сярод жывых герояў яго паэзіі», — успамінаў потым пісьменнік[1].

Неабходна адзначыць, што на станаўленне светапогляду будучага пісьменніка паўплывала вучоба на аддзяленні журналістыкі філфака БДУ, дзе яго аднакурснікамі былі І. Пташнікаў, В. Адамчык, М. Дземянкоўскі.

Для абагульнення вучнямі фактаў біяграфіі і творчасці І. Чыгрынава выкарыстоўваюцца пытанні вучэбнага дапаможніка (с. 117).

Другая частка ўрока прысвячаецца аналізу твора «У ціхім тумане», які мэтазгодна правесці камбінаваным шляхам.

На ўступным этапе настаўнік раскрывае творчую гісторыю апавядання і адзначае, што майстэрства пісьменніка выявілася ў нетрадыцыйнай інтэрпрэтацыі праблемы «чалавек і вайна».

На арыентацыйным этапе можна прапанаваць вучням параўнаць канцоўкі апавядання «Маці», дзе на просьбу Рэйдзіхі паказаць магілу сына Ганна катэгарычна адмовіла: «Ніхто вам не пакажа, цётка Матруна! Ні я, ні хто іншы...», і канчатковага варыянта твора пад назвай «У ціхім тумане», дзе жанчыне ўсё ж паказваюць, дзе пахаваны яе сын-паліцай. Гэта дазволіць высветліць, як вучні зразумелі асноўную ідэю апавядання.

Аналіз твора вядзецца па наступных пытаннях:

*1. Хто такая Рэйдзіха і як яе апісвае аўтар?*

*2. Што перажывае Рэйдзіха падчас наведвання вёскі Бароўка?*

---

[1] Успаміны пісьменніка можна знайсці ў кн.: *Чыгрынаў, І.* Збор твораў: у 6 т. / І. Чыгрынаў. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1995. — Т. 6.

*3. Якой была рэакцыя Ганны на з'яўленне Рэйдзіхі? Чаму?*

*4. У якой сям'і рос і выхоўваўся Якаў Рэйда?*

*5. Чаму Якаў Рэйда стаў здраднікам?*

*6. Ці вінавата Рэйдзіха, што яе сын стаў здраднікам?*

*7. Праз які вобраз і як у творы выяўляюцца аўтарскія гуманістычныя ідэі?*

Асаблівую ўвагу пры аналізе вобраза Рэйдзіхі неабходна звярнуць на партрэтную характарыстыку гераіні, бо менавіта праз яе аўтар перадае душэўную ўзрушанасць і глыбіню асабістай трагедыі маці здрадніка. Аналізуючы вобраз Якава Рэйды, вучні павінны найперш акрэсліць прычыну здрады і нялюдскіх паводзін чалавека. Высновы, да якіх павінны прыйсці адзінаццацікласнікі, можна знайсці ў тэксце вучэбнага дапаможніка. Настаўніку неабходна звярнуць увагу і на асаблівасці кампазіцыі апавядання. Аўтар будуе сюжэт на аснове ўспамінаў, тым самым ён даводзіць, што нават праз трыццаць год тыя трагічныя падзеі вярэдзяць душу чалавека і ў памяці людской яны застануцца назаўсёды.

На заключным этапе настаўнік можа звярнуцца да абмеркавання сэнсу назвы твора «У ціхім тумане», бо пісьменнік, як правіла, падкрэслівае загалоўкам найбольш глыбокую і важную думку. Для пачатку размовы прыводзяцца словы А. Марціновіча, які адзначыў перавагу канчатковай назвы: «І сапраўды, яна больш не тое, што дакладная, а выразная, я б сказаў, эмацыянальна напоўненая. Праз гэтыя звычайныя словы яскрава відаць паяднанасць чалавека з прыродай, з усёй яе вечнасцю і загадкавасцю». Далей можна прапанаваць вучням паразважаць, якая назва — «Маці» ці «У ціхім тумане» — больш адпавядае зместу твора.

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць інфармацыю пра жыццёвы і творчы шлях І. Чыгрынава ў вучэбным дапаможніку і адказаць на пытанні, змешчаныя ў канцы тэмы (с. 115—117, 122—126); прачытаць апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».

## УРОК 2.

### Аналіз апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы»

Эпіграфам урока настаўнік можа ўзяць словы К. Чорнага: «Чалавек — гэта цэлы свет». Адштурхоўваючыся ад гэтага тэзісу, пры падрыхтоўцы вучняў да ўспрымання апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» можна адзначыць, што І. Чыгрынаў у гэтым і іншых сваіх творах таленавіта, па-майстэрску паказваў адметны духоўны свет непрыкметных «маленькіх» людзей. Сярод людзей, якія жывуць побач з намі, нярэдка можна сустрэць дзівакоў, якіх не разумеюць, а нярэдка і крыўдзяць. Такі галоўны герой апавядання.

На арыентацыйным этапе можна выкарыстаць тэставае заданне.

1. Дзе адбываецца дзеянне твора?
   а) Лясныя Дачы;
   б) гарадок Залужжа;
   в) Вітунь.
2. Як звалі галоўнага героя?
   а) Дземідзёнак;
   б) Васіль Антонавіч;
   в) Дакуліха.
3. У каго на кватэры жыў герой?
   а) у Марыі Апанасаўны;
   б) у Дакуліхі;
   в) у Пятроўны.
4. Страту якога блізкага чалавека так цяжка перажываў стары ляснік?
   а) дачкі;
   б) жонкі;
   в) унучкі.
5. Каго купляў і выпускаў на волю Дземідзёнак?
   а) птушак;
   б) зайцоў;
   в) вожыкаў.
6. Дзе ён гэта рабіў?
   а) на Ганчарнай вуліцы;
   б) каля Мёртвага возера;
   в) на Зінкевічавым лузе.

7. Якія рысы характару дамінавалі ў Дземідзёнка?
   а) эгаізм, самалюбства, самаўпэўненасць;
   б) самаахвярнасць, гуманізм, маральная чысціня;
   в) прафесіяналізм, уменне выйсці з самых складаных сітуацый, любоў да зямлі.

8. Якія радкі апісваюць галоўнага героя апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы»?
   а) «Ён быў невысокага росту, згорблены, з белай бародкай і такімі ж белымі валасамі, што выбіваліся з-пад саламянага брыля. На незнаёмым была вылінялая сацінавая кашуля з манішкай, падпярэзаная поясам з кутасамі, а на рубчыкавых штанах віднелася некалькі невялікіх латак»;
   б) «Бывае, бегае вакол хаты, корпаецца то ў гародчыку, то двор падчышчае, ды і на вуліцы насупраць Дакуліхінай хаты не тое, што ля іншых, — чыста. ...Ветлівы ...Толькі чамусьці неразгаворлівы. Панурыцца і маўчыць»;
   в) «Штосьці прыгожае і непрыгожае адначасова было ў твары гэтага чалавека. У шэрых і крыху раскосых вачах... асабліва калі ён усміхаўся, загараліся хітраватыя іскрынкі. Але загараліся толькі на адзін кароткі міг».

Адказы: 1. б; 2. а; 3. б; 4. в; 5. а; 6. в; 7. б; 8. а, б.

Для аналізу апавядання можна абраць павобразны шлях, таму што ў цэнтры твора адзін яркі герой з выразнай псіхалагічнай характарыстыкай, на прыкладзе якога паказана тыповая мадэль паводзін чалавека-дзівака. Настаўнік задае вучням наступныя пытанні:

*1. Што мы можам сказаць пра характар Дземідзёнка па аўтарскім апісанні яго знешняга выгляду?*

*2. Чым адрозніваецца Дземідзёнак ад іншых гараджан?*

*3. Чаму людзі лічылі галоўнага героя дзіваком?*

*4. Якую трагедыю перажыў Дземідзёнак і як гэта паўплывала на яго характар?*

*5. Чаму Дземідзёнак купляў птушак і выпускаў іх на волю?*

*6. У чым заключаецца галоўная ідэя твора?*

Высновы, да якіх павінны прыйсці вучні, можна знайсці ў артыкуле вучэбнага дапаможніка.

Для падагульнення аналізу і высвятлення ступені засваення асноўнай ідэі твора вучнямі настаўнік прапаноўвае паразважаць над радкамі апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы»: «...Я хацеў памагчы чалавеку загаіць рану. І так няўмела ўзяўся за гэта. Лепш бы не брацца зусім. Бо не кожная рана паддаецца лекам. Асабліва калі на душы...». Вучні павінны прыйсці да высновы, што ў адносінах з людзьмі абавязкова павінна быць тактоўнасць і далікатнасць, таму што нават з добрымі намерамі — словам ці справаю — можна пакрыўдзіць чалавека, зрабіць яму балюча.

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць раздзел вучэбнага дапаможніка, прысвечаны аналізу апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» (с. 118—122); сінтэзуючы інфармацыю, атрыманую на папярэднім уроку, падрыхтаваць вуснае выказванне на тэму «Чалавек і вайна ў апавяданнях І. Чыгрынава»; прачытаць апавяданне І. Навуменкі «Сямнаццатай вясной».

## ІВАН НАВУМЕНКА

### УРОК 1.

### Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Аналіз апавядання «Сямнаццатай вясной»

Кампазіцыйна ўрок можа складацца з дзвюх частак: 1-я — лекцыя настаўніка пра асобныя (вызначальныя) старонкі біяграфіі пісьменніка, якая дапаўняецца вучнёўскім чытаннем невялікіх урыўкаў з яго «этапных» апавяданняў; 2-я — эўрыстычная гутарка па апавяданні «Сямнаццатай вясной» па пытаннях з вучэбнага дапаможніка і дадатковых.

У вучэбным дапаможніку згадваюцца тры старонкі біяграфіі мастака слова: даваенная, калі ён толькі-толькі закончыў школу; ваенная, калі летуценным юнаком пайшоў на фронт і браў удзел у баях на Карэльскім перашыйку, у Прыбалтыцы, на Украіне; пасляваенная, калі стаў вядомым навукоўцам, выкладчыкам і загадчыкам кафедры БДУ, акадэмікам, віцэ-прэзідэнтам НАН Беларусі. «Сухія факты» цудоўна «аздобяць» вучнёўскія выступленні. Адно з іх — пра летуценнасць мар, рамантычнасць

настрою даваеннага пакалення, выхаванага сталінскім часам, — лепш за ўсё ўзяць з апавядання «Чуеце, хлопцы?» (1960 г.), якое выдатна характарызуе яго настрой, памкненні, перапыненыя злавесным часам. Настаўнік падводзіць і клас, і чытальніка да ўспрымання тэксту ўрыўка лаканічнай фразай: «Трэба было быць мужнымі, смелымі, каб пераадолець ружовую настроенасць і знайсці ў сабе сілы для супрацьстаяння ворагам».

Другая старонка жыцця — ваенная — больш выразна будзе акрэслена ў тым выпадку, калі настаўнік у сваім слове адзначыць, што вельмі цяжка ваяваць, глядзець у вочы смерці таму, хто толькі пачынае жыць усвядомлена, толькі-толькі зведаў, што значыць для чалавека каханне, хто думае пра будучыню, а не пра мінулае. Сваё жыццё і жыццё хлопцаў-равеснікаў паказаў пісьменнік і ў лірызаванай трылогіі, што складаецца з аповесцей «Дзяцінства», «Падлетак», «Юнацтва» і была выдадзена асобнай кнігай у 1997 годзе. «Нягледзячы на суровыя выпрабаванні вайной, тыя, хто выжыў на вайне з навуменскага пакалення, — распавядае настаўнік далей, — захавалі ў сэрцах сваіх добрыя чалавечыя пачуцці: веру ў Дабро, у сапраўднае Каханне, у Справядлівасць. Таму не выпадкова трылогія пра Васіля Войціка — сына чыгуначніка (аўтабіяграфічны вобраз) — заканчваецца сцэнай развітання вылечаных у шпіталі ў Германіі рускіх салдат з жанчынамі, якія шчыра і светла закахаліся ў іх, чужаземцаў». Словы настаўніка дапаўняюцца вучнёўскім чытаннем урыўка з фінальнай сцэны аповесці «Юнацтва»: «Каля шпіталю натоўп немак, маладых, сярэдняга веку, пажылых. Яны, не саромячыся, плачуць, абдымаюць, цалуюць сваіх часовых нарачоных, піхаюць ім у рукі нейкія пакункі. Вось так канчаюцца войны. Любоўю, мілаваннем розных рас і народаў».

Трэцяя старонка біяграфіі пісьменніка самая працяглая па часе. Настаўнік адзначае, што І. Навуменка перажыў і пасляваенную нястачу, і выпрабаванне на навуковую сталасць і дасведчанасць, што заняткі навукай ён пастаянна сумяшчаў з мастацкай творчасцю: адна за адной выходзілі манаграфіі пра Янку Купалу, Якуба Коласа, М. Багдановіча, кнігі артыкулаў і рэцэнзій, апавяданні, аповесці і раманы. У тым ліку трылогія пра Міцю Птаха і яго сяброў, што сам-насам сутыкнуліся з ваеннай навалай і спачатку разгубіліся, а пасля знайшлі сваё

месца ў радах супраціўлення фашызму, — «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці». І ў знакамітай трылогіі, як у апавяданнях, І. Навуменка застаецца рамантыкам, захопленым прыгажосцю роднай беларускай прыроды, шчырым і светлым каханнем (можна зачытаць урывак).

Вынікі лекцыі з элементамі выразнага чытання ўрыўкаў з твораў пісьменніка лепш за ўсё падвесці ў форме эўрыстычнай гутаркі па пытаннях вучэбнага дапаможніка (с. 129). Пытанне першае: *Калі і дзе нарадзіўся пісьменнік? Да якога пакалення адносіцца? Што вы ведаеце пра яго малую радзіму?* Прывядзём прыкладныя адказы на яго: «Іван Якаўлевіч Навуменка нарадзіўся ў 1925 годзе ў горадзе-райцэнтры Васілевічы Гомельскай вобласці. Гэта значны чыгуначны вузел. Закончыў школу ў ваенным годзе. У маладым узросце ў 1943 годзе, спачатку падвучыўшыся вайсковай справе, трапіў з рэгулярнай арміяй на фронт. Адносіцца да пакалення, крыху старэйшага за пакаленне “дзяцей вайны”, якое пазней назавуць філалагічным. Можна лічыць яго і прадстаўніком ваеннага пакалення, да якога адносяцца І. Шамякін (1921 г. нар.), А. Пысін (1920 г. нар.), М. Аўрамчык (1920 г. нар.), І. Мележ (1921 г. нар.) і іншыя майстры слова. Пачатак творчасці пісьменніка прыпадае на 1955 год — час з’яўлення ў часопісе “Маладосць” першага апавядання. Малая радзіма пісьменніка — Гомельшчына, жытніца Беларусі, з яе асушанымі тарфянікамі, паўнаводнымі рэкамі Прыпяць, Днепр, Сож, з маляўнічымі азёрамі і шыракалістымі дубровамі. Гэта радзіма І. Мележа (Хойніцкі раён) і І. Шамякіна (Добрушскі раён)».

Другое пытанне — *Якія старонкі біяграфіі пісьменніка вам запомніліся і чаму?* — патрабуе «разняволенага», непрымусовага адказу. Думаецца, што некалькім вучням даспадобы даваенная старонка, якая адпавядае рамантычнаму настрою моладзі, і ў наш складаны час не пазбаўленай рамантычных памкненняў, актыўных пошукаў жыццёвых арыенціраў. А нехта адзначыць ваенную старонку, падкрэсліць, што менавіта ў такіх маладых людзей, як І. Навуменка і яго хлопцы-равеснікі, трэба вучыцца мужнасці, гераізму, пераадоленню цяжкасцей. Настаўнік павінен падтрымаць і тых і другіх і адзначыць, што пасляваеннае жыццё І. Навуменкі не было ўсыпана ружамі, што дасягнуць значных вышынь змаглі нямногія з яго пакалення.

Трэцяе пытанне — *Якія творы І. Навуменкі вы можаце назваць? Ці ёсць сярод іх творы з паэтычнымі загалоўкамі?* — мае на мэце выпрацаваць у вучняў і самастойнасць мыслення, і адчуванне сапраўднай прыгажосці, якая вельмі часта адкрываецца ў загалоўках кніг, асобных твораў. І. Навуменка — рамантык і лірык у жыцці і творчасці. Падобныя рысы светапогляду і характару адбіліся на назвах напісаных ім кніг: «Верасы на выжарынах» (1960 г.), «Замець жаўталісця» (1977 г.), «Водгулле далёкіх вёснаў» (1989 г.), «Смутак белых начэй» (1980 г.), «Асеннія мелодыі» (1987 г.) і інш.

Другая частка ўрока можа быць праведзена ў форме эўрыстычнай гутаркі па прачытаным творы «Сямнаццатай вясной», напачатку якой настаўнік лаканічна даводзіць вучням, што гэта адно з лепшых апавяданняў пісьменніка пра даваенны час, пра яго пакаленне. Адказ на пытанні павінен пацвярджацца цытаваннем урыўкаў з твора.

Пытанне першае — *Якія праблемы даваеннага і ваеннага жыцця закранае пісьменнік у апавяданні «Сямнаццатай вясной»?* — датычыцца асабістай і грамадскай сфер чалавечага жыцця, і ў першую чаргу жыцця моладзі (тэматычны аспект). А паколькі праблема, паводле слоўнікаў літаратуразнаўчых тэрмінаў, — гэта вострае, нявырашанае пытанне, дык напрошваецца вывад, што іх — галоўных — у творы дзве. Над імі задумваюцца даваенныя юнакі: «Як быць у экстрэмальнай сітуацыі, калі над Радзімай навісла пагроза заняволення фашыстамі?»; «Ці не з'яўляецца каханне здрадай высокім ідэалам барацьбы з ворагам?». Герой-апавядальнік увесь час перажывае, што здраджвае сяброўству, парушае клятву змагацца з акупантамі, бо пакахаў Стасю — «цудоўную белую птушку». Калі ж ён даведаўся, што Стася працуе пры немцах фельчаркай, ён яшчэ больш сябе ўзненавідзеў і супакоіўся толькі тады, калі яму паведамілі пра сувязь Стасі з партызанамі.

Настаўнік можа паставіць дыскусійнае пытанне класу: *Ці могуць людзі кахаць, калі ідзе вайна? Як іншыя пісьменнікі адказваюць на гэта пытанне?* Паколькі ўжо вывучалася творчасць І. Шамякіна, вучні могуць паведаміць, што гэты мастак слова паказвае сапраўднае каханне Вольгі Ляновіч і Алеся Гапанюка. А нехта, магчыма, узгадае аповесць «Альпійская балада» В. Быкава пра каханне «пасярод вайны» Івана і Джуліі.

У артыкуле вучэбнага дапаможніка, як і ў тэксце апавядання, дадзены грунтоўны адказ на другое пытанне: *Што перашкаджае Цімоху прызнацца Стасі ў каханні? Якое параўнанне выкарыстоўвае аўтар для характарыстыкі дзяўчыны?* Але варта звярнуць увагу пры адказе на яго першую палову, што прычыны зацятасці і напружанага духоўнага стану Цімоха — знешнія (вопратка бедная: латаныя-пералатаныя порткі, разлезлыя туфлі, кантрастная лёгкаму, светламу адзенню Стасі) і ўнутраныя (як і яго сябры, юнак рыхтаваўся да барацьбы, а затым змагаўся з фашыстамі, таму лічыў, што юнацкія светлыя пачуцці маглі перашкодзіць агульнай справе). Вучні пры адказе на другую частку пытання адзначаць, што Стася ў белай вопратцы ўяўляецца Цімоху «цудоўнай белай птушкай», а ў канцы твора, калі юнак дазнаўся, што яна забяспечвала партызанаў медыкаментамі, у яго вачах белая птушка паўстала яшчэ і тоненькай трасцінкай, ахінутай «нейкім новым, казачным святлом». Стася ў апавяданні і ў вачах юнака — сімвал чысціні і прыгажосці.

На пытанне трэцяе вучні знойдуць вычарпальны адказ у вучэбным дапаможніку. Цяжэй пойдзе праца па чацвёртым заданні: *Вызначце ў апавяданні экспазіцыю, завязку, кульмінацыю дзеяння і яго развязку*. Паколькі апавяданне — малы эпічны, ліра-эпічны, а на сучасным этапе часта лірычны жанр, у ім экспазіцыі звычайна няма. Завязкай твора (скажам так — з прыкметамі экспазіцыі) з’яўляецца замалёўка вясны, апісанне квітнеючага бэзу і згадка пра тое, што ўпершыню ў такі час росквіту жыцця не адбыўся экзамен у школе. Пасля шматзначнай завязкі пачало разгортвацца дзеянне — танцы пры немцах у прывакзальным скверыку і адносіны да падзей сяброў, збор зброі, помста ворагу, раненне Цімоха. Кульмінацыйнай падзеяй можна лічыць сцэну падрыву чыгункі (спісанага немцамі на партызанаў). Пачынаючы з сутычкі са здраднікам Сёхманам, дзеянне пайшло на спад і наступіла развязка з элементамі эпілогу — Цімох даведваецца пра трагічны лёс Стасі. Усе кампазіцыйныя часткі апавядання «спавітыя» пейзажнымі замалёўкамі, лірычным вобразам пахучага бэзу, перажываннямі галоўнага героя — юнака з узнёслымі марамі, летуценніка, здольнага на сапраўднае каханне.

Вынік размовы пра апавяданне можна падвесці пастаноўкай традыцыйнага, але заканамернага пытання: *Ці лічыце вы паводзіны юнакоў, паказаныя І. Навуменкам, ідэальнымі?* Улічваючы тое, што на сучасным этапе ацэначныя крытэрыі жыцця рэзка памяняліся, а ідэалы патрыятызму адціснутыя на другую пазіцыю прагматычнымі, меркантыльнымі інтарэсамі, настаўнік скіруе думкі вучняў на неабходнасць помніць і шанаваць такія каштоўнасці, як любоў да маці, да малой і вялікай радзімы, дружба, каханне.

❒ **Дамашняе заданне:** карыстаючыся вучэбным дапаможнікам, скласці характарыстыку вобраза Стасі; прачытаць апавяданне «Хлопцы самай вялікай вайны».

## УРОК 2.

### Аналіз апавядання «Хлопцы самай вялікай вайны». Паглыбленне паняццяў пра сюжэт і пазасюжэтныя кампаненты

У пачатку ўрока настаўнік адзначыць, што твор быў напісаны ў 1970 годзе, праз 14 гадоў пасля раней разгледжанага апавядання «Сямнаццатай вясной», і адрозніваецца ад яго больш сталым асэнсаваннем падзей ваеннага часу, жыцця пакалення 1925 года нараджэння, якое амаль усё загінула ці ў партызанах, ці на фронце, ці ў фашысцкай няволі. Пра гэта галоўны герой апавядання Віктар Пасашка часта думаў: «Вайна яшчэ не скончылася, а хлопцаў нараджэння дваццаць пятага года, з якімі разам хадзілі ў школу і якія пайшлі на фронт, Віктар жывога не памятаў нікога...» У творы праўдзіва паказаны ўзаемаадносіны былых партызан і прызваных у армію юнакоў з франтавікамі, якія былі мабілізаваныя ў мірны час; цяжкасці побыту падчас тылавой падрыхтоўкі да ваенных дзеянняў, адпраўкі на фронт. Кранаюць сваёй суровай праўдай масавыя сцэны: жанчыны спачатку зневажаюць навабранцаў, а затым выпраўляюць на фронт як родных сыноў. Стыль пісьменніка падкрэслена рэалістычны, асабліва пры адлюстраванні абставін, у якіх разгортваецца дзеянне, і толькі ў асобных выпадках набывае адзнакі рамантычнай узнёсласці, павышанай эмацыянальнай афарбоўкі.

Першае пытанне вучэбнага дапаможніка: *Калі адбываюцца падзеі ў апавяданні «Хлопцы самай вялікай вайны»? Які настрой пануе сярод салдат-нававбранцаў?* На першую частку яго вучні адкажуць лаканічна: падзеі адбываюцца ў 1943 годзе. Настаўніку неабходна адзначыць, што вайна яшчэ не скончылася, а краіна ўжо пачала «паўставаць на руінах»: адноўлены рух на чыгунках, наладжана харчаванне салдат, ажывіўся гандаль прадуктамі і адзеннем. Падчас адказу на другую частку пытання вучні самастойна адзначаць, што, нягледзячы на рознагалоссі паміж франтавікамі і нававбранцамі, усе вайскоўцы мараць пра хутчэйшую адпраўку на фронт, усведамляюць сябе місіянерамі «самай вялікай вайны».

Адказваючы на другое пытанне — *Якія постаці вылучаюцца ў апавяданні?* — вучні падкрэсляць, што гэта найперш постаць Віктара Пасашкі. Адказ неабходна пацвердзіць вытрымкамі з тэксту (пажадана скласці цытатны план характарыстыкі героя).

Пытанне трэцяе — *Як пісьменнік апісвае ваенны час, вайсковы побыт?* — патрабуе абавязковага пацвярджэння тэкставымі цытатамі, з якіх адкрыецца суровая праўда вайны праз апісанне побытавых сцэн: няўтульнасць «вагоннага жыцця», пастаяннае пачуццё голаду, убоства вопраткі і абутку нававбранцаў. Мінідыскусія можа разгарнуцца ў класе, калі паставіць пытанне: *Ці засяроджвалі ўвагу на такіх «дробязях» салдацкага побыту іншыя беларускія і рускія пісьменнікі?* Пэўна, многія адкажуць на яго лаканічна: «Не, не засяроджвалі». Настаўнік падводзіць вынікі палемікі фразай: «Значыць, І. Навуменка зрабіў гэта адзін з першых у час, калі ваенныя падзеі пачалі прыхарошвацца, гераізавацца і ідэалізавацца пісьменнікамі».

Адказ на чацвёртае пытанне — *Ахарактарызуйце пакаленне Віктара Пасашкі* — павінен улічваць набытыя вучнямі пры вывучэнні апавядання «Сямнаццатай вясной» веды. Калі ў творы «Хлопцы самай вялікай вайны» Віктар і яго равеснікі паўстаюць досыць сталымі людзьмі, крытычна ацэньваюць падзеі, дык у другім творы героі выглядаюць у большай ступені рамантыкамі, летуценнікамі, рызыкантамі і максімалістамі.

Пытанне пятае датычыцца вызначэння кульмінацыі ў абодвух апавяданнях. У апавяданні «Сямнаццатай вясной» такой

можа быць сцэна падрыву чыгункі і перастрэлкі юнакоў з паліцаем Сёхманам. У другім апавяданні — «духаўздымная» сцэна маршыроўкі паўгалодных навабранцаў пад гукі духавога аркестра на вайсковым пляцы.

Вынікі працы над творчасцю І. Навуменкі можна падвесці ў форме эўрыстычнай гутаркі па двух пытаннях:

1. *Чаму нас вучаць творы пісьменніка-рамантыка?*

2. *Ці камфортна пачуваецца сёння былым франтавікам?*

❒ **Дамашняе заданне:** для замацавання ведаў па тэорыі літаратуры можна прапанаваць вучням запоўніць табліцу (запаўняецца другі слупок — «Тлумачэнне»).

**Сюжэт і кампазіцыя мастацкага твора**

| Назва | Тлумачэнне |
|---|---|
| ***Сюжэтныя элементы*** | |
| Экспазіцыя | Уступ да дзеяння, які настройвае чытача на ўспрыманне твора, канфлікту, тэмы, вобразаў, падзей |
| Завязка дзеяння | Падзея (выпадак), з якога пачынаецца дзеянне |
| Развіццё дзеяння | Падзеі ў руху, зменах, спалучэнні |
| Кульмінацыя | Вышэйшы пункт канфлікту |
| Развязка | Вынік развіцця дзеяння, завяршэнне падзей, развязка канфлікту |
| Эпілог | Аповед пра дзеянне і лёс герояў пасля завяршэння падзей у творы |
| ***Пазасюжэтныя элементы*** | |
| Уводныя эпізоды (застаўкі) | Эпізоды, не звязаныя з рэальным сюжэтам, але нагаданыя падзеямі, што адбываюцца ў творы |
| Лірычныя адступленні | Аўтарскія выказванні лірычнага, публіцыстычнага, філасофскага характару |
| Чужы тэкст | Цытаты, застаўкі з твораў іншых аўтараў |

**ДАВЕДКА.** Праграма раіць самастойна прачытаць два апавяданні пісьменніка. Можна прапанаваць вучням прачытаць апавяданне «Чуеце, хлопцы?» (1960 г.), напісанае ў перыяд рамантычнай настроенасці І. Навуменкі. Форма твора — лірычны маналог, зварот аўтара да равеснікаў, якіх ён абагаўляе: да Цішкі Дразда, які марыў быць авіяканструктарам, але стаў ляснічым, бо «самалёты хутка старэюць», «а дубы будуць расці заўсёды»; да Міколы, які пасля вайны стаў настаўнікам пачатковых класаў, каб з літар складаць слова, «жывое, чалавечае, неўміручае»; да Грышы, якога, параненага, расстралялі немцы.

## РЫГОР БАРАДУЛІН

### УРОК 1.

### Жыццёвы і творчы шлях Рыгора Барадуліна. Тэма роднай мовы, Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта

Пачаць урок можна з гутаркі па наступных пытаннях: *Што вы ведаеце пра Р. Барадуліна — выдатнага беларускага паэта? Якія яго вершы з вывучаных у папярэдніх класах вы памятаеце?* Гэта настроіць вучняў на ўспрыманне новага матэрыялу, актывізуе іх памяць. Для разгляду жыццёвага і творчага шляху Р. Барадуліна можна выбраць такія метады, як лекцыя настаўніка, выступленні падрыхтаваных вучняў, выкарыстанне нагляднасці (партрэт паэта, выстава кніг). Настаўнік падае матэрыял пра дзяцінства і юнацтва паэта, ваеннае ліхалецце ў форме лекцыі з падключэннем кароткіх выступленняў падрыхтаваных вучняў. Свае адказы адзінаццацікласнікі могуць зрабіць як на аснове вучэбнага дапаможніка, так і на матэрыяле дадатковай літаратуры, якая падаецца ў канцы манаграфічнай тэмы. Асаблівую ўвагу настаўнік звяртае на асобу мастака слова, на тыя факты з біяграфіі, якія ўплывалі на сталенне юнака: хутар Верасовачка, дзе нарадзіўся паэт; маці Куліна Андрэеўна і бабуля Малання Несцераўна, якія ведалі многа народных песень, казак; бацька Іван Рыгоравіч,

што не вярнуўся з вайны; вучоба ва Ушацкай сярэдняй школе, дзе першым літаратурным настаўнікам для будучага паэта стаў Канстанцін Паўлавіч Баразна, выкладчык беларускай літаратуры, які наладзіў выпуск школьнага літаратурнага альманаха; навучанне ў БДУ; сяброўства з У. Караткевічам; літаб'яднанне пры газеце «Чырвоная змена»; праца студэнтам на цаліне. Гэтыя пералічаныя этапы можна прапанаваць вучням запісаць у сшытак.

Далей настаўнік звяртае ўвагу, што першая кніга паэта «Маладзік над стэпам» выйшла ў 1959 годзе і была прысвечана цаліннай тэматыцы, што яшчэ студэнтам Р. Барадулін быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў, а пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў літкансультантам аддзела культуры ў рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», пазней — у рэдакцыях часопісаў «Бярозка», «Беларусь», «Полымя». Тэма роднай мовы, яе лёсу хвалявала паэта на працягу ўсёй творчасці. У вершы «Неруш» Р. Барадулін паказвае бяздоннае багацце беларускай мовы, невычэрпныя магчымасці роднага слова.

Настаўнік выразна чытае верш і задае пытанні:

*1. Якімі пачуццямі прасякнуты верш?*

*2. Якім вы ўяўляеце асобу лірычнага героя?*

*3. Як вы думаеце, што азначае назва «Неруш»?*

*4. Праз якія мастацкія тропы аўтар перадае свае адносіны да роднай мовы?*

Пасля адказаў вучняў робіцца падагульненне, што верш прасякнуты пачуццямі любові да матчынай мовы, трывогі за яе будучыню, за яе чысціню. Лірычны герой — сапраўдны сын беларускай зямлі, поўны рашучасці і мужнасці яе абараняць і адстойваць. Назва верша «Неруш» азначае першаснасць, некранутасць, чысціню беларускай мовы.

Далей неабходна вярнуць вучняў да тэксту, засяродзіць іх увагу на мастацкай адметнасці твора. Каб адзінаццацікласнікі змаглі яе спасцігнуць, настаўнік звяртае ўвагу на тры сэнсавыя часткі верша: першая — роздум аб лёсе і багацці матчынай мовы, у якім лірычны герой выказвае любоў і пяшчоту, смутак і замілаванне да роднага слова; другая — лірычная споведзь паэта аб уласным творчым абавязку — берагчы родную мову, адстойваць яе ад абразы; трэцяя — урачыстая прысяга паэта

свайму народу ў вернасці, у беражлівых адносінах да духоўнай спадчыны радзімы. Тэма Бацькаўшчыны і спадчыны выразна выявілася і ў вершы «Яна адна, зямля вякоў...».

Настаўнік выразна чытае верш і праводзіць эўрыстычную гутарку:

*1. Якое пачуццё аб'ядноўвае гэты верш з папярэднім?*

*2. Якім чынам паэт выяўляе сваю шчырую і клапатлівую любоў да Беларусі?*

*3. З якой мэтай згадвае аўтар гераічнае мінулае Беларусі?*

*4. Якая думка гучыць у апошняй страфе верша?*

Робіцца падагульненне, што пачуццё любові, замілаванасці да Радзімы, да яе духоўных скарбаў аб'ядноўвае гэты верш з папярэднім. Паэт выяўляе сваю любоў да Бацькаўшчыны праз метаніміі (Беларусь — «прамень святла», «струмень жывой вады», «хлебны колас»), праз вобразы птушак, якія заўсёды вяртаюцца з выраю ў родны край, праз дарагія і родныя песні, быліны, курганы. Паэт звяртаецца да гераічнай гісторыі беларускай зямлі, каб уславіць мужнасць і самаахвярнасць беларусаў, якія вызвалілі родны край, захавалі яго незалежнасць. У апошняй страфе верша гучыць напамін і запавет нашчадкам захоўваць вольнасць роднай зямлі. Такім чынам, у гэтым творы сцвярджаецца думка пра незалежнасць, неўміручасць Бацькаўшчыны. Каб лепш засвоіць змест твора, вучням можна прапанаваць скласці цытатны план верша.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць паведамленне на тэму «Духоўны свет лірычнага героя вершаў Р. Барадуліна».

## УРОК 2.

### Філасофскія і хрысціянскія матывы ў паэзіі Рыгора Барадуліна. Пейзажная лірыка. Асаблівасці паэтычнага майстэрства

Пачаць урок варта з паўтарэння пройдзенага, каб праверыць, як вучні засвоілі папярэдні матэрыял. З мэтай эканоміі часу можна прапанаваць выканаць невялікі тэст на 3—5 мінут:

1. Дзе нарадзіўся Р. Барадулін?
   а) у мястэчку Ушачы;
   б) у Мінску;
   в) у вёсцы Верасоўка.

2. Дзе Р. Барадулін атрымаў адукацыю?
   а) ва Ушацкай сярэдняй школе;
   б) у БДУ;
   в) у Мінскім настаўніцкім інстытуце;
   г) а + б.
3. Якую назву меў першы зборнік паэта?
   а) «Нагбом»;
   б) «Неруш»;
   в) «Маладзік над стэпам».
4. Якім пачуццём аб'яднаны вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…»?
   а) сумам па радзіме;
   б) любоўю да Бацькаўшчыны і яе духоўнай спадчыны.

Настаўнік просіць 2—3 вучняў зрабіць аналіз аднаго з вывучаных вершаў (план аналізу — на с. 300). Адзін з лепшых вучняў знаёміць клас са сваім паведамленнем «Духоўны свет лірычнага героя вершаў Р. Барадуліна».

Пасля праверкі дамашняга задання настаўнік працягвае знаёміць з лірыкай Р. Барадуліна, акцэнтуючы ўвагу на тым, што ў многіх сваіх творах паэт па-філасофску асэнсоўвае праблемы сэнсу жыцця, прызначэння чалавека на зямлі. Да іх належыць верш «Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём», у якім гучыць роздум над сапраўднымі, вечнымі каштоўнасцямі. Настаўнік выразна чытае верш і прапануе вучням наступныя пытанні і заданні:

*1. Якія настрой і пачуцці выклікаў у вас гэты верш?*

*2. Якім матывам прасякнуты твор?*

*3. Выкажыце свае адносіны да праблемы, узнятай у вершы.*

*4. Што вы можаце сказаць пра форму гэтага твора? У чым яе адметнасці?*

*5. Як вы думаеце, што азначаюць словы паэта «старайся не ў дзяльбе, а ў малацьбе»?*

Пасля адказаў вучняў настаўнік робіць падагульненне, што верш прасякнуты заклікам да кожнага з нас памятаць, што жыццё хуткаплыннае, і таму нельга марнаваць яго на нікчэмныя дробязі. Словы паэта «старайся не ў дзяльбе, а ў малацьбе» азначаюць, што нельга ад жыцця толькі браць, увесь час нешта дзяліць, а патрэбна яшчэ і аддаваць, ствараць высокую ду-

хоўнасць, маральнасць, дабрыню. Вучні перачытваюць верш самастойна і складаюць яго план.

Настаўнік падкрэслівае, што сапраўдныя вартасці жыцця для паэта — гэта перш за ўсё хрысціянскія каштоўнасці. Хрысціянска-медытатыўная лірыка займае надзвычай важнае месца ў творчасці Р. Барадуліна. Паэт імкнецца наблізіцца да Усявышняга, паразважаць над пытаннямі вечнага і зямнога. У вершы «Божа, паспагадай усім...» Р. Барадулін пераконвае нас у тым, што толькі вера ў Бога падтрымлівае зямныя, стваральныя сілы чалавека і дапамагае супрацьстаяць разбуральным. Далей чытаецца верш «Божа, паспагадай нам усім...» і праводзіцца эўрыстычная гутарка:

*1. Якія ўражанні, пачуцці, думкі выклікаў у вас гэты твор?*

*2. Якім матывам прасякнуты верш?*

*3. Якім вам уяўляецца лірычны герой верша?*

*4. Што можна сказаць пра адметнасці лірычнай формы твора?*

*5. Якую думку сцвярджае аўтар у вершы?*

*6. Праз якія мастацка-выяўленчыя сродкі яна раскрываецца?*

Пасля адказаў вучняў настаўнік робіць вывад, што верш прасякнуты хрысціянскім матывам веры ў Бога, з дапамогай якой чалавецтва зможа дасягнуць згоды, жыць без вайны, вярнуць «заблуканыя душы». Лірычны герой верша — праваслаўны беларус-патрыёт, які свята верыць, што толькі Бог, малітоўнае слова садзейнічаюць нашаму набліжэнню да Ісціны, Любові, Хараства, Сумлення. Адметная форма твора — гэта верш-малітва за кожнага беларуса, за свой народ, за Бацькаўшчыну. У творы аўтар выказвае думку, што вера ў Бога дапамагае чалавеку сцвярджаць сапраўдную Духоўнасць у сваіх паўсядзённых справах. Гэтая думка раскрываецца праз яскравыя метафары: «каб ржавела сякера ў ката», «каб вячэраю пахнуў дым», «каб цяплелі пагляды людскія».

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што асобную старонку творчасці Р. Барадуліна займае пейзажная лірыка, у якой паэт выяўляе свой адметны талент — эмацыянальна, шматколерна, пластычна ўспрымаць прыроду ва ўсёй яе непаўторнасці, узнаўляць па-новаму багацце навакольнай рэчаіс-

насці. Прыкладам гэтага з'яўляецца верш «Заспаная раніца мжыстая...». Настаўнік выразна чытае верш і задае пытанні:

*1. Якім настроем прасякнуты твор?*

*2. Як вы думаеце, чаму аўтар называе восеньскую раніцу «заспанай» і «мжыстай», «скупой на фарбы і гукі»?*

*3. Якім вы ўяўляеце лірычнага героя верша?*

*4. Што, на вашу думку, азначае восень для лірычнага героя?*

*5. Як вы разумееце выраз «усё да паўдня праясніцца»?*

Пасля ён робіць падагульненне, што гэты верш прасякнуты філасофска-задумлівым настроем з прычыны надыходу восені. Твор пачынаецца з апісання восеньскай раніцы, якая падаецца праз канкрэтна-пачуццёвыя метафары-асацыяцыі. Аўтар называе восеньскую раніцу «заспанай», «мжыстай», «скупой на фарбы і гукі», каб перадаць стан душы лірычнага героя, у якога ўзнікае шчымліва-сумны, настальгічны настрой. Лірычны герой верша — чалавек, які чуйна рэагуе на прыродныя з'явы, адчувае і па-свойму ўспрымае вобразы, гукі, фарбы, пахі, смакі восені. Восень для яго не толькі час суму, але і прадчуванне нечага новага ў жыцці, яшчэ не зведанага. Выраз «усё да паўдня праясніцца» азначае перамены ў настроі лірычнага героя, яго аптымістычнае светасузіранне.

Далей вучням прапануецца прачытаць у вучэбным дапаможніку артыкул «Асаблівасці паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна» (с. 150—151) і адказаць на пытанне: *Праз якія мастацкія сродкі і спосабы паэт выяўляе сваё майстэрства ў вершах?* Для эфектыўнасці можна скласці і запісаць у сшытак план адказу: 1) метафарычная вобразнасць лірыкі Р. Барадуліна; 2) асаблівасці рытмічнай пабудовы вершаванага радка; 3) выкарыстанне крылатых выразаў і афарызмаў, фальклору ў вершах.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вусныя паведамленні на тэмы: «Тэма Бацькаўшчыны і роднай мовы ў паэзіі Р. Барадуліна», «Філасофскія і хрысціянскія матывы ў лірыцы Р. Барадуліна», «Пейзажная лірыка Р. Барадуліна», «Асаблівасці паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна»; прачытаць раман Г. Бёля «Дом без гаспадара».

# ГЕНРЫХ БЁЛЬ

## УРОК 1.

## Творчы партрэт Генрыха Бёля. Арыентацыйныя заняткі па рамане «Дом без гаспадара»

Паколькі вучні з Г. Бёлем як пісьменнікам знаёмяцца ўпершыню, то тлумачэнне новага матэрыялу варта пачаць з разгляду яго партрэта. Адзінаццацікласнікі адзначаць задуменнасць твару, яго разумны, добры і ў той жа час поўны ўнутранага болю погляд, што сведчыць пра цяжкі лёс мастака слова. Далей вывучаюцца біяграфічныя звесткі і творчы шлях Г. Бёля, коратка характарызуецца эпоха, літаратурныя абставіны, якія склаліся пасля Другой сусветнай вайны.

**ДАВЕДКА.** У вучэбным дапаможніку змешчана даволі скупая інфармацыя, яе трэба пашырыць. Матэрыял для асвятлення асобных важных у творчым плане момантаў жыцця Г. Бёля можна знайсці ў крыніцах, пададзеных у бібліяграфіі[1].

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка варта падаць вучням у форме лекцыі, у ходзе якой яны робяць канспект.

### Тэзісны план

Кёльн, сям'я, сацыяльнае асяроддзе як фактары фарміравання Бёля-пісьменніка і грамадзяніна. «Дом маіх бацькоў быў неаднародным — багемным, дробнабуржуазным, пралетарскім» (Г. Бёль).

---

[1] *Герцык, А.* Раман Генрыха Бёля «Дом без гаспадара» / А. Герцык // Роднае слова. — 1998. — № 1. — С. 111—122; *Фрадкин, И.* Генрих Бёлль — писатель, и больше чем писатель / И. Фрадкин // Генрих Бёлль. Собрание сочинений: в 5 т. — М., 1989. — Т. 1: Романы. Повесть. Рассказы. Эссе. 1946—1954 гг. — С. 5—28; *Кубарева, Н. П.* Зарубежная литература второй половины XX в. / Н. П. Кубарева. — М., 2002. — С. 153—163; История немецкой литературы: в 3 т. — М., 1985. — Т. 3. — С. 216—217, 277—278.

Усведамленне Бёлем-гімназістам, што ён і яго сябры «вучацца не для жыцця, а для смерці».

Служба ў вермахце і негатыўныя адносіны да фашызму.

Творчыя імпульсы (уражанні ад сусветнага эканамічнага крызісу, рамантычная загадкавасць вялікага горада, захапленне творчасцю пісьменнікаў рэлігійна-маральнага, хрысціянскага кірунку). Першыя літаратурныя вопыты.

Прызнанне Г. Бёля лідарам заходнегерманскіх пісьменнікаў пакалення, якое вярнулася з фронту. Паняцце «літаратура руін».

Наступствы выступлення Г. Бёля ў 1982 годзе ў Кёльне на міжнародным кангрэсе пісьменнікаў у абарону міру.

Публікацыя ў 1985 годзе ў сувязі з саракавой гадавінай капітуляцыі фашысцкай Германіі «Пісьма маім сынам».

Апошнія гады жыцця.

Увага вучняў звяртаецца на эпіграф да тэмы: «Хто забудзецца на зло, зробленае вайной, хто забудзецца на няшчасці, прынесеныя фашызмам, — той нягоднік». Гэтая думка Г. Бёля павінна выразна прагучаць, увайсці ў свядомасць як знак вечнай памяці жывых, новых пакаленняў пра жахі вайны, як заклік да супрацьстаяння злу. Эпіграфам можа таксама стаць урывак з санета «Аб сэнсе паражэння», які паэт-эмігрант Іаганес Р. Бехер напісаў, калі вярнуўся на радзіму ў 1945 годзе:

Ёсць вышэйшы сэнс і ў самім паражэнні,
І нават у ім перамога можа быць:
Знайсці, аплакаўшы памерлых, прасвятленне,
З няславы блаславенне ўтварыць. *(Пераклад І. А. Швед)*

Г. Бёль перажываў падобныя настроі, думаў пра сэнс паражэння і яго наступствы для нямецкага народа. Інтэрпрэтуючы свой раман «І не прамовіў ніводнага слова» аўтар — па ўласным прызнанні — ставіў галоўнай задачай паказаць, што «новае грамадства, заснаванае на хцівасці і сямейным эгаізме, было, па сутнасці, вяртаннем да старога ўкладу жыцця. Прычыну гэтаму я бачыў у тым, што немцы ўсё яшчэ не прайгралі вайну, што яны ўсё яшчэ не прызналі сваіх паражэння і краху і не ўсвядомілі, што ў гэтых паражэнні і краху быў для іх заключаны вялікі шанс». Ён настойліва шукаў у душах сваіх суайчыннікаў не ціхмянасць і пакору, а нянавісць да сіл зла, пераконваў чытачоў

у актыўнасці і адказнасці чалавечай думкі і памяці, у неабходнасці іх пастаяннай звернутасці да таго, на што нельга забыцца ў хуткаплыннасці моманту. Большасць бёлеўскіх герояў не жывуць адным днём, памяць аб мінулым для іх — абавязковая ўмова чалавечнасці іх быцця. Але гэтая памяць горкая, і таму быццё іх трагічнае. Г. Бёль пісаў творы, у якіх спрабаваў прааналізаваць прычыны вялікай трагедыі краіны і абставіны, якія стваралі «маленькую трагедыю» кожнага чалавека.

Важным у плане інтэлектуальнай падрыхтоўкі да ўспрымання вывучаемага твора з'яўляецца аповед настаўніка пра тое, што, хоць Г. Бёль прайшоў усю вайну ад першага да апошняга дня ў шынялі салдата гітлераўскага вермахту, ён не прымаў фашызму. Подласць фашызму, на думку пісьменніка-гуманіста, выяўляецца ў тым, што чалавека, які стаў ахвярай несправядлівасці і мабілізаванага ў вермахт, правакавалі на насілле ў адносінах да іншых людзей і цэлых народаў.

У пачатку 1950-х гадоў пісьменнікі-антыфашысты аказаліся перад тварам разгорнутага націску неафашысцкай і рэваншысцкай ідэалогіі ў самых разнастайных яе формах — ад выразна выяўленай да завуаляванай. Страх «дурнога паўтарэння», вяртання мінулага абвастрыў неабходнасць канкрэтна-гістарычнага і рэалістычнага асэнсавання ідэалогіі фашызму і падзей Другой сусветнай вайны, іх перадгісторыі, вытокаў і прычын. Паказ вайны стаў актыўна ідэалагічным, выразна скіраваным супраць новых міфаў пра вайну: міфа пра «гераізм на страчаным пасту», пра мужнасць «падманутага» і «бязвіннага» нямецкага салдата, пра «вызваленчую (ад бальшавізму) місію» гітлераўскай арміі на Усходзе і да т. п. Амаль усе крытыкі, якія пішуць пра пісьменнікаў-антыфашыстаў, прызнаюць, што найбольш значнай, авангарднай фігурай у гэтай літаратуры становіцца Г. Бёль. Ужо ў першай сваёй аповесці «Цягнік прыйшоў своечасова» (1949 г.) пісьменнік з вялікай эмацыянальнай сілай выяўляе гістарычную асуджанасць гітлераўскага «паходу на Усход».

Агляд тэматыкі творчасці Г. Бёля, зроблены настаўнікам, дапаможа зразумець вучням бёлеўскую канцэпцыю «бяссэнсавасці». Пісьменнік лічыў, што дзве асноўныя характарыстыкі гітлераўскай захопніцкай вайны — гэта яе бесчалавечнасць і бяссэнсавасць. Бяссэнсавымі пры гэтым з'яўляюцца не толькі

забойствы і разбурэнні, але і намаганні прыпісаць ужо пасля вайны нейкі вышэйшы сэнс гітлераўскаму «паходу на Усход». Настаўнік падкрэслівае, што творы Г. Бёля былі перакладзены на 48 моў, прагучалі рэзкім дысанансам аптымізму тагачаснай афіцыйнай ідэалогіі, сталі прыкладам для пісьменнікаў ФРГ і ўспрымаліся як сумленне новай, лепшай Германіі.

Можна прапанаваць аднаму з вучняў падрыхтаваць паведамленне, якое ўключыць тыя звесткі пра мастака слова, якія дапамогуць аднакласнікам усвядоміць светапоглядныя ўстаноўкі пісьменніка і матывы яго звароту да ваеннай праблематыкі, успрыняць маштабнасць творчасці і сусветную вядомасць Г. Бёля.

Пасля знаёмства адзінаццацікласнікаў з асобай арыгінальнага мастака слова і асаблівасцямі яго літаратурнай творчасці праводзіцца праверка ведання ўступных матэрыялаў да тэмы шляхам франтальнага апытання:

*1. Што вы даведаліся пра жыццё і творчасць пісьменніка?*

*2. Як лёс Г. Бёля адбіўся ў яго творах?*

*3. Пры распрацоўцы якой тэмы і ў якіх жанрах талент пісьменніка раскрыўся найбольш поўна?*

Жыццё і творчасць Г. Бёля падводзяць адзінаццацікласнікаў да роздумаў пра вытокі трагічнага ў жыцці чалавека і цэлых краін (у Г. Бёля гэта разрыў між свядомасцю і ўчынкам), пра тое, ці можа чалавек выстаяць у складаных умовах і застацца чалавекам, захаваць свой гонар. Ці трэба памятаць новым пакаленням пра войны, разбурэнні, смерць? І чаму? Што такое патрыятызм, вернасць абавязку, здрада? Ці можна станоўча ацаніць дэзерцірства і пры якіх абставінах? У чым сэнс і кошт жыцця? Работа над гэтымі пытаннямі створыць у класе неабходную праблемную сітуацыю.

Далей настаўнік правярае ўспрыманне вучнямі зместу рамана «Дом без гаспадара», прачытанага імі дома. З гэтай мэтай ён ставіць некалькі вузлавых пытанняў.

*У які час адбываліся падзеі, апісаныя ў рамане? Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць ваш вывад.* Каб адказаць на гэтае пытанне, вучням давядзецца ўспомніць факты і, магчыма, зачытаць адпаведныя фрагменты рамана, якія сведчаць, што

твор мае дзве рэтраспектывы — у ім апавядаецца пра падзеі ваеннага і пасляваеннага часу. Настаўнік можа патлумачыць, што з'яўленне ў творчасці Г. Бёля двухпланавай апавядальнай структуры сведчыць пра адносіны пісьменніка да грамадска-палітычнай рэчаіснасці пасляваеннай Заходняй Германіі і з'яўляецца мастацкай матэрыялізацыяй рашучага непрымання і крытыкі рэстаўрацыйнага курсу канцлера Адэнаўэра.

*Як і чаму глыбока веруючы пісьменнік-католік, для якога рэлігія з'яўлялася крытэрыем чалавечага сумлення, крытыкуе афіцыйную царкву ў рамане? Знайдзіце адпаведныя эпізоды ў тэксце.* Каб вучні маглі больш асэнсавана справіцца з заданнем, настаўнік паведамляе, што, па ўласным прызнанні Г. Бёля, пісьменнік разумеў рэлігію «не як нешта царкоўна-абстрактнае, а як яднанне людзей» і скептычна адносіўся да рытуалаў і абрадаў, да адбывання набажэнскай павіннасці. Пісьменнік-гуманіст прад'яўляў каталіцкай царкве цяжкія сацыяльна-маральныя і палітычныя абвінавачванні: лічыў канкардат, заключаны ў 1933 годзе Ватыканам з гітлераўскімі ўладамі, чорнай здрадай у адносінах да германскай дэмакратыі, благаславеннем крывавых, тэрарыстычных дзеянняў фашысцкага рэжыму.

**ДАВЕДКА.** 20 ліпеня 1933 года Ватыкан падтрымаў набіраўшы сілы нацызм, калі кардынал Пачэлі падпісаў у Рыме канкардат (пагадненне) паміж Ватыканам і нацысцкай Германіяй. У канцы 1933 года падтрымка Ватыкана стала адным з асноўных фактараў у імкненні Гітлера да сусветнага ўладарання.

Тут варта прывесці звесткі пра тое, што Г. Бёль не быў членам ніякай палітычнай партыі, аднак у перадвыбарчай кампаніі пачатку 1970-х гадоў актыўна выступаў на баку Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі. Апазіцыйная партыя хрысціянскіх дэмакратаў і органы, якія яе падтрымлівалі, беспадстаўна аб'явілі Г. Бёля духоўным настаўнікам тэрарызму. У хаце пісьменніка адбыўся вобыск.

Далей арыентацыйныя занятті па творы праводзяцца спосабам выбарачнага пераказу жыццёвых падзей герояў. Гэта пэўным чынам абумоўлена адноснай «маланаселенасцю» рамана. У ім

падрабязна прасочваюцца лёсы двух хлопчыкаў-сірот, іх маці і Альберта Мухава.

❒ **Дамашняе заданне:** даць загалоўкі раздзелам рамана «Дом без гаспадара», кожны з якіх напісаны ад імя пэўнага героя — то дзяцей, то дарослых.

## УРОК 2.

### Душэўныя пакуты пасляваеннага пакалення. Аналіз рамана «Дом без гаспадара»

Мэтазгодным пераходам да разгляду рамана «Дом без гаспадара» можа быць засяроджанне ўвагі вучняў на галоўнай думцы твора і спецыфіцы яе раскрыцця з развіццём сюжэта. Варта звярнуцца да эпіграфа і такім чынам падрыхтаваць адзінаццацікласнікаў да аналізу рамана, а затым правесці яго, выкарыстоўваючы пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку (с. 161). Пасля прачытання артыкула ў вучэбным дапаможніку (с. 155—161) работа праводзіцца камбінаваным шляхам, які ўключае элементы павобразнага, «следам за аўтарам», праблемна-тэматычнага, кампазіцыйнага аналізу. Настаўнік звяртае ўвагу на кампазіцыйную адметнасць рамана Г. Бёля «Дом без гаспадара». Паколькі кожны раздзел напісаны ад імя пэўнага героя, перавага можа аддавацца павобразнаму метаду аналізу, характарыстыцы пяці апавядальнікаў.

Настаўнік пытаецца: *Хто выступае апавядальнікам у творы? Пра што кожны з іх распавядае?* Называюцца галоўныя героі рамана — Генрых, Марцін, іх маці — Нэла і Вільма, Альберт.

*Што аб’ядноўвае герояў рамана?* Найхутчэй, увага вучняў скіруецца на тое, што ўсе героі рамана так ці інакш з’яўляюцца ахвярамі былой вайны. Іх не пакідаюць думкі пра крывавы гвалт у гады гітлерызму і пра смерць маладых «гаспадароў дамоў» на вайне.

*Як аўтарам раскрываецца псіхалогія дзяцей-сірот у рамане? Падрыхтуйце параўнальную характарыстыку сяброў — Марціна і Генрыха. Як жывецца хлопчыкам у «доме без гаспадара»?* Хлопчыкі, якія належаць да розных сацыяльных колаў,

самастойна спрабуюць зразумець свет дарослых, прызвычаіцца да яго. Спасціжэнне гэтага складанага жыцця пачынаецца са знаёмства з «дзядзькамі», з якімі сустракаюцца іх маці. Падлеткі пачынаюць задумвацца над непагрэшнасцю нормаў існуючай маралі. Шчырае сяброўства, узаемападтрымка дапамагаюць хлопцам шукаць сваё месца ў дарослым свеце, дзе галоўную ролю адыгрываюць грошы.

*Як Марціну ў размовах з Генрыхам адкрываецца складанасць жыцця? Як ён адказвае сабе на пытанне катэхізіса: «Навошта мы прыйшлі ў гэты свет?»* Нягледзячы на тое што Марцін жыве ў дастатку, ён заўважае, што яго маці адрозніваецца ад «амаральнай» маці яго сябра найперш тым, што яна забяспечаная і спакойная за дабрабыт сям'і. Хлопчыка ўразіла, што яго бабуля за адзін абед у рэстаране траціць амаль столькі, колькі сям'я яго сябра Генрыха за тыдзень. У Марціна ўзнікаюць сумненні: ці сапраўды чалавек прыходзіць у свет, каб служыць Богу. І падлетак задумваецца аб уласным шляху да людзей.

*Ці часта Генрых па-дзіцячаму вольна бавіў час? Як хлопчык адносіўся да школы?* На Генрыху ляжыць недзіцячая адказнасць за сям'ю. Хлопец трывожыцца за маці, маленькую сястрычку Вільму, ён амаль не ўсміхаецца, і адзіная яго ўцеха — клопаты пра сястру. Пажадана, каб адзінаццацікласнікі знайшлі ў рамане словы, якія падмацуюць іх меркаванні.

*Пра сэнс якога слова і чаму часта задумваецца Генрых? Як, на вашу думку, гэта характарызуе героя?* Вучні прыгадаюць, што Генрых засяроджваецца на сэнсе слова «маральны». Ён пераконваецца, што рэальнае жыццё супярэчлівае: настаўнікі і святар сцвярджаюць адно, а жыццё сведчыць зусім пра іншае. У яго нараджаецца спадзяванне, што і ў матуліным, усё ж такі «не-амаральным», жыцці знойдзецца месца спагадзе, зычлівасці іншых людзей.

Далей вучням прапануецца зрабіць параўнальную характарыстыку вобразаў дзвюх маці. Яны скажуць, што жыццё Нэлы, маці Марціна, забяспечанай жанчыны, не асветлена высокім сэнсам. Яна занята толькі ўласнымі праблемамі, ёй нават не цікава, чым жыве яе сын. Бясконца смуткуючы па страчаным мужу, Нэла жыве пераважна былым і неадступнымі думкамі аб помсце Гезелеру. Гераіня, на жаль, не ўсведамляе, што пачуццё

нянавісці і прага помсты толькі спусташаюць яе душу. Варта спыніцца на эпізодзе сустрэчы Нэлы і Гезелера. Вучням можна прапанаваць пераказаць гэтую сцэну ад імя Нэлы.

Жыццё другой гераіні, маці Генрыха, Вільмы Брылах — сапраўды страшнае. Абставіны матэрыяльнай безвыходнасці закрэслілі свет яе пачуццяў і душэўных перажыванняў. За цяжкай штодзённай працай гераіня страціла сваю індывідуальнасць. З апошніх намаганняў яна імкнецца выжыць і падняць на ногі Генрыха. Хлопчык са шкадаваннем заўважае, што ў маці змяняюцца адзін за другім «амаральныя дзядзькі». Ніхто з іх не імкнецца стаць сапраўднай апорай іх сям’і. Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што два словы — «амаральна» і «без сораму» — праходзяць праз увесь раман і адносяцца менавіта да Вільмы, аднак гэтая жанчына, нягледзячы на цяжкую працу і прыніжэнні, захавала ў сабе (у адрозненне ад багатай Нэлы) найлепшыя чалавечыя якасці.

Далей вучні разважаюць над прычынамі трагічнага лёсу загінулага паэта Раймунда Баха. Яны павінны прыйсці да разумення, што гэта не проста персанаж, але і сімвал. Трагедыя героя ў тым, што ён ненавідзеў фашызм і вайну, але, як і яго сябар, мастак Альберт Мухаў з невыразнай грамадзянскай пазіцыяй, міжволі прычыніўся да іх прапаганды. Вершы, якія малады паэт друкаваў, былі выкарыстаны нацыстамі, і нават пасля смерці паэта яго забойцы з іх дапамогай прапагандуюць новую вайну. Гэты вобраз важны і для разумення думкі, якую аўтар настойліва праводзіў у многіх творах: подласць фашызму выяўлялася ў тым, што чалавека, які стаў ахвярай несправядлівасці і быў мабілізаваны ў вермахт, правакавалі на здзяйсненне насілля ў адносінах да іншых людзей і цэлых народаў. Пісьменнік ненавідзіць фашызм за тое, што ён быў узаконенай несправядлівасцю, здзекаваўся з годнасці асобы. Вытокі трагічнага ў Г. Бёля знаходзяцца ў разрыве паміж свядомасцю і ўчынкам.

*Якую ролю адыгрывае вобраз мастака Альберта Мухава ў разуменні аўтарскай пазіцыі, светапогляду пісьменніка? У чым заключаецца прывабнасць гэтага вобраза?* Трэба думаць, вучні без цяжкасці назавуць Альберта самым разумным і шчырым сярод дарослых герояў рамана. Ён, у адрозненне ад іншых, не

страцыю веры ў будучыню. Гэты герой у душы не прымае фашызм і «брудную» вайну, не забыў забітага сябра і клапоціцца пра яго сына.

*Ці лічыць аўтар свайго героя Альберта Мухава маральным ідэалам?* — прапануе настаўнік вучням пытанне для абмеркавання. На гэтае дыскусійнае пытанне яны могуць даць як станоўчы, так і адмоўны адказ, абгрунтаваўшы яго. *У чым абмежаванасць Альберта Мухава?* Герой, ужо маючы вопыт вайны і пасляваеннага ліхалецця, працягвае растрачваць свой вялікі талент на бяскрыўдныя малюнкі, за якія яму добра плацяць.

Далей вучні, абапіраючыся на адпаведны раздзел вучэбнага дапаможніка па тэме, вызначаюць сэнс назвы рамана і адметнасць апавядальнай манеры аўтара. Яны робяць выснову, што «Дом без гаспадара» — гэта Германія пасля Другой сусветнай вайны, якая стала вялікай трагедыяй і для нямецкага народа, бо ўся краіна ператварылася ў няўтульны, недагледжаны дом, які да таго ж застаўся без гаспадара. Без гаспадароў аказаліся і хаты абодвух хлопчыкаў, бацькі якіх не вярнуліся з вайны. Назва сімвалізуе таксама няўпэўненасць аўтара ў будучыні краіны, дзе Г. Бёль заўважаў новыя праявы шавінізму і мілітарызму. Злавесныя прыкметы мінулага, якія жывуць у сучасным, — важны элемент мастацкага стылю пісьменніка. Адметнасць апавядальнай манеры аўтара ў рамане «Дом без гаспадара» ў тым, што кожны раздзел напісаны ад імя розных герояў — то дзяцей, то дарослых. Гэта дапамагае Г. Бёлю з розных бакоў раскрыць праблемы жыцця ў тагачаснай Германіі як бедных, так і забяспечаных людзей.

У выніку разважанняў вучні прыйдуць да вываду, што Г. Бёль імкнецца да праўдзівага адлюстравання ў выяўленні чалавека і ўсёй сучаснай яму рэчаіснасці. Раман мае моцны антываенны пафас. Пісьменнік бескампрамісна разбурае міфы пра вайну, паказвае яе бесчалавечнасць і бяссэнсавасць. Настаўнік павінен падвесці вучняў да высновы, што гэтым творам аўтар імкнецца абудзіць ў душах сваіх суайчыннікаў нянавісць да разбуральных сіл зла, выяўляе дысгармонію, няўтульнасць, духоўную неўладкаванасць і бязрадаснасць пасляваеннага жыцця, што прагучала выразным дысанансам аптымізму афіцыйнай ідэалогіі.

У заключэнні ўрока варта прапанаваць вучням абагульняльнае пытанне пра актуальнасць рамана, яго грамадска-маральнай праблематыкі ў наш час.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць адказы на пытанні вучэбнага дапаможніка (с. 161).

## ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ

### УРОК 1.

### Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэтэсы. Аналіз верша «Чаму ніколі не баюся я…»

Кампазіцыйна першы ўрок складаецца з лекцыі настаўніка пра лёс выдатнай паэтэсы з «застаўкамі» — чытаннем найбольш характэрных (этапных) вершаў (не больш трох) і ў заключэнні аднаго з твораў, прысвечаных ёй, — і эўрыстычнай гутаркі пра верш «Чаму ніколі не баюся я…».

У лекцыі настаўнік паведамляе, што Я. Янішчыц адносіцца да пакалення «сямідзясятнікаў» — аўтараў, якія ўваходзілі ў літаратуру следам за «шасцідзясятнікамі». Лёс гэтага пакалення звязаны з пераацэнкай рамантычных ілюзій, абвешчаных пасля выкрыцця культу асобы Сталіна, адчуваннем трагізму сітуацыі, ілжывасці паводзін камуністычных лідараў, савецкага кіраўніцтва, якое толькі на словах адстойвала інтарэсы народа. Адбілася на творчасці паэтэсы і адчуванне не толькі пазітыўнага, але і адмоўнага ўплыву навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на жыццё, разрыву гарманічных адносін паміж вёскай і горадам. Падобнае адчуванне стала прычынай паступовай замены радаснага настрою на трагедыйны ў зборніках «Ясельда», «Пара любові і жалю», «Каліна зімы». Ужо назва апошняга з іх — трывожная, ад яе павявае зімовым холадам.

Трэба абавязкова адзначыць, што такая ж эвалюцыя адбывалася і ў творчасці равесніц Я. Янішчыц — В. Коўтун, Т. Бондар, зборнік апошняй «Адна» складаецца выключна з трагедыйных па змесце элегій пра адзіноцтва асобы ў разбураным свеце.

Размова пра лёс Я. Янішчыц будзе далёка не поўнай, калі не падкрэсліцца (не вылучыцца на першую пазіцыю) «вясковасць» і радаводу, і маральна-духоўнага стану паэтэсы. Вясковыя карані, тым больш неадрыўныя ад нерушнасці, першазданнасці, натуральнасці (што ў свой час заўважыў рускі пісьменнік А. Купрын — аўтар аповесці «Алеся») палескага краю, яго дзівоснай прыроды (асабліва параўнальна з цэнтральнымі рэгіёнамі Беларусі, хоць бы той самай Случчынай), адбіліся на змесце творчасці паэтэсы, сталі абярэгам ад ілюстрацыйнасці і рытарызму, абстрактнай разважлівасці, «апрадмецілі» яе і ўзбагацілі яскравымі, недасяжнымі аўтарам, што твораць «з галавы», а не арыентуюцца на сардэчныя імпульсы, чуласцю, лагоднасцю, пяшчотай. Вернасць «вяскоўству», спрадвечным законам гарманічнага быцця паводле ўзаемнага даверу і павагі прадстаўнікоў розных пакаленняў вызначыла асноўны пафас паэзіі Я. Янішчыц — пафас гуманізму. Ім і народжаны радкі, падобныя вось гэтым, з якіх складаецца верш з першым, вызначальным радком — «Плачу даўгі раллі...». Гэты верш можа выразна прачытаць настаўнік ці вучань (пажадана, на памяць):

**Плачу даўгі раллі**
**І лугу шапаткому.**
Мне цёпла на зямлі
І лёгка, як нікому.
Але галоўны доўг —
**Плаціць за шчасце болем.**

Заканчваючы гэтую частку размовы пра лёс і творчасць «палескай ластаўкі», настаўнік можа адзначыць наступнае: «Звярніце ўвагу на першыя два радкі, якія сведчаць пра шчырую адданасць паэтэсы раллі і шапаткому лугу — выразным вобразам-рэаліям "вясковага" характару, а таксама на радок — "Плаціць за шчасце болем". Гэты радок наводзіць нас на роздум і пра "антыгарадскі" настрой аўтара, і пра тое, што яна не ўяўляе асабістага шчасця (у тым ліку ў каханні) без захавання вясковых традыцый. І тут асабліва значнымі ўяўляюцца радкі "І для цябе мой дом / Адкрыты, нібы поле", якія, верагодней за ўсё, звернутыя да кожнага. І зварот гэты зноў-такі не абмінае вернасць вясковым традыцыям: невыпадкова ж дом

параўноўваецца з адкрытым полем — атрыбутам малой радзімы паэтэсы».

Пры размове пра гарадское жыццё Я. Янішчыц неабходна абавязкова зрабіць акцэнт на «неканчатковым урастанні» ў яго светлага шчырага слова пра вёску, родных людзей, снежныя грамніцы і Ясельду. Горад быў ёй амаль чужым, рэдка саграваў сваёй ласкай. Таму і клапацілася ўражлівая і далікатная паляшучка, каб у век навукова-тэхнічных дасягненняў яе родная хата не ператварылася ў сувенір. Далей зноў могуць прагучаць прачулыя, поўныя трывогі за будучыню радкі верша «Сюды вяртаюся ад скрух...»:

Сюды вяртаюся ад скрух,
З імжастых сураеяў.
Яшчэ жывы ў хаце дух,
Бо мама сцены грэе.
<...>
Ды кожны раз баюся я
Паміж вайной і мірам,
Каб хата сельская мая
Не стала сувенірам.

«Нарошчванне» трагедыйнага пафасу адбывалася ў паэзіі Я. Янішчыц і па прычыне асабістай: адносіны з Сяргеем Панізнікам — паэтам, яе равеснікам, яе мужам — пагоршыліся. Адзінота гняла. Каб не сынок Андрэй, не падтрымка родных і блізкіх, яна пайшла б ад нас яшчэ раней. Боль стаўся скразным у яе творчасці і вызначыў трагедыйны пафас большасці элегійных твораў, што склалі зборнікі «Ясельда» (1978 г.), «Пара любові і жалю» (1983 г.), «Каліна зімы» (1987 г.), «У шуме жытняга святла» (1988 г.). У іх і прырода, і чалавечыя дзеянні, і каханне маюць трагедыйную «падсветку».

Пры аналізе верша «Чаму ніколі не баюся я...» з першага зборніка «Снежныя грамніцы» трэба звярнуць увагу вучняў на яго філасафічнасць, на тое, што асновай жыцця паэтэса лічыць «зялёную зямлю», якая «магутней слабасці і смерці». Усё астатняе — «паўната» галавы і сэрца, мазалі — ад любові да яе. Верш наводзіць на роздум пра першаснасць зямнога пачатку ў паэзіі Я. Янішчыц, пра яе вернасць малой і — гэта

будзе пазней — вялікай радзіме. Менавіта такой асаблівасцю і характарызавалася беларуская паэзія, пачынаючы з часоў Ф. Скарыны (помнім яго словы пра тое, што кожная птушка мае сваё гняздо, а тым больш — чалавек) і М. Гусоўскага і заканчваючы XX стагоддзем.

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць адказы на першыя тры пытанні вучэбнага дапаможніка (с. 171).

**ДАВЕДКА.** Варта папрасіць вучняў пры адказе на першае пытанне — *Калі і дзе нарадзілася Я. Янішчыц? Чым адметная яе малая радзіма?* — падабраць карціны краявідаў палескага краю (вёсачка Рудка ў Пінскім раёне, рэчка Ясельда, неабсяжныя палі, векавечныя дубровы, непраходныя (цяпер асушаныя) балоты — вось прыкметы малой радзімы паэтэсы).

Другое пытанне — *Як называліся зборнікі паэтэсы? Патлумачце назвы. Што гэта за свята — снежныя грамніцы?* — патрабуе ад вучняў засяродзіць увагу на невыпадковасці назваў як кніг пісьменнікаў, так і асобных твораў. У іх звычайна закладзены адказ на пытанне пра змест, ідэйны пафас твора, а то і творчасці ў цэлым, пра адносіны аўтараў (а яны і вызначаюць пафас) да жыцця,ператворанага ў вобразы. Зыходзячы з выяўлення падобных адносін і неабходна «раскручваць» тэкст, шукаць у ім адпаведнасць аўтарскаму (а праз яго — чытацкаму) настрою. Пабудуем сэнсавы рад з назваў зборнікаў паэтэсы: «Снежныя грамніцы» → «Ясельда» → «Пара любові і жалю» → «Каліна зімы» → «У шуме жытняга святла». Патлумачым яго «змест»: захапленне першароднасцю жыцця і яго прыгажосцю, выдых радасці ад замілавання светам існым → зачараванасць прыродай, роднымі мясцінамі, улюбёнасць у прыгажосць → адчуванне кантраснасці жыцця, яго супярэчлівасці, светлаценнасці, пастаноўка побач вобразаў-універсалій Любоў і Жаль → культ адзіноты, сцюжнай завеі, пераўвасабленне ў вобраз Каліны, якая высільваецца, выжывае ў экстрэмальных умовах → і, нарэшце, вяртанне да вытокаў, да першакрыніцы, сімвалам якіх становіцца адзін з самых распаўсюджаных (ментальных) беларускіх вобразаў — вобраз Жыта, які

нарадзіўся на глыбокай філасофскай аснове, паводле ўдумлівых, аналітычных, а не рамантычна-ўзнёслых адносін да рэчаіснасці (асацыятыўны вобраз «жытняе святло» тут не выпадковы). Кола замкнулася на хвалі пераадолення страт і болю, вяртання да першавытокаў. Можна задаць вучням пытанне: *Назвы якіх кніг, твораў беларускіх, рускіх, замежных пісьменнікаў, вам вядомых, выразна раскрываюць пазіцыю, агульны настрой іх аўтараў?* Адказваючы на пытанне, яны могуць назваць раман І. Мележа «Подых навальніцы» (адчуванне бяды, што навісла над Палессем і палешукамі), пенталогію І. Шамякіна «Трывожнае шчасце» (шчасце, апавітае трывогай); эмацыянальныя, прасякнутыя трагедыйным настроем назвы зборнікаў П. Панчанкі «Крык сойкі» (гэтая птушка першая папярэджвае лясных жыхароў пра набліжэнне небяспекі), «Горкі жолуд» (адчуванне драматызму жыцця і цяжкасці місіі мастака слова); клопат Р. Барадуліна пра захаванне гармоніі жыцця выяўляецца ў назве яго кнігі «Неруш», стоеная незадаволенасць заганамі жыцця — у назве «Маўчанне перуна»; вернасць зямному жыццю, яго першавытокам закладзена ў назвах зборнікаў паэзіі Максіма Танка «Дарога, закалыханая жытам» і «Збор калосся». Прыклады можна прадоўжыць.

Пры разглядзе трэцяга задання — *Колькі перыядаў у творчасці Я. Янішчыц можна вызначыць? Дайце кароткую характарыстыку аднаго з іх* — можна стварыць дыскусійную сітуацыю пастаноўкай пытання: *Два ці тры перыяды вылучаюцца ў творчасці паэтэсы?* У вучэбным дапаможніку пішацца пра тры: ранняя паэзія, рамантычна-ўзнёслая, «светлая» (зборнік «Снежныя грамніцы»); «пераходны» перыяд, час пераацэнкі ранейшай пазітыўнай канцэпцыі жыцця (зборнікі «Дзень вечаровы» і «Ясельда»); трэці этап — паказ «разломнага» жыцця, вылучэнне яго змрочнага пачатку, шуканне выйсця з драматычнай сітуацыі, па-філасофску глыбокая ацэнка падзей (зборнікі «Пара любові і жалю», «Каліна зімы», «У шуме жытняга святла»). Нехта з вучняў выкажа думку на гэты конт, аднясе зборнікі «Дзень вечаровы» і «Ясельда» да ранняга, першага, а наступныя — да сталага, позняга, перыяду.

## УРОК 2.

### Аналіз вершаў «Не воблака, а проста аблачынка…», «Помню, помню праз гады…», «Любоў мая…»

Напачатку ўрока ідзе паўтарэнне пройдзенага матэрыялу ў форме адказаў на пытанні:

*1. Чаму, на ваш погляд, лёс выдатнай паэтэсы склаўся так трагічна?*

*2. Чаму свой першы зборнік паэзіі Я. Янішчыц назвала «Снежныя грамніцы»?*

У вучэбным дапаможніку даецца падрабязны аналіз праграмных твораў «Не воблака, а проста аблачынка...», «Помню, помню праз гады...» і «Любоў мая...», якога і трэба прытрымлівацца. Звычайна вучні правільна адказваюць на пытанні пра змест твора, перадаюць уласныя адчуванні пасля яго прачытання. Цяжэй, нават адзінаццацікласнікам, даецца размова пра эстэтычную вартасць вершаў, дасканаласць іх формы. Два пытанні вучэбнага дапаможніка (4-е і 5-е) засяроджваюць увагу менавіта на гэтай праблеме.

Заданне чацвёртае — *Вызначце вершаваныя памеры вершаў «Чаму ніколі не баюся я...» і «Помню, помню праз гады...»* — пастаўлена не выпадкова, бо менавіта з рытму пачынаецца вершаваны тэкст. Рытм вызначаецца характарам настрою: весела чалавеку — харэічны метр тут да месца; сумна, трывожна на душы — падыдзе дактыль ці анапест; ахоплівае ўрачысты, узнёслы настрой — звяртайся да ямба, як гэта зрабілі Якуб Колас у «Новай зямлі» («Мой ро́дны ку́т, як ты́ мне мі́лы! / Забы́ць цябе́ не ма́ю сі́лы»), А. С. Пушкін — у «Палтаве» («Гори́т восто́к заре́ю но́вой»). Метр становіцца памерам у вершаваных радках, якія складаюцца з рознай колькасці стоп. Метр і памер можна вызначаць скандзіраваннем, вылучаючы націскныя склады (вусна), і лічбавымі радамі: калі націскныя склады 2, 4, 6, 8, і г. д. — гэта ямб; 1, 3, 5, 7 і г. д. — харэй; 2, 5, 8, 11 — амфібрахій; 3, 6, 9, 12 — анапест; 1, 4, 7, 10 — дактыль. У двухскладовых метрах могуць узнікаць націскныя склады і з'яўляцца дадатковыя націскныя стопы спандэя (–́ –́) ці пропускі націскаў — пірыхій (∪ ∪), а таму лічбавы рад можа парушацца, аднак у цэлым ён захоўваецца.

Вызначым вершаваны памер твора «Чаму ніколі не баюся я...» з дапамогай лічбавых радоў першых чатырох радкоў:

∪ –́ ∪ –́ ∪ ∪ ∪ –́ ∪ –́ — 2, 4, 8, 10
∪ ∪ ∪ –́ ∪ ∪ ∪ –́ ∪ –́ — 4, 8, 10
–́ ∪ ∪ –́ ∪ –́ ∪ ∪ ∪ –́ — 1, 4, 6, 10
∪ –́ ∪ –́ ∪ –́ ∪ ∪ ∪ –́ ∪ — 2, 4, 6, 10

Як відаць са схемы, у цэлым ва ўсіх радках захоўваецца лічбавы рад ямбічнага метру. Робім вывад: верш напісаны пяці- і шасцістопным ямбам. Доўгія словы ствараюць эфект запаволенасці рытму. У сваю чаргу гэтая запаволенасць уздзейнічае на нашу свядомасць — нам здаецца, што паэтэса шукае словы, каб выказаць невымерную любоў да роднай зямлі, з якой усё пачынаецца.

Верш «Помню, помню праз гады...» напісаны пад уражаннем народнай песні, мадыфікаваныя радкі з якой — «Выпі, золатца, вады, / Сэрца супакоіцца», — відаць, запомніліся паэтэсе з дзяцінства. Таму яна і ўставіла іх «жыўцом», без змен, у тэкст. Многія народныя песні заснаваны на харэічным метры, бо часта выконваліся падчас танцаў, суправаджаліся скокавым рытмам. Фальклорная аснова гэтага твора Я. Янішчыц з'яўляецца падказкай. Вызначаем памер з дапамогай лічбавага рада з націскных складоў: возьмем за аснову радок, што даў назву твору, і два радкі — працытаванае аўтарам пажаданне аднавяскоўцаў, падказанае ім у сваю чаргу словамі народнай песні («Помню, помню праз гады»; «Выпі, золатца, вады, / Сэрца супакоіцца»). Схема і лічбавыя рады наступныя:

–́ ∪ –́ ∪ –́ ∪ –́ — 1, 3, 5, 7
–́ ∪ –́ ∪ ∪ ∪ –́ — 1, 3, 7
–́ ∪ ∪ ∪ –́ ∪ ∪ — 1, 5

Як бачым, першы радок чыста харэічны, узорны, сведчыць, што верш напісаны чатырохстопным харэем. У другім радку — 3-я, у трэцім — 2-я і 4-я стопы — пірыхій, націск прапушчаны, бо ў рад становяцца доўгія словы. Аднак і ў гэтых радках па чатыры стапы (уключаючы ўсечаныя). Робім вывад: верш напісаны чатырохстопным харэем, ускладненым стопамі пірыхія.

Менавіта гэтыя стопы надаюць размоўнасць інтанацыі. Такім чынам, вершы напісаны памерамі, якімі перадаецца розны (медытатыўны, філасофскі і радасна-мажорны) змест.

Пытанне пятае — *Якімі рысамі паэзія Я. Янішчыц блізкая да вуснай народнай творчасці?* — грунтоўна раскрыта ў вучэбным дапаможніку. На прыкладзе верша «Помню, помню праз гады...» выразна відаць захапленне паэтэсы фальклорам, якое выявілася і ў песеннай інтанацыі, і ў выкарыстанні народнай фразеалогіі («золатца», «сэрца супакоіцца»), сталых эпітэтаў («сцежкі-птушкі вольныя», «сонейка высокае»), харэічнага метра, вобразаў (вобраз крыніцы з гаючай вадой).

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць літаратурную кампазіцыю — чытанне твораў Я. Янішчыц, якія спадабаліся вучням (добра было б выпусціць класную насценную газету пра жыццё і творчасць «ластаўкі Палесся»); пазнаёміцца з артыкулам дапаможніка, прысвечаным жыццю і творчасці Г. Марчука (с. 172—181), і прачытаць яго навелы.

## ГЕОРГІЙ МАРЧУК

### УРОК.

### Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Навелы «Канон Богу», «Канон Базару», «Канон Гарыні», «Канон Маці»

Асноўнымі метадамі, якімі можа карыстацца на ўроку настаўнік, з'яўляюцца слова настаўніка, выбарачнае чытанне твораў і гутарка.

З уступнага слова адзінаццацікласнікі даведаюцца пра кароткія звесткі з жыцця і творчасці Г. Марчука. Асаблівы акцэнт варта зрабіць на месцы нараджэння будучага пісьменніка — Давыд-Гарадок, які згаданы ім у многіх творах. Гэта ўнікальны куток Беларусі, які размяшчаецца ў маляўнічым палескім краі, там, дзе паўнаводная Гарынь зліваецца з прыгажуняй Прыпяццю. Давыд-Гарадок мае багатую гісторыю. Вось як, на-

прыклад, апісаны гэты край адным з яго сыноў У. Глушаковым: «Давыд-Гарадоцкая зямля... У светлай гарыньскай вадзе, якую і ў ліпеньскую спёку студзяць нябачныя струмені крыніц, што ўзыходзяць наверх з пясчанага дна, захавана таямніца твайго заснавальніка; вось і да гэтае пары вучоныя мужы не прыйшлі да адзінай высновы: яцвяжскі князь, які прыняў тут пры хрышчэнні імя Давыда, заснаваў паселішча ці не. Як сцвярджае вядомы беларускі этнограф Павел Шпілеўскі, горад быў заснаваны князем валынскім Давыдам Ігаравічам. Гарадок цікавы не толькі з пункту погляду яго гістарычнага мінулага, але і самімі людзьмі, крыху смуглаватымі, з адметнымі прозвішчамі: Бесан, Койдан, Сеген, Майсюк, Сайдал...». На гэтай зямлі нарадзіліся многія вядомыя сёння мастакі слова: У. Глушакоў, Л. Дранько-Майсюк, Г. Марчук. Немалаважнае значэнне для разумення станаўлення Г. Марчука як пісьменніка мела выхаванне, якое па прычыне ранняй смерці бацькоў хлапчука адбывалася ў сям'і бабулі і дзядулі.

Дома адзінаццацікласнікі пазнаёміліся з артыкулам дапаможніка, прысвечаным жыццю і творчасці Г. Марчука. Настаўнік просіць вучняў: *Акрэсліце вызначальныя рысы характару мастака слова*. Абапіраючыся на матэрыял артыкула, вучні адзначаюць сілу волі пісьменніка, яго здольнасць супрацьстаяць нялёгкім жыццёвым абставінам, мэтанакіраванасць, выключную працавітасць, арганізатарскія здольнасці.

Наступная частка ўрока прысвячаецца аналізу «Давыд-гарадоцкіх канонаў». Яны невялікія па аб'ёме, таму ўрыўкі з іх можна зачытваць у класе ў працэсе работы. Пры вывучэнні «Канона Богу» настаўніку мэтазгодна выкарыстаць метад эўрыстычнай гутаркі па наступных пытаннях:

*1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад прачытанага твора. Зыходзячы з уласных рэлігійных перакананняў ацаніце светапоглядную пазіцыю гарадчукоў і тое месца, якое ў ёй адводзіцца Богу.*

*2. Карыстаючыся матэрыялам артыкула вучэбнага дапаможніка, прысвечанага навелам Г. Марчука (с. 175—181), вызначце, якое з прыведзеных значэнняў слова «канон» выкарыстаў аўтар, даючы назву сваім творам.*

*3. У «Каноне Богу» аўтар вылучыў каля трыццаці пастулатаў «у стасунках гарадчукоў з Богам». Назавіце і асэнсуйце іх значэнне ў жыцці местачкоўцаў.*

Пры аналізе «Канона Маці» настаўнік звяртае ўвагу вучняў, што менавіта гэты твор завяршае цыкл навел, якія пачынаюцца з «Канона Богу». Пытанні для гутаркі:

*1. Аб чым сведчыць такая кампазіцыйная структура нізкі?*

*2. Падзяліце «Канон Маці» на сэнсавыя часткі. Дайце назву кожнай. (Уступ, споведзь, запавет, заключэнне.)*

*3. Ахарактарызуйце вобраз сына, які на ўяўнай споведзі перад маці прызнаецца: «Мамо, не было і дня, каб я не ўспамінаў цябе».*

*4. Паразважайце над пісьменніцкім прынцыпам: расказваючы пра землякоў, імкнуцца іх прыхарошваць.*

*5. Звярніце ўвагу на запавет. Як ён характарызуе героя твора?*

*6. У чым бачыць аўтар сэнс чалавечага жыцця? Выкажыце свае адносіны да аўтарскай пазіцыі.*

Пры аналізе «Канона Гарыні» можна выкарыстаць наступныя пытанні:

*1. Якую ролю ў жыцці гарадчукоў займае Гарынь?*

*2. Як адносіцца аўтар да ракі свайго дзяцінства? Чым тлумачацца такія адносіны?*

*3. Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў стварае пісьменнік характар ракі?*

*4. Асэнсуйце функцыю вобраза рыбака ў творы. Якія тыповыя рысы гарадчукоў увасоблены ў гэтым вобразе?*

*5. Вызначце сімвалічны сэнс вобраза Гарыні ў навеле.*

Сёння вельмі плённа развіваецца духоўная і матэрыяльная культура гарадчукоў, якую памнажаюць шаўцы, рыбакі, мастакі-жывапісцы, цесляры, рэзчыкі па дрэве, гандляры. Традыцыйнымі былі і застаюцца для гэтага краю кірмашы, на якіх людзі прадаюць плён сваёй працы і купляюць неабходныя рэчы. Таму невыпадкова да апісання базару звяртаюцца амаль усе творцы, народжаныя на гэтай зямлі.

Настаўніку варта прапанаваць вучням параўнаць апісанне кірмашу, зробленае У. Глушаковым, Л. Дранько-Майсюком і Г. Марчуком.

**У. Глушакоў:** «У вазках тых, аздобленых бляшанымі ўзорамі і каруначкамі, чаго толькі няма: бурштынавы мёд у пузатых выдзеўбаных бачурках-мігах, важкія пліткі жоўтага свечачнага воску — комы, кублы, даверху набітыя салёным салам, кашы з ежай, вінам, загорнутая ў шчыльную льняную тканіну вяндліна, вялікія вязкі вяленай рыбы, уюноў і сушаных белых грыбоў, цюкі авечай воўны, мяхі з пушнінай, соллю, вострымі прыправамі — гваздзікай, карыцай, перцам, рулоны палатна, сукна і колькі яшчэ ўсялякага дабра!»

**Л. Дранько-Майсюк:** «*Место* — так у Гарадку яшчэ зусім нядаўна называлі і цэнтр горада, і сам базар, і не знаць, што ў пятніцу і ў нядзелю ў Гарадку базар, усё адно як не знаць, што алфавіт пачынаецца з літары А...

Нешта блізкае да рэлігійных пачуццяў узнікала ў душы, калі гаворка заводзілася пра гандаль.

— Куды ідзеш! — пыталася, напрыклад, суседка Маня ў суседкі Адаркі.

— На место! — з мяккай урачыстасцю ў лагодным пакорлівым голасе адказвала Адарка і тут жа хрысцілася...

Вясновы продаж кветкавага насення вёў да большай заможнасці і задавальнення сабой, таму гэты від сезоннага гандлю (назаву яго *вясняніцтвам*!) стаў у Гарадку ці не асноўнай работай, а таксама ж займеў апісальную назву: ехаць на вясну, ці, кажучы па-мясцоваму, — на вэсну, і самі гарадчукі пачалі называць сябе *вяснянікамі*, або *васнянікамі*. Спачатку вясняніцтвам займаліся толькі мужчыны, але вось у 1933 годзе на вэсну паехала мяшчанка Ганна Ткачык, і яна стала першай гарадзецкай *вясняніччкай*. Ці не пра яе гэта песня:

На базары я стаю
І насенне прадаю —
Не праходзьце, людцы дарагія!
А купіце... Ну, хоць раз...
І пасейце... Толькі ў час...
Кветкі вырастуць у вас
Залатыя!
Аж дзівуецца базар —
Самы лепшы мой тавар!
І ярчэйшыя мае цікеткі!
Падыходзьце, вас прашу,
Да зярнятка пакажу
І як сеяць раскажу
Дзіва-кветкі».

Настаўнік задае пытанні:

*1. Чым з'яўляецца базар для гарадчукоў? Чаму? Што дало падставу аўтару сказаць: «Будзённых базараў тут не бывае. Усе святочныя»?*

*2. Як выяўляецца характар жыхароў Гарадка праз паводзіны на базары?*

Заключная частка ўрока можа быць праведзена ў форме гутаркі па наступных пытаннях:

*1. У якіх літаратурных жанрах працуе пісьменнік?*

*2. Якія тэмы дамінуюць у творах Г. Марчука?*

*3. Назавіце найбольш значныя творы пісьменніка.*

*4. Чаму Г. Марчук лічыць, што Гарынь першай выхоўвае і загартоўвае характар чалавека?*

*5. Чаму пісьменнік параўноўвае раку з часам? Што яднае іх?*

*6. Якія адметнасці мясцовага базара падкрэслівае Г. Марчук у навеле «Канон Базару»?*

❒ **Дамашняе заданне:** узгадаць цыкл нарысаў У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі», звярнуць увагу на тое, як знакаміты беларускі класік апісвае Давыд-Гарадок, параўнаць яго назіранні з назіраннямі Г. Марчука, даць ім уласную ацэнку; прачытаць драму «Князь Вітаўт» або «Чорная панна Нясвіжа» А. Дударава.

## АЛЯКСЕЙ ДУДАРАЎ

На тэму «Аляксей Дудараў» у XI класе праграмай адводзіцца ўсяго дзве гадзіны, за якія настаўніку неабходна даць вучням кароткія звесткі пра драматурга, зрабіць аналіз драмы «Князь Вітаўт» або драмы «Чорная панна Нясвіжа» (на выбар настаўніка), вывучыць па тэорыі літаратуры паняцце пра гістарычную драму. У сувязі з гэтым можна прапанаваць наступную сістэму ўрокаў:

**урок 1** — «Уступныя і арыентацыйныя заняткі па драме "Князь Вітаўт" або "Чорная панна Нясвіжа" Аляксея Дударава. Характарыстыка вобразаў. Развіццё сюжэта»;

**урок 2** — «Заключныя заняткі. Кампазіцыйная і жанравая адметнасць п’есы “Князь Вітаўт” або “Чорная панна Нясвіжа”. Паняцце пра гістарычную драму».

## УРОК 1.

### Уступныя і арыентацыйныя заняткі па драме «Князь Вітаўт» або «Чорная панна Нясвіжа» Аляксея Дударава. Характарыстыка вобразаў. Развіццё сюжэта

На ўступным этапе неабходна пазнаёміць клас з творчым шляхам драматурга, каб у пэўнай ступені падвесці да ўспрымання твора. Гэта можна зрабіць рознымі шляхамі. Першы спосаб: даць заданне лепшым вучням падрыхтаваць паведамленне. Эфектыўным можа быць і другое метадычнае рашэнне: настаўнік сам знаёміць клас з творчай біяграфіяй А. Дударава, акцэнтуючы ўвагу на асноўных этапах жыцця пісьменніка. Мэтазгодна падключыць успаміны драматурга, якія змешчаны ў аўтабіяграфічных нататках «Я родам з дзяцінства». А. Дудараў з любоўю расказвае пра сваіх бацькоў, пра сваю родную вёску Кляны, невялікую рэчку Расасенку, якая працякала непадалёку:

«Бацька, Ануфрый Іосіфавіч Дудараў, прыйшоў з вайны. Гвардыі старшына.

Маці, Дударава Анастасія Яўхімаўна, перажыла ўсю акупацыю, бежанства і іншыя жахі разам з маленькімі дачушкамі Дзінай, якая нарадзілася ў 1937 годзе, і Надзяй, якой «пашчасціла» з’явіцца на свет 20 чэрвеня 1941 года.

Выжылі. Страшная статыстыка кожнага чацвёртага (а можа, і трэцяга) іх не зачапіла. Калі я ўжо быў дарослым, то зразумеў, што гэтая статыстыка дабрала сваё ў нейкай іншай беларускай сям’і, і там ужо трэба весці гаворку пра кожнага другога, а можа, нават і першага...

Узімку было шмат снегу, сумёты аж да стрэх. Завірухі, нехта ў коміне выў.

Увесну разводдзе, крыгі па Расасенцы, ручаі, што білі сонцам у вочы.

Улетку шмат сонца, цёплыя віры ў Расасенцы, чаканне самага любімага свята, Купалля, калі ўсю ноч абавязкова трэба было не спаць.

Восень я не любіў. У самы пачатак яе, што быў падобны на працяг лета, трэба было капаць бульбу: школа пасылала вучняў у калгас, пасля школы трэба было на свае соткі. Спіна баліць, рукі ў ссохлай гразі.

А пазней усё памірае. Холад, цемрадзь, “цёмныя ночы восені”, як казаў Караткевіч, доўгія, тужлівыя. <...>

Вечарамі збіраліся мужчыны то ў адной, то ў другой хаце, іншым разам з чаркай, іншым толькі з самакруткамі, успамінамі. Пра вайну, якая яшчэ была блізка, ад якой зямля яшчэ была гарачая. Расказвалі хто пра партызанаў, хто пра Сталінград, хто пра канцлагер, хто пра штрафбат.

Для мяне было шчасцем, калі мужыкі збіраліся ў нашай хаце. Ляжаў на печы (восень, зіму і вясну — гэта быў мой прытулак. На лета я перабіраўся ў пуньку на сена) і слухаў, слухаў, слухаў... Гаварылі пра тое, што нельга было пачуць на ўрачыстых сходах і па радыё, не пачытаць у літаратуры. Хіба што ўжо пасля, у творах Быкава, Адамовіча, Астаф’ева.

І калі ў мяне пытаюцца, адкуль у мяне веды пра вайну, заўсёды адказваю — адтуль. Ад бацькі, з пракураных кляноўскіх хат і ад лепшай літаратуры пра вайну».

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў, што ў 1962 годзе сям’я пераехала ў вёску Зарубы, на радзіму Анастасіі Яўхімаўны, пачалі будаваць новую хату. Але ў 1963 годзе іх напаткала страшнае гора — памерла маці. Таму пасведчанне аб заканчэнні васьмігодкі Аляксей атрымліваў у Андрэеўскай школе-інтэрнаце. Згуртаваць сям’ю змагла добрая беларуская жанчына Агаф’я Ксенафонтаўна, мачаха, якую дзеці палюбілі як родную маці.

Настаўнік можа ўзгадаць, што няпростым і нялёгкім быў шлях А. Дударава да драматургіі. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1967 годзе юнак марыў стаць афіцэрам, але не прайшоў медыцынскую камісію. Паступіў у Наваполацкае ГПТВ-28 нафтавікоў, а праз год прызвалі ў армію. У аўтабіяграфіі А. Дудараў згадвае: «Пасля дэмабілізацыі два гады працаваў слесарам кантрольна-вымяральных прыбораў на Полацкім нафтаперапрацоўчым. Карацей, традыцыйна, як і ва ўсіх тых, хто майго роду-племені. І раптам... За паўгода... Спачатку тэатральны калектыў, потым трохмесячныя курсы афіцэраў запасу.

У чэрвені 1972 года стаў малодшым лейтэнантам, а ў ліпені гэтага ж года — студэнтам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута акцёрскага факультэта».

Настаўнік акцэнтуе ўвагу на тым, што вучоба ў тэатральна-мастацкім інстытуце паўплывала на далейшыя творча-эстэтычныя пошукі пісьменніка. У гэты час ён захапіўся драматургіяй і пачаў пісаць драматычныя творы. Сваю дыпломную працу — ролю ў выпускным спектаклі — іграў А. Дудараў таксама паводле сваёй першай уласнай п'есы «Выбар».

Наступным этапам творчасці драматурга стала праца акцёрам у Тэатры юнага гледача, пра што яскрава засведчыў пісьменнік у аўтабіяграфіі:

«Ранкам рэпетыцыі, вечарамі спектаклі. Па начах пісаў.

Апавяданні... Сцэнарыі... П'есы...

У 1979 годзе наш выдатны паэт Генадзь Бураўкін (ён тады ўзначальваў Дзяржтэлерадыё БССР), прачытаўшы адзін з маіх кінасцэнарыяў, патэлефанаваў у тэатр (на кватэры тэлефона ў мяне не было), дачакаўся, пакуль мяне знойдуць і сказаў: "Не ведаю, які ты акцёр, а тое, што літаратура — твой шлях, не сумняваюся". І прапанаваў перайсці з тэатра на "Тэлефільм", дзе па маіх сцэнарыях ужо былі зняты кароткаметражкі "Кола" і "Дэбют", якія ўзяло Цэнтральнае тэлебачанне. Першыя мастацкія стужкі.

Так скончылася маё акцёрскае жыццё і пачалося 30-гадовае жыццё літаратурнае».

Далей настаўнік заўважае, што новым этапам творчасці драматурга стаў час, калі з 1991 па 2002 год А. Дудараў займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Мастацтва Беларусі» (зараз «Мастацтва»). Але праца не перашкодзіла яму плённа займацца і драматургічнай дзейнасцю. У гэты перыяд яго творчасці з'яўляецца гістарычная тэма, з-пад пяра драматурга выходзяць гістарычныя драмы «Вежа» (1991 г.), «Князь Вітаўт» (1993 г.), «Купала» (1994 г.), «Адцуранне» (1994 г.), «Палачанка» (1997 г.), «Чорная панна Нясвіжа» (1998 г.), «Прынц Мамабук» (1999 г.), «Крыж» (2001 г.) і многія іншыя. Пісьменнік так тлумачыў прычыны звароту да гістарычнага мінулага Беларусі: «Мне там цікава. А ў сённяшнім дні нецікава. Таму і з'явіліся гістарычныя

п’есы. Я раней пра каханне пісаў — светлае, добрае пачуццё, але яно праходзіла ўскосна. У “Князю Вітаўце” яго больш, у “Палачанцы” таксама. А ў “Чорнай панне Нясвіжа” — поўнае каханне. Упэўнены, што гэты матэрыял будзе глядзецца. Бо прыгожа, там багата пачуцця».

А. Дудараў у сваім інтэрв’ю заўважае, што «творчасці ніхто ніколі перашкодзіць не зможа. Калі ёсць, што выказаць, — абавязкова выкажаш. Хай для гэтага не будзе ні ўмоў, ні часу, ні месца. Хай хоць увесь свет перашкаджае, тое, што павінна быць напісана — напісана будзе».

### Драма «Князь Вітаўт»

Настаўніку мэтазгодна спачатку праверыць прачытанне вучнямі п’есы. З гэтай мэтай можна прапанаваць класу выканаць заданні на картках, выкарыстоўваючы рэпрадуктыўныя пытанні:

*1. Хто выратаваў з палону князя Вітаўта?*

*2. Якім чынам быў забіты Кейстут?*

*3. З кім ажаніўся Ягайла?*

Далей настаўнік просіць вучняў абмяняцца думкамі і ўражаннямі ад прачытанага твора:

*1. Якое ўражанне зрабіў на вас твор? Якія цікавыя эпізоды вам запомніліся?*

*2. Якія развагі, думкі, пачуцці і чаму выклікала ў вас п’еса «Князь Вітаўт» А. Дударава?*

*3. Хто з герояў п’есы вам спадабаўся і чаму? Каго асуджаеце і за што?*

*4. Падумайце, каго з персанажаў можна лічыць носьбітам аўтарскага ідэалу, а каго — не.*

Настаўнік прыступае да аналізу п’есы «Князь Вітаўт». З гэтай мэтай ён прапануе вучням адказаць на наступныя пытанні:

*1. Калі і дзе адбываюцца падзеі ў п’есе?*

*2. Назавіце галоўных герояў твора. Якія рысы характару раскрываюць яны праз свае ўчынкі?*

*3. Якія гістарычныя падзеі адлюстраваны ў драме? Якім чынам уводзяцца аўтарам у сюжэт фантастычныя эпізоды, звязаныя з міфалагічнымі вобразамі Купалы і беражніц?*

*4. Які канфлікт ляжыць у аснове твора? Якое вырашэнне для яго знаходзіць драматург?*

Пасля гутаркі з класам настаўнік робіць падагульненне. П'еса «Князь Вітаўт» аднаўляе падзеі сівой даўніны, XIV стагоддзя, калі ствараласяся дзяржава беларускага народа — Вялікае Княства Літоўскае, калі за ўладу змагаліся два стрыечныя браты — Вітаўт і Ягайла.

У п'есе адлюстраваны барацьба за ўладу паміж Ягайлам і Вітаўтам, забойства Кейстута, шлюб і каранацыя Ягайлы, пагадненне Ягайлы з Вітаўтам — гістарычныя падзеі, якія напоўнены асаблівым драматызмам, маюць вострую канфліктнасць. Асаблівасцю кампазіцыі гэтай драмы з'яўляецца тое, што ў ёй спалучаюцца два планы: рэалістычны, звязаны з гістарычнымі падзеямі, і фантастычны, населены міфалагічнымі вобразамі (Купала, беражніцы). Гэтыя планы ў творы ўвесь час перакрыжоўваюцца і пераходзяць адзін у другі. Адметным у п'есе з'яўляецца і тое, што дзеянне пастаянна пераносіцца то ў Гародню, то ў Трокі, то ў Крэва, то ў Кракаў, то ў Вільню. У аснове твора ляжыць канфлікт паміж двума стрыечнымі братамі — Вітаўтам і Ягайлам, які на працягу п'есы ўзбуйняецца, завастраецца і пераходзіць у маральна-этычны канфлікт паміж дабром і злом.

Далей настаўнік прапануе вучням ахарактарызаваць Вітаўта і Ягайлу. Пасля характарыстыкі вобразаў можна прапанаваць вучням паразважаць над пытаннямі: *Як у п'есе «Князь Вітаўт» вырашаецца праблема асабістага шчасця? Якую думку сцвярджае аўтар у творы?*

Пасля гутаркі з класам настаўнік робіць высновы. Праблема асабістага шчасця ў п'есе вырашаецца з дапамогай вобразаў Вітаўта, Ягайлы, Ядвігі, пакаёўкі Алены. І Ягайла, і Вітаўт асабістае шчасце ставяць на другі план, бо бяруць шлюб не з тымі жанчынамі, якіх кахаюць, а з тымі, хто выгадны для ўмацавання дзяржавы. Таксама і польская каралева Ядвіга адмаўляецца ад свайго кахання да прынца аўстрыйскага Вільгельма, дзеля інтарэсаў Польшчы згаджаецца на шлюб з Ягайлам. А пакаёўка Алена ахвяруе сваім жыццём дзеля выратавання князя Вітаўта. У драме «Князь Вітаўт» сцвярджаецца думка, што галоўнымі каштоўнасцямі на зямлі з'яўляюцца любоў, еднасць, згода і мір.

У канцы ўрока праводзіцца рэфлексія: *Падумайце, чаму А.Дудараў назваў п'есу «Князь Вітаўт», а не «Кароль Ягайла»?*

❒ **Дамашняе заданне**: зрабіць параўнальную характарыстыку вобразаў Вітаўта і Ягайлы.

### Драма «Чорная панна Нясвіжа»

Спачатку настаўнік прапануе вучням абмяняцца ўражаннямі пра п'есу:

*1. Якія пачуцці выклікаў у вас твор?*

*2. Якія эпізоды з драмы «Чорная панна Нясвіжа» вам асабліва запомніліся і чаму?*

*3. Хто з герояў вам найбольш спадабаўся? Чаму?*

Праверыць прачытанне тэксту настаўнік можа такім шляхам: прапанаваць вучням пераказаць сюжэт п'есы па так званым ланцужку: адзін вучань пачынае, другі працягвае і г. д. Гэта дасць магчымасць уключыць увесь клас у актыўную працу.

Затым праводзіцца гутарка па наступных пытаннях:

*1. Якія гістарычныя факты пакладзены ў аснову сюжэта п'есы «Чорная панна Нясвіжа»?*

*2. У чым выяўляецца канфлікт п'есы?*

*3. Чым вызначаецца кампазіцыя драмы «Чорная панна Нясвіжа»?*

*4. Пералічыце герояў твора. Каго з іх можна назваць галоўнымі і чаму?*

*5. Якія адносіны звязваюць герояў твора? Сцісла перакажыце эпізоды, дзе яны сутыкаюцца паміж сабой.*

*6. Ахарактарызуйце персанажаў п'есы.*

*7. Якая праблема вырашаецца ў п'есе? Якую думку сцвярджае аўтар?*

У канцы ўрока праводзіцца рэфлексія: *Паразважайце, як вырашаецца ў творы праблема кахання і ўлады.*

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Праблема кахання і ўлады ў драме "Чорная панна Нясвіжа"».

## УРОК 2.

## Заключныя заняткі. Кампазіцыйная і жанравая адметнасць п’есы «Князь Вітаўт» або «Чорная панна Нясвіжа». Паняцце пра гістарычную драму

### П’еса «Князь Вітаўт»

Настаўнік пачынае ўрок з паўтарэння пройдзенага матэрыялу. Мэтазгодна для гэтага правесці франтальнае апытванне:

*1. Вызначце асноўныя этапы творчасці А. Дударава.*

*2. Якія фактары ўплывалі на мастацкае сталенне драматурга?*

*3. Які канфлікт ляжыць у аснове драмы «Князь Вітаўт»?*

*4. У чым выявілася наватарства Дударава-драматурга ў п’есе «Князь Вітаўт»?*

*5. У чым асаблівасць кампазіцыі драмы «Князь Вітаўт»?*

*6. Якія галоўныя агульначалавечыя каштоўнасці сцвярджаюцца ў п’есе?*

Затым настаўнік правярае дамашняе заданне. Адзін з вучняў робіць параўнальную характарыстыку вобразаў Вітаўта і Ягайлы, а астатнія ўдзельнічаюць у абмеркаванні.

Пасля гэтага настаўнік пераходзіць да вывучэння новага матэрыялу і прапануе вучням адказаць на наступныя пытанні:

*1. Успомніце, на якія роды падзяляецца мастацкая літаратура?*

*2. Да якога роду літаратуры трэба аднесці п’есу «Князь Вітаўт» А. Дударава і чаму?*

*3. Якія спецыфічныя адметнасці характэрныя для жанру драмы?*

*4. Чаму п’еса А. Дударава «Князь Вітаўт» па сваіх жанравых адметнасцях з’яўляецца драмай?*

*5. Якой мовай (вершаванай ці празаічнай) напісана гэта п’еса?*

*6. Якія падзеі адлюстраваны ў творы?*

*7. Якія героі дзейнічаюць у драме «Князь Вітаўт»?*

Пасля адказаў вучняў настаўнік звяртае ўвагу, што ў творы выразна выявіўся наватарскі падыход А. Дударава да ўвасаб-

лення падзей гістарычнага мінулага. Перш за ўсё, у гэтай п'есе выкарыстана вершаваная мова, напісаная класічным пяцістопным ямбам. Па-другое, у ёй акрамя гістарычных асоб (Вітаўта, Ягайлы, Кейстута) дзейнічаюць і міфалагічныя багі, духі (Купала, беражніцы). Па сваіх жанравых адметнасцях п'еса «Князь Вітаўт» належыць да гістарычнай драмы, бо ў ёй гістарычныя падзеі — барацьба за ўладу паміж Ягайлам і Вітаўтам, забойства Кейстута, шлюб і каранацыя Ягайлы, пагадненне Ягайлы з Вітаўтам — напоўнены асаблівым драматызмам, маюць вострую канфліктнасць.

Настаўнік прапануе вучням прачытаць у падручніку артыкул па тэорыі літаратуры пра гістарычную драму (с. 190) і выпісаць у сшытак азначэнне жанру.

У канцы праводзіцца рэфлексія: *Паразважайце, чаму п'еса «Князь Вітаўт» з'яўляецца гістарычнай драмай?*

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць пісьмовы адказ на тэму (на выбар): 1. «Вітаўт і Ягайла — тыповыя прадстаўнікі ўлады часоў Сярэдневякоўя»; 2. «Праблема асабістага шчасця ў драме "Князь Вітаўт" А. Дударава»; 3. «Жанравыя і кампазіцыйныя адметнасці п'есы "Князь Вітаўт" А. Дударава».

## П'еса «Чорная панна Нясвіжа»

Урок пачынаецца з праверкі дамашняга задання. Адзін з вучняў зачытвае паведамленне на тэму «Праблема кахання і ўлады ў п'есе "Чорная панна Нясвіжа" А. Дударава», а другі аналізуе адказ таварыша.

Пасля гэтага настаўнік звяртаецца да класа з пытаннямі:

*1. Якія роды мастацкай літаратуры вы ведаеце?*

*2. Да якога роду літаратуры адносіцца п'еса «Чорная панна Нясвіжа»?*

*3. Якімі спецыфічнымі рысамі вызначаецца жанр драмы?*

*4. Чаму п'есу А. Дударава «Чорная панна Нясвіжа» можна аднесці да жанру драмы?*

*5. Якія гістарычныя падзеі паказаны ў творы?*

Выслухаўшы адказы вучняў, настаўнік робіць выснову, што ў творы А. Дудараў паказвае гісторыю кахання караля Жыгімонта

і Барбары Радзівіл у рамантычным асвятленні. Сам А. Дудараў жанр п’есы вызначыў як драматычную паэму ў трох частках, але даследчыкі адзначаюць, што гэты твор з’яўляецца гістарычнай драмай з элементамі меладраматызму і рамантызацыі, таму што ў ім гістарычныя падзеі падаюцца ў вострых жыццёвых супярэчнасцях, рамантызуюцца чалавечыя пачуцці.

Такім чынам настаўнік падводзіць вучняў да вывучэння паняцця пра гістарычную драму. Ён звяртаецца да класа з пытаннямі: *Які жанр у драматургіі называецца драмай? Як вы думаеце, у чым спецыфіка гістарычнай драмы як жанру драматургіі?*

❐ **Дамашняе заданне**: зрабіць праблемна-вобразны аналіз драмы «Чорная панна Нясвіжа» А. Дударава (якія праблемы і на аснове якіх вобразаў яны вырашаюцца ў творы). Перад вывучэннем наступнай тэмы варта даць апераджальнае дамашняе заданне асобным вучням: падрыхтаваць рэфераты па наступных тэмах: «Жанравы стан сучаснай беларускай лірыкі», «Мой любімы сучасны паэт», «Тэмы і праблемы сучаснай беларускай паэзіі».

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ (з сярэдзіны 1980-х гадоў)

## ПАЭЗІЯ

### УРОК 1.

### Жанрава-тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі

Асноўным метадам работы на ўроку будзе лекцыя настаўніка, якая спалучаецца з эўрыстычнай гутаркай, дыспутам, самастойнай працай вучняў (рэфераты, канспекты, праца па вучэбным дапаможніку), выразным чытаннем урыўкаў з паэтычных твораў; можна выкарыстаць абарону праектаў ці справаздачы творчых груп па апераджальных заданнях.

У лекцыі па аглядавай тэме трэба закрануць наступныя пытанні:

- назва эпохі, яе часавыя межы (канец XX — пачатак XXI ст.);
- агульная характарыстыка грамадска-палітычнага жыцця (яго найважнейшых падзей);
- адметнасць культуры дадзенай эпохі (тэатр, музыка, жывапіс і інш.);
- характарыстыка літаратурнага працэсу (кароткія звесткі пра літаратурныя школы, кірункі, плыні; жанравая і тэматычная разнастайнасць; найбольш значныя імёны, творы);
- кароткая характарыстыка творчасці асобных пісьменнікаў, якія не вывучаюцца манаграфічна.

Пры вывучэнні творчасці акрэсленых праграмай аўтараў можна выкарыстаць таксама тэматычна-праблемны прынцып:

- вылучыць філасофскі напрамак у сучаснай паэзіі, адзначыць пошукі новых жанраў і формаў твораў;

- разгледзець інтымную лірыку, паказаць яе разнастайнасць;
- даць ацэнку грамадзянскай паэзіі на сучасным этапе;
- паказаць асэнсаванне чарнобыльскай тэмы ў сучаснай беларускай паэзіі;
- даць звесткі пра ўрбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на прадстаўленасць сучаснай паэзіі шматлікімі пісьменніцкімі пакаленнямі: класікі (П. Броўка, Максім Танк, П. Панчанка, А. Куляшоў); «ваеннае пакаленне» (А. Пысін, М. Аўрамчык, А. Русецкі, Н. Гілевіч, А. Лойка, М. Арочка), «філалагічнае пакаленне» (Р. Барадулін, У. Караткевіч, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, П. Макаль, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў і інш.), сямідзясятнікі (А. Разанаў, Я. Янішчыц, Л. Дранько-Майсюк, Л. Галубовіч, Р. Баравікова, Т. Бондар, А. Сыс і інш.); самая маладая генерацыя (В. Жыбуль, А. Хадановіч, В. Трэнас, Т. Сівец і інш.).

Трэба падкрэсліць, што на сучасным літаратурным працэсе пазітыўна адбіўся актыўны ўдзел у ім моладзі, стварэнне ёю творчых суполак. Найбольш плённымі сталіся пошукі членаў створанай у 1987 годзе літаратурнай суполкі «Тутэйшыя» А. Асташонка, П. Васючэнкі, А. Глобуса, С. Кавалёва, А. Сыса і інш. (гл. матэрыял вучэбнага дапаможніка). Напрыканцы мінулага стагоддзя (1993 г.) было створана «Таварыства вольных літаратараў» (І. Сідарук, А. Аркуш, Л. Сільнова, Л. Сом і інш.), мастацкая праграма якога зводзілася да адмаўлення ранейшых традыцый і культурнага цэнтрызму сталіцы. У 1995 годзе з'явіўся новы літаратурны рух — «Бум-Бам-Літ» (З. Вішнёў, С. Мінскевіч, А. Туровіч, В. Жыбуль і інш.). Творчасць, паводле тэорыі і практыкі гэтага таварыства, павінна адмовіцца ад класічнага жанрава-тэматычнага аблічча, уяўляць сабой своеасаблівую эпатажную самапрэзентацыю аўтараў, слова якіх атрымала б права на існаванне па-за тэкстам, па-за перадачай інфармацыі.

Выразным прыкладам самастойнага існавання слова (як звышадзінкі) па-за тэкстам з'яўляецца наступны верш пра каханне В. Жыбуля:

Я хачу паварушыць тваім хвастом,
я мару падыхаць тваімі жабрамі
і, каб шырэй наглядзецца тваім хараством,
з вачэй сцерці водрасці швабраю.

Па вадзе ад цябе расплываюцца кругі
з-за цяністага куста эладэі.
Ты лямпавы промні збіраеш у стагі.
Навучы мяне так. Я не ўмею.

Мы сядзім і чакаем, што ж будзе далей,
не хаваючы закаханыя твары.
Я хачу да цябе дакрануцца, але
мы жывём у розных акварыумах.

Нягледзячы на слоўную эквілібрыстыку, падобную да стылёвых пошукаў футурыстаў В. Хлебнікава, І. Севяраніна і А. Кручоных, які назваў шэдэўральнымі пяць сваіх радкоў «дыр бул щыл / уберщур / скум / вы со бу / рлэз», вершы маладых паэтаў кранаюць сімвалічнасцю (словы і думкі матэрыялізуюцца!) і незвычайнасцю (свежасцю) вобразнасці: «Ты лямпавы промні збіраеш у стагі» — каханая паўстае як усемагутная і магнетычная чараўніца, свет якой з'яўляецца супрацьлеглым свету лірычнага героя («мы жывём у розных акварыумах» ).

Пытанне пра паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў варта разгледзець на прыкладзе твораў 2—3 паэтаў на выбар: А. Куляшова, Максіма Танка, П. Панчанкі, А. Вярцінскага, А. Разанава, Р. Баравіковай ці інш.

Настаўнік павінен абавязкова адзначыць, што сярод паэтаў-філосафаў Беларусі адно з першых месцаў належыць Максіму Танку, для творчасці якога характэрна імкненне засвоіць традыцыі сусветнай літаратуры (верлібр, танка, хоку, паглыбленая асацыятыўная вобразнасць), разбурыць класічныя каноны, надаць вершам большую прытчападобнасць. Яго філасофская лірыка ўяўляе сабой вышэйшы этап руху мастацкай творчасці беларусаў да інтэлектуалізацыі:

Здавалася, што на ўсё жыццё хопіць
У мяне расплачвацца:
За дабро — дабром,
За забыццё — памяццю,
За абыякавасць — цеплынёй,
За жорсткасць — ласкай.

Філасофскую паэзію класіка нацыянальнай літаратуры можна супаставіць, да прыкладу, з падобнымі творамі Р. Барадуліна ці прапанаваць запоўніць наступную табліцу:

| Пытанні | Максім Танк | Рыгор Барадулін |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |

Гістарычная тэматыка ў літаратуры на сучасным этапе годна прадстаўлена зборнікам «Кніга ўзнаўленняў» А. Разанава — своеасаблівай энцыклапедыяй складанай гісторыі Беларусі. Паэт стварае літаратурныя наследаванні адкрытай дыдактычнай накіраванасці, перакладае на сучасную літаратурную мову творы, напісаныя знакамітымі асветнікамі, рэлігійнымі і дзяржаўнымі дзеячамі (Кірылам Тураўскім, Францыскам Скарынам, Сымонам Будным, Васілём Цяпінскім, Іпаціем Пацеем, Язэпам Руцкім, Кірылам Транквіліён-Стаўравецкім, Мялеціем Сматрыцкім, Львом Сапегам), якія вучаць нашчадкаў «людзьмі звацца». Названай тэме прысвечаны вершы А. Пісьмянкова, Л. Рублеўскай, балады В. Шніпа і інш.

Лірыка кахання вызначае творчае аблічча Р. Баравіковай: назвы яе кніг выразна аб гэтым сведчаць — «Слухаю сэрца», «Каханне», «Пад небам першага спаткання», «Люстэрка для самотнай». Яе вершы надзвычай эмацыянальныя, поўныя экспрэсіі, выказваюць жаданне паэтэсы кахаць і быць каханай, яе парыў да ідэальнага, незямнога пачуцця. У драматычных паэмах «Барбара Радзівіл» і «Саламея» створаны вобразы рэальных гістарычных асоб (Барбары Радзівіл і Саламеі Пільштыновай-Русецкай), жанчын, апантаных каханнем, якія ставяць гэта пачуццё вышэй за ўсё на свеце, для іх нішто ўлада, багацце, спакой.

На думку некаторых даследчыкаў, новай рысай сучаснай паэзіі стаў зварот беларускіх паэтаў (А. Разанаў, Р. Барадулін, І. Багдановіч, Д. Бічэль, М. Шайбак і інш.) да рэлігійна-хрысціянскай і біблейска-філасофскай тэматыкі. Адно з асноўных месцаў у лірыцы паэтаў паступова займае малітва-зварот да Бога з просьбай дапамагчы і падтрымаць Радзіму: «Над бацькаўшчынай сумнай і прыгожай, / Зачараванай чарам летаргіі, / Прыадчыні аблік твой светлы, Божа, / Праліся ў душы тайнай літургіі» (І. Багдановіч), а таксама выратаваць кожнага чалавека.

Тэматычны дыяпазон сучаснай беларускай паэзіі не абмяжоўваецца акрэсленымі вышэй тэмамі. Адным з дамінантных пытанняў, якому прысвячаюць свае творы паэты, становіцца пытанне пра выдаткі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС (калектыўныя зборнікі «Зорка Палын», «Прайсці праз зону», кнігі М. Мятліцкага «Бабчын», «Чаканне сонца», В. Зуёнка «Лета трывожных дажджоў», «Чорная лесвіца», вершы Максіма Танка «Просьба аб дараванні», «Тут Беларусь была», Р. Барадуліна «На схіле двухтысячагоддзя» і інш.). Даследчык сучаснай паэзіі Л. Гарэлік так вызначае ўплыў тэхнагенных катастроф і прыродных катаклізмаў на мастацкую творчасць паэтаў: «Постчарнобыльская эра прынесла непрадказальныя змены ў грамадскую свядомасць, прымусіла задумацца і пераканацца, што пісаць так, як раней, не пажадана. Ці можна пасля Чарнобылю ўвогуле займацца вepisodes вершатворчасцю, марыць пра высокія матэрыі?» Паэты адчуваюць сваю асабістую далучанасць да лёсу роднага краю, немагчымасць, як раней, пісаць радасныя і светлыя вершы пра прыроду: «Нават у мройныя / зорныя ночы / светлыя вершы / прыходзіць не хочуць» (А. Пісьмянкоў).

Шырокае распаўсюджанне ў сучаснай беларускай паэзіі атрымала ўрбаністычная тэматыка. Успрыманне горада ў творчасці паэтаў двухбаковае: гэта не толькі ўслаўленне і любаванне гарадскім жыццём (А. Глобус), але і апісанне жорсткасці і няўтульнасці бяздушнай прасторы (Г. Булыка, Г. Каржанеўская і інш.). Падобны элегічна-тужлівы, часам нават трагедыйны настрой урбаністычнай лірыкі большасці паэтаў тлумачыцца найперш спустошанасцю і здрабненнем чалавечых душ сучаснікаў, апантаных дасягненнем толькі матэрыяльнага дабрабыту.

Дарэчным будзе правядзенне міні-дыскусіі на тэму «Сучасны горад: які ён?» пасля чытання двух урыўкаў з вершаў А. Глобуса і Л. Рублеўскай:

Мне падабаецца: мікрараён —
Жалезны дух у канструктыўным целе,
Дзіцячы пляц і школьны стадыён...
Мне падабаюцца шурпатыя панэлі.
Люблю метро, асветлены вагон
І колы, што на грукат захварэлі.
Люблю, калі састаў бярэ разгон
У доўгім, як працоўны дзень, тунэлі.
Мне да душы падмуркі ў катлаване,
Абмазаныя ў чорную смалу.
Мне да душы ісці па рыштаваннях
На самы найвышэйшы дах. Люблю
Убачыць на дарожным скрыжаванні
Рассыпаную з кузава зямлю.

*А. Глобус. «Сталіца»*

Паламаныя лаўкі прыгожа засцеле лістота,
Паламаныя лёсы прымірацца з болем глухім.
Гэта — восень зямлі, гэта жоўтая песня самоты.
Гэта вочы шкляныя праспекта і цемра над ім.

*Л. Рублеўская. «Гарадскі раманс»*

У апошні час усё больш шырокую прастору ў сучаснай паэзіі заваёўваюць монастрафічныя, нерыфмаваныя вершы: вершаказы, квантэмы, пункціры, хоку, танка А. Разанава і іншых аўтараў. Э. Акулін адрадзіў і надаў новае дыханне газэлі, В. Жыбуль, П. Васючэнка — паліндрому, А. Хадановіч — лімэрыку.

**ДАВЕДКА.** ***Газель*** — від монастрафічнага лірычнага верша, пабудаванага на 3—12 двухрадкоўях (бейтах) з рыфмоўкай **аа, ба, ва** і г. д. У апошнім бейце (макта) павінен упамінацца тахалус (імя ці псеўданім аўтара). Асаблівасць газелі заключаецца ў тым, што кожны бейт утрымлівае завершаную думку і мае адносна самастойнае значэнне.

***Паліндром*** — верш, які можна чытаць у адваротным парадку (з апошняй літары (радка) да першай) без змен зместу.

***Лімэрык*** — пяцірадкоўе, напісанае анапестам, у якім 1, 3, 5-ы радкі складаюцца з трох стоп, а 2-і, 4-ы — з дзвюх з рыфмоўкай **аабба**. Змест кожнага радка ў падобным

творы з'яўляецца рэгламентаваным: у першым адбываецца знаёмства з персанажам, у другім — паведамляецца пра яго дзеянне або асаблівасць (уласцівасць), трэці радок уяўляе сабой развіццё дзеяння, чацвёрты — развязку, а пяты — аўтарскую ацэнку героя.

Пытанне пра жанравыя пошукі сучаснай беларускай паэзіі можна разгледзець на прыкладзе творчасці А. Разанава на заключным уроку, прысвечаным вывучэнню аглядавай тэмы.

Акрамя змешчаных ў вучэбным дапаможніку (с. 202), настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. Ахарактарызуйце паэзію А. Разанава, Л. Дранько-Майсюка, А. Сыса, Я. Янішчыц, Т. Бондар (на выбар)? Якія яе тэматычныя рамкі? Які настрой яна выяўляе? Чым адрозніваецца ад паэзіі, створанай майстрамі слова старэйшых пакаленняў?*

*2. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з наступных тэм: «Грамадзянская лірыка Ніла Гілевіча. Тэма сучаснасці ў ёй», «Максім Танк — майстар верлібра, паэт-філосаф», «Алесь Разанаў і мадэрнізм», «Тэма памяці ў паэзіі Аляксея Пысіна».*

Напрыканцы ўрока настаўнік прапануе вучням запоўніць наступную табліцу:

| План | Літаратура 1960—1985 гг. | Сучасная літаратура |
|---|---|---|
| Храналагічныя рамкі | | |
| Грамадска-сацыяльныя падзеі | | |
| Пісьменнікі, творы | | |
| Асноўныя тэмы, праблемы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Наватарства | | |

❐ **Дамашняе заданне:** стварыць літаратурную карту Беларусі, дзе адзначыць месцы нараджэння паэтаў, прозвішчы якіх згадваліся на ўроку. Некаторым вучням даецца індывідуальнае заданне: падрыхтаваць рэферат, прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Я. Сіпакова[1].

[1] Дадатковым матэрыялам можа служыць выданне: *Сіпакоў, Я.* Замаразкі на першацвет / Я. Сіпакоў // Вытокі песні. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. — Мінск, 1973. — С. 262—270.

## УРОК 2.

### Старонкі біяграфіі і творчасці Янкі Сіпакова. Тэматычны дыяпазон лірыкі паэта

Урок варта пачаць з чытання верша Я. Сіпакова «Дзе нам баліць, там і душа...»:

Дзе нам баліць, там і душа:
З душы ўвесь чалавек сабраны.
Мы адчуваем нечакана:
Дзе нам баліць, там і душа.
Таму чым большая душа, —
Даўжэй шчымяць і ныюць раны.
Дзе нам баліць, там і душа:
З душы ўвесь чалавек сабраны.

Пасля прачытання твора настаўнік можа прапанаваць творчае заданне: падабраць асацыятыўны рад да слова «душа» і даць уласнае вызначэнне гэтага паняцця.

Настаўнік павінен адзначыць, што 10 сакавіка 2011 года Я. Сіпакова не стала.

Наступны этап урока — лекцыя настаўніка аб жыццёвым і творчым шляху Я. Сіпакова або рэферат вучня. У лекцыі настаўнік павінен адзначыць, што першыя зборнікі паэта сведчаць аб яго вернасці метафарычнаму, вобразнаму, а значыць — найбольш архаічнаму светаўяўленню. Свежасць паэтычнага бачання, схільнасць да яркай метафарычнасці, да канкрэтнага ўспрымання, востры зрок і слых, пульсуючы, эмацыянальны радок — усё гэта вартасці паэзіі Я. Сіпакова. Адсюль і яе сувязь з прыродай, навакольным асяроддзем, «зямная першароднасць», калі так можна сказаць, бо Я. Сіпакоў імкнецца паказаць унутраны стан чалавека, які ўсімі каранямі звязаны з роднай зямлёй, з народам, усім ачалавечаным светам. І разам з тым яго лірычны герой здольны дасягнуць такіх духоўных вышынь, якія даступныя толькі ўсяму чалавецтву.

Паэзія Я. Сіпакова каштоўная не толькі тым, што ў ёй раскрываюцца пачуцці, перажыванні тонкай асобы, яе незвычайная ўлюбёнасць у свет. Тое ж самае не ў меншай ступені ўласціва ўсім сапраўдным пісьменнікам. Аднак творы Я. Сіпакова ўражваюць чымсьці непаўторна зямным, ціхім і пяшчотным, родным і

шматзначным. Яны як бы непасрэдна вынікаюць з прыродных назіранняў, каб затым зноў увасобіцца ў слоўную «вопратку».

Так, лірычны герой у паэзіі Я. Сіпакова — часцей за ўсё асоба неўтаймаваная, ранімая, з абвостранай рэакцыяй на няпраўду і зло жыцця, чые ідэалы надзвычай высокія, што абумоўлена вайной, сіроцтвам. Я. Сіпакоў не ў меншай ступені, чым Р. Барадулін, «зямны» мастак слова.

Акрамя змешчаных у вучэбным дапаможніку (с. 214), настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. З якімі творамі Я. Сіпакова вы знаёміліся ў папярэдніх класах? Якім тэмам яны былі прысвечаны?*

*2. У чым заключаецца трагізм лёсу Я. Сіпакова? Якімі фактарамі ён быў абумоўлены?*

*3. Якія праблемы закранае ў сваёй лірыцы Я. Сіпакоў? Адказ падмацуйце прыкладамі з прачытаных твораў.*

❐ **Дамашняе заданне:** карыстаючыся памяткай для аналізу лірычнага твора (с. 300), прааналізаваць адзін з вершаў Я. Сіпакова.

## УРОК 3.

### Жанравае багацце лірыкі Янкі Сіпакова. Кніга «Веча славянскіх балад». Паэма «Одзіум»

Пасля праверкі дамашняга задання можна задаць пытанне: *Якія жанры лірыкі вы ведаеце?* Гэта накіруе дзейнасць класа на аналіз твораў Я. Сіпакова таго ці іншага жанру.

Для далейшай работы варта ўзнавіць веды вучняў пра верлібр, оду, прытчу (гл. «Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў», с. 292—297), а таксама элегію, баладу і санет.

**ДАВЕДКА.** ***Медытатыўная элегія*** — гэта элегія актыўнай думкі, высокага аналітызму, напружанага, але разумна арганізаванага, гарманічнага перажывання.

***Балада*** — вельмі старажытны жанр, які сінтэзуе ў сабе лірычны, эпічны і драматычны пачаткі. Аўтара балады цікавіць эпічнае здарэнне, але не само па сабе, а менавіта тым, што яно дае магчымасць паказаць веліч ці нізасць чалавечага духу, выказаць свае адносіны да пэўнай з'явы. Дра-

матычнасць жа балады абумоўлена складанасцю канфлікту паміж Дабром і Злом, імкненнямі чалавека да нечага светлага і немагчымасцю іх здзяйснення. Баладзе ўласцівыя гераічны пафас, што вынікае з трагедыйнай калізіі і трагедыйнага сюжэта, а таксама дынамізм, ад якога дзеянне «выходзіць наверх», не губляецца, пераплятаецца з пачуццём, узбагачае і «актывізуе» яго.

Балада выступае ў чатырох галоўных разнавіднасцях: як чыста эпічная, калі ў яе аснову пакладзены падзеі, дзеянне; пераважна лірычная, у якой аўтар праз апісанне пачуццяў і перажыванняў лірычнага героя выяўляе свае адносіны да свету; выразна драматычная, заснаваная на канфлікце і напружаным дзеянні; сінтэтычная, якая з'яўляецца вынікам сінтэзу адзнак трох вышэйназваных разнавіднасцей.

У жанравых адносінах балады разнастайныя. Гэта балады-паданні, балады-легенды, балады-прытчы, балады-казкі, балады-рэфлексіі, балады-думы, балады-песні, балады-спведзі, балады-партрэты і інш.

Балады могуць мець розную форму: яны могуць быць маналагічнымі, напісанымі ад імя непасрэдных удзельнікаў падзей (што бліжэй да лірыкі); дыялагічнымі, калі пры дапамозе дыялога развіваецца дзеянне, раскрываюцца характары герояў (блізкія да драмы); выяўленча-апісальнымі, дзе выяўляецца падзейны сюжэт (блізкія да эпасу).

***Санет*** (італ. *sonette*, ад *sonare* — 'гучаць, звінець') — цвёрды (класічны) від верша, які складаецца з чатырнаццаці радкоў, напісаных пяцістопным ямбам (радзей шасці- ці чатырохстопным). Аб'ядноўвае два чатырохрадкоўі і два трохрадкоўі, арганізаваныя пэўнай рыфмоўкай. У катрэнах адбываецца развіццё тэмы, у тэрцэтах — кульмінацыя і развязка; самым моцным па думцы і па вобразнасці павінен быць апошні тэрцэт (санетны замок). У адпаведнасці з класічнымі законамі, апошняе слова твора павінна быць своеасаблівым сэнсавым «ключом» санета; у той жа час ніводнае слова (акрамя дапаможных) не павінна паўтарацца.

Узнік санет у Італіі (XIII ст.), потым пашырыўся ў іспанскай, партугальскай, французскай, англійскай і іншых літаратурах. У беларускай традыцыі ўпершыню з'явіўся ў 1610 годзе, калі М. Сматрыцкі змясціў у сваім «Трэнасе»

ўласны пераклад аднаго з санетаў Ф. Пятраркі на лацінскую і польскую мовы. Першыя санеты на беларускай мове апублікаваў Янка Купала ў 1910 годзе («Жніво», «Па межах родных і разорах», «Запушчаны палац»). Следам за ім да санета звярнуўся М. Багдановіч («***Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...», «***Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...» і інш.).

*Вянок санетаў* — вершаваная структура, якая складаецца з 15 санетаў: паўтарэннем асобных радкоў усе 14 санетаў звязаны паміж сабою, а таксама з магістралам — пятнаццатым, заключным санетам, што складаецца з першых радкоў папярэдніх санетаў. Кожны наступны санет пачынаецца радком, якім заканчваецца папярэдні. Многія беларускія паэты звярталіся да гэтай складанай паэтычнай формы (напрыклад, адзін з самых апошніх па часе — вянок санетаў Н. Мацяш «Бабіна лета ў Белаазёрску»).

Аднак самай складанай санетнай структурай з'яўляецца *вянок вянкоў санетаў*. Ён складаецца з 15 вянкоў санетаў; апошні, пятнаццаты, вянок санетаў уключае ў сябе магістралы ўсіх папярэдніх. Першы беларускі (і ўвогуле славянскі) вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы» надрукаваў у 1992 годзе Змітрок Марозаў; таксама падобныя творы напісалі М. Віняцкі і С. Шах.

Я. Сіпакоў паўстае ў медытатыўных элегіях філосафам, які глыбока пазнае сябе і свет, вырашае складаныя праблемы чалавечага існавання, гісторыі, жыцця:

Мы весялімся, нібы дзеці...
А болю — цесна болю: у свеце
Перанаселенасць на боль.

У працытаваным урыўку паэт разважае пра сучасны стан чалавецтва, пра яго здрабненне і жорсткасць, адсутнасць у многіх людскіх сэрцах міласэрнасці. І толькі лірычнаму герою не ўсё роўна, а таму ён перажывае, спачувае нават гэтай раўнадушнай частцы чалавецтва.

У эпічных баладах ствараецца ўражанне поўнай адсутнасці аўтара, але гэта не так: аўтар, пакідаючы сам-насам і падзеі, і герояў, «раствараецца» ў тэксце, прымушае дзеянне самараскрывацца («Падатак. Балгарская балада. XVI стагоддзе»).

Лірычныя балады Я. Сіпакова гучаць як унутраныя маналогі герояў. Іх кампазіцыя не перашкаджае разгортванню маральна-этычнага і сацыяльнага канфліктаў, развіццю ўнутранага дзеяння, паказу барацьбы паміж сіламі дабра і зла («Вяселле»).

Так, у баладзе «Чубы» толькі пяць пачатковых радкоў — больш-менш разгорнутае апісанне, гістарычная даведка пра нараджэнне бунту былых сялян, а цяпер казакоў супраць улад, а пасля ідзе ўнутраны маналог вольных людзей пра тое, што іх, вольных, хочуць зноў запрыгоніць. У рэшце рэшт драматычныя ўнутраныя перажыванні перарастаюць у бунт, пратэст:

— Не хочам вашай ласкі,
У нас свой парадак — наскі.

Многія балады Я. Сіпакова створаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі твораў драматургіі: у іх аснове ляжыць востры канфлікт, матэрыял падаецца ў форме дыялога. Яскравым прыкладам падобнай разнавіднасці з'яўляецца балада «Разня», аснову якой складае размова маці і маленькага сына, з якой чытач даведваецца і пра жудасныя падзеі, і пра стаўленне да іх аўтара:

— Мамачка, мамка, чаму, паглядзіце,
Чырвоная рэчка такая?
— Сыне мой, сыне, у ёй не вадзіца —
То ж кроў наша, сыне, людская.

Самыя па-мастацку вартасныя балады нараджаюцца ў Я. Сіпакова на аснове спалучэння трох спосабаў паказу рэчаіснасці: маналагічнага, дыялагічнага і апісальнага («Пытанне»).

Я. Сіпакоў з аднолькавым поспехам карыстаўся рознымі класічнымі (сталымі, традыцыйнымі) жанрамі. Побач з трагедыйнай па змесце баладай у яго існуе і сумная, ціхая элегія, і гучная, заклікавая ода. З дапамогай жанру оды паэт змог не толькі ўхваліць гераічныя ўчынкі і подзвігі людзей, але і даць выверaную, філасофска-значную ацэнку падзеям, засяродзіцца на агульначалавечых праблемах, узняць шчырыя чалавечыя пачуцці на адпаведную жанравай зададзенасці вышыню.

Многа ў паэта і од памяці, у якіх прыгадваецца мінулая Вялікая Айчынная вайна, славіцца подзвіг вядомых і невядомых герояў («Паранены партызан», «Каска»). Па сваім героіка-трагедыйным гучанні такія творы блізкія і да балады, і да элегіі,

канцэнтруюць у сабе маштабны, шматгранны змест, сведчаць пра размыванне жанравых межаў у літаратуры нашых дзён.

Прытчавымі з'яўляюцца многія творы Я. Сіпакова. Прыгадаем некаторыя з іх. «Скарга прыручанага ваўка» — баладны верш пра страчаную свабоду, пра жыццё на волі, якое немагчымае ў канкрэтных умовах, калі ці не самы вольналюбівы звер — воўк — апынуўся ў звярынцы ў клетцы і — што яшчэ больш жахліва — пастаўлены насупраць зайца, што выскаляецца з вечнага ворага свайго, цяпер нявольніка.

Дасканалымі з пункту гледжання зместу і формы з'яўляюцца санеты Я. Сіпакова. Самым вялікім дасягненнем паэта ў санетатворчасці з'яўляецца яго вянок санетаў «Жанчына» з кнігі «У поўдзень, да вады...». У сваім вянку санетаў паэт узняў жанчыну на высокі п'едэстал гонару, ахінуў яе не адцягнена-абстрактным, а канкрэтным, зямным арэолам святасці і прыгажосці, пакланіўся ёй, як Маці, Каханай, Жонцы.

Цыкл санетаў «Жанчына» ўяўляе сабою не проста падбор санетаў, створаных паэтам і аб'яднаных агульнай тэмай, а адлюстроўвае яго задуму паказаць саму жанчыну і яе жыццё не статычна, а ў развіцці. Таму кожнаму санету можна даць назву, што злучыць яго з наступным і папярэднім: «Сустрэча» — «Саюз двух» — «Дабрыня» — «Мадонна» — «Цяжкі крыж маці» — «Шматаблічнасць» і г. д.

Верлібрам напісаны амаль усе вершы цыкла «Раскальцаваныя птушкі» з кнігі «У поўдзень, да вады...». Найчасцей выкарыстоўвае яго паэт для твораў на гістарычную тэматыку з трагедыйным пафасам («Вайна», «З успамінаў», «Гледзячы на даўні здымак»).

Я. Сіпакоў у другой палове 1980-х — пачатку 2000-х гадоў як бы не вытрымлівае «імпульсіўнасці і сцэнічнасці» паэзіі і паступова пераходзіць да адлюстравання падзей і праяў аб'ектыўнага свету ў эпасе. Пошукі ў жанравых межах апавядання адбыліся ў кнігах Я. Сіпакова «Спадзяванне на радасць» (1983 г.), «Пяць струн» (1984 г.), «Журба ў стылі рэтра» (1990 г.), «Тыя, што ідуць» (1993 г.), «Вецер на даху вагона» (2003 г.), якія засведчылі «эпізацыю» таленту пісьменніка. І ў прозе Я. Сіпакоў шмат у чым застаецца паэтам, яго апавяданні прасякнуты лірычным хваляваннем, эмацыянальнай настроенасцю, узнёсласцю думкі.

Кніга паэм у прозе «Ахвярны двор» (1991 г.) вызначаецца зваротам да жахлівых трагедый XX стагоддзя — землятрусу ў Арменіі і Чарнобыльскай катастрофы, а таксама да драматычнага жыцця Т. Шаўчэнкі і лёсу Абхазіі, да ўражанняў ад наведвання пушкінскага Міхайлаўскага. Яе складаюць паэмы ў прозе «Хата», «Ахвярны двор», «Одзіум» і інш. Голас лірычнага героя паэмы «Одзіум» звернуты да Бога з верай у заступніцтва, у паратунак народа Беларусі. Ва ўсіх паэмах з кнігі адчуваецца моцны публіцыстычны элемент — вынік неабыякавасці пісьменніка да жыцця, калі трагедыя стала ўнутраным болем паэта.

Пры вывучэнні паэмы Я. Сіпакова «Одзіум» варта звярнуць увагу на наступныя пытанні:

а) семантыка назвы («одзіумам» для старажытных рымлян быў «прадмет нянавісці і нараканняў»);

б) вобразы-сімвалы і асноўныя матывы паэмы (вобразы двух братоў і сястры з гаваркімі імёнамі — Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа, мёртвай прыроды — «зямлі за калючым дротам», пчалы — «маленька-вялікай атамнай бомбы», семкі — «неўтаймоўнага рэактара», яблыка — «хоць і не міна, а забівае», вобраз-персанаж бабкі Параскі, хібакусі; матыў неаб'яўленай вайны і інш.);

в) адметнасць кампазіцыі паэмы (каркасам выступае малітва «Ойча наш», што перарываецца аўтарскім тэкстам);

г) паэтыка і стыль твора (антытэза — супрацьпастаўленне дзвюх эпох, да і пасля трагедыі; паўторы, рэфрэн «Чорная быль — Чарнобыль. / Чорны баль — Чарнобаль. / Чорная бель — Чарнобель. / Чорны боль — Чарноболь»; празаізацыя мовы; выкарыстанне лексікі розных пластоў, лічбавых дадзеных, гістарычных даведак і інш.).

Акрамя змешчаных ў вучэбным дапаможніку (с. 214), настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. Раскрыйце адметнасць кампазіцыі зборніка «Веча славянскіх балад» Я. Сіпакова.*

*2. У чым заключаецца жанравая адметнасць балады? Які зборнік паэта складаецца толькі з балад? Самастойна прачытайце балады паэта «Чубы», «Падатак» і «Разня». У чым іх адрозненне? Карыстаючыся схемай аналізу мастацкага твора (с. 298—299), прааналізуйце адну з прапанаваных балад.*

*3. Чаму Я. Сіпакова называюць майстрам санетаў? Што такое вянок санетаў?*

*4. Што такое верлібр (прытча)? Якія верлібры (прытчы) Я. Сіпакова вы ведаеце?*

❐ **Дамашняе заданне:** параўнаць жанравую палітру творчасці Я. Сіпакова з жанравай палітрай Р. Барадуліна; некаторым вучням прапануецца індывідуальнае заданне: падрыхтаваць рэферат, прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху А. Вярцінскага.

## УРОК 4.

## Старонкі біяграфіі і творчасці Анатоля Вярцінскага. Стыль пісьменніка як адметная мастацкая сістэма

Урок варта пачаць з праверкі самастойнай працы вучняў (рэфераты).

Настаўнік падагульняе адказы вучняў, адзначае, што А. Вярцінскі з'яўляецца адным з прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення», школы высокага, засяроджанага на маральна-этычных праблемах, а значыць агульначалавечага мастацтва, таго яго адгалінавання, што арыентуецца на філасафічнасць, культ думкі.

У 1963 годзе паэт выказаўся пра два віды паказу рэчаіснасці, падобныя на спосабы апрацоўкі металу, — халодны і гарачы, падтрымаў з іх менавіта другі, гарачы, а халодны ахарактарызаваў як «строга супрацьпаказаны». І растлумачыў, чаму так лічыць: «Першы, рэгістрацыйна-інвентарызацыйны, дае фармальную, чыста знешнюю актуальнасць, стварае толькі выгляд яе, другі, даследча-творчы, дае актуальнасць сапраўдную». Як бачым, сам аўтар прызнаў асновай сваёй мастацкай творчасці даследча-творчы пачатак. Яго мастацтва — не павярхоўнае адлюстраванне ўбачанага, а ацэнка, пераацэнка, аналіз рэчаіснасці. Яму мала нейкую ісціну вызначыць, проста канстатаваць. Яму трэба яе выразна акрэсліць, развіць на вачах чытача ў сапраўднае адзінства думак, звязаць зыходны тэзіс з іншымі, часам з асацыятыўным адценнем. Таму амаль кожны верш паэта трымаецца на паўторах, на разгортванні філасофскага выказвання. Часцей за ўсё тэзісы паўтараюцца тройчы. У гэтым заключаецца наватарства А. Вярцінскага.

Асаблівасцю стылю А. Вярцінскага з'яўляецца яго гуманістычная накіраванасць, ён працягвае традыцыі, закладзеныя яшчэ волатамі Адраджэння — Ф. Скарынам, М. Гусоўскім. Менавіта таму і звяртаецца паэт з палымяным заклікам да людзей:

Не прашу я доўгага веку,
Не прашу асаблівай любві.
Я прашу цябе: «Будзь чалавекам!»
Я прашу вас: «Будзьце людзьмі!»
Нельга ж вечна жыць, як некалі.
Час другі зусім — глядзі.
Людзі! Будзьце чалавекамі!
Чалавекі! Будзьце людзьмі!

У якасці дадатковых настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. Якія вершы Анатоля Вярцінскага вы вывучалі ў папярэдніх класах, якім тэмам яны былі прысвечаны?*

*2. Вызначце тэматыку лірыкі А. Вярцінскага. Дакажыце, што ў сваёй творчасці паэт арыентуецца на аналіз рэчаіснасці.*

*3. Карыстаючыся схемай аналізу мастацкага твора (с. 298—299), прааналізуйце адзін з твораў А. Вярцінскага.*

❒ **Дамашняе заданне:** выпісаць радкі з вершаў А. Вярцінскага, якія сведчаць пра гуманізм яго пазіцыі, светаадчування; прачытаць паэму А. Вярцінскага «Песня пра хлеб».

## УРОК 5.

## Жанравая разнастайнасць лірыкі Анатоля Вярцінскага. Паэма «Песня пра хлеб»

Урок прысвечаны разгляду прыярытэтных жанраў, да якіх прыцягнута ўвага А. Вярцінскага.

Адным з самых распаўсюджаных жанраў у творчасці А. Вярцінскага з'яўляецца прытча — жанр старажытны, эталагічны (нораваапісальны), павучальны, што мае свае вытокі яшчэ ў Бібліі. Аўтарскае вызначэнне прыналежнасці да жанру прытчы атрымалі толькі тры творы — «Дурман», «Арол галодны і сыты», «Мы, мёд і пчала». Астатнія ж вершы даследчыкі лічаць прытчамі па фармальна-зместавых прыметах. Яшчэ ў першых вершах паэт пачаў распавядаць прытчу пра блуднага сына — усё чалавецтва.

Арыентацыя на ўнутраны маналог, на зварот не толькі да чытача, але і да ўніверсума — чалавецтва — знаходзіць увасабленне ў яшчэ адной даволі распаўсюджанай жанравай форме ў А. Вярцінскага — у вершах-зваротах, закліках з абавязковымі элементамі павучальнасці («Медсястры», «Пасмяротна рэабілітаваным», «Просьба», «Некалькі пытанняў да лесу», «Перасцярога» і інш.). Так, верш «Просьба», напісаны ў форме непасрэднага звароту да чалавецтва, сведчыць пра імкненне паэта да ўзвышэння чалавечай асобы і занатавання сувязі часоў і пакаленняў.

Жанр оды таксама атрымаў належнае распаўсюджанне ў творчасці А. Вярцінскага. Адычнасць гучання ўласцівая многім вершам паэта пра вайну, пра рух часу, пра Чалавека як Асобу («Ода добрым людзям», «Мы напачатку зазналі страху», «Навагодні тост», «Дзівак-чалавек», «Ода магчымасцям мірнага жыцця, або Штрых да партрэта Васіля Быкава»). Дарэчы, адычнае гучанне ўласціва не толькі адзначаным вершам-павучанням, але і многім іншым творам.

Як мы ўжо адзначалі, паэт больш чуйны да чужога болю і гора, чым да радасці, таму медытатыўная элегія займае не апошняе месца ў вобразным свеце А. Вярцінскага. Часцей за ўсё яго элегіі прасякнутыя думкамі пра чалавека і чалавецтва, рух і зменлівасць часу, пра страту кахання, пра непазбежную смерць, пра прадаўжэнне жыцця ў нашчадках («З жалем гляджу на дзіця...», «Хлопчык глядзіць», «Мы жывём, каб вяртацца...», «Трагічна-сумная няўвязка...»).

Балада як жанр не атрымала шырокага распаўсюджання ў паэзіі А. Вярцінскага, як у творчасці іншых прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення», у прыватнасці Я. Сіпакова. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што рамантычны светапогляд не быў уласцівы А. Вярцінскаму ў такой моцнай ступені, як іншым паэтам-шасцідзясятнікам, ён — паэт-публіцыст, аратар-«навучыцель». Хоць многія творы яго заснаваныя на паказе супрацьстаяння Дабра і Зла, паэт не імкнецца з найбольшай дакладнасцю апісаць гэты канфлікт, а галоўная яго задача — паказаць вынік гэтай барацьбы, выказаць свае парады і разуменне яе прычын і тым самым навучыць людзей супрацьстаяць Злу ў яго ўніверсальна-касмічным абліччы.

Вершаў-прысвячэнняў у паэта значна больш, чым балад: «Скажы мне, мама...», «Пра дзярзанне», «Сустрэча на Паркавай магістралі», паэма «Заазер'е». Паэт балюча перажывае адсутнасць адрасатаў вершаў, без якіх шмат што страціў і сам, і наша грамадства, якое часта не цэніць таленты, і жывуць яны толькі ў памяці сумленных суграмадзян і ў яго творах. На гэтай глебе з'явіліся ў А. Вярцінскага вершы-эпітафіі, якія працягваюць традыцыі гэтага жанру ў беларускай літаратуры, маюць моцную сувязь з фальклорам, з абрадавымі песнямі.

У сваёй паэзіі А. Вярцінскі не толькі паспяхова асвоіў сталыя жанры і жанравыя формы, але і надаў ім новы павучальны змест, стварыў новы жанр «проза-паэзіі» (вершы-зонгі з лібрэта оперы па матывах аповесці В. Быкава «Воўчая зграя»).

Вершы-роздумы, медытацыі, разважанні і вершы-заклікі, прамовы, павучанні, прытчы, рэпартажы знаходзяцца ў паэзіі А. Вярцінскага ў цеснай узаемасувязі. Уся лірыка паэта становіцца як бы суцэльнай філасофскай прытчай пра Дабро і Зло, Праўду і Ману, праметэяў і непраметэяў.

Аналіз паэмы «Песня пра хлеб» можна правесці па наступным плане.

План

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор.
2. Месца твора ў сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка:
   да якога перыяду ён адносіцца;
   ці працаваў аўтар у час напісання паэмы над іншымі творамі?
3. Звесткі аб першай публікацыі твора, аб уплыве на свядомасць чытача, аб крытычных ацэнках твора (звяртаецца ўвага і на новае прачытанне).
4. Характарыстыка:
   тэматыкі, праблематыкі;
   асаблівасцей сюжэта, кампазіцыі, стылю;
   мастацкіх сродкаў;
   ідэйнага зместу.
5. Аналіз філасофскай канцэпцыі аўтара.
6. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.
7. Прыклады ўрыўкаў твора, у якіх ёсць пацвярджэнні вашым разважанням аб асаблівасцях кампазіцыі, стылю, аб філасофскай канцэпцыі аўтара.

Акрамя змешчаных у вучэбным дапаможніку (с. 220), настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. Ахарактарызуйце ў цэлым жанравую палітру творчасці мастака слова.*

*2. Чаму прытча стала дамінантнай жанравай прыметай індывідуальнага стылю А. Вярцінскага?*

*3. Якія вершы адычнага гучання А. Вярцінскага вы ведаеце? Ці адрозніваюцца оды паэта ад твораў падобнага жанру ў творчасці Я. Сіпакова?*

❐ **Дамашняе заданне:** параўнаць індывідуальныя стылі А. Вярцінскага і Р. Барадуліна.

## УРОК 6.

### Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы Алеся Разанава

Урок варта пачаць з уступнага слова настаўніка пра наватарскія тэндэнцыі, якія выявіліся ў сучаснай паэзіі: імкненне да змястоўнай шырыні, філасофскага асэнсавання падзей, авалодання прынцыпамі авангардысцкай і постмадэрнісцкай паэтыкі; пра А. Разанава як паэта-наватара.

Важным момантам уступнага слова павінна быць акцэнтацыя ўвагі вучняў на такім момантце біяграфіі (у вучэбным дапаможніку біяграфічны матэрыял адсутнічае), як удзел падчас вучобы ў БДУ ў Мінску ў выступленнях студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта ў абарону беларускай мовы (1968 г.), за што паэт быў адлічаны з гэтай установы адукацыі. Давялося заканчваць вучобу ў Брэсцкім педагагічным інстытуце (1970 г.). Затым была служба ў войску, праца ў газеце «Літаратура і мастацтва», выдавецтве «Мастацкая літаратура», Скарынаўскім цэнтры. А. Разанаў быў галоўным рэдактарам часопіса «Крыніца», які па незалежных ад яго прычынах спыніў сваю дзейнасць. Творы паэта перакладзены асобнымі кнігамі ў Грузіі, Балгарыі, Польшчы, Германіі. А. Разанаў з юнацкіх гадоў вытрымліваў выпрабаванне абставінамі на вернасць сваёй Айчыне, матчынаму слову, на сапраўдны, а не ўяўны патрыятызм.

Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы А. Разанава дастаткова поўна разгледжана на старонках вучэбнага дапаможніка, таму ніжэй прапануюцца разгорнутыя адказы на прапанаваныя ў ім пытанні і дадатковы матэрыял па вывучэнні творчасці паэта (філасофскай лірыкі).

Першае пытанне (с. 229) — *Якія тэмы пераважалі ў ранняй паэзіі А. Разанава? У чым заключаецца наватарства паэта ў раскрыцці тэмы Радзімы?* — часткова раскрыта ў вучэбным дапаможніку ў межах аналізу верша «Радзіма», змешчанага ў зборніку «Назаўжды» (1974 г.). Можна дапоўніць звесткі, якія там утрымліваюцца, паведамленнем пра тое, што для паэта Радзіма — гэта ўвесь акаляючы чалавека свет: прырода, птушкі, дрэвы, каханая дзяўчына, маці, якая дарue жыццё. Можна працытаваць для ілюстрацыі сказанага ўрывак з верша «Дрэвы» — твора, у якім сцвярджаецца адзінства і ўзаемапераходнасць розных формаў жыцця:

Вы нашы браты, якія
па нашых слядах не пайшлі.
Вы засталіся шумліва
расці ўвышыню і ўглыб,
каб рушылі мы шчасліва
дарогаю птушак і рыб.

Наватарства паэта ў раскрыцці тэмы Радзімы, думаецца, заключаецца ў тым, што ён абвяргае традыцыйнае «прадстаўленне» яе чытачу ў абліччы маці (амаль усе паэты), нявесты, жонкі (сімвалісты, выразней за ўсіх — А. Блок) і паказвае яе істотай, якая хоць і «высвечвала бяздонным дном», «ведзьмавала туманом», «летам бабіным звінела» (тут яшчэ ўсё зразумелае, яскрава паэтызаванае), але да канца так і застаецца загадкавай, непазнавальнай істотай («І мне няўцям, адкуль ты ёсць, / адкуль пасля з'яўляцца будзеш»; «Твае не вызначыць мне межы / і не намацаць твой вотык»; «Ты ўся наводдалі заўсёды»). Апошняе паэтава выказванне, прыведзенае ў дужках, наводзіць на роздум: «А ці не з А. Блокам, аўтарам радка "Большое видится на расстоянии", у дадзеным выпадку салідарызуецца наш паэт?»

Пытанне другое — *Як вы разумееце тэрмін «філасофская (інтэлектуальная) паэзія»? Якімі рысамі яна адрозніваецца ад выяўленча-апісальнай?* — мае тэарэтычны «ўхіл». Тэрміны «філасофская лірыка», «інтэлектуальная лірыка» сінанімічныя і ўказваюць на паэзію, якая арыентуецца на роздум, развагу, у якой пераважае думка, адсоўваючы пачуццё на другі план. Гэта паэзія вечных тэм пра жыццё і смерць, чалавека і прыроду, праўду і хлусню, дабро і зло і г. д. Яна адрозніваецца ад філасофіі, што трымаецца на абстрактных, лагічных развагах, сваёй

вобразнасцю. Нават саму думку такая паэзія можа зрабіць аб'ектам асэнсавання. Некаторыя даследчыкі такую «роздумную паэзію» называюць тэрмінам «паэзія думкі» (па-руску «поэзия мысли»).

Узоры філасофскай лірыкі стварылі ў XIX стагоддзі рускія паэты Я. Баратынскі і Ф. Цютчаў, у беларускай, крыху пазней, — М. Багдановіч — аўтар крылатых радкоў:

Жыві і цэльнасці шукай.
Аб шырацe духоўнай дбай.

А. Разанаў у ранні перыяд творчасці стварыў шэраг твораў-роздумаў, твораў-разважанняў, арыентуючыся на рэалістычны стыль. Сярод іх можна адзначыць верш «Чалавек» (1966 г.), у якім у афарыстычнай форме, вобразна раскрываецца дарвінаўская тэорыя паходжання чалавека, працэс эвалюцыі «яшчэ не чалавека», які змог узняцца на ногі, угледзець «дрымучымі вачамі вышыню» і стаць свядомай істотай. Твор гэты варта зачытаць настаўніку ці вучням. Ён — яскравае сведчанне таго, чым адрозніваецца мысленне вобразамі ад навуковага мыслення сілагізмамі, паняццямі:

Касматы,
першабытны,
нізкалобы,
яшчэ не чалавек, упершыню
ён аглядзеў —
загадкавая спроба —
дрымучымі вачамі вышыню.
Яна цякла, палала, зіхацела,
уздрыгвала агеньчыкамі зор.
Ён разагнуўся мускулістым целам,
узняўся і — уражаны — замёр:
працяты невядомым запаветам,
апалены высокай сінявой,
нібы Атлант, —
нагамі ў планету,
і ў нерухомы купал — галавой.

Варта звярнуць увагу на характарыстычныя эпітэты, якімі надзелена першабытная чалавекападобная істота: «касматы», «нізкалобы», «дрымучымі вачамі», «мускулістым целам».

Дзякуючы гэтым тропам, мы зрокава ўяўляем нашага даўняга продка. А ператварэнне яго ў першачалавека падкрэсліваецца гіпербалай: ён разагнуўся і, «нібы Атлант» (міфічны герой), нагамі ўпёрся ў планету, а ў «нерухомы купал» неба — галавой. Звернем увагу яшчэ на адзін момант: паэту было падчас напісання твора ўсяго 19 гадоў.

У вершы «Празорца» (1967 г.) чытаем пранікнёныя радкі пра вызначальныя рысы, якія яднаюць мёртвых і жывых — адточаныя, па-філасофску шматзначныя:

Жаданне жыць...
Любоў і смага...
Што можа быць вышэй за іх?!
Беззапаветная адвага
з'яднала мёртвых і жывых.

А верш «Іх далячыні развялі...» (1970 г.) поўнасцю складаецца з радкоў — філасофскіх формул, сэнсавых рэбусаў, загадак, якія можна адгадаць толькі напружаннем розуму: «Сумуе ястраб па зямлі, / па вышыні сумуе клетка»; «не мае сэнсу сам палёт / без перашкодаў да палёту»; «Няхай пачатку страчан след — / Ляціць працяг, / і час у сведкі, / што знітаваны гэты свет / саюзам ястраба і клеткі».

*Падумайце ўважліва, якую ідэю даводзіць нам, чытачам, аўтар верша.* Хутчэй за ўсё, гэта сцвярджэнне філасофскага тэзісу адзінства супрацьлегласцей у мастацкай, вобразнай форме: без вышыні не можа існаваць нізіна, не можа быць волі без стрымліваючых фактараў («саюз ястраба і клеткі»), канца без пачатку, вытокаў.

Падсумаваць вынікі працы на ўроку можна па дадатковых пытаннях:

*1. Кім жа быў А. Разанаў у пачатку творчасці — традыцыяналістам ці наватарам? Якія рысы рэалістычнага стылю ўласцівыя паэту?*

*2. Ці можна назваць А. Разанава паэтам-філосафам? Калі можна, дык з якімі аўтарамі падобнага кірунку ён стаіць побач?*

Добра было б, каб ролю эфектнай канцоўкі выканалі прачытаныя ці настаўнікам, ці вучнямі радкі верша «Адно сказаць, як пішацца — пішы...» пра складаны, драматычны працэс мастацкай творчасці, у якім пераважае «моцартаўскі» пачатак —

натхненне, пачуццё. У сувязі з чым невыпадковы паўтор словазлучэння «як пішацца — пішы»:

Адно сказаць, як пішацца — пішы,
не мудрагеліць,
слухацца натхнення...
Кляймёныя адзнакамі душы,
тваімі стануць гэтыя імгненні.

❒ **Дамашняе заданне:** адказаць на пытанні 3, 4 вучэбнага дапаможніка (с. 229).

## УРОК 7.

### Традыцыйнае і наватарскае, адметнасць жанрава-стылёвых пошукаў, індывідуальны стыль Алеся Разанава

Ніжэй прапануецца матэрыял да ўступнага слова і заключнай эўрыстычнай гутаркі, у аснове якой трэцяе і чацвёртае пытанні дапаможніка і дадатковыя заданні.

Першымі ў творчасці А. Разанава з’яўляюцца пункціры — невялікія (часцей 4—6 радкоў) лірычныя мініяцюры, сфакусаваныя на перадачы адной думкі, фіксацыі аднаго пачуцця («Куды? Адкуль?.. — / маўчанне... / Не дасць адказу час. / Стаю — і сам пытанне, іду — / і сам адказ»).

Квантэмы («квант паэтычнай энергіі» (Я. Гарадніцкі)) — незавершаныя, недасказаныя паэтычныя творы, якія характарызуюцца перарывістасцю думкі, своеасаблівы імпульс да сатворчасці: «сам-насам з незавершанасцю / што / пярэчыць перамогам / бездань ззаду».

Версэт — адна з самых распаўсюджаных у творчасці А. Разанава вершаформаў — твор прытчавага, павучальнага характару, у якім па-філасофску глыбока пераасэнсоўваецца свет звычайных рэчаў і паняццяў:

Я чую шмат слоў.

Бачу мноства людзей.

Усе яны кажуць, што трэба адрозніваць няшчырасць ад шчырасці, уяўнасць ад праўды, намер ад здзяйснення, клопат пра аднаго сябе ад клопату пра ўсіх іншых...

Але цяпер зіма.

І словы, і людзі, і ўсё наваколле захутаны ў шэрань.

І сухадрэвіны не адрозніваюцца ад дрэў.

У працытаваным версэце «Шэрань» паэт асэнсоўвае ўяўныя і сапраўдныя каштоўнасці, якімі кіруецца чалавек у жыцці. Апошні сінтаксічны перыяд утрымлівае важную філасофскую выснову: часам з-за «шэрані» правесці выразнае размежаванне паміж Дабром і Злом немагчыма.

Імкненнем наблізіць паэтычную мову да празаічнай, паглыбіць яе аналітызм вызначаюцца вершаказы — набліжаныя да прозы творы, у якіх рытмаваральнымі сродкамі выступаюць чаргаванне сінтаксічных перыядаў, паўторы, інверсіі і аднолькавая (ці блізкая) будова фраз («Грошы шукаюць схованку, дзе б іх не бачылі лішнія вочы, — ці прыгаршчы, ці гаршчок, ці гарышча, — і аб сабе не гавораць уголас, а калі рашаюцца гаварыць, то — шэптам, шоргатам...»), і зномы — гнасеалагічныя[1] адзінкі, якія выяўляюць погляд паэта на свет і быццё чалавека ў ім, на жыццё і смерць, на творчасць і мастацтва («Праз рознасць патэнцыялаў свядомасці звычайнай і надзвычайнай (прадбачання, інтуіцыі, натхнення) узнікае ток, што рухае думку, што жывіць творчасць»). У працытаваным творы А. Разанава выяўляецца імкненне мастака ва ўсім дайсці да сутнасці з'яў, выявіць паходжанне і спецыфіку творчасці.

Настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:

*1. Якія рысы ўласцівыя квантэме? Растлумачце паходжанне назвы.*

*2. Пункцір як жанравая форма. Якія асаблівасці ўласцівы пункціру як жанравай форме?*

*3. Што гэта за твор — версэт? Як тлумачыцца яго назва ў літаратуразнаўчых слоўніках?*

*4. Вершаказ — эпічны ці лірычны, празаічны ці вершаваны твор?*

У якасці падагульнення вучні запоўняць табліцу:

| Жанр твора | Прыклад твора | Азначэнне жанру |
|---|---|---|
| Пункцір | | |
| Квантэма | | |
| Версэт | | |
| Вершаказ | | |
| Зном | | |

[1] *Гнасеало́гія* — у філасофіі: тэорыя пазнання.

❒ **Дамашняе заданне:** карыстаючыся памяткай для падрыхтоўкі адказу на пытанне пра значэнне творчасці пісьменніка (с. 299), раскрыць значэнне творчасці А. Разанава для беларускай літаратуры.

По жаданні настаўніка замест акрэсленых тэм **урокаў 2—7** можна прапанаваць наступныя:

**урокі 2, 3** — «Васіль Зуёнак. Вершы. Паэма "Сяліба"»;
**урокі 4, 5** — «Раіса Баравікова. Вершы»;
**урок 6** — «Мар'ян Дукса. Вершы»;
**урок 7** — «Генадзь Пашкоў. Вершы».

Алгарытм пабудовы названых урокаў карэнным чынам не адрозніваецца ад папярэдніх, таму ніжэй пададзены толькі асноўныя рэкамендацыі па арганізацыі навучання.

**Васіль Зуёнак.** Эпіграфам да ***першага ўрока*** па вывучэнні творчасці В. Зуёнка можа стаць наступнае выказванне вядомага даследчыка літаратуры У. Гніламёдава: «Васіль Зуёнак — адзін з самых вядомых сучасных беларускіх паэтаў пакалення "шасцідзясятнікаў", на плечы якіх сёння надзейна абапіраецца ўвесь шмат'ярусны гмах нацыянальнай літаратуры. Яны здолелі з немалым поспехам праявіць сябе ва ўсіх яе відах і жанрах — ад паэзіі да прозы і драматургіі ўключна».

Настаўнік можа прапанаваць вучням паразважаць над пытаннем: *Каго з сучасных пісьменнікаў пакалення «шасцідзясятнікаў» можна назваць тытанам? Узгадайце іх творы.*

Першы этап урока — лекцыя настаўніка ці паведамленні вучняў, прысвечаныя жыццёваму і творчаму шляху В. Зуёнка. На гэтым этапе вучні павінны будуць запоўніць сінхранічную табліцу:

| Даты (перыяд) | Адметнасць часу | Жыццё пісьменніка | Творы |
|---|---|---|---|
| | | | |

На ўроку варта даць самыя цікавыя звесткі з біяграфіі пісьменніка. У паэта два дні нараджэння: па пашпарце (3 чэрвеня 1935 г.) і сапраўдны (на месяц пазней, 3 ліпеня таго ж года); да вайны пайсці ў школу не давялося, але чытаць і пісаць В. Зуёнак

навучыўся рана, яшчэ да школы і інш.[1] А таксама выбраць 3—4 творы пісьменніка рознага жанру і тэматыкі («З вайны сустрэлі мацяркі сыноў…», «Зарука», «Вясновая казка», «Тры вышыні», «Ніхто не пачуў...») і комплексна прааналізаваць іх па схеме, змешчанай у дапаможніку (с. 300).

На заключным этапе вучні самастойна ці з дапамогай настаўніка падвядуць вынікі вывучэння лірыкі В. Зуёнка, у якіх павінны адлюстравацца наступныя тэзісы:

а) у жанравым аспекце вершы В. Зуёнка вызначаюцца вялікай разнастайнасцю, заканамернае ўвасабленне ў творчасці мастака знайшлі наступныя паэтычныя жанры: элегія («Поўдзень», «Не бяжы, не ўцячэш ад сябе...», «Бруснічная элегія» і інш.); балада («Мезенны палец (Балада няспаленай вёскі)», «Балада Відовай гары», «Тапор (балада прагрэсу)» і інш.); ода («Любоў да Айчыны сваёй...», «Студэнцкі чамадан», «Бессмяротнасць (ода воіну і міласэрнасці)»); прытча («Памылкі», «Гаварыла маці», «Спроба трактата “Адкуль Homo sapiens”» і інш.);

б) мастак слова ўзнімае маштабна-эпічныя па сваёй прыродзе праблемы (вайны і міру, будучыні нацыі, грамадства і чалавецтва, захавання экалагічнай раўнавагі і маральнай дабрачыннасці);

в) у сваёй большасці вершы паэта ўзніклі як водгук на падзеі грамадскага быцця і ўтвараюць своеасаблівы летапіс эпохі праз прызму аўтарскай суб'ектыўнасці.

❐ **Дамашняе заданне:** падабраць эпіграф да паэмы «Сяліба» і патлумачыць свой выбар; падрыхтаваць паведамленне да канферэнцыі па паэме В. Зуёнка на адну з тэм: «Што разумее В. Зуёнак пад паняццем “Сяліба”?», «Што для вас радзіма, сяліба, родны кут?», «Чалавек і прырода: сябры ці ворагі?».

***Другі ўрок*** — па вывучэнні паэмы В. Зуёнка «Сяліба» — можна пабудаваць у форме канферэнцыі з уступным словам настаўніка пра гісторыю напісання твора.

Паэма «Сяліба» адкрывае кнігу «Пяцірэчча», яна пісалася на працягу 1965—1970 гадоў і выйшла ў 1973 годзе, даўшы

---

[1] Дадатковы матэрыял для вывучэння жыццёвага шляху *Зуёнак, В.* Бачу з усіх сцяжын… / В. Зуёнак // Вытокі песні. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. — Мінск, 1973. — С. 77—80.

назву паэтычнаму зборніку, за які В. Зуёнак быў узнагароджаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі (1974 г.). У зборніку 1973 года паэма выйшла з падзагалоўкам «Дыялог праз гады і ростані». Пры наступных выданнях (у кнізе «Жніўны дзень» (1985 г.) і другім томе выбраных твораў (1998 г.)) аўтар удакладніў падзагаловак, пазначыўшы гэтым перавагу лірычнага пачатку ў творы: «Дыялог праз гады і ростані, перамоўлены з самім сабою». Першая паэма В. Зуёнка вызначаецца трывалай гістарычнай, геаграфічнай і аўтабіяграфічнай асновай. Выразнага развіцця дзеяння ў паэме няма, яна пераважна лірычная: у форме дыялога з самім сабою аўтар раскрывае нам свае пачуцці, перажыванні і думкі:

АГНЁМ ВАЗЬМІСЯ,
ЧАС ТОЙ І ТОЙ ДЗЕНЬ...
Я памяць крэсліў
безліччу дарог,
Я памяць засціў
стромамі надзей...

Падагульненнем канферэнцыі можа стаць параўнанне вучнёўскіх поглядаў і назіранняў з артыкулам У. Гніламёдава[1].

❐ **Дамашняе заданне:** пісьмова адказаць на пытанне 4 вучэбнага дапаможніка (с. 208); індывідуальныя заданні: падрыхтаваць рэфераты пра жыццёвы і творчы шлях Р. Баравіковай.

**Раіса Баравікова.** ***Першы ўрок*** варта цалкам прысвяціць вывучэнню старонак жыццёвага і творчага шляху паэтэсы. Карысным матэрыялам для яго арганізацыі паслужыць відэафільм «Я — дзяўчынка на шары...». А напрыканцы ўрока настаўнік папросіць вучняў адказаць на пытанне: *Чаму для назвы фільма выбраны радкі з аднайменнага верша Р. Баравіковай?*

Шар вялікі, бязмежны
у здзіўленні я кратаю,
быццам Белыя Вежы,

---

[1] *Гніламёдаў, У. В.* Васіль Зуёнак / У. В. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т. — Мінск, 2002. — Т. 4. Кн. 1. — С. 626—628.

быццам чорныя кратэры,
горы ззяюць снягамі
і дымяцца абшары
у мяне пад нагамі.
Я — дзяўчынка на шары!

Калі магчымасці прагляду фільма няма, то ўрок пачнецца з зачытвання працытаванага верша настаўнікам, пасля якога можна прапанаваць вучням калектыўна паразважаць над пытаннем: *Ці можна рабіць падзел на жаночую і мужчынскую паэзію? Калі так, то што іх аб'ядноўвае, а што адрознівае?*

У працэсе адказу можна паспрабаваць запоўніць дыяграму Вена: у перасячэнні акружнасцей пазначаецца агульнае, а там, дзе няма перасячэння — адрознае.

жаночая паэзія  мужчынская паэзія

Другім этапам урока стане знаёмства з вучнёўскімі рэфератамі пра жыццёвы і творчы шлях Р. Баравіковай і запаўненне сінхранічнай табліцы, прыведзенай да першага ўрока па вывучэнні творчасці В. Зуёнка.

На трэцім этапе мэтазгодным уяўляецца правядзенне міні-конкурсу чытальнікаў: выразнае чытанне і каменціраванне вершаў, завучаных адзінаццацікласнікамі на памяць.

Этап падвядзення вынікаў можна правесці ў выглядзе адказу на пытанне 2 вучэбнага дапаможніка (с. 225).

❒ **Дамашняе заданне:** падрыхтавацца да канферэнцыі па тэме «Рамонкі для самотнай: лірычная гераіня Р. Баравіковай у ранняй паэзіі і вершах апошніх гадоў»: распрацаваць план канферэнцыі, падрыхтаваць пытанні для абмеркавання, комплексна прааналізаваць адзін з вершаў.

***Другі ўрок*** — канферэнцыя, прысвечаная творчасці паэтэсы, «Рамонкі для самотнай: лірычная гераіня Р. Баравіковай у ранняй паэзіі і вершах апошніх гадоў». Падагульненнем можа быць калектыўнае запаўненне табліцы:

| Традыцыі | Наватарства |
|---|---|
| Наследаванне таго, што стварылі пісьменнікі-папярэднікі | Далейшае развіццё лепшых рыс творчай спадчыны, пошукі новага |

❒ **Дамашняе заданне:** параўнаць індывідуальныя стылі Р. Баравіковай і Г. Ахматавай, запоўніўшы табліцу:

| Пытанні | Раіса Баравікова | Ганна Ахматава |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |
| Іншае | | |

Індывідуальныя заданні: падрыхтаваць паведамленні пра жыццё і творчасць М. Дуксы.

**Мар'ян Дукса.** На першым этапе ўрока настаўнік прапануе адказаць на пытанні:

*1. Паняцці «рэальная асоба» і «творчая індывідуальнасць» перасякаюцца, як дзве акружнасці, што маюць агульную частку, памер якой індывідуальны ў кожным канкрэтным выпадку. Якім чынам адбываецца падобны сінтэз?*

*2. Якую ролю ў станаўленні творчай індывідуальнасці адыгрывае біяграфія паэта? Якімі бываюць прычыны звароту да паэтычнай творчасці?*

Працягам урока стане невялікае вучнёўскае паведамленне пра біяграфію паэта і комплексны аналіз верша М. Дуксы «Дзве кнігі» па схеме, прапанаванай у вучэбным дапаможніку (с. 300).

Любімая кніга ў вокладцы белай,
дзе людзі сышліся, звяры і гады.
Пакрыўджаны сэрцам, душою прымлелай
я п'ю тваю мудрасць, сасмяглы заўжды.

Зялёная кніга ў вокладцы зорнай.
Штодзённа гартаю палі і лясы.
Шапочаш старонкай то светлай, то чорнай,
то з плачам, то з песняй твае галасы.

Не ведаю нават, дзе болей навукі,
дзе болей знайшоў для сябе пачуцця...
Вядуць мяне, лёгенька ўзяўшы пад рукі,
настольная Кніга і Кніга Быцця.

Вывучэнне творчасці М. Дуксы можна правесці ў форме семінара:

1) настаўнік прапануе кожнаму з вучняў выбраць лепшы, на яго погляд, твор паэта;

2) на ўроку вучні атрымліваюць заданні: а) прааналізаваць выбраны верш па плане; б) абмяняцца вершамі з суседам па парце і напісаць эсэ на атрыманы твор.

План

1. Тэматыка і праблематыка
2. Пафас
3. Лірычны герой
4. Жанр
5. Мастацкая вобразнасць

Заключным этапам семінара стане калектыўнае абмеркаванне 3—4 вучнёўскіх эсэ (на выбар настаўніка).

❐ **Дамашняе заданне:** законспектаваць асноўныя этапы творчасці М. Дуксы і скласці невялікую паэтычную анталогію з вершаў паэта.

**Генадзь Пашкоў.** Першая частка ўрока па вывучэнні творчасці Г. Пашкова адбываецца ў форме лекцыі настаўніка пра асаблівасці стылю паэта, у якой трэба спыніцца на наступных аспектах:

1) на пачатку творчага шляху вызначальнай для паэта становіцца тэма малой радзімы, роднай хаты;

2) паэзія Г. Пашкова разнапланавая: вершы і паэмы пра замежжа, роздумы пра лёс Зямлі і зямлян, вершы пра мінулую і магчымыя новыя войны, пра адмоўны ўплыў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на лёс зямлі і людскія лёсы, пра Чарнобыль і інш.;

3) Г. Пашкоў — аўтар ліра-эпічных («Трывога» і «На ласіных картах») і лірыка-філасофскіх («Легенда Прыпяці», «Дзяўчынка з блакітным мячыкам») паэм, прысвечаных тэме ўзаемаадносін чалавека і прыроды.

Рэфлексію па першай частцы ўрока можна правесці ў форме калектыўнага абмеркавання пытання: *Ці згодны вы, што творчым крэда Г. Пашкова можна лічыць наступныя радкі, змешчаныя на вокладцы зборніка «Тваім святлом благаславёны»?*

> І што б ні рабіў я,
> ды зноў
> у сэрцы пульсуе
> адзінае:
> аснова
> ўсіх асноў —
> Жанчына,
> Зямля,
> Радзіма.

*Чаму ў трыядзе «Жанчына—Зямля—Радзіма», на вашу думку, першай з'яўляецца менавіта Жанчына, а не Радзіма? Калі вы не згодны з абраным для самапрэзентацыі Г. Пашкова вершам, паспрабуйце знайсці яму замену (на матэрыяле вершаў з названага зборніка).*

Другая частка ўрока стане абагульненнем вывучанага па тэме «Паэзія» ў форме запаўнення табліцы. Можна прапанаваць вучням калектыўна абмеркаваць пытанне: *Якой я бачу літаратуру XXI стагоддзя?*

| Рысы стылю | Мар'ян Дукса | Раіса Баравікова | Генадзь Пашкоў |
|---|---|---|---|
| Тэматыка і праблематыка | | | |
| Пафас | | | |
| Лірычны герой | | | |
| Жанры | | | |
| Мастацкая вобразнасць | | | |

❐ **Дамашняе заданне:** законспектаваць асноўныя звесткі з жыцця і творчасці Г. Пашкова.

# ПРОЗА

## УРОК 1.

### Тэматыка і праблематыка сучаснай прозы

Агляд сучаснай прозы — тэма, складаная для вывучэння. Пры абмежаванай колькасці гадзін асэнсаваць усё, што прапанавана, надзвычай цяжка. Найбольш прымальны шлях падачы матэрыялу — лекцыя. Яе прызначэнне заключаецца ў тым, каб паглыбіць уяўленне вучняў пра напрамкі творчых пошукаў, тэматыку і ідэйны змест сучаснай прозы, пашырыць веды пра пісьменнікаў, чые творы ўжо вывучаліся, і пазнаёміць з тымі, чые творы ўпершыню ўведзены ў праграму. Настаўнік можа абапірацца на тыя звесткі, якія ўжо атрыманы ў папярэдніх класах, а таксама прапанаваць некалькім вучням падрыхтаваць выступленні пра жыццёвы шлях і творы асобных празаікаў.

Варта прапанаваць вучням знайсці некаторыя звесткі пра пісьменнікаў, параіць ім звярнуцца да дапаможнай літаратуры, каб зрабіць невялікія паведамленні і дапоўніць выступленне настаўніка[1].

З творчасцю В. Быкава, І. Шамякіна, І. Навуменкі вучні знаёміліся раней, а таму размова пра іх падчас аглядавай тэмы — працяг асэнсавання спадчыны народных пісьменнікаў. У V—VIII класах на ўроках вывучаюцца таксама творы І. Пташнікава, В. Адамчыка, В. Карамазава, В. Казько, А. Жука, Г. Далідовіча,

---

[1] У школьнай праграме змешчаны спіс найважнейшай літаратуры па тэме, але неабходна вылучыць такія карысныя крыніцы, як: Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Інстытут літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусь, Беларуская энцыклапедыя; пад. рэд. А. В. Мальдзіса. — Мінск: БелЭн, 1992—1995; Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. Т. 4. Кн. 1. 1966—1985 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск: Бел. навука, 2002. — 928 с.; Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986—2000 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск: Бел. навука, 2003. — 975 с.

Л. Дайнекі, творы многіх празаікаў прапанаваны для пазакласнага і самастойнага чытання, у тым ліку і тых, якія прадстаўлены ў аглядавай тэме.

Задача літаратуры на сучасным этапе застаецца нязменнай — адлюстраваць свой час у мастацкіх карцінах і вобразах. На пераломе двух стагоддзяў гэта ўскладняецца яшчэ тым, што грамадства ўступіла ў новы перыяд свайго развіцця. Распалася вялікая дзяржава, узнікла незалежная Рэспубліка Беларусь, востра паўстала праблема пераадолення ранейшых уяўленняў пра жыццё грамадства і яго перспектывы.

У тэматыцы сучаснай прозы можна вылучыць два найважнейшыя кірункі. Першы — асэнсаванне сацыяльных і маральна-філасофскіх праблем, да чаго неабходна дадаць і творы пра чарнобыльскую бяду. Гэта ўвага мастакоў слова да тых падзей і працэсаў, якія хвалююць людзей і вызначаюць сучасны стан грамадскага жыцця.

Другі кірунак — гістарычная тэма, творы пра мінулае роднага краю, у тым ліку пераасэнсаванне савецкага і заходнебеларускага перыядаў, а таксама пра творы Вялікую Айчынную вайну.

Для зручнасці аналізу ў праграме і ў вучэбным дапаможніку творы размеркаваны тэматычна. Вядома, у адным значным творы можа ўзнімацца мноства праблем сацыяльна-псіхалагічнага і маральна-этычнага планаў. Усякая тэма застаецца надзённай, калі канцэпцыя жыцця, як выяўленне поглядаў пісьменніка на вострыя пытанні, адлюстроўвае сучасны стан развіцця грамадства. Надзённасць аўтарскай пазіцыі вызначае ідэйны змест твора, акрэслівае характары персанажаў, уплывае на вырашэнне канфлікту, які ляжыць у аснове сюжэта.

У лепшых творах мастакоў слова жыццё паказваецца шырока, аб'ёмна, усебакова. Асоба станоўчага героя праяўляецца праз яго актыўную дзейнасць у разнастайных сферах рэчаіснасці. Пісьменнікі вядуць з чытачамі зацікаўленую размову аб тым, што робіць чалавека шчаслівым і што перашкаджае яму быць і адчуваць сябе такім.

Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дзе зроблена спроба асэнсавання тэматыкі і праблематыкі здабыткаў сучаснай прозы, можа стаць асновай лекцыі настаўніка (с. 234—237). Вядома, яе варта дапоўніць дадатковымі звесткамі і кароткімі выступленнямі вучняў пра жыццё і творчасць некаторых празаікаў.

Праграма прапануе для вывучэння двух-трох аўтараў на выбар настаўніка і вылучае творчасць І. Пташнікава, В. Казько, В. Карамазава. Трэба мець на ўвазе і тое, што гэта апошняя тэма, якая завяршае вывучэнне літаратуры, падсумоўвае этапы яе развіцця і акрэслівае перспектывы далейшых пошукаў айчыннага прыгожага пісьменства. Сучасная літаратура самабытна і дасканала прадстаўляе сусветнаму чытачу рух свайго народа ў гісторыі, яго менталітэт і духоўны космас, з'яўляючыся арыгінальнай часткай агульначалавечай культуры.

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць аповесць «Тартак» І. Пташнікава; індывідуальнае заданне для аднаго-двух вучняў: зрабіць кароткія паведамленні пра жыццё і творчы шлях І. Пташнікава (для гэтага варта выкарыстаць як матэрыял вучэбнага дапаможніка, так і дадатковыя звесткі з таго спісу літаратуры, які прыведзены ў праграме).

## УРОК 2.

### Жыццёвы і творчы шлях Івана Пташнікава. Аповесці «Тартак», «Найдорф»

Адзінаццацікласнікі ўжо звярталіся да вывучэння творчасці вядомага празаіка. У VI класе вывучаецца апавяданне «Алені», а для пазакласнага чытання прапануюцца «Арчыбал» (VI клас) і «Ільвы» (VII клас). На пачатку ўрока можна звярнуцца да вучняў з пытаннем: *Якія творы І. Пташнікава вы ведаеце?* Затым разам з імі ўспомніць галоўныя падзеі і акрэсліць асноўныя ідэі твораў.

Настаўнік падагульняе звесткі пра адметнасць і своеасаблівасць І. Пташнікава-мастака. Падзеі ў яго творах адбываюцца ў гады вайны ці ў пасляваенны час, але героі ва ўспамінах нязменна вяртаюцца ў тыя грозныя дні. Гэта надае творам востры драматызм, які звязаны як з абставінамі часу, так і з супярэчнасцямі ва ўзаемаадносінах персанажаў. Мастак-псіхолаг уводзіць чытача ў свет думак і перажыванняў сваіх герояў, якія часта аказваюцца перад няпростым, а то і вызначальным жыццёвым выбарам. Яны не адступаюць перад выпрабаваннямі, застаюцца мужнымі і высакароднымі ў сваіх учынках, кіруюцца нормамі народнай маралі пры вырашэнні складаных праблем. Многія старонкі твораў нагадваюць маналогі дзеючых асоб, праз

якія выяўляюцца адносіны да падзей. Часта голас пісьменніка зліваецца з голасам герояў яго твораў. Вылучае І. Пташнікава арыгінальная манера пісьма, імкненне да выразнай і сакавітай мовы. У яго прозе спалучаюцца навізна і яркасць мастацкіх вобразаў, дакладнасць і непаўторнасць дэталей, свежасць і змястоўнасць слова. Усё гэта дапамагае стварыць запамінальныя малюнкі жыцця і непаўторныя характары персанажаў.

Галоўная задача ўрока — аналіз аповесці «Тартак», дзеля чаго пажадана выкарыстаць шлях «следам за аўтарам», прасачыць развіццё падзей. У пачатку аналізу можна спытаць адзінаццацікласнікаў: *Што вы ведаеце пра гісторыю вёскі Дальва, якой было наканавана паражыць лёс Хатыні?* Пасля настаўнік просіць вучняў падзяліцца ўражаннямі ад прачытанага: *Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас гэты твор?* Аповесць уражвае вострым і драматычным сюжэтам, які звязаны са спробай жыхароў вёскі Дальва выратавацца ў час блакады партызанскага краю. *Перад якім выбарам ставілі карнікі жыхароў вёскі? Што рухала вяскоўцамі, калі яны імкнуліся дагадзіць фашыстам?* Карнікі паставілі ўмову, паводле якой магла ацалець вёска і ўсе яе жыхары толькі тады, калі яны даставяць збожжа ў Краснае. Вядома, усякі кампраміс з фашыстамі быў немагчымы, але людзей не пакідала надзея выратавацца ад смерці. У гэтых умовах ніхто не хацеў думаць пра горшае, а таму сем чалавек вязуць збожжа ў нямецкі гарнізон. Абставіны гэтага шляху і трэба прасачыць.

*Вызначце эмацыянальны фон твора. Чым ён абумоўлены?* Трывога адразу ахоплівае чытача. Трывога і за тых, хто вязе збожжа па ваенных дарогах у акружэнні зграі карнікаў, і за тых, хто чакае ў вёсцы выратавання ад смерці. І сапраўды, дарогі мірнага абоза і ўзброеных забойцаў непазбежна павінны былі перакрыжавацца. Акупанты ў любы час могуць забыць пра ранейшыя абяцанні, што ўрэшце і адбылося. Там, дзе да вайны быў тартак (лесапілка), карнікі спыняюць абоз і ставяць яго наперадзе сваёй калоны, каб схавацца ад партызанскіх куль. У час бою возчыкі адзін за адным гінуць, акрамя Алёшы.

*Каго і чаму выбралі жыхары вёскі для выканання адказнага даручэння? Навошта аўтар уводзіць у твор рэтраспектыўны паказ мінулых падзей?* Ужо сам выбар у якасці возчыкаў гэтых

людзей яскрава сведчыць аб тым, хто заставаўся ў вёсках у час вайны, — хворыя, старыя, жанчыны, падлеткі. Пісьменнік скіроўвае ўвагу чытача на самаахвярнасць вяскоўцаў, якія любой цаной хацелі ўратаваць жыццё сваім блізкім. Ён прасочвае лёсы кожнага з возчыкаў, аднаўляе ранейшае жыццё ў сям'і, у супольнай працы.

Пры абмеркаванні аповесці варта вылучыць найбольш яркія і запамінальныя эпізоды, якія ўразілі вучняў. Гэта, напрыклад, ад'езд з вёскі ў дарогу, трывожныя эпізоды ў час паездкі, мацярынскі клопат Насты, трагічная смерць возчыкаў, вяртанне Алёшы на папялішча роднай вёскі. Вучням павінны быць цікавымі думкі і ўспаміны падлеткаў Тані і Алёшы.

Калі былі прачытаны абедзьве аповесці — «Тартак» і «Найдорф», то варта звярнуцца да аналізу і другога твора.

Пытанні і заданні для праверкі ведаў падаюцца ў вучэбным дапаможніку (с. 245).

❒ **Дамашняе заданне:** карыстаючыся памяткай для аналізу мастацкага вобраза (с. 299), падрыхтаваць разгорнутую характарыстыку аднаго з герояў аповесці; прачытаць апавяданне І. Пташнікава «Французжанкі» (ці «Тры пуды жыта»).

## УРОК 3.

## Раманы «Мсціжы», «Алімпіяда»; апавяданне «Французжанкі» (ці «Тры пуды жыта») Івана Пташнікава

Падрабязны аналіз усіх гэтых твораў на адным уроку зрабіць немагчыма. Варта спыніцца на тэмах і праблемах, у іх узнятых. У пачатку ўрока мэтазгодна ўзнавіць веды вучняў пра раман як жанр эпічнай літаратуры і ўзгадаць віды раманаў. Для гэтага варта выкарыстаць слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў у вучэбным дапаможніку (с. 296). Далей неабходна папрасіць адзінаццацікласнікаў абгрунтавана даказаць, да якога віду адносіцца раман «Мсціжы».

«Мсціжы» — адзін з самых значных сацыяльна-псіхалагічных раманаў другой паловы XX стагоддзя. У цэнтр твора ставіцца шмат вострых, надзённых пытанняў грамадскага жыцця.

*Як праз вобраз галоўнага героя Вялічкі выяўляецца аўтарская канцэпцыя чалавека?* У рамане «Мсціжы» пісьменнік

выказаў сваю канцэпцыю жыцця. Чалавек хоча быць асобай, працаваць у калектыве, жыць у еднасці з роднай зямлёй і быць шчаслівым з дарагімі яму людзьмі. Сюжэт твора — гэта пошукі Андрэем Вялічкам свайго месца ў жыцці. Падзеі развіваюцца ў цэлым паслядоўна, у адпаведнасці з тымі выпрабаваннямі, з якімі сутыкаецца герой. Ён даволі часта ўспамінае перажытае, сямейнае жыццё, удзел у партызанскім змаганні, пасляваенныя гады.

*Як жыццё і лёс выпрабоўваюць галоўнага героя на трываласць яго перакананняў? Хто і што дапамагло яму выстаяць?* І. Пташнікаў, як і ў папярэдніх творах, надзвычай драматызуе падзеі, ускладняе жыццёвы лёс героя: смерць жонкі Веркі, з якой жыў у добрай згодзе многа гадоў, хвароба, ускладненні і праблемы на працы, уласныя гаспадарскія клопаты.

Абвастрэнне сюжэтнага дзеяння звязана і з характарам героя, які настойліва, часам пакутліва, але сумленна шукае выйсце са складанай жыццёвай сітуацыі. Выстаяць у драматычных абставінах яму дапамагаюць многія людзі.

Аўтар падкрэслівае, што Вялічку не падабаецца, калі хтосьці вырашае за яго тыя праблемы, якія ставіць жыццё. Ён перакананы, што чалавек сам павінен выбіраць, як жыць і што рабіць. Добра разумее Вялічку і пастаянна клапоціцца пра яго дачку Балюта, абараняе на калгасным сходзе брыгадзір Юбіцкі, запрашаюць на працу, як сумленнага чалавека, геолагі.

*Параўнайце вобразы Вялічкі і Падбярэцкага. Акрэсліце жыццёвыя ідэалы кожнага з герояў.* Вялічка колькі разоў уступае з Падбярэцкім у спрэчку, а то і бойку, калі той пачынае цынічна гаварыць пра людзей. Не хоча разбірацца ў складанасцях і праблемах старшыня калгаса Дзярызямля, якому таксама «рукі трэба».

Асабліва трагічныя ў творы лёсы Рамана і Вулі. *Якую драму перажыў Вуля і як гэта паўплывала на яго паводзіны?* Гэты герой спрабуе апраўдацца перад Вялічкам, выказвае боль, які не дае яму спакою. У час вайны ён выратаваўся сам, але не змог выратаваць жонку і дзяцей. Вуля і зараз лёгка пераходзіць ад адной справы да іншай. Ён, раней за Вялічку, перайшоў да геолагаў.

*У чым, на думку аўтара, заключаецца сэнс жыцця?* У творы выяўляецца канфлікт паміж чалавекам — працаўніком

і творцам і чалавекам-спажыўцом. Гэты канфлікт найперш падаецца праз узаемаадносіны персанажаў. Сям'я, працоўны калектыў, прырода — гэта тое асяроддзе, у якім жыве чалавек. Паступова акрэсліваецца і галоўная ідэя рамана. *Што даюць чалавеку праца, прырода, чым яны з'яўляюцца для яго?* Вучні павінны прыйсці да высновы, што зносіны з прыродай, любімая, патрэбная людзям праца забяспечваюць радасці існавання. У рамане нямала яркіх малюнкаў, запамінальных эпізодаў, на якія варта звярнуць увагу. Дзеля гэтага трэба прапанаваць вучням вылучыць такія моманты, зачытаць (калі трэба) паасобныя эцюды і выказаць сваё станаўленне да іх.

*Чым, на погляд аўтара, з'яўляецца родны кут, яго прырода, людзі? Чым абумоўлена вяртанне Вялічкі з Полацка ў вёску?* Родны кут — гэта крыніца жыватворнай энергіі, здольная гаюча ўплываць на духоўны свет асобы, якая ўмее чула адгукацца на праявы навакольнага жыцця. Варта выбраць некалькі змястоўных пейзажных замалёвак, праз якія перадаецца і душэўны стан чалавека. Гэта дапаможа высвятліць тую ідэю, што значнасць чалавека як асобы праяўляецца і праз яго адносіны да прыроды.

Усім зместам рамана пісьменнік пераконвае чытачоў у правільнасці рашэння героя. Вялічка зразумеў: калі ён страціць родны кут, то можа страціць і тое, што звязвае яго з жыццём, робіць чалавекам, і ператварыцца ў бяздумнага спажыўца, якога цікавіць, як больш атрымаць і ўрваць для сябе.

Гутарку па апавяданнях І. Пташнікава можна правесці па наступных пытаннях: *Як праз лёсы герояў апавяданняў «Французжанкі» і «Тры пуды жыта» раскрываецца драматызм беларускай гісторыі?* Падзеі ў апавяданні «Французжанкі» адбываюцца ў першы пасляваенны год. Перамога, якую так доўга чакалі беларусы, не прынесла многім людзям жаданага шчасця. Зноў распачалася новая хваля рэпрэсій, зноў сталі шукаць ворагаў сярод сваіх. Гэтая пільнасць у такіх заўзятых службоўцаў, як Дувалаў, ператваралася ў жорсткі і зацяты здзек з людзей. Пры вывучэнні твора варта ўсе падзеі, дэталі і развагі звязаць з галоўнай праблемай — асуджэннем недаверу да чалавека і здзеку з яго, — так востра акрэсленай у апавяданні.

Тая ж праблема, але яшчэ ў больш вострай форме, ставіцца ў апавяданні «Тры пуды жыта». Старая жанчына, жонка загуб-

ленага чалавека, задае недаўменнае пытанне і не знаходзіць на яго адказу: «Чаму згнаілі маладымі ў зямлі і майго Сяльвестру і Ставэрку? І ў нашай вёсцы па чалавеку: лічы праз хату».

*Хто вінаваты, на думку аўтара, у тым, што лёс Александрыны склаўся драматычна?* Сумленная працаўніца Александрына і праз многа гадоў так і не можа зразумець, якая віна была ў яе мужа, за што ён быў рэпрэсаваны. Ёй горка і крыўдна да слёз, калі пры яго рэабілітацыі выдалі ад калгаса тры пуды жыта і лапік сенажаці: «Адкупіцца хочуць. У тры пуды ацанілі чалавека. І вязка сена — наверх...» Жанчына не хацела ўсё гэта атрымліваць, ды затым разважыла: «Пакуль буду палучаць жыта — буду разам з Сяльвестрам... І пакуль буду касіць Зурэчча, буду разам з ім... Разам... А там — калі вытрымае сэрца».

І вось на стале даведка аб рэабілітацыі, а на лаве мех з жытам. «І яе ахапіла такая гарката і немата, што яна зноў апусцілася ля мяшка на калені і, ашчапіўшы галаву, закрычала нема — на ўсю хату, на ўвесь двор, на ўсю вёску». Вечарам яна зацята кляпала касу, каб ісці на луг.

Ад гора, болю, перажыванняў і празмернай зацятасці жанчына сама захварэла. Яе ратуюць дачка і сын, але пытанне аб тым, чаму была пазбаўлена шчасця Александрына і яе сям'я, так і застаецца без адказу.

*Растлумачце сімвалічны сэнс назвы твора?* Тры пуды жыта сталі сімвалічнай цаной паламанага чалавечага жыцця, страчаных надзей і спадзяванняў.

❒ **Дамашняе заданне:** прачытаць аповесць В. Казько «Суд у Слабадзе» і па вучэбным дапаможніку пазнаёміцца са звесткамі пра жыццё і творчасць пісьменніка (с. 245—250).

## УРОК 4.

## Жыццёвы і творчы шлях Віктара Казько. Аповесць «Суд у Слабадзе»

Многія факты біяграфіі В. Казько знайшлі ўвасабленне ў яго творах, як гэта заўважаецца ў аповесці «Суд у Слабадзе». Будучы пісьменнік рана страціў маці, у малым узросце перажыў вайну, а пасля яе выхоўваўся ў дзіцячых дамах. У аповесці ён падсумаваў

сваe ўражанні і назіранні, выказаўся як мастак пра трагічны лёс народа і асобнага чалавека ў страшныя дні ліхалеццяя.

*Хто з'яўляецца галоўным героем твора? Памяць пра якую трагедыю ён носіць у душы?* У цэнтры аповесці «Суд у Слабадзе» — трагічны лёс падлетка Колькі Лецечкі. У час вайны ён быў скалечаны фашыстамі і нічога не памятаў. У дзетдомаўскім ізалятары Колька і дажыў да сямнаццаці гадоў.

*Карыстаючыся прыкладным планам характарыстыкі мастацкага вобраза (памятка на с. 299 вучэбнага дапаможніка), ахарактарызуйце галоўнага героя.*

Варта на ўроку прасачыць за настойлівымі пошукамі Лецечкі, які хоча ведаць усё пра самога сябе, хоча зразумець сваё месца ў жыцці і спрагназаваць магчымасць жаданай будучыні. Да таго ж над ім вісіць пагроза хуткай смерці, бо тых, хто жыве ў ізалятары, іншыя дзетдомаўцы часам крыўдліва завуць «недаробкамі». Вартаўнік дзед Захар'я прадказвае яму смерць і нават вызначае час года і час сутак: «Пасля Івана Купельніка лажыцца табе на ўсходзе сонца». Хоць Колька не ведае, «ці то падалося яму, надумалася, ці то сснілася», але з таго часу раніцай ён «пільнуе сонца». Так што часу ў яго засталося вельмі мала, а тут яшчэ суд, які нечакана вяртае яму памяць пра вайну і пра ўсё, што давялося перажыць.

Важны не так той прысуд, які будзе вынесены, як тое, што вынікае з судовага працэсу. Прысуд карнікам ужо прадвызначаны, пазіцыя людзей Слабады выяўлена адразу з пачаткам суда. Дзед Захар'я не можа стрымаць сваё гора, бо ўспаміны пра дзяцей ніяк не хочуць адпускаць яго: «Касу ў рукі вазьму, а ў травах — галоўкі бялявыя дзяцей маіх стаяць, лыжку ў рукі, а з талеркі — іх вочы на мяне...»

Трагічныя моманты і малюнкі ваеннага часу вынікаюць не толькі з паказанняў паліцаяў, з успамінаў Захар'і і Нічыпара. Лецечка слухае паказанні карнікаў пра шматлікія злачынствы, якія яны чынілі, і таксама пачынае вяртацца ва ўспамінах у тыя жудасныя дні. Вайна ў творы — жахлівая, невыносная, бо прыносіла людзям пакуты і здзекі, кроў і смерць.

Лецечка згодзен з Захар'ем, што паліцаі ўжо сталі мерцвякамі, бо яны адступіліся ад тых нормаў жыцця, якімі павінны

кіравацца людзі. Паводзінамі на судовым працэсе яны так і не наблізіліся да разумення сваёй віны, неабходнасці асудзіць саміх сябе за здзейсненыя злачынствы і пакаяцца за нечуваныя, страшныя грахі. Яны так і не захацелі прызнаць, што для іх настаў «судны дзень». «Кожнаму чалавеку, кожнай яго справе ёсць судны дзень, ёсць судны час», — сцвярджаецца ў творы.

*Акрэсліце галоўную праблему аповесці і спосабы яе выяўлення ў творы.* Праблема віны і адказнасці за ўчыненае супраць людзей зло становіцца адной з вядучых у творы. Паліцаі ж знаходзілі розныя прычыны, каб апраўдацца, адмовіцца ад сваіх ранейшых слоў: «На то ж вайна, то ж вайна, немцы... Я адмаўляюся, адмаўляюся я...» Кожны з іх «выкручваўся, хітраваў, поўзаў, вытаргоўваў сваё жыццё...» Няўхільны абвінаваўчы прысуд выносіцца не толькі карнікам, а і вайне, фашызму, які развязаў яе дзеля сваіх разбойных мэт.

*У чым трагічнасць лёсуВанькі Лецечкі? Як суд прычыніўся да яго жыцця?* У час суда Лецечка балюча перажывае тыя пакуты, праз якія праходзілі людзі, і гэтыя перажыванні становяцца для яго невыноснымі, нібы ён зноў трапляе ў фашысцкі дзетдом: «Увесь зямны жах засяродзіўся для яго на чорнай, коса зрэзанай іголцы шпрыца. Увесь зямны боль глядзеў на яго, цікаваў з гэтай дзірачкі». Ён прыйшоў да сумнай высновы, што «не здолее больш жыць на зямлі з гэтай сваёй памяццю». Ён не хоча і не можа жыць у атмасферы нянавісці, бо нельга доўга пражыць з ёю ў сэрцы. Ён хоча жыць зусім інакш, каб людзі па-добраму ставіліся адзін да аднаго. Ён мірыць Захар'ю і бабу Зосю, раздае свае рэчы сябрам, удзельнічае ў агульным пратэсце, каб дзетдом меў спецзабеспячэнне і каб пазбавіўся ад прыдзірлівай выхавацелькі. Яго ўжо цягне ў вялікі вольны свет, які ляжыць за сценамі панурага ізалятара.

Перажыванні, звязаныя са зваротам у балючую памяць, не праходзяць бясследна. Гэта таксама прысуд вайне, крывавым катам, якія так і не адчулі сваёй віны, не захацелі пакаяцца, а мітусліва імкнуліся «вытаргаваць» фізічнае існаванне. Нянавісць усё яшчэ працягвае чыніць зло. Ахвярай яе стала і шматпакутнае дзіця ваеннага часу.

❐ **Дамашняе заданне:** прачытаць раман В. Казько «Неруш».

## УРОК 5.

### Раман «Неруш» Віктара Казько

У кожным сучасным грамадстве, у тым ліку і ў нас на Беларусі, вялікая ўвага ўдзяляецца ахове акаляючага асяроддзя, падтрыманню гарманічнага суіснавання грамадства з прыродай — зямлёй, паветрам, лясамі, рэкамі, азёрамі, без чысціні якіх немагчыма захаваць жыццё чалавека, жывёл, раслін. У свеце, на жаль, часам адбываюцца тэхнагенныя катастрофы са знішчальнымі для чалавецтва наступствамі. У ліку іх — чарнобыльская на Украіне ў 1986 годзе, якая сапраўды чорным крылом накрыла Беларусь, аварыя на Фукусіме ў Японіі ў 2011 годзе, наступствы якой яшчэ не могуць аб'ектыўна ацаніць і спрагназаваць вучоныя.

Праблема захавання чысціні, непарушнасці навакольнай прыроды, інакш кажучы — экалагічная праблема, стала вострай, хвалюючай у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, і асабліва ў сучаснай літаратуры. У сучасным літаратурным працэсе ўзнікла паняцце «экалагічная літаратура».

Да экалагічнай прозы належаць творы В. Казько, і найперш раман «Неруш».

*Якой актуальнай грамадскай праблеме прысвечаны раман? Выявіце аўтарскія адносіны да яе?* Раман «Неруш» В. Казько прысвечаны адной з самых надзённых тэм — экалогіі. Тэма гэта набыла ў апошні час выключную вастрыню, бо захаванне акаляючага асяроддзя звязана з галоўнай праблемай грамадства — яго будучыняй. Вядома, у кожным з раманаў на першы план выходзіць адзін з важных аспектаў. У «Нерушы» падкрэслена вылучаецца неабходнасць захавання належнай мяжы пры правядзенні работ па асушэнні палескіх балот. З гэтага непазбежна вынікае праблема адказнасці чалавека, кіраўніка за тыя незваротныя страты, якія можа панесці прырода ў выніку паспешлівых і непрадуманых праектаў. Але змест твора значна шырэйшы. «Мне шмат хацелася сказаць пра духоўнасць чалавека ўвогуле, пра народ, яго гістарычную памяць, нацыянальную самасвядомасць і многае іншае. Усё гэта ў рамане пераплецена і ўзаемазвязана», — зазначае пісьменнік.

У цэнтр увагі на ўроку, такім чынам, неабходна паставіць тыя вядучыя праблемы, якія вынікаюць з ідэйнага зместу твора. Ён

заключаецца не толькі ў захаванні прыроды, а і ў неабходнасці дбайнага стаўлення да духоўнай спадчыны народа. Захаванне прыроды — гэта захаванне жыцця на абжытай тэрыторыі, захаванне не толькі спрыяльных умоў для гаспадарання, а і пастаяннае памнажэнне духоўных здабыткаў народа.

Арганізаваць аналітычную дзейнасць вучняў на ўроку дапаможа наступная сістэма пытанняў і заданняў:

*1. Якія змены напаткалі жыхароў вёскі Княжбор пры правядзенні асушэння балот?*

*2. Якую ролю ў змене наваколля роднай вёскі выконвае Мацей Роўда?*

*3. Як ён ставіцца да сваіх службовых абавязкаў? Пад уплывам якіх абставін змяніліся яго адносіны да сваёй працы і да самога сябе?*

*4. Акрэсліце аўтарскую пазіцыю да пераўтварэнняў на Палессі.*

*5. Як спажывецкія адносіны да прыроды ўплываюць на духоўны свет чалавека?*

*6. Вызначце ролю легендаў, выкарыстаных у творы, у раскрыцці ідэйнай задумы аўтара.*

*7. Растлумачце сімвалічны сэнс назвы твора.*

❐ **Дамашняе заданне:** прачытаць раман В. Карамазава «Пушча»; індывідуальнае заданне: падрыхтаваць паведамленні пра жыццё і творчасць В. Карамазава.

## УРОК 6.

### Кароткі агляд творчасці Віктара Карамазава. Раман «Пушча»

Вучні ўжо маюць уяўленне пра творчасць пісьменніка: апавяданне «Дзяльба кабанчыка» вывучаецца ў VIII класе, а для пазакласнага чытання прапанаваны «Падранак» (VI клас) і «Прыліпала» (VIII клас). Гэта дае магчымасць правесці з адзінаццацікласнікамі гутарку пра тыя творы, з якімі яны ўжо пазнаёміліся. Размову пажадана пашырыць паведамленнямі некалькіх вучняў пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Паколькі тэма ўрока — аналіз рамана «Пушча», то раннія творы павінны ўспрымацца як этапы станаўлення празаіка. Ужо ў зборніку «Падранак» было тое, што знойдзе свой працяг

у «Пушчы». Тут і спробы заглыбіцца ў штодзённае жыццё, і жаданне вылучыць постаці цікавых людзей, і пастаянная ўвага да праблемы захавання прыроды. Да ліку лепшых апавяданняў адносяцца тыя, якія прадстаўлены ў вучэбным дапаможніку, але можна вылучыць і некаторыя іншыя. Напрыклад, эсэ «Ліпеньскі сшытак» — натхнёнае ўслаўленне мудрай і вечнай красы прыроды. Гэты твор тэматычна шмат у чым перагукаецца з раманам «Пушча».

Аповесць «Бярозавыя венікі» ўспрымаецца як чарговы этап у творчасці В. Карамазава і ў плане пошукаў формы буйнога празаічнага твора, і ў плане ўвагі да надзённых праблем і вострых жыццёвых канфліктаў. У аснове непаразумення як паміж бацькам і сынам, так і паміж сябрамі дзяцінства ляжаць кар'ерысцкія памкненні Сцяпана, якому хочацца ўтульна ўладкавацца ў Мінску на добрай пасадзе і ў прасторнай кватэры. Для гэтага трэба пастаянна дагаджаць кіраўніку ўстановы, але маральныя выдаткі такога жыцця не могуць прайсці бясследна.

Складанасць вывучэння рамана «Пушча» заключаецца не толькі ў тым, што гэта маштабны па аб'ёме і праблематыцы твор, а і ў своеасаблівасці яго кампазіцыйнай пабудовы. Разнастайныя праблемы вакол пушчы і ставяцца ў цэнтр увагі на ўроку, а развагі над імі падмацоўваюцца вылучэннем найбольш значных эпізодаў, у якіх выяўляецца пазіцыя персанажаў.

*Крытыкі, ацэньваючы раман, пісалі аб яго важным значэнні ў выпрацоўцы экалагічнай філасофіі, аб стварэнні новай этыкі ўзаемаадносін чалавека з прыродай у сучасным грамадстве. Ці пагаджаецеся вы з гэтымі меркаваннямі і чаму? Якія іншыя творы «прыродаахоўнай» праблематыкі ў нашай літаратуры вам вядомыя?* Праблемна-тэматычны шлях аналізу найбольш прыдатны для таго, каб акрэсліць распрацоўку ў рамане важных грамадскіх задач. Пісьменнік закранае надзённыя пытанні, якія звязаны з сучасным станам узаемадачыненняў чалавека і прыроды. Аўтар прадставіў шэраг вобразаў кіраўнікоў, звычайных працаўнікоў, прадстаўнікоў старэйшага і малодшага пакаленняў, якія па-рознаму ставяцца да лесу: кіраўнікі Зімавец, Валошка, Ракуцёнак; леснікі Курнепа, Агейчык, Рысеў; прадстаўнікі іншых прафесій, звязаных з лесам, — Насця, дзед Гарох, Міна, Міцька; студэнты-практыканты Андрэй і Алена.

*Ахарактарызуйце адносіны кіраўнікоў да пушчы? Каго з іх можна назваць спажыўцом, а каго — сапраўдным гаспадаром? Адказ абгрунтуйце.* Першая задача кіраўнікоў прадпрыемстваў заключаецца ў тым, каб задаволіць шматлікія патрабаванні па набыцці драўніны і адначасова не загубіць пушчу, па магчымасці выконваць шматлікія просьбы і заяўкі, але рупліва ахоўваць прыроду і памнажаць яе багацці. Стаўленне да прыроды, да лесу падзяляюць персанажаў на сапраўдных гаспадароў і хцівых спажыўцоў, на сяброў і ворагаў пушчы.

*Каго, без сумнення, можна лічыць станоўчымі героямі рамана і чаму?* Да станоўчых персанажаў трэба аднесці ляснічага Валошку, лесніка Макара Курнопу, студэнта-практыканта Андрэя, а таксама дзеда Гароха, Насцю, Міну, шчырых працаўнікоў, у якіх «душа балела за ўсё жывое».

*Каго з герояў В. Карамазава можна лічыць ворагамі пушчы? Чаму?* Ворагі пушчы — гэта тыя, хто з розных жыццёвых пазіцый, але з адным спажывецкім падыходам ставяцца да пушчы. Спажывецтва — гэта спосаб жыцця і вядучая рыса псіхалогіі. Зімавец аддаў загад спілаваць спрадвечныя дубы. Ён з кар'ерысцкіх разлікаў запрашае на паляванне высокіх чыноў з Мінска, якія хацелі пастраляць ласёў. Да спажыўцоў адносяцца памочнік ляснічага Вайцюк, дробны браканьер Рысеў, старшыня калгаса, які праз няўдалую меліярацыю асушыў ладны кавалак лесу, і тыя ж паляўнічыя.

*Ці можам лічыць, што галоўнай гераіняй твора з'яўляецца сама векавечная пушча, адухоўлены свет прыроды? Адказ абгрунтуйце. Раскрыйце сімвалічнае значэнне назвы твора і алегарычны сэнс вобраза Лёсіка Мураўкі.* Аўтар абагаўляе «душу» пушчы пры дапамозе сімвалічных і алегарычных вобразаў («Іванаў корань», святы дуб і інш.). Але найбольш значны ў алегарычнай сістэме рамана вобраз Лёсіка Мураўкі, які з часоў вайны застаўся псіхічна хворым. У лесе, сярод дрэў, раслін, птушак, яму спакайней і ўтульней, чым з людзьмі. Свядомасць героя раздвоена паміж рэальным светам людзей і ўяўным, лясным светам, дзе ён адчувае сябе Панам пушчы. Ён з'яўляецца голасам, трывогай, аховай пушчы. У канцы твора ён з пажарнай вышкі склікае людзей бараніць дуброву, якую Зімавец вырашыў аддаць пад нарыхтоўку мясаразрубачных калодак для Магаданскага аблгандлю.

Праз гэты і іншыя вобразы рамана пісьменнік паказвае, што неабходна берагчы запаветныя беларускія лясы; сучасная тэхнагенная цывілізацыя ўжо даўно жыве ў доўг, абкрадаючы наступныя пакаленні.

❒ **Дамашняе заданне:** пазнаёміцца з аповесцю «Крыж на зямлі і поўня ў небе» В. Карамазава пра вядомага мастака В. К. Бялыніцкага-Бірулю.

## ДРАМАТУРГІЯ

### УРОК 1.

### Сучасная беларуская драматургія. Асноўныя кірункі і творы

Мэта аглядавага ўрока — дапамагчы вучням уявіць працэсы, якія адбываюцца ў сучаснай драматургіі, пазнаёміць з найбольш значнымі прадстаўнікамі і творамі. Задача настаўніка: паказаць адметнасць сучаснай беларускай драматургіі, разнастайнасць яе пошукавых кірункаў, падрыхтаваць вучняў да ўспрымання прапанаваных праграмай драматычных твораў для абавязковага і пазакласнага чытання, зацікавіць найбольш значнымі сучаснымі п’есамі. Акрамя таго, зварот да сучасных драматычных твораў дапаможа школьнікам па-новаму асэнсаваць вывучаныя раней п’есы класікаў беларускай драматургіі В. Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, А. Макаёнка і інш., убачыць пераемнасць паміж класікамі і сучаснікамі, а таксама тое кардынальна новае, што назіраецца ў сучасным літаратурным працэсе, у развіцці драматургіі і тэатра.

Настаўнік можа звярнуцца да традыцыйнай формы аглядавага ўрока — лекцыі, аднак пачаць урок пажадана з гутаркі-зачыну пра ўнікальнасць і складанасць драматургіі як роду літаратуры. У якасці адпраўнога пункта такой гутаркі могуць паслужыць словы А. Дударава: «Драматургія — вышэйшы літаратурны жанр... Яна ўбірае ў сябе і паэзію, і прозу, і публіцыстыку, і псіхалогію, і філасофію, і рэлігію, мінулае, цяпе-

рашняе, будучае. Яна — жыццё». Настаўнік нагадвае вучням іншыя выказванні аб драматургіі, адзначае, што яшчэ Арыстоцель лічыў драматургію самай дасканалай формай слоўнага мастацтва. Пра спецыфіку драматургіі, яе вытокі можа быць падрыхтавана кароткае паведамленне аднаго з вучняў. Па ходзе гутаркі настаўнік задае наступныя пытанні:

*1. Чым абмежавана драма ў параўнанні з прозай і лірыкай?*

*2. Што неабходна ўлічваць драматургу, каб яго п'еса аказала ўздзеянне на чытача і гледача?*

*3. Што ляжыць у аснове драматычнага твора?*

*4. Чым вызначаецца адметнасць жанру драмы і што ўплывае на выбар таго ці іншага драматычнага жанру аўтарам?*

*5. Які жанр, на вашу думку, пераважае ў беларускай драматургіі і чаму?*

*6. Чаму драматургічны дар лічыцца «рэдкай з'явай»?*

Важна, каб вучні разважалі, маглі выказаць свае меркаванні наконт спецыфікі драматургіі. Пасля завяршэння гутаркі настаўнік робіць падагульненне і адзначае, што напісанне п'есы патрабуе ад пісьменніка не толькі драматургічнага дару, але і ўмення бачыць жыццё ў яго канфліктнай супярэчлівасці, выяўляць найбольш вострыя праблемы сучаснасці, інакш кажучы, адчуваць «драматычнае», заўважаць драматызм звычайнага жыцця.

Драматургія прызвана ісці ў нагу з часам, адгукацца на падзеі грамадскага жыцця, таму драматург павінен бачыць вострыя канфлікты сучаснасці, каб адлюстраваць іх у творы. Настаўнік просіць вучняў назваць выдатных беларускіх драматургаў, вывучаныя раней п'есы і коратка ахарактарызаваць сутнасць канфліктаў у гэтых творах. Па меры неабходнасці варта дапаўняць адказы вучняў і праводзіць сувязь з грамадска-гістарычнай сітуацыяй, у якой прыгаданыя п'есы былі напісаныя. Пасля такой гутаркі неабходна перайсці непасрэдна да тэмы ўрока і папрасіць вучняў назваць асноўныя праблемы сённяшняга жыцця, вылучыць найбольш вострыя, на іх думку, канфлікты сучаснасці.

Існуе перакананне, што найбольш спрыяльнымі для драматургіі з'яўляюцца пераходныя перыяды.

**ДАВЕДКА.** Настаўнік можа прывесці выказванні рускага тэатразнаўцы І. Вішнеўскай і вядомага рускага драматурга М. Пагодзіна. «Калі прыходзіць час драматургіі? Існуе меркаванне, што драма ўбірае ў сябе толькі неспакойнае, толькі тое, што мяняецца, што хаатычнае, бязладнае, што мае патрэбу ў навядзенні парадку, у дасягненні дасканаласці, у стварэнні гармоніі», — заўважае І. Вішнеўская. М. Пагодзін гаварыў, што «драматургія там, дзе бязладдзе»[1].

Настаўнік падключае вучняў да пошуку адказу на пытанне: *Чаму беларуская драматургія перажывала крызіс у 80-я гады XX стагоддзя?* Аналізуючы грамадскую сітуацыю, якая склалася ў гэты перыяд, стан беларускага тэатра, варта прыгадаць і тое, што драма, будучы жанрам «дзейснага слова», актывізуецца тады, калі чалавек аказваецца здольны да дзеяння, калі ў грамадстве прысутнічае дух актыўнасці.

Такім чынам, лекцыя настаўніка павінна пачацца з разгляду грамадска-культурных умоў названага перыяду, вызначэння адметнасці сітуацыі ў драматургіі і тэатры гэтага часу. Матэрыял лекцыі для зручнасці можна разбіць на часткі-блокі, змест якіх сцісла прадставіць у апорным канспекце (ніжэй прыводзіцца план).

План

1. Умовы развіцця. Крызіс беларускай драматургіі і тэатра ў 1980-я гады, яго прычыны і шляхі пераадолення.

2. Характарыстыка перыяду. Пераходнасць ад савецкай да постсавецкай драматургіі, змена светапоглядных і мастацкіх арыенціраў. Пашырэнне і абнаўленне тэматыкі і праблематыкі твораў, развіццё традыцыйных і пошук новых жанравых формаў.

3. Новае пакаленне драматургаў. Прыход новага пакалення на мяжы 1980—90-х гадоў, арыентацыя маладых драматургаў на лепшыя здабыткі айчыннай і замежнай драматургіі.

4. Гістарычная драма. Рост папулярнасці гэтага жанру на новым этапе нацыянальнага адраджэння (канец 1980—90-я гг.). Асэнсаванне пісьмен-

---

[1] Вывучэнне аглядавых тэмаў па беларускай літаратуры: вучэб.-метад. дапам. / аўт.-склад.: В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. — Мінск: Юніпрэс, 2001. — С. 232—233.

нікамі-драматургамі драматычнага і разам з тым гераічнага мінулага свайго народа з пазіцыі новага дня і мастацкага бачання пэўнага творцы. Вобразы Францыска Скарыны, Рагнеды, Еўфрасінні Полацкай, Барбары Радзівіл і іншых у сучасных гістарычных п'есах.

5. Сучасная беларуская камедыя. Развіццё традыцый беларускай камедыяграфіі на сучасным этапе.

6. Эксперыментальная драматургія. Шляхі абнаўлення паэтыкі ў драматургіі «новай хвалі»: абсурдысцкая і герменеўтычная беларуская п'еса.

Такі канспект, у якім будзе сістэматызаваны матэрыял лекцыі, настаўнік можа падрыхтаваць для кожнага вучня. У ім варта пакінуць месца для запісаў, якія вучань будзе рабіць на дадзеным уроку і пры далейшай самастойнай працы. На аснове канспекта, уласных запісаў па ходзе лекцыі і аглядавага артыкула «Драматургія», змешчанага ў вучэбным дапаможніку (с. 258—270), адзінаццацікласнікі павінны ўявіць выразную карціну развіцця беларускай драматургіі другой паловы 1980—90-х гадоў.

У заключэнне сваёй лекцыі настаўнік прапануе старшакласнікам назваць асноўныя кірункі развіцця беларускай сучаснай драматургіі. Важна акцэнтаваць увагу вучняў на тым, што ў цэлым у сучаснай беларускай драматургіі творчы пошук вядзецца аўтарамі ў двух напрамках: «Першы — шлях адкрытага эксперыменту, выпрабаванне новых форм умоўнасці, нетрадыцыйнае выкарыстанне сцэнічнай прасторы і часу. Другі напрамак звязаны з выкарыстаннем і трансфармацыяй традыцыйных сродкаў, назапашаных айчыннай драматургіяй»[1].

Па магчымасці лекцыя настаўніка суправаджаецца зрокавымі і слоўна-вобразнымі ілюстрацыямі: партрэтамі драматургаў, рэжысёраў і акцёраў, фотаздымкамі сцэн са спектакляў, цытатамі з твораў, літаратурных і тэатральных рэцэнзій. Да ўрока пажадана падрыхтаваць выставу кніг па сучаснай беларускай драматургіі.

❐ **Дамашняе заданне:** падрыхтаваць адказы на пытанні, змешчаныя ў канцы адпаведнага артыкула ў вучэбным дапаможніку (с. 270); прачытаць п'есу А. Петрашкевіча «Прарок для Айчыны».

---

[1] *Васючэнка, П.* Драматургія і час. — Мінск, 1991. — С. 9.

## УРОК 2.

## «Служыць Бацькаўшчыне». Уступныя і арыентацыйныя заняткі да п'есы Алеся Петрашкевіча «Прарок для Айчыны»

Па тэме «Алесь Петрашкевіч» праграмай прапануецца для вывучэння на выбар адна з п'ес, прысвечаных асобе беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны, — «Напісанае застаецца» або «Прарок для Айчыны». Дадзеныя п'есы складаюць дылогію і будуць аднолькава цікавыя для вучняў. Аднак мы прапануем узяць для аналізу п'есу «Прарок для Айчыны», якая была напісана ў вывучаемы перыяд, у 1990 годзе, у параўнанні з п'есай «Напісанае застаецца», дата напісання якой — 1978 год. Акрамя таго ў п'есе «Напісанае застаецца», на нашу думку, не зусім удала стасуецца гістарычная праўда з творчым вымыслам. Адзінаццацікласнікі ўжо добра дасведчаныя ў гісторыі, і вобраз вялікага нямецкага рэфарматара Марціна Лютэра, які ў творы паказаны ў зніжаным плане, можа выклікаць у іх нязгоду. Пісьменнік мае права на домысел, але нельга скажаць агульны змест дзейнасці пэўнай гістарычнай асобы. Постаць заснавальніка Рэфармацыі ў п'есе ставіцца на адну прыступку з інквізітарамі. Марцін Лютэр у творы А. Петрашкевіча не грэбуе подкупам і карыстаецца паслугамі блудніц. Гэта не зусім адпавядае гістарычнай аб'ектыўнасці. Пры тым «пратэстантызм, Рэфармацыя адыгралі значную ролю і ў станаўленні беларускай культуры, актывізавалі творчую чыннасць такіх славутых паслядоўнікаў Скарыны, як Васіль Цяпінскі і Сымон Будны»[1]. Даследчык беларускай драматургіі П. Васючэнка лічыць п'есу «Напісанае застаецца» творам у многім палемічным, з прыкметамі «п'есы-дыскусіі», дзе вядуцца спрэчкі і дыялогі на рэлігійныя, навуковыя і свецкія тэмы. Паміж дзвюма п'есамі А. Петрашкевіча, прысвечанымі Францыску Скарыну, значны часавы прамежак, за які ўзрасло драматургічнае майстэрства аўтара. У п'есе «Прарок для

---

[1] *Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў. — Мінск, 2000. — С. 54.

Айчыны» менш дэкларатыўнасці, пісьменнік тут больш заглыбляецца ў драму жыцця знакамітай асобы, свет яе думак і перажыванняў, у змест тагачаснай эпохі.

Сістэма ўрокаў па творы можа быць акрэслена наступным чынам: на першым уроку праводзяцца ўступныя і арыентацыйныя заняткі, на другім і трэцім аналізуецца твор і ў завяршэнне трэцяга ўрока праводзяцца заключныя заняткі.

На ўступным этапе вучні знаёмяцца са звесткамі пра жыццё і творчасць А. Петрашкевіча, што пададзены ў артыкуле дапаможніка (с. 270—274), і рыхтуюцца да гутаркі па першых трох пытаннях, змешчаных пасля яго (с. 283). З артыкула яны даведваюцца пра значнасць зробленага пісьменнікам для беларускай літаратуры і культуры за 40 гадоў актыўнай працы, пра адметнасць яго творчасці і месца ў ёй твораў гістарычнай тэматыкі. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што да гістарычнай тэмы драматург звярнуўся яшчэ ў канцы 1970-х гадоў, калі яна не была такой папулярнай у беларускай драматургіі, ды і ўвогуле ў літаратуры. Гэта сведчыць пра смеласць маладога на той час пісьменніка. Амаль што на раўне з У. Караткевічам ён пачынае працаваць над гістарычнай драмай.

Каб вучні лепш засвоілі прачытаны матэрыял, настаўнік можа задаць дадаткова яшчэ такія пытанні:

*1. З якога жанру А. Петрашкевіч пачаў сваю творчую дзейнасць у драматургіі і чаму?* (Адказваючы на гэтае пытанне, вучні павінны ўспомніць з папярэдняга ўрока, што жанр камедыі найбольш распрацаваны ў беларускай драматургіі.)

*2. У чым адметнасць творчага стылю А. Петрашкевіча?*

*3. На якія дзве групы можна падзяліць драматычныя творы пісьменніка паводле зместу?* (Сучаснай і гістарычнай тэматыкі.)

*4. Хто з беларускіх драматургаў аказаў найбольшае ўздзеянне на станаўленне драматурга? Чаму?* (К. Крапіва, з якім А. Петрашкевічу давялося працаваць у рэдакцыі БелСЭ.)

*5. Як выявіўся талент А. Петрашкевіча як драматурга публіцыстычнага мыслення ў творах на гістарычную тэматыку?*

Гутарка па дадзеных пытаннях і пытаннях дапаможніка падрыхтуе вучняў да далейшай працы — вывучэння п’есы

«Прарок для Айчыны». Асабліва важна, каб адзінаццацікласнікі зразумелі, што зварот драматурга да гістарычнай тэмы — з'ява заканамерная, у гэтым праявілася логіка развіцця таленту мастака слова. Пісьменніцкае і жыццёвае крэда А. Петрашкевіча: «Служыць Бацькаўшчыне». Будучы пісьменнікам публіцыстычнага мыслення, бескампрамісным, неабыякавым да лёсу сваёй Айчыны А. Петрашкевіч шукаў у гістарычным мінулым адказы на балючыя праблемы сённяшняга дня, на пытанне: «Што чакае Беларусь у будучым?» Гарачы патрыёт, пісьменнік не мог не звярнуцца да такой знакавай у лёсе Беларусі фігуры, як Францыск Скарына. Сярод слынных герояў нацыі найперш імя Францыска Скарыны лічыцца нацыянальным сімвалам Беларусі, увасабленнем розуму, мужнасці, таленту і працавітасці яе народа. Нездарма ж у адказе на пытанне анкеты для кнігі «Шчыра, як на духу. Споведзі вядомых людзей Беларусі» (2001 г.) пра тое, якая асоба ў гісторыі чалавецтва найбольш імпануе пісьменніку, ён адказаў: «З усіх мне найбольш сімпатычны асветнік, філосаф, перакладчык, мастак Францішак Скарына». Настаўнік можа выкарыстаць на ўроку і іншыя дадзеныя з гэтай анкеты, што дапаможа класу лепш уявіць асобу аўтара. Можна папрасіць вучняў падумаць, як бы яны адказалі на пытанні анкеты. Прывядзём некаторыя з іх.

*Якія станоўчыя якасці ў чалавеку найбольш цэніце?* (Найбольш цаню ў чалавеку працавітасць, сумленнасць, абавязковасць.)

*Якія чалавечыя заганы не церпіце?* (Не цярплю гультайства, п'янства, здрады.)

*Які Ваш любімы занятак?* (Любімы занятак: пісьменства і стварэнне энцыклапедый, пчалярства.)

*Пра якую мясціну на зямлі ў Вас застаўся самы прыемны ўспамін?* (Самы прыемны ўспамін пра крыніцу, якая носіць назоў матулі — «Леўчыхінай крыніцы».)

*Чым (якімі падзеямі, здарэннямі) засталося ў памяці дзяцінства?* (Дзяцінства засталося ў памяці жахлівым жыццём і катаржнай працай за калючым дротам нямецкага гарнізона ў маёй Пярэвалачні падчас трохгадовай нямецкай акупацыі.)

*Якой Вы бачыце Беларусь праз...?* (Пакуль што Беларусь не бачу. Беларусь у шэрым змроку.)

На ўроку настаўнік знаёміць вучняў з кнігамі А. Петрашкевіча, прадстаўляе энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час», факсімільнае выданне Бібліі Скарыны ў трох тамах, да выхаду ў свет якіх прычыніўся пісьменнік, калі працаваў намеснікам галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Важна, каб вучні пазнаёміліся таксама са Статутам Вялікага Княства Літоўскага, пра які ідзе гаворка ў п'есе «Прарок для Айчыны». Настаўнік расказвае гісторыю стварэння Статута, гаворыць пра яго значэнне як помніка прававой культуры і мовы беларусаў. Пры гэтым ён знаёміць клас з партрэтамі тых, хто меў дачыненне да выдання зводу законаў Княства і ўпамінаецца ў тэксце твора. Вучні могуць паразважаць над тым, чаму важна для дзяржавы мець свой звод законаў, канстытуцыю.

На арыентацыйным этапе вучні, якія чыталі п'есу дома, дзеляцца сваімі ўражаннямі пра твор, адказваюць на пытанні:

*1. Што найбольш уразіла ў п'есе?*

*2. Што новага даведаліся пра гістарычных асоб, адлюстраваных у творы?*

*3. Хто з герояў твора выклікае сімпатыю і чаму?*

*4. Як вы зразумелі фінал драмы?*

*5. Ці хацелася б вам паглядзець спектакль па гэтым творы?*

Далей неабходна перайсці да пераказу падзей гістарычнай драмы і акрэсліць праблемы твора. Па просьбе настаўніка вучні пераказваюць змест першай, другой і трэцяй дзей. Пры гэтым яны павінны звярнуць увагу на тое, што падзеі ў п'есе пададзены не ў храналагічнай паслядоўнасці. Мы сустракаемся з галоўным героем Францыскам Скарынам у пазнаньскай турме, а затым даведваемся, якім чынам ён туды трапіў. Таму ў творы пераплятаюцца сцэны з рэальнага часу, з успамінаў Скарыны і тыя падзеі, якія адыгралі вызначальную ролю ў лёсе героя. Настаўнік адзначае, што ў сувязі з гэтым у п'есе можна вылучыць тры асноўныя сюжэтныя лініі: падзеі рэальнага часу, успаміны Скарыны і сцэны, у якіх раскрываюцца таемныя планы змоўшчыкаў супраць асветніка.

❐ **Дамашняе заданне:** вызначыць, якія падзеі драмы «Прарок для Айчыны» можна аднесці да кожнай з сюжэтных ліній; прыдумаць назвы да кожнай дзеі п'есы і падумаць над значэннем назвы твора «Прарок для Айчыны».

## УРОК 3.

## Сістэма персанажаў і сюжэтныя лініі ў п'есе Алеся Петрашкевіча «Прарок для Айчыны». Аналіз твора

Урок можна пачаць з праверкі дамашняга задання. Вучні называюць падзеі кожнай сюжэтнай лініі:

*1-я сюжэтная лінія:* знаходжанне Скарыны ў турме, размовы з вартаўнікам-палачанінам, апраўданне і вызваленне друкара;

*2-я сюжэтная лінія* (звязана з успамінамі Скарыны і з намаганнямі прыхільнікаў Статута паспрыяць яго выданню): аўдыенцыя ў караля Польскага Жыгімонта I Старога ў Кракаве наконт тэксту Статута Вялікага Княства Літоўскага ў прысутнасці каралевы Боны, канцлера Гаштольда і віленскага епіскапа Яна; сустрэча Скарыны з канцлерам Гаштольдам у віленскай рэзідэнцыі вялікага канцлера і размова аб неабходнасці выдання Статута; размова Гаштольда з каралём аб Скарыне і яго адпраўцы ў Кёнігсберг; Скарына ў Кёнігсбергу і трывожныя звесткі з Вільні; прыезд Скарыны ў Вільню і няўдалая паездка ў Масковію, сустрэча з Максімам Грэкам у Валакаламскім манастыры;

*3-я сюжэтная лінія* (звязана з дзеяннямі праціўнікаў Скарыны і выдання Статута): сцэны размоў інтрыганкі каралевы Боны з Чалавекам у чорным. Ужо ў першай дзеі Бона адкрыта выказвае сваю нязгоду з намерамі выдаць Статут і папярэджвае Скарыну аб тым, што яго праца будзе мецъ ворагаў. Пачынаючы ж з другой дзеі прыводзяцца размовы Боны з прадстаўніком усемагутнага ордэна, з якіх мы даведваемся аб перашкодах, якія чыняцца Скарыне, і аб няўдачы, якая напаткала яго ў Маскве.

П'еса А. Петрашкевіча прысвечана самаму драматычнаму перыяду ў жыцці беларускага асветніка. Шмат давялося перажыць Скарыне за перыяд з 1529 па 1532 год, шмат у якіх месцах ён пабываў за гэты час. Настаўнік просіць вучняў: *Вызначце геаграфію падзей, якія папярэднічалі турэмнаму зняволенню Скарыны.* Далей настаўнік пытаецца: *Ці вернецца, на вашу думку, Скарына на радзіму пасля вызвалення з познаньскай турмы?* Вучні павінны даць аргументаваны адказ. *З фінальных слоў Скарыны мы даведваемся, што ён едзе прэч з радзімы, нягледзячы на ахоўную грамату караля, якая так урачыста*

*зачытваецца ў апошняй сцэне. Чаму?* Вучні скажуць, што Скарыну збіраліся атруціць праз Вартаўніка, а значыць ворагі не спыняцца і ў далейшым. Настаўнік просіць адзінаццацікласнікаў прыгадаць пачатак твора, зачытаць урывак з першай сцэны, дзе да Скарыны ў вязніцу з'яўляюцца прывіды Маргарыты, Якуба Бабіча, Канстанціна Астрожскага, Максіма Грэка, брата Івана і Міколы Гусоўскага. Няхай вучні зачытаюць гэты ўрывак па ролях і адкажуць, пра якія няшчасці, што напаткалі галоўнага героя на радзіме, мы з яго даведваемся. Адзінаццацікласнікі называюць асноўныя з іх: знішчэнне пажарам друкарні, смерць жонкі Маргарыты, брата Івана, паплечнікаў і мецэнатаў Якуба Бабіча і Канстанціна Астрожскага. Як бачым, многа няшчасцяў прыйшлося перажыць Скарыну, перш чым ён трапіў у турму горада Познань. Адзінае, што суцяшае друкара ў гэты час, — яго кнігі. Таму, калі б магчыма было спадзявацца зноў наладзіць друкарскую справу на радзіме, Скарына паспрабаваў бы гэта зрабіць. Аднак з тэксту п'есы мы даведваемся, што новыя папскія эдыкты забаранялі выданне якіх бы то ні было кніг, акрамя «богаслужэбных лацінскіх». І за выкананнем гэтых указанняў пільна сачылі. Таму, нягледзячы на перамогу Скарыны, апраўданне яго і вызваленне з турмы ў фінале п'есы, твор заканчваецца на мінорнай ноце, як і пачынаецца. Выдавецкая справа Скарыны церпіць крах.

*Параўнайце першую і апошнюю сцэны твора. Назавіце тыя сродкі, якія дапамагаюць перадаць адпаведны настрой галоўнага героя, стварыць неабходную атмасферу ў пачатку п'есы.* У першай сцэне твора — гэта матыў і словы сумнай народнай песні, якая то перарываецца, то зноў чуецца герою, а таксама з'яўленне прывідаў дарагіх Скарыну людзей, якія, на жаль, не могуць прыйсці на дапамогу зняволенаму, яны — умоўныя персанажы і наведваюць героя і размаўляюць з ім толькі ва ўяўленні. У апошняй жа сцэне з'яўляецца кароль Жыгімонт пры ўсіх каралеўскіх атрыбутах і дыктуе свой чарговы ўказ адносна Скарыны. *Словы каралеўскага ўказа, які дакляруе абарону нашаму герою, гучаць урачыста і пад пагрозай смерці забараняюць чыніць якія б то ні было перашкоды доктару Скарыну. Але як яны ўспрымаюцца чытачом?* Вучні ўспамінаюць, з якой іроніяй апісвае аўтар караля ў першай

дзеі («каралю каля шасцідзесяці, ён зняў чаравікі і падабраў ногі на трон, карону павесіў на старчак спінкі трона злева, на старчаку справа вісіць «дзяржава», кароль соладка спіць...»), прыгадваюць скаргі Жыгімонта на інтрыгі каралевы, аглядкі на рымскія эдыкты. Кароль адкрыта прызнаецца, што баіцца каралевы і не давярае ёй. Таму і ўказ каралеўскі ўспрымаецца намі іранічна. Вось чаму фінальнымі з'яўляюцца не палажэнні ахоўнай граматы для Скарыны, а словы галоўнага героя, апранутага ў дарожную вопратку, а не ў доктарскую мантыю: «Позна... Позна, ваша святая Каралеўская Вялікасць. Спалены не толькі кнігі і друкарня, спалены і масты...»

Заключныя словы героя прачытваюцца на ўроку поўнасцю. Настаўнік задае пытанне: *Чаму Скарына гаворыць, што ён паспяшаўся стаць прарокам у сваёй Айчыне? Чаму аўтар даў такую назву твору: «Прарок для Айчыны»? Мы ведаем, што менавіта ў назве твора выказваецца яго асноўная думка. Хто такі прарок і пры якіх абставінах прынята гаварыць, што ён не прымаецца ў сваім родным краі?*

> **ДАВЕДКА.** У назве твора адчуваецца сувязь з вядомым выразам «Няма прарока ў сваёй Айчыне», які пайшоў ад слоў Хрыста, прыведзеных у Евангеллі ад Мацвея: «Не бывае прарока без пашаны, хіба што толькі на бацькаўшчыне сваёй, і ў доме сваім» (Мцв. 13:57). Пасля таго, як Хрыстос пабываў у розных мясцінах, стварыў там многа цудаў і набыў вядомасць, ён вярнуўся ў родны горад Назарэт, але быў адвергнуты гараджанамі.

Гэтыя словы паўтараюцца тады, калі людзьмі не цэняцца талент, здольнасці, заслугі блізкіх, суайчыннікаў, аддаецца перавага чужому перад родным. Скарына таксама сутыкаецца на сваёй радзіме з варожасцю, тут яму пагражае смерць. Такім чынам, асноўны канфлікт твора — канфлікт таленавітай, геніяльнай асобы з гістарычнымі абставінамі, з часам. Аўтар называе свайго героя прарокам для сваёй Айчыны, але яму прыходзіцца пакінуць Беларусь пасля многіх няшчасцяў і супрацьдзеянняў з боку ворагаў. Няшчасці, якія выпадаюць на долю Скарыны, тлумачацца ў творы ўчынкамі каралевы Боны

Сфорцы і дзеяннямі сіл, якім яна служыць. *Намалюйце слоўны партрэт каралевы, назавіце яе ўчынкі, сродкі, якімі яна дзейнічае супраць Скарыны.* Каралева Бона ў творы прадстаўляе сілы праціўнікаў выдання Статута Вялікага Княства Літоўскага, выступае непрымірымым ворагам Княства, ворагам дабра, прагрэсу і асветы. Аднак, насуперак усяму, Скарына яшчэ больш пераконваецца ў справядлівасці той справы, якой ён прысвяціў сваё жыццё. Таму, нягледзячы на мінорны тон, твор не пазбаўлены аптымізму.

*Выкажыце свае меркаванні наконт таго, у чым заключаецца аптымізм п'есы.* Трэба звярнуць увагу вучняў на тое, што прыхільнікаў Скарыны і справы выдання Статута ў творы больш, чым тых, хто ёй супрацьдзейнічае. Асаблівую сімпатыю ў адзінаццацікласнікаў павінен выклікаць Вартаўнік, які не паддаўся на подкуп і дапамог галоўнаму герою вызваліцца з турмы. Размовы Скарыны з вартаўніком познаньскай турмы — лепшыя старонкі твора.

*Зачытайце найбольш яркія, на вашу думку, дыялогі п'есы, у якіх выяўляецца характар персанажаў.* Гэтае заданне вучні могуць выконваць у малых групах, кожная з якіх павінна будзе зачытаць па ролях выбраныя ёю ўрыўкі.

Тры сюжэтныя лініі твора ўзаемазвязаныя паміж сабой, яны раскрываюць асноўную думку і выяўляюць галоўны канфлікт п'есы. Цэнтральным у драме з'яўляецца вобраз Скарыны, астатнія персанажы можна падзяліць на дзве групы: прыхільнікаў (паплечнікаў) Скарыны і яго праціўнікаў.

❐ **Дамашняе заданне:** скласці план вуснага адказу і падрыхтаваць паведамленне на тэму «Сістэма персанажаў драмы А. Петрашкевіча "Прарок для Айчыны"».

## УРОК 4.

## Гістарычная праўда і творчы вымысел у драме «Прарок для Айчыны». Працяг аналізу твора і заключныя заняткі

Працягваючы аналіз гістарычнай драмы «Прарок для Айчыны», важна звярнуць увагу на драматургічнае майстэрства А. Петрашкевіча, уменне пісьменніка ўдала спалучаць праўду гістарычнага факта з творчым вымыслам.

Настаўнік задае класу наступныя пытанні:

*1. Што вы ведаеце пра Статут Вялікага Княства Літоўскага?*

*2. Якія існуюць меркаванні гісторыкаў аб дачыненні Ф. Скарыны да яго выдання?*

*3. Назавіце персанажаў п'есы, створаных фантазіяй аўтара. Дайце ім характарыстыку.*

*4. Як вы лічыце, чаму аўтар так многа старонак твора прысвячае размовам галоўнага героя з Вартаўніком?*

Тое, што Скарына меў дачыненне да выдання Статута Вялікага Княства Літоўскага, не з'яўляецца даказаным, аднак даследчыкі лічаць гэта магчымым. Драматург выкарыстаў дадзеную гістарычную гіпотэзу і развіў яе мастацкімі сродкамі, удала звязаўшы з іншымі праўдзівымі фактамі жыцця першадрукара. Пісьменнік уводзіць у тэкст п'есы выдуманага персанажа — Вартаўніка, які аказваецца земляком Скарыны, выхадцам з Полацка. *Знайдзіце дыялогі Скарыны з Вартаўніком. Якую ролю ў раскрыцці аўтарскай задумы яны выконваюць?* Размовы Скарыны з Вартаўніком дапамагаюць аўтару раскрыць чалавечыя рысы характару галоўнага героя, ажывіць яго вобраз, наблізіць яго да чытача. З іх мы даведваемся пра ўнутраныя перажыванні героя. Вучні на аснове тэксту п'есы даюць характарыстыку гэтым перажыванням, адзначаюць сум галоўнага героя па родным краі і па кніжнай справе. Дыялогі Скарыны і Вартаўніка дапамагаюць раскрыць кантраст велічнай фігуры беларускага першадрукара, здзейсненага ім з выпрабаваннямі лёсу зняволенага. Вобраз Вартаўніка ў драме яшчэ і прыклад тыпу беларуса-аптыміста, які любіць трапнае слова, прыказку, гумар.

Цікавым эпізодам твора з'яўляецца сустрэча Скарыны з вядомым філосафам і багасловам таго часу Максімам Грэкам у Валакаламскім манастыры. Настаўнік знаёміць вучняў з фактамі біяграфіі Максіма Грэка.

**ДАВЕДКА.** Максім Грэк быў запрошаны ў Маскву з Грэцыі для перакладу на рускую мову царкоўных кніг і трапіў у няміласць да вялікага князя Васіля III. Вучоны быў несправядліва абвінавачаны і асуджаны царкоўным саборам

у 1525 годзе і сасланы ў Валакаламскі манастыр. Гісторыкі сцвярджаюць, што ўтрымліваўся ён у вельмі суровых умовах пры поўнай забароне на літаратурную дзейнасць. Максіму Грэку былі, несумненна, вядомыя пражскія выданні беларускага асветніка, што даказаў сучасны амерыканскі даследчык, загадчык славянскага аддзялення бібліятэкі Гарвардскага каледжа Х. Олмстэд. Даследчык выказаў меркаванне, што Максім Грэк мог і асабіста сустрэцца са Скарынам у Маскве да свайго зняволення. Аднак магчымасць такой сустрэчы лічыцца гісторыкамі малаверагоднай.

Настаўнік дае заданне знайсці ў творы апісанне сустрэчы двух асветнікаў — Францыска Скарыны і Максіма Грэка, — пераказаць гэты эпізод і адказаць на пытанне: *Як вы думаеце, для чаго аўтар уводзіць у твор вобраз Максіма Грэка?* А. Петрашкевіч у сваёй драме паказвае, што Скарына асабіста быў знаёмы з Максімам Грэкам і дабіўся праз уплывовых людзей сустрэчы з ім нават у зняволенні. Пісьменнік называе час і месца знаёмства Скарыны з Максімам Грэкам: 1512 год, Венецыя. Скарына і Максім Грэк, па дапушчэнні драматурга, разам вучыліся друкарскай справе ў знакамітага венецыянскага друкара і вучонага-гуманіста Альда Мануцыя. Вядома, што Максім Грэк паходзіў з сям'і багатага грэчаскага саноўніка і атрымаў бліскучую адукацыю ў Парыжы, Венецыі і Фларэнцыі. Не выключана, што і Скарына мог бываць у Венецыі, вучыцца друкарскай справе ў гэтым горадзе.

Сустрэча аднадумцаў дае магчымасць аўтару раскрыць планы Скарыны наконт выдання кніг у Маскве. Як вядома, гэтым планам не суджана было здзейсніцца. У творы выразна прасочваецца сувязь лёсаў двух асветнікаў, якія церпяць за сваю асветніцкую дзейнасць. Настаўнік дае заданне класу: *Параўнайце, у чым падабенства і адрозненне лёсу гэтых герояў.*

Настаўнік просіць: *Вызначце ролю мастацкага вымыслу ў іншых эпізодах драмы.* Адзінаццацікласнікі прыходзяць да заключэння, што ён дапамагае драматургу раскрыць асноўную думку твора, ажывіць дзеянне, зацікавіць чытача.

У заключэнне разгляду драмы вучні рыхтуюцца да адказу на 6-е і 7-е пытанні вучэбнага дапаможніка (с. 283), выпісваюць

з тэксту выказванні Скарыны, якія характарызуюць яго як асветніка і гуманіста. Гэта могуць быць, напрыклад, наступныя словы героя з першай дзеі: «...Мой дэвіз — роўная свабода ўсім, агульнае багацце для ўсіх. І ён не прыдуманы некім злым. Ён паходзіць ад закона прыроджанага: тое чыніце іншым усім, што самому люба ад іншых усіх. І таго не чыніце іншым, чаго сам сабе не хочаш ад іх меці...» Дадаткова настаўнік дае вучням наступныя заданні: вызначыць адметнасць жанру твора, яго месца ў драматургічнай спадчыне А. Петрашкевіча; адзначыць па тэксце пункты развіцця канфлікту твора, паразважаць, ці можна лічыць канфлікт у творы завершаным пасля вызвалення галоўнага героя з турмы.

❐ **Дамашняе заданне:** прачытаць п'есу У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею».

## УРОК 5.

### Вастрыня канфлікту ў драме Уладзіміра Бутрамеева «Страсці па Аўдзею»

Урок можна пачаць з прэзентацыі асобы і творчасці У. Бутрамеева, выкарыстаўшы матэрыял вучэбнага дапаможніка (с. 287—291), у форме ўступнага слова настаўніка ці паведамлення загадзя падрыхтаванага вучня.

Асноўную частку ўрока варта аддаць рабоце над лепшай п'есай драматурга «Страсці па Аўдзею» («Крык на хутары»). Пачаць вывучэнне драмы можна з аналізу каментарыя вядомага рэжысёра Беларускага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы В. Раеўскага (с. 288). *Ці згодны вы з меркаваннем рэжысёра? Аргументуйце свой адказ.* Вучнёўскія адказы якраз і выконваюць ролю арыентацыйнага этапу, высветляць ступень іх ведання зместу і асэнсавання праблематыкі твора. П'еса ўяўляе сабой цэласнае мастацкае палатно, дзе трагедыя беларускага селяніна паказана на фоне канкрэтных гістарычных падзей, у кантэксце сацыяльнага жыцця грамадства, з глыбокім пранікненнем у псіхалогію чалавека-працаўніка. Маючы вопыт вывучэння твораў на тэму калектывізацыі, вучні без асаблівых цяжкасцей вызначаць асноўную праблему драмы — зямлі і волі.

*Чаму аўтар пазбягае ў п'есе рэмарак, уласнай характарыстыкі персанажаў?* Гісторык па спецыяльнасці, У. Бутрамееў імкнуўся максімальна наблізіць твор да жыцця, даючы чытачу магчымасць рабіць уласныя высновы. Гэта патрабавала ад драматурга пэўных намаганняў, але напоўніла п'есу незвычайным разуменнем і адчуваннем тагачаснай рэчаіснасці.

*З якімі героямі вывучаных твораў беларускіх пісьменнікаў вы параўналі б вобраз Аўдзея? У чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?* Адзінаццацікласнікі, несумненна, прыгадаюць Сымона з «Раскіданага гнязда» Янкі Купалы і Васіля Дзятла з «Палескай хронікі» І. Мележа. Настаўніку варта звярнуць увагу на жыццёвую пераканальнасць вобраза Аўдзея, яго выразна акрэсленыя прынцыпы, гатоўнасць і імкненне іх адстойваць.

*У чым прычына, вытокі сямейнага дабрабыту Аўдзея? Як аб гэтым разважае сам галоўны герой?* Шлях Аўдзея да заможнага гаспадара-хлебароба паказаны ў п'есе даволі выразна. У асноўным аўтар для гэтага выкарыстоўвае маналогі героя. Цяжка даваўся Аўдзею кожны набытак у гаспадарцы. Ён удзячны сваёй маці, якая, прадаючы па вёсках прадметы неабходнай вясковай галантарэі, сабрала для сына першы капітал. Далей ужо сам Аўдзей «пуп ірваў, горб гарбаціў, кішкі вузлом завязваў», каб зажыць годна.

І купалаўскі Сымон, і мележаўскі Васіль паказаны ў творах як сямейнікі, на фоне цесных сямейных узаемаадносін, бо сям'я для беларуса — гэта «гняздо»-апірышча, без якога не ўяўляюцца і асабістае шчасце, і матэрыяльны дабрабыт, і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. *Як Аўдзей адносіцца да сямейнікаў? Ці не надта ён патрабавальны, а магчыма, дэспатычны да іх у пытаннях вядзення гаспадаркі?* — правакуе настаўнік вучняў да разважанняў па згаданай тэме. На першы погляд гаспадар, сапраўды, не дае спуску нікому: ні старым, ні малым, усім знаходзіцца работа на зямлі ці каля дома. Але паказальна, што ніхто не скардзіцца на такое становішча ў сям'і. Філасофія Аўдзея, якая выяўляецца ў афарыстычным выслоўі «Хто гняздо ўе, у таго і ўецца, у таго і ёсць, той жыве...» успрымаецца сямейнікамі як аксіёма жыцця. Яны добра ўсведамляюць, што без знясільваючай працы на зямлі, без узаемадапамогі не будзе заможнасці.

Пэўныя супярэчнасці выклікаюць у вучняў адносіны галоўнага героя да жабрака. *Ці апраўдваеце вы гаспадара, які асуджае свайго былога суседа за жабрацтва?* Гэта праблемнае пытанне, і трэба даць адзінаццацікласнікам магчымасць шчыра выказацца, актуалізаваць прачытанае, спраецыраваць яго на праблемы сучаснага жыцця.

Заключная частка ўрока будзе прысвечана асэнсаванню праблемы асобы і ўлады, трагедыі працаўніка ва ўмовах калектывізацыі. Пытанне для вучняў не новае, таму трэба засяродзіць іх увагу на эпізодзе, звязаным з жаданнем Аўдзея набыць малатарню. *Чаму Аўдзей падчас ваяўнічай з боку ўладаў калектывізацыі, пад пагрозай страціць маёмасць тым не менш не адмаўляецца ад жадання набыць малатарню?* Тым самым драматург сцвярджае трываласць прынцыпаў селяніна, яго спадзяванні на ўласную гаспадарку і працу на зямлі. Да апошняга Аўдзей не хоча верыць, што ёсць такая ўлада, якая можа нахабна, сілай адабраць нажытае цяжкай працай.

У якасці падагульнення ў асэнсаванні ідэйнага зместу п’есы вучням можна прапанаваць паразважаць над яе назвамі («Страсці па Аўдзею» і «Крык на хутары») і параўнаць іх, а таксама над аўтарскім вызначэннем жанру — народная драма.

❒ **Дамашняе заданне:** выканаць заданні вучэбнага дапаможніка да твора (с. 291); прачытаць п’есы С. Кавалёва «Звар’яцелы Альберт», «Трышчан ды Іжота», «Чатыры гісторыі Саламеі», «Стомлены д’ябал» (клас дзеліцца на чатыры групы, кожная з якіх чытае адну п’есу).

## УРОК 6.

### Герменеўтычныя п’есы Сяргея Кавалёва

На апошнім уроку разглядаецца герменеўтычная драматургія С. Кавалёва. Эпіграфам да ўрока можа паслужыць наступнае выказванне паэта Л. Дранько-Майсюка: «Звычайна драматургі жыццё ператвараюць у літаратуру. Сяргей Кавалёў, наадварот, літаратуру ператварае ў жыццё».

На ўступным этапе настаўнік знаёміць вучняў са звесткамі з жыцця і творчасці драматурга, што пададзены ў адпаведным артыкуле дапаможніка (с. 283—287). У сваім паведамленні ён

акцэнтуе ўвагу на спецыфіцы драматургіі С. Кавалёва. Будучы вучоным-літаратуразнаўцам, даследчыкам старабеларускай літаратуры і прыхільнікам тэатра, пісьменнік працуе ў жанры герменеўтычнай (ад грэч. hermeneutikós — 'вытлумачэнне, інтэрпрэтацыя') п'есы, п'есы-рымейка (ад англ. remake — 'пераствараць'). У прадмове да зборніка «Стомлены д'ябал» (2004 г.) ён так тлумачыць сутнасць сваёй драматургічнай дзейнасці: «Як гісторык літаратуры і драматург у адной асобе, я займаюся герменеўтычнай драматургіяй: спрабую актуалізаваць у сучаснай тэатральнай культуры адметныя помнікі літаратурнай спадчыны, ажывіць забытыя сэнсы і значэнні». На думку С. Кавалёва, «старадаўнія тэксты захоўваюць у сабе важныя сэнсы і значэнні, нацыянальныя і сусветныя архетыпы, забытыя на многія стагоддзі, але, магчыма, актуальныя менавіта для нашай эпохі». Таму задача ўрока заключаецца ў тым, каб дапамагчы вучням вызначыць, якія актуальныя як для мінулых стагоддзяў, так і для нашага часу праблемы ўздымае драматург у сваіх п'есах, заснаваных на пераасэнсаванні даўніх тэкстаў.

Ва ўступным слове настаўнік адзначае таксама месца дзіцячай п'есы ў творчасці С. Кавалёва, з якой пісьменнік пачаў сваю драматургічную дзейнасць. Першая дзіцячая п'еса-казка «Драўляны рыцар» створана ў стылі добра вядомага ў дзіцячай літаратуры матыву падарожжа дзяцей у іншасвет, якое суправаджаецца неверагоднымі прыгодамі і выпрабаваннямі. Аўтар удала спалучае казку з рэальнасцю, традыцыйныя матывы рыцарства і самаахвярнасці з праблемамі сучаснасці, казачны свет дзяцінства і мары з прагматычным светам дарослых. Асаблівую папулярнасць набыла п'еса С. Кавалёва для дзяцей «Дарога на Віфлеем» (іншы варыянт назвы: «Братка Асёл»), у якой вядомыя падзеі нараджэння Збаўцы свету паказваюцца праз прызму жыццёвых блуканняў і пошукаў галоўнага героя твора — Асла. Проста і па-майстэрску пісьменнік раскрывае важныя філасофскія ісціны для маленькага чытача. Настаўнік называе і іншыя п'есы С. Кавалёва для дзяцей: «Хохлік», «Заяц варыць піва», «Пацалунак ночы», «Пясчаны замак», адзначае, што драматург працягвае плённа працаваць у гэтым жанры.

Наступны этап урока — арыентацыйны. Спачатку настаўнік прапануе выказаць свае ўражанні ад прачытаных дома п'ес.

Адказы адзінаццацікласнікаў дадуць інфармацыю аб тым, што найбольш іх закранула, на што яны звярнулі ўвагу. Каб паглыбіць успрыманне твораў і перайсці да іх аналізу, неабходна падзяліць клас на групы і даць заданне: назваць персанажаў і коратка пераказаць сюжэт канкрэтнай п’есы (кожнай групе прапануецца адна п’еса).

Затым варта перайсці да вызначэння гістарычнай асновы твораў і разгляду праблематыкі. Вядома, што глыбока прааналізаваць кожную з названых п’ес на адным уроку не атрымаецца, таму задача настаўніка — звярнуць увагу вучняў на іх жанравую адметнасць і найбольш значныя і актуальныя для нашага часу пытанні, што ўздымаюцца ў іх. Неабходна паказаць, што кожны з вышэйназваных твораў — гэта не простае паўтарэнне вядомых літаратурных сюжэтаў ці іх інсцэніроўка, а вынік творчага пошуку, «свабоднае канструяванне» аўтарам мастацкага свету. Драматург стварае новы твор, у якім дзейнічаюць вядомыя літаратурныя персанажы і аднаўляюцца некаторыя папулярныя сюжэтныя лініі, але імкнецца даць ім сваю інтэрпрэтацыю. У гэтых п’есах выразна адчуваецца асоба аўтара, а дыялог вядзецца не толькі паміж героямі, «але і паміж рознымі творамі, жанрамі, эпохамі» (С. Кавалёў).

Таму настаўнік можа задаць наступнае пытанне: *Якія веды неабходныя чытачу, каб належным чынам ацаніць герменеўтычныя п’есы С. Кавалёва?* Зразумела, што чытач павінен быць філалагічна падрыхтаваным, ведаць гісторыю беларускай літаратуры. Далей вучні з дапамогай настаўніка называюць творы, якія выступаюць асновай для творчых апрацовак С. Кавалёва. Гэта рыцарскі сярэднявечны раман «Трышчан», кніга фантастычных апавяданняў Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», мемуары С. Пільштыновай-Русецкай «Авантуры майго жыцця», напісаныя ў XVIII стагоддзі і выдадзеныя ў XX стагоддзі спачатку на польскай мове, а потым і на беларускай. Самая ж паспяховая ў сцэнічным жыцці п’еса-рымейк С. Кавалёва «Стомлены д’ябал» грунтуецца на мастацкіх творах ажно трох вызначальных для беларускай драматургіі аўтараў: К. Марашэўскага, Ф. Аляхновіча, Янкі Купалы. Дарэчы, святло рампы на «Вольнай сцэне» п’еса пабачыла ў 1999 годзе (спектакль у пастаноўцы Р. Таліпава).

Настаўнік адзначае, што драматург бярэ за аснову сваіх п'ес забытыя або напаўзабытыя беларускія тэксты, актуалізуючы іх такім чынам для чытача (тут варта прыгадаць яшчэ п'есы «Балада пра Бландою», «Францішка, або Навука кахання», асновай для напісання якіх паслужылі рыцарскі раман «Бава» і лёс першай беларускай жанчыны-драматурга Францішкі Уршулі Радзівіл, п'есу якой «Распуснікі ў пастцы» С. Кавалёў цалкам уключае ў свой твор). Так, з дапамогай герменеўтычнай драматургіі С. Кавалёва мінулае вяртаецца да нас, каб стаць актуальнасцю сённяшняга дня.

*Якое жанравае вызначэнне сваім творам дае сам аўтар?* Вучні называюць, што гэта п'еса-містыфікацыя паводле твораў Я. Баршчэўскага, п'еса паводле матываў старажытнабеларускага рыцарскага рамана XVI стагоддзя, рамантычная гісторыя з трагікамічнымі ўспамінамі, фантасмагорыя з жыцця і літаратуры беларусаў. Як бачым, жанравае вызначэнне твораў С. Кавалёва сведчыць аб тым, з якіх крыніц чэрпаў сваё натхненне аўтар пры распрацоўцы арыгінальных сюжэтаў.

*Якія ж схаваныя сэнсы беларускіх літаратурных тэкстаў, актуальныя для нас сёння, аўтар выяўляе ў сваіх п'есах-рымейках?* Для адказу на гэтае пытанне вучням трэба вызначыць асноўны канфлікт кожнай з названых п'ес С. Кавалёва, выкарыстаўшы матэрыял дапаможніка (с. 283—287). Супаставіўшы творы, клас прыйдзе да высновы, што іх сутнасць падобная. Гэта маральны канфлікт паміж героямі з супрацьлеглымі каштоўнасцямі, праз якія выяўляюцца адвечныя экзістэнцыяльныя праблемы чалавечага існавання, прыадкрываецца адвечнае супрацьстаянне Дабра і Зла. У п'есах С. Кавалёва заўважаецца сутыкненне высокамаральных прынцыпаў адных персанажаў з прагавітасцю, сквапнасцю і здрадлівасцю другіх. Гаворачы пра твор «Стомлены д'ябал» — «беларускую гісторыю пра звычайнага чалавека, пра ягоныя пошукі шчасця і прычыны няшчасцяў», аўтар адзначае: «Я паспрабаваў падсумаваць пэўны досвед — жыццёвы і літаратурны — сваіх славутых папярэднікаў у вырашэнні адвечных экзістэнцыяльных праблем, актуальных для чалавека як у XVIII стагоддзі, так і ў нашыя дні» (прадмова да зборніка п'ес «Стомлены д'ябал»). Гэтае выказванне праўдзівае ў адносінах да ўсёй драматургічнай спадчыны С. Кавалёва.

У заключэнне настаўнік задае класу наступныя пытанні, якія дапамогуць зрабіць высновы не толькі да ўрока па творчасці С. Кавалёва, але і да ўсёй тэмы «Драматургія»:

*1. Якімі рысамі вылучаецца сучасны літаратурны працэс, у прыватнасці драматургія?*

*2. Якое месца ў сучаснай беларускай драматургіі займае творчасць С. Кавалёва?*

*3. Чым, на вашу думку, тлумачыцца папулярнасць герменеўтычных п'ес драматурга (за ўвесь перыяд творчай дзейнасці С. Кавалёва было пастаўлена каля ста спектакляў у Беларусі і за мяжой)?*

*4. Якія канфлікты становяцца прадметам сённяшняй драматургіі?*

*5. Назавіце герояў сучасных беларускіх п'ес, хто яны?*

*6. У чым мастацкая адметнасць сучаснай п'есы? Якія актуальныя праблемы ў ёй закранаюцца?*

Настаўнік дае заданне назваць вядомыя вучням сучасныя п'есы і выбраць, да якога з прыведзеных ніжэй канфліктаў яны адносяцца: «чалавек і грамадства», «чалавек і чалавек», «чалавек з самім сабой», «чалавек і прырода», «час і чалавек».

Вывучэнне драматычных твораў у школьным курсе дае магчымасць настаўніку далучыць вучняў да сакрэтаў сцэнічнага мастацтва, прадэманстраваць ім сілу ўздзеяння трапнага слова, вучыць шчырасці ў выказванні сваіх пачуццяў і думак, развіваць мову. Таму пажадана, каб урокі прадугледжвалі творчыя заданні, якія дапамогуць абудзіць творчую думку вучняў, пранікнуць у сутнасць драматычнага дзейства, характараў персанажаў.

❒ У якасці творчага **дамашняга задання** настаўнік можа папрасіць вучняў паспрабаваць самім прыдумаць сюжэт сучаснай п'есы, намаляваць афішу да спектакля ці напісаць рэцэнзію на самастойна прачытаны твор, арганізаваць інсцэніроўку фрагментаў твораў, якія вывучаліся на папярэдніх уроках.

Па жаданні настаўніка замест **урока 6** «Герменеўтычныя п'есы Сяргея Кавалёва» можна правесці **заключны ўрок** па ўсёй тэме «Драматургія» ў форме чытацкай канферэнцыі па самастойна прачытаных творах ці семінара. У гэтым выпад-

ку вучням загадзя даецца заданне прачытаць адну ці некалькі сучасных п'ес (з прапанаванага настаўнікам спісу) і падрыхтавацца да паведамлення аб разгледжаным творы на плане.

План

1. Тэма і жанравая адметнасць твора.
2. Сюжэт і героі.
3. Асаблівасць канфлікту і аўтарская пазіцыя.
4. Уласныя ўражанні і думкі.

Калі заключны ўрок плануецца правесці ў форме чытання рэфератаў, тады на аглядавым уроку настаўнік прапануе вучням іх тэматыку.

---

## ЗМЕСТ

Ад аўтараў ........ 3

**Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў (5)**

Іван Шамякін ........ 7
Васіль Быкаў ........ 29
Эрнэст Хемінгуэй ........ 53
Міхась Стральцоў ........ 58
Ніл Гілевіч ........ 66
Іван Чыгрынаў ........ 74
Іван Навуменка ........ 81
Рыгор Барадулін ........ 89
Генрых Бёль ........ 95
Яўгенія Янішчыц ........ 104
Георгій Марчук ........ 111
Аляксей Дудараў ........ 115

**Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1980-х гадоў)**

Паэзія ........ 125
Проза ........ 156
Драматургія ........ 170

Вучэбнае выданне

**Мельнікава** Зоя Пятроўна
**Ішчанка** Галіна Мікалаеўна
**Адрэйкавец** Надзея Дзмітрыеўна і інш.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
# ў 11 класе

Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў
установ агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Ю. А. Якаўчэнка*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейкі*
Карэктары *С. Н. Алава, К. В. Шобік*

Падпісана ў друк 30.05.2011. Фармат 60×84 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,16.
Ул.-выд. арк. 10,0. Тыраж 3300 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва "Беларускі Дом друку"». Вытворчасць № 1.
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Вул. Мяснікова, 37, 220010, г. Мінск